# У ВАЙНЫ НЕ ЖАНОЧЫ ТВАР

СВЯТЛАНА АЛЕКСІЕВІЧ



ГАЛАСЫ УТОПІІ

ДА 70-ГОДДЗЯ
СВЯТЛАНЫ АЛЕКСІЕВІЧ

Выдадзена
пры дапамозе
краўдфандынгу
Ulej.by

Паважаны чытач!

Гэтае унікальнае выданне стала магчымае дзякуючы супольным намаганням грамадскасці Беларусі, краўдфандынгавай платформы Ulej.by, «Белгазпрамбанка» і Цэнтра выяўленчага і медыямастацтва «Новая культурная ініцыятыва».

У найноўшым беларускім перакладзе апублікаваныя разам пяць кніг першай ў беларускай гісторыі лаўрэаткі Нобелеўскай прэміі ў галіне літаратуры Святланы Алексіевіч, аб'яднаных у цыкл «Галасы Утопіі».

З мэтай зрабіць кнігі Алексіевіч даступнымі для чытачоў нашай краіны «Белгазпрамбанк» падбаў, каб гэтае выданне можна было знайсці ва ўсіх беларускіх бібліятэках.

СВЯТЛАНА АЛЕКСІЕВІЧ

# У ВАЙНЫ НЕ ЖАНОЧЫ ТВАР

Пераклаў з рускай
Валянцін Акудовіч

Логвінаў

Дакументальна-мастацкая хроніка «Галасы Утопіі» — пяць кніг, у якіх «маленькі чалавек» сам апавядае пра свой лёс. Гэта адметны жанр — шматгалосыя раманы-споведзі, у якіх з малых падзеяў складваецца вялікая гісторыя.

Перад чытачом — апошняя аўтарская рэдакцыя цыкла ў найноўшым беларускім перакладзе. Пісьменніца паводле свайго творчага метаду дапрацавала хроніку: скасавала цэнзурныя праўкі, далучыла новыя эпізоды, а таксама старонкі з уласнага дзённіка.

«У вайны не жаночы твар» — першая кніга хронікі. Досвед унікальнага спазнання духоўнага свету жанчыны, якая трывае нечалавечыя пакуты вайны.

ISBN 978-609-8213-36-2

© Святлана Алексіевіч, 2018
© Валянцін Акудовіч, пераклад на беларускую мову, 2018
© Logvino literatūros namai, 2018

*—Калі ўпершыню жанчыны з'явіліся ў войску?*

—Ужо ў IV стагоддзі да нашай эры ў войсках Афінаў і Спарты былі жанчыны. Пазней яны бралі ўдзел у паходах Аляксандра Македонскага. Рускі гісторык Мікалай Карамзін пісаў пра нашых продкаў: «Славянкі часам хадзілі на вайну з бацькамі і мужамі, не палохаючыся смерці: прыкладам, пасля аблогі Канстанцінопаля ў 626 годзе грэкі знайшлі сярод забітых славянаў шмат жаночых трупаў. Маці, калі выхоўвалі дзяцей, рыхтавалі іх быць ваярамі».

*—А ў новы час?*

—Упершыню ў Англіі ў XVI стагоддзі пачалі фармаваць вайсковыя шпіталі, у якіх служылі жанчыны.

*—Што адбылося ў XX стагоддзі?*

—У Першую сусветную вайну ў Брытаніі жанчын ужо прымалі ў Каралеўскія вайскова-паветраныя сілы, былі сфармаваныя Каралеўскі дапаможны корпус і Жаночы легіён аўтатранспарту — колькасцю 100 тысяч чалавек. У Расіі, Германіі, Францыі жанчыны таксама пачалі служыць у вайсковых шпіталях і санітарных цягніках.

А падчас Другой сусветнай вайны жанчыны ўжо былі ва ўсіх родах войскаў у многіх краінах: у брытанскай арміі — 225 тысяч, у амерыканскай — 450–500 тысяч, у германскай — 500 тысяч…

У Савецкай арміі ваявала калі мільёна жанчын. Яны авалодалі ўсімі вайсковымі прафесіямі, у тым ліку і самымі «мужчынскімі». Нават паўстала моўная праблема: у словаў «танкіст», «пехацінец», «аўтаматчык» да таго часу не існавала жаночага роду, паколькі гэтую справу яшчэ ніколі не выконвалі жанчыны. Жаночыя словы нарадзіліся там, на вайне…

*З размовы з гісторыкам*

# ЧАЛАВЕК БОЛЬШЫ ЗА ВАЙНУ (З ДЗЁННІКА КНІГІ)

Бо мільёны за грош загубленых
Пратапталі сцяжыну ў ноч...
*Восіп Мандэльштам*

## 1978–1985 гг.

Пішу кнігу пра вайну...

Я, каторая не любіла чытаць ваенныя кнігі, хоць у маім дзяцінстве і юнацтве ва ўсіх гэта была ўлюбёная чытанка. Ва ўсіх маіх аднагодкаў. І гэта было зразумела — мы былі дзецьмі Перамогі. Дзецьмі пераможцаў. Першае, што я памятаю пра вайну? Сваю дзіцячую тугу сярод незразумелых і вусцішных словаў. Пра вайну згадвалі заўсёды: у школе і дома, на вяселлях і хрэсьбінах, у святы і на хаўтурах. Нават у дзіцячых размовах. Суседскі хлопчык аднойчы запытаў мяне: «А што людзі робяць пад зямлёй? Як яны там жывуць?». Мы таксама прагнулі разгадаць таямніцу вайны.

Тады я і задумалася пра смерць... І ўжо ніколі не спынялася пра яе думаць, для мяне яна зрабілася галоўнай таемнасцю жыцця.

Усё для нас бярэ пачатак з таго страшнага і таямнічага свету. У нашай сям'і ўкраінскі дзядуля, мамін бацька, загінуў на фронце, пахаваны недзе ў мадзьярскай зямлі, а беларуская бабуля, татава мама, памерла ад тыфу ў партызанах, двое яе сыноў служылі ў войску і згінулі без вестак у першыя месяцы вайны, з трох вярнуўся

адзін. Мой бацька. Адзінаццаць сваякоў разам з дзецьмі немцы спалілі жывымі — каго ва ўласнай хаце, каго ў вясковай царкве. Так было ў кожнай сям'і. Ва ўсіх.

Вясковыя хлопчыкі доўга яшчэ гуляліся ў «немцаў» і «рускіх». Крычалі нямецкія словы: «Хендэ хох», «Цурук», «Гітлер капут!».

Мы не ведалі свету без вайны, свет вайны быў адзіна знаёмым нам светам, а людзі вайны — адзіна знаёмымі нам людзьмі. Я і сёння не ведаю іншага свету і іншых людзей. А ці былі яны ўвогуле калі-небудзь?

* * *

Вёска майго дзяцінства пасля вайны была жаночай. Бабскай. Мужчынскіх галасоў не памятаю. Так у мяне і засталося: пра вайну распавядаюць бабы. Плачуць. Спяваюць, як плачуць.

У школьнай бібліятэцы — палова кніг пра вайну. І ў вясковай, і ў райцэнтры, куды бацька часта ездзіў па кнігі. Цяпер я маю адказ — чаму. Хіба выпадкова? Мы ўвесь час ваявалі або рыхтаваліся да вайны. Ці згадвалі пра тое, як ваявалі. Ніколі не жылі інакш, відаць, і не ўмеем. Не ўяўляем, як жыць яшчэ, гэтаму нам трэба будзе некалі доўга навучацца.

У школе нас вучылі любіць смерць. Мы пісалі сачыненні, як хацелі б памерці ў імя… Мроілі…

А галасы на вуліцы казалі пра іншае, вабілі мацней.

Я доўга была кніжным чалавекам, якога жывое жыццё адначасна інтрыгавала і палохала. Ад яго няведання з'явілася адвага. Цяпер думаю: калі б я была больш рэальным чалавекам, ці магла б кінуцца ў гэткую бездань? З чаго так сталася — ад няведання? Ці ад паклікання? Бо паклікане пэўна ж ёсць…

Доўга шукала… Якімі словамі можна пераказаць тое, што я чую? Шукала жанр, які б адпавядаў таму, як я бачу свет, як уладкаваныя маё вока, маё вуха.

Аднойчы трапіла ў рукі кніга «Я з вогненнай вёскі» А. Адамовіча, Я. Брыля, У. Калесніка. Такое ўзрушэнне я спазнала толькі аднойчы, калі чытала Дастаеўскага. А тут — нязвыклая форма: раман, створаны з галасоў самога жыцця, з таго, што я чула ў дзяцінстве, з таго, што сёння гучыць на вуліцы, дома, у кавярні, у тралейбусе. Вось! Пошук заканцаваўся. Я знайшла тое, што шукала. Што прадчувала.

Алесь Адамовіч стаў маім настаўнікам…

* * *

Два гады не столькі сустракалася і запісвала, колькі думала. Чытала. Пра што будзе мая кніга? Ну, яшчэ адна кніга пра вайну… Навошта? Ужо былі тысячы войнаў — малых і вялікіх, вядомых і невядомых. А напісана пра іх яшчэ болей. Але… Пісалі мужчыны і пра мужчынаў — гэта сталася зразумелым адразу. Усё, што мы ведаем пра вайну, мы ведаем з «мужчынскага голасу». Мы ўсе ў палоне «мужчынскага» ўяўлення і «мужчынскага» адчування вайны. «Мужчынскіх» словаў. А жанчыны маўчаць. Ніхто ж, акрамя мяне, не распытваў маю бабулю. Маю маму. Маўчаць нават тыя, хто быў на фронце. А калі раптам наважацца на ўспаміны, дык апавядаюць не «жаночую» вайну, а «мужчынскую». Падладжваюцца пад канон. І толькі дома ці расплакаўшыся ў коле франтавых сяброваак яны пачынаюць гаварыць пра сваю вайну, мне невядомую. Не толькі мне, усім нам. У сваіх журналісцкіх росшуках я не аднойчы была сведкай, адзінай слухачкай абсалютна ўнікальных тэкстаў.

І мяне скаланала, як у дзяцінстве. Праз гэтыя аповеды праглядаў пачварны ашчэр таямнічага… Калі жанчыны пераказваюць вайну, у іх няма ці амаль няма таго, пра што мы звykліся чытаць і чуць: як адны людзі гераічна забівалі другіх і перамаглі. Ці атрымалі паразу. Якая была тэхніка і якія генералы. Жаночыя расповеды — іншыя і пра іншае. У «жаночай» вайны свае фарбы, свае пахі, сваё святло і свае абсягі пачуццяў. Свае словы. Там няма герояў і неймаверных подзвігаў, там ёсць проста людзі, абцяжараныя нечалавечай чалавечай справай. І пакутуюць там не толькі яны (людзі!), але і зямля, і птушкі, і дрэвы. Усе, хто жыве разам з намі на гэтым свеце. Пакутуюць без словаў, што яшчэ больш страшна.

Але чаму? — не аднойчы пыталася я ў сябе. Чаму, заняўшы і адстаяўшы сваё месца ў некалі абсалютна мужчынскім свеце, жанчыны не адстаялі сваю гісторыю? Свае словы і свае пачуцці? Не паверылі самі сабе. Ад нас быў утоены яшчэ адзін свет. Іх вайна засталася невядомай…

Хачу напісаць гісторыю гэтай вайны. Жаночую гісторыю.

* * *

Пасля першых сустрэч…

Здзіўленне: ваенныя прафесіі ў гэтых жанчын — санінструктарка, снайперка, кулямётчыца, камандзір зенітнай установкі, сапёрка, а цяпер яны — бухгалтаркі, лабаранткі, экскурсаводкі, настаўніцы… Несупадзенне роляў — там і тут. Апавядаюць быццам не пра сябе, а пра нейкіх іншых дзяўчат. Сёння самі сабе дзівяцца. І на маіх вачах «ачалавечваецца» гісторыя, робіцца падобнай да проста жыцця. З'яўляецца іншая оптыка.

Сустракаюцца неверагодныя апавядальніцы, у іх жыцці ёсць старонкі, якія могуць супернічаць з найлепшымі старонкамі класікі. Чалавек так ясна бачыць сябе зверху — з неба, і знізу — з зямлі. Перад ім увесь шлях наверх і шлях уніз — ад анёла да звера. Успаміны — гэта не жарсны ці абыякавы пераказ зніклай рэальнасці, а новае нараджэнне мінулага, калі час вяртаецца. Але найперш гэта — творчасць. Апавядаючы, людзі ствараюць, «пішуць» сваё жыццё. Здараецца, што і «дапісваюць», і «перапісваюць». Тут трэба быць асцярожным. Не губляць пільнасць. Разам з тым, боль плавіць, нішчыць любы фальш. Надзвычай высокая тэмпература! Шчыра, пераканалася я, трымаюць сябе простыя людзі — медсёстры, кухаркі, прачкі. Яны, як бы гэта больш дакладна сказаць, вымаюць словы з сябе, а не з газет і прачытаных кніг — не з чужога. Толькі са сваіх уласных пакутаў і пачуццяў. Эмоцыі і мова адукаваных людзей, як гэта ні дзіўна, звычайна хутчэй трапляюць пад уплывы часу. Пад яго агульную кадыфікацыю. Яны дэфармаваныя ведамі другога парадку. Міфамі. Часта даводзіцца доўга кружляць, каб пачуць гісторыю пра «жаночую» вайну, а не «мужчынскую»: як адступалі, наступалі, дзе быў той фронт… Патрабуецца не адна сустрэча, а шмат сеансаў. Быццам стараннаму партрэтысту.

Падоўгу гасцюю ў незнаёмым доме ці кватэры, здараецца, цэлы дзень. П'ём чай, прымерваем нядаўна набытыя кофтачкі, абмяркоўваем прычоскі і кулінарныя рэцэпты. Разглядаем разам фотаздымкі ўнукаў. І вось тады… Праз нейкі час, ніколі не ведаеш, праз які і чаму, раптам надыходзіць той доўгачаканы момант, калі чалавек адыходзіць ад канону — гіпсавага ці жалезабетоннага, як нашыя помнікі — і рушыць да самога сябе. У сябе. Пачынае згадваць не вайну, а сваю маладосць.

Частку свайго жыцця… Трэба злавіць гэты момант. Не прамінуць! Аднак часта пасля доўгага дня, запоўненага словамі, фактамі, слязьмі, у памяці застаецца толькі адна фраза (але якая!): «Я такая маленькая пайшла на фронт, што за вайну нават падрасла». Яе і пакідаю ў нататніку, хоць на магнітафоне накручана дзясяткі і дзясяткі метраў. Чатыры-пяць касет…

Што мне дапамагае? Тое, што мы прызвычаіліся жыць талакой. Разам. Саборныя людзі. Усё ў нас на вачах грамады — і шчасце, і слёзы. Умеем пакутаваць і не хаваць пакуты. Пакуты апраўдваюць нашае цяжкае і бязладнае жыццё. Для нас боль — гэта мастацтва. Мушу засведчыць, жанчыны адважна становяцца на гэты шлях…

* * *

Як яны сустракаюць мяне?

Называюць: «дзяўчынка», «дачушка», «дзетачка», пэўна, каб я была з іхняга пакалення, яны паводзіліся б са мной інакш. Спакойна і на роўных. Без радасці і здзіўлення, якія прыносіць сустрэча маладосці і сталасці. Гэта надзвычай істотны момант, што тады яны былі маладыя, а цяпер распавядаюць пра той час добра пажылымі. Праз жыццё ўспамінаюць — праз сорак гадоў. Прыадчыняюць мне свой свет асцярожна, далікатна: «Адразу пасля вайны пабралася шлюбам. Схавалася за мужа. За побыт, за дзіцячыя пялюшкі. З ахвотай схавалася». І мама прасіла: «Маўчы! Маўчы! Не прызнавайся». Я выканала свой абавязак перад Радзімай, але не маю радасці з таго, што там была. Што я ўсё гэта ведаю… А ты — зусім дзяўчынка. Цябе мне шкада…». Часта бачу, як яны сядзяць і прыслухоўваюцца да сябе.

Да гукаў сваёй душы. Ці сувымерныя яны словам. За доўгія гады чалавек пачынае разумець, што вось было жыццё, а цяпер трэба змірыцца і рыхтавацца да сыходу. Шкада, ды і крыўдна знікнуць проста так. Між іншага. Мімаходам. І калі ён азіраецца назад, у ім з'яўляецца жаданне не проста згадаць пра былое, але і зразумець таямніцу жыцця. Самому сабе адказаць на пытанне: навошта гэта з ім было? Ён глядзіць на ўсё развітальным і самотным позіркам… Амаль адтуль… Няма чаго ўжо падманваць і падманвацца. Яму цяпер зразумела, што без думкі пра смерць у самім чалавеку нічога нельга разгледзець. Яе тайна ахутвае ўсё.

Вайна — занадта інтымнае хваляванне. І такое ж бясконцае, як чалавечае жыццё…

Аднойчы жанчына (лётчыца) адмовілася са мной сустрэцца. Патлумачыла па тэлефоне: «Не магу… Не хачу да гэтага вяртацца. Я была тры гады на вайне… І тры гады я не пачувалася жанчынай. Мой арганізм змярцвеў. Менструацыі не было, амаль ніякіх жаночых жаданняў. А я ж была прыгожая… Калі мой будучы муж зрабіў мне прапанову… Гэта ўжо ў Берліне, ля Рэйхстага… Ён сказаў: "Вайна скончылася. Мы засталіся жывыя. Выходзь за мяне замуж". Я хацела заплакаць. Закрычаць. Штурхануць яго! Як гэта замуж? Цяпер? Сярод усяго гэтага — замуж? Сярод чорнай сажы і чорнай цэглы… Ты паглядзі на мяне… Паглядзі — якая я. Ты спачатку зрабі з мяне жанчыну: дары кветкі, сустракайся са мной, кажы прыгожыя словы. Я так гэтага хачу. Так чакаю! Я ледзь яго не збіла… Хацела выцяць… А ў яго была абпаленая, чырвоная адна шчака, і я бачу: ён усё зразумеў, у яго цякуць слёзы па гэтай шчацэ. Па яшчэ не загоеных шнарах… І сама не даю веры таму, што кажу: "Добра, пайду за цябе".

Прабачце мне… Не магу…».

Я яе зразумела. Але гэта таксама старонка ці паўстаронкі будучай кнігі.

Тэксты, тэксты. Усюды — тэксты. У гарадскіх кватэрах і вясковых хатах, на вуліцы і ў цягніках… Я слухаю… Усё болей ператвараюся ў адно вялізнае вуха, увесь час звернутае да іншага чалавека. «Чытаю» голас.

* * *

Чалавек большы за вайну…

Запамінаецца менавіта тое, што ён большы. Ім кіруе нешта такое, што мацнейшае за гісторыю. Мне трэба зважаць шырэй — пісаць праўду пра жыццё і смерць увогуле, а не толькі праўду пра вайну. Задаць пытанне Дастаеўскага: колькі ў чалавеку чалавека і як гэтага чалавека ў сабе абараніць? Відавочна, што зло вабіць. Яно больш прывабнае за дабро. Больш спакуслівае. Усё глыбей патанаю ў бязмежным свеце вайны, усё астатняе злёгку паблякла, сталася звычайнейшым, чым звычайна. Неабсяжны і звярыны свет. Разумею цяпер адзіноту чалавека, які вярнуўся адтуль. Як з іншай планеты ці з тагасвецця. Ён мае веды, якіх у іншых няма, і здабыць іх можна адно там, побач са смерцю. Калі ён спрабуе нешта пераказаць словамі, у яго з'яўляецца прадчуванне катастрофы. Чалавек губляе мову. Ён хоча сказаць, а мы зразумець, але нічога ў нас не атрымліваецца.

Яны заўсёды ў іншай прасторы, чым слухач. Іх ахутвае нябачны свет. Як найменей сумоўнічаюць трое: той, хто апавядае цяпер, гэты ж чалавек, якім ён быў тады, у момант падзеі, — і я. Мая мэта — перадусім здабыць праўду таго часу. Тых дзён. Без скажэння пачуццяў. Адразу пасля вайны чалавек расказаў бы адну вайну,

праз дзясяткі гадоў, натуральна, у яго нешта мяняецца, бо ён міжволі дадае ў былое ўжо ўсё сваё наступнае жыццё. Усяго сябе. Тое, як ён жыў гэтыя гады, што чытаў, бачыў, каго сустрэў. Урэшце, шчаслівы ён ці не. Размаўляем з ім сам-насам, ці побач яшчэ нехта ёсць. Сям'я? Сябры — якія? Франтавыя сябры — гэта адно, усе астатнія — іншае. Дакументы — жывыя істоты, яны мяняюцца разам з намі, у іх бясконца можна знаходзіць яшчэ нешта. Штосьці новае і неабходнае нам менавіта цяпер. У гэтую хвіліну. Што мы шукаем? Найперш не подзвігі і геройства, а непрыкметнае і чалавечае, нам самае цікавае і блізкае. Ну, што болей за ўсё мне хацелася б даведацца, напрыклад, з жыцця Старажытнай Грэцыі… З гісторыі Спарты… Я хацела б прачытаць, як і пра што тады людзі размаўлялі дома. Як выпраўляліся на вайну. Якія словы казалі ў апошні дзень і ў апошнюю ноч перад расстаннем са сваімі каханымі. Як чакалі іх з вайны… Не герояў і палкаводцаў, а звычайных юнакоў…

Гісторыя — праз аповед нікім не заўважанага сведкі і ўдзельніка. Так, мяне менавіта гэта цікавіць, гэта я хацела б зрабіць літаратурай. Але апавядальнікі — не толькі сведкі, менш за ўсё сведкі, а акцёры і творцы. Немагчыма наблізіцца да рэальнасці ўшчыльную, лоб у лоб. Паміж рэальнасцю і намі — нашыя пачуцці. Разумею, што маю справу з версіямі, у кожнага свая версія, а ўжо з іх, з іх колькасці, з іх суплётаў ствараецца вобраз часу і людзей, якія ў ім жывуць. Але я не хацела б, каб пра маю кнігу сказалі: яе героі рэальныя — і не больш за тое. Гэта, маўляў, гісторыя. Усяго толькі гісторыя.

Пішу не пра вайну, а пра чалавека на вайне. Пішу не гісторыю вайны, а гісторыю пачуццяў. Я — гісторык душы. З аднаго боку, даследую канкрэтнага чалавека,

які жыве ў канкрэтны час і ўдзельнічае ў канкрэтных падзеях, а з другога, мне карціць разгледзець у ім вечнага чалавека. Трымценне вечнасці. Тое, што ёсць у чалавеку заўжды.

Мне кажуць: ну, успаміны — гэта і не гісторыя, і не літаратура. Гэта проста жыццё, засмечанае і не ачышчанае рукой мастака. Сыравіна маўлення, кожны дзень ёю запоўнены. Усюды валяецца гэты друз. Толькі друз яшчэ не храм! Але для мяне ўсё інакш… Менавіта там, у жывым чалавечым голасе, у прыватным адлюстраванні мінулага схаваная першатворная радасць і аголены невынішчальны трагізм жыцця. Ягоныя хаос і жарсць. Адзінкавае і неспасцігальнае. Там яны яшчэ нікім не апрацаваныя. Сапраўдныя.

Я будую храмы з нашых пачуццяў… З нашых жаданняў, расчараванняў. З нашых мараў. З таго, што было, але можа знікнуць.

* * *

Яшчэ раз пра тое самае… Мяне цікавіць не толькі тая рэальнасць, што нас атачае, але і тая, што ўнутры нас. Мяне вабіць не сама падзея, а падзея пачуцця. Скажам так — душа падзеі. Для мяне пачуцці — рэальнасць.

А гісторыя? Яна — на вуліцы. У натоўпе. Я веру, што ў кожным з нас — трохі гісторыі. У аднаго — паўстаронкі, у другога — дзве-тры. Мы разам ствараем кнігу часу. Кожны галосіць сваю праўду. Жах адценняў. І трэба ўсё гэта расчуць, і распусціцца ва ўсім гэтым, і стацца гэтым усім. І ў той жа час не згубіць сябе. Паяднаць мову вуліцы і літаратуры. Складанасць яшчэ ў тым, што пра мінулае мы кажам сённяшняй мовай. Як перадаць ёю пачуцці тых даўніх дзён?

* * *

Зранку тэлефонны званок: «Мы з вамі не знаёмыя… Але я прыехала з Крыма, тэлефаную з чыгуначнага вакзала. Ці далёка гэта ад вас? Хачу вам распавесці сваю вайну».

А мы рыхтаваліся з маёй дзяўчынкай паехаць у парк. Пакружляць на каруселі. Як патлумачыць шасцігадоваму чалавечку, чым я занятая. Яна неяк у мяне запыталася: «Што такое вайна?». Як адказаць… Я хачу адпусціць яе ў гэты свет з пяшчотным сэрцам і вучу, што нельга ад няма чаго кветку зрываць. Нядобра багоўку раздушыць, адарваць у стракозы крыльцы. А як патлумачыць дзіцяці вайну? Патлумачыць смерць? Адказаць на пытанне: чаму там забіваюць? Забіваюць нават маленькіх, такіх, як яна. Мы, дарослыя, як бы ў змове. Разумеем, пра што гаворка. А вось — дзеці? Пасля вайны мне неяк бацькі гэта растлумачылі, а я сваймў дзіцяці патлумачыць ужо не магу. Трэба адшукаць словы. Вайна нас вабіць усё менеей, нам усё цяжэй знайсці ёй апраўданне. Для нас гэта ўжо проста забойства. Прынамсі, для мяне яно так.

Напісаць бы такую кнігу пра вайну, каб ад вайны ванітавала і сама думка пра яе была б гідкай. Шалёнай. Каб ванітавала нават генералаў…

Мае сябры-мужчыны (у адрозненне ад сяброўак) агаломшаныя такой жаночай логікай. І я зноў чую «мужчынскі» аргумент: «Ты не была на вайне». А можа, гэта і добра: мне невядомае полымя нянавісці, у мяне ясныя вочы. Немужчынскія, неваенныя…

Ёсць у оптыцы паняцце «святласіла» — здольнасць аб'ектыва болей ці меней зафіксаваць успрынятую выяву. Дык вось, жаночая памяць пра вайну самая «святласільная» паводле напятасці пачуццяў, паводле болю. Я б нават сказала, што «жаночая» вайна больш

страшная за «мужчынскую». Мужчыны хаваюцца за гісторыю, за факты, вайна зачароўвае іх як дзея і супрацьстаянне ідэй, розных мэтаў, а жанчыны захопленыя пачуццямі. І яшчэ — мужчынаў з дзяцінства рыхтуюць, што ім, магчыма, трэба будзе страляць. Жанчын такому не вучаць… яны не збіраліся выконваць гэткую работу… І таму яны памятаюць іншае, і інакш памятаюць. Здольныя ўбачыць схаванае ад мужчынаў. Яшчэ раз паўтаруся: жаночая вайна — з пахам, з колерам, з дробязямі побыту: «далі нам рэчмяшкі, мы пашылі з іх сабе спаднічкі»; «у ваенкамаце ў адны дзверы зайшла ў сукенцы, а ў іншыя выйшла ў штанах і гімнасцёрцы, касу адрэзалі, на галаве застаўся адзін чубчык…»; «немцы расстралялі вёску і паехалі… Мы прыйшлі на тое месца: утаптаны жоўты пясок, а зверху — адзін дзіцячы чаравічак…». Не аднойчы мяне папярэджвалі (асабліва мужчыны-пісьменнікі): «Жанчыны табе нагавораць. Напрыдумляюць». Але я пераканалася: такое нельга прыдумаць. У каго такое спісаць? Калі і можна спісаць, дык толькі ў жыцця, у яго аднаго такая фантазія.

Пра што б жанчыны ні казалі, у іх заўсёды прысутнічае думка: вайна — гэта перадусім забойства і цяжкая праца. А затым — і проста звычайнае жыццё: спявалі, кахалі, накручвалі бігудзі…

Толькі папарадзе і заўсёды, як невыносна і страшна паміраць. Аднак яшчэ больш невыносна і страшна — забіваць, бо жанчына дорыць жыццё. Дорыць. Доўга носіць яго ў сабе, выняньчвае. Я зразумела, што жанчынам цяжэй забіваць.

* * *

Мужчыны… Яны без ахвоты пускаюць жанчын у свой свет, на сваю тэрыторыю.

На Мінскім трактарным заводзе шукала жанчыну, яна служыла снайперкай. Была знакамітай снайперкай. Пра яе неаднойчы пісалі ў франтавых газетах. Нумар хатняга тэлефона далі мне ў Маскве яе сяброўкі, але стары нумар. Прозвішча таксама ў мяне было запісанае дзявочае. Пайшла на завод, дзе, як я ведала, яна працуе, у аддзеле кадраў пачула ад мужчынаў (дырэктара завода і начальніка аддзела кадраў): «Мужчынаў хіба не хапае? Навошта вам гэтыя жаночыя гісторыі. Жаночыя фантазіі…». Мужчыны баяліся, што жанчыны пра нейкую не тую вайну распавядуць.

Была ў адной сям'і… Ваявалі муж і жонка. Сустрэліся на фронце і там жа пабраліся шлюбам: «Вяселле сваё адсвяткавалі ў акопе. Перад боем. А белую сукенку я сабе пашыла з нямецкага парашута». Ён — кулямётчык, яна сувязная. Муж адразу выправіў жонку на кухню: «Ты нам што-небудзь згатуй». Ужо і кіпень забулькатаў, і бутэрброды нарыхтаваныя, яна прысела з намі побач, але муж тут жа яе падняў: «А дзе клубніцы? Дзе наш гасцінец з лецішча?». Пасля маёй настойлівай просьбы незадаволена саступіў сваё месца са словамі: «Кажы, як я цябе навучыў. Без слёз і жаночай драбязы: хацелася быць прыгожай, плакала, калі касу адрэзалі». Пазней яна мне шэптам прызналася: «Усю ноч са мной штудыяваў том "Гісторыі Вялікай Айчыннай вайны". Хваляваўся за мяне. І цяпер нервуецца, што не тое ўспомню. Не так, як трэба».

Так было не аднойчы, не ў адным доме.

Сапраўды, яны шмат плачуць. Крычаць. Пасля майго сыходу глытаюць пігулкі ад сэрца. Выклікаюць «хуткую». Але ўсё роўна просяць: «Ты вяртайся. Абавязкова вяртайся. Мы так доўга маўчалі. Сорак гадоў маўчалі…».

Разумею, што плач і крык нельга ўпарадкоўваць, інакш галоўным будзе не плач і не крык, а слова. Замест жыцця застанецца літаратура. Такі гэта матэрыял, тэмпература гэтага матэрыялу. Увесь час — вышэй за максімум. Чалавек найбольш бачны і поўны менавіта на вайне і яшчэ, можа быць, у каханні. Да самых глыбінных нетраў. Перад абліччам смерці ўсе ідэі блякнуць і адкрываецца неспасцігальная вечнасць, да якой ніхто не падрыхтаваны. Мы яшчэ жывём у гісторыі, а не ў космасе.

Некалькі разоў я атрымлівала адасланы на вычытку тэкст з прыпіскай: «Пра драбніцы не варта… Пішы пра нашу вялікую Перамогу…». А «драбніцы» — гэта тое, што для мяне галоўнае — цеплыня і яснасць жыцця: пакінуты чубчык замест касаў, гарачыя катлы з кашай і супам, якія няма каму есці — са ста чалавек вярнуліся пасля бою сем; або тое, як не маглі хадзіць пасля вайны на кірмаш і глядзець на мясныя лаўкі… Нават на чырвоны паркаль… «Ах, мая ты харошая, ужо сорак гадоў прамінула, а ў маім доме ты не знойдзеш нічога чырвонага. Я ненавіджу пасля вайны чырвоны колер!»

* * *

Услухоўваюся ў боль… Боль як сведчанне прамінулага жыцця. Іншых сведчанняў для мяне няма, бо я не маю да іх даверу. Словы не аднойчы ўводзілі нас у зман.

Думаю пра пакуты як самую ёмістую форму інфармацыі, якая наўпрост злучана з таямніцай. З таемствам жыцця. Уся руская літаратура пра гэта. Пра пакуты яна пісала болей, чым пра любоў. І мне пра гэта апавядаюць болей…

* * *

Хто яны — рускія ці савецкія? Не, яны былі савецкія — і рускія, і беларусы, і ўкраінцы, і таджыкі…

Усё-такі быў ён, савецкі чалавек. Такіх людзей, я думаю, болей ніколі не будзе, яны самі гэта ўжо разумеюць. Нават мы, іхнія дзеці, іншыя. Хацелі быць, як усе. Падобнымі не на сваіх бацькоў, а на свет. А што казаць пра ўнукаў…

Але я люблю іх. Захапляюся імі. У іх былі Сталін і ГУЛаг, але была і Перамога. І яны гэта ведаюць.

Атрымала нядаўна ліст:

«Мая дачка мяне вельмі любіць, я для яе — гераіня, калі яна прачытае вашу кнігу, дык будзе моцна расчараваная. Бруд, вошы, паўсюдная кроў — усё гэта праўда. Я не адмаўляю. Але хіба ўспаміны пра гэта здольныя нарадзіць гонар і годнасць? Падрыхтаваць да подзвігу…».

Не аднойчы запэўнівалася:

…наша памяць — далёка не дасканалы інструмент. Яна не толькі адвольная і капрызлівая, яна яшчэ на ланцугу часу, як сабака…

…мы глядзім на мінулае з сучаснасці, мы не можам глядзець з ніадкуль.

…а яшчэ яны любяць тое, што з імі было, бо гэта не толькі вайна, але і маладосць. Першае каханне.

* * *

Слухаю, як яны прамаўляюць… Слухаю, як яны маўчаць… І словы, і маўчанне — для мяне тэкст…

— Гэта не для друку, для цябе… Старэйшыя… Яны сядзелі ў цягніку задумлівыя… Самотныя. Я не забудуся,

як адзін маёр пачаў размаўляць са мной ноччу, калі ўсе спалі, пра Сталіна. Ён добра выпіў і зрабіўся смелым, сказаў, што яго бацька ўжо дзесяць гадоў у лагеры, без права на ліставанне. Жывы ці не — невядома. Гэты маёр сказаў страшныя словы: «Я хачу абараняць Радзіму, але я не хачу абараняць гэтага здрадніка рэвалюцыі — Сталіна». Я ніколі не чула такіх словаў… Я спалохалася. На маё шчасце, зранку яго ўжо не было. Пэўна, выйшаў…

— Скажу табе па сакрэце… Я сябравала з Аксанай, яна была з Украіны. Гэта ад яе я ўпершыню пачула пра страшны голад ва Украіне. Галадамор. Ужо жабку ці мыш было не знайсці — усё з'елі. У яе вёсцы памерла палова людзей. Памерлі ўсе яе малодшыя браты і тата з мамай, а яе ўратавала толькі тое, што ноччу яна крала на калгаснай стайні конскі гной і ела. Ніхто не мог яго есці, а яна ела: «Цёплы не лезе ў рот, а халодны можна. Лепш замёрзлы, ён сенам пахне». Я кажу: «Аксана, таварыш Сталін змагаецца. Ён знішчае шкоднікаў, толькі іх шмат». — «Не, — адказвае яна, — ты дурніца. Мой тата быў настаўнікам гісторыі, ён мне казаў: «Калі-небудзь таварыш Сталін адкажа за свае злачынствы…».

Ноччу я не спала і думала: а раптам Аксана — вораг? Шпіёнка? Што рабіць? Праз два дні ў баі яна загінула. У яе не засталося нікога з родных, не было каму даслаць пахаванку…

Кранаюся гэтай тэмы асцярожна і рэдка. Нашыя людзі дагэтуль паралізаваныя не толькі сталінскім гіпнозам і страхам, але і ранейшай сваёй верай. Не могуць ніяк разлюбіць тое, што любілі. Мужнасць на вайне і мужнасць мыслення — гэта дзве розныя мужнасці. А я думала, што гэта тое самае.

* * *

Рукапіс даўно ляжыць на стале…

Ужо два гады я атрымліваю адмовы з выдавецтваў. Тое самае і з часопісамі. Прысуд заўсёды аднолькавы: занадта страшная вайна. Зашмат жахаў. Натуралізму. Не хапае вызначальнай ролі камуністычнай партыі. Карацей, не тая вайна… Якая ж яна — тая? З генераламі і мудрым генералісімусам? Без крыві і вошай. З героямі і подзвігамі. А я памятаю з дзяцінства: ідзём з бабуляй паўз вялікае поле, яна распавядае: «Пасля вайны на гэтым полі доўга нічога не радзіла. Немцы адступалі… І быў тут бой, два дні біліся… Забітыя ляжалі адзін каля аднаго, як снапы. Як шпалы на чыгуначнай станцыі. Немцы і нашыя. Пасля дажджу ва ўсіх былі заплаканыя твары. Мы іх месяц усёй вёскай хавалі…».

Як мне забыць пра гэтае поле?

Я не проста занатоўваю. Я высочваю, збіраю чалавечы дух там, дзе пакуты ператвараюць маленькага чалавека ў вялікага. Дзе чалавек робіцца большым. І тады ён для мяне — ужо не нямко і не прывід пралетарыяту гісторыі. Праяўляецца яго душа. Дык у чым жа мой канфлікт з уладай? Я зразумела — вялікай ідэі патрэбны маленькі чалавек, ёй не патрэбны вялікі. Ён сумнеўны і нязручны для яе. Працаёмкі ў кшталтаванні. А я яго шукаю. Шукаю маленькага вялікага чалавека. Прыніжаны, растаптаны, абражаны — прайшоўшы праз сталінскія лагеры і здраду, ён усё-такі перамог. Стварыў цуд.

Але гісторыю вайны падмянілі гісторыяй перамогі.

Ён сам пра гэта раскажа…

## Праз сямнаццаць гадоў (2002–2004 гг.)

Гартаю свой даўні дзённік…

Спрабую згадаць чалавека, якім я была, калі пісала гэтую кнігу. Таго чалавека ўжо няма, і нават няма краіны, у якой мы тады жылі. А гэта яе абаранялі і за яе гінулі ў сорак першым — сорак пятым. За акном цяпер усё іншае: новае тысячагоддзе, новыя войны, новыя ідэі, новая зброя і зусім нечаканы рускі (дакладней — руска-савецкі) чалавек, які перайначыўся дазвання.

Пачалася гарбачоўская перабудова… Маю кнігу адразу надрукавалі, прычым фантастычным накладам — два мільёны асобнікаў. Гэта быў час, калі здаралася мноства неймаверных падзей, мы зноў рынулі некуды на злом галавы. Зноў — у будучыню. Мы яшчэ не ведалі (ці забыліся), што рэвалюцыя — заўсёды ілюзія, асабліва ў нашай гісторыі. Але ўсведамленне гэтага з'явіцца потым, а тады ўсіх хмяліла паветра свабоды. Я штодня пачала атрымліваць дзясяткі лістоў, мае папкі разбухалі на вачах. Людзям зажадалася гаварыць… Дагаворваць… Яны зрабіліся і больш свабоднымі, і больш шчырымі. У мяне не засталося сумневу, што я вырачаная бясконца дапісваць свае кнігі. Не перапісваць, а дапісваць. Паставіш кропку, а яна ўмомант ператвараецца ў шматкроп'е…

* * *

Я думаю пра тое, што, пэўна, сёння пыталася б пра іншае і чула б іншыя адказы. І напісала б іншую кнігу, не зусім іншую, але ўсё ж такі іншую. Матэрыялы (з якімі я маю справу) — жывыя сведчанні, што не цвярдзеюць, як астылая пасля полымя гліна. Не моўкнуць. Яны іна-

чацца разам з намі. Пра што я найперш пыталася б цяпер? Чаго хацела б дадаць? Мяне б моцна цікавіў... падшукваю слова... біялагічны чалавек, а не толькі чалавек ідэі і часу. Я паспрабавала б зазірнуць глыбей у чалавечую прыроду, у цемрадзь, у падсвядомае. У таемнасць вайны.

Напісала б пра тое, як прыйшла да былой партызанкі... Мажная, але яшчэ прыгожая жанчына — і яна мне распавяла, як іх група (яна старэйшая і двое падлеткаў) пайшлі ў выведку і выпадкова захапілі ў палон чатырох немцаў. Доўга з імі блукалі па лесе. Напароліся на засаду. Зразумела, што з палоннымі ўжо не праскочаць, не ўратуюцца, і яна вырашыла — трэба застрэліць немцаў. Падлеткі забіць не змогуць: ужо некалькі дзён яны разам хаваюцца ў лесе, а калі ты так доўга побач з чалавекам, хай сабе і чужым, усё роўна звыкаешся з ім, ён наблізаны да цябе — ужо ведаеш, як ён есць, як спіць, якія ў яго вочы, рукі. Не, падлеткі не змогуць. Пра гэта няма чаго і думаць. Атрымліваецца, забіваць павінна сама. І яна пачала згадваць, як іх забівала. Мусіла падманваць і тых, і гэтых. З адным немцам быццам адправілася па ваду і стрэліла ззаду. У патыліцу. Другога па дровы пагнала... Мяне проста ўзрушыла, як спакойна яна пра гэта апавядала.

Тыя, хто быў на вайне, кажуць, што цывільны чалавек ператвараецца ў вайсковага за тры дні. Чаму хапае менавіта трох дзён? Ці гэта таксама міф? Бадай што так. Чалавек на вайне куды больш загадкавы і ўтоены ад іншых.

Амаль ва ўсіх лістах чытала: «Я вам не ўсё апавяла тады, таму што час быў іншы. Мы звыкліся шмат што змоўчваць...», «Не ўсё вам даверыла. Яшчэ нядаўна пра гэта нельга было казаць. Ці сорамна...», «Ведаю прысуд

дактароў: у мяне страшны дыягназ… Хачу адкрыць усю праўду…».

А колькі дзён таму атрымала гэты ліст: «Нам, старым, цяжка жыць. Але мы пакутуем не праз ганебна нішчымную пенсію. Найболей крыўдзіць, што нас выгналі з вялікага мінулага ў невыносна маленькую сучаснасць. Ужо ніхто не запрашае выступаць у школы, у музеі, ужо нікому мы не патрэбныя. У газетах, калі чытаеш, фашысты выглядаюць усё болей высакароднымі, а чырвоныя салдаты ўсё больш страшнымі».

Час — гэта таксама радзіма… Але я па-ранейшаму люблю сваіх суразмоўцаў. Не люблю іх час, а іх люблю.

* * *

Усё можа зрабіцца літаратурай…

Найболей мяне зацікавіў у маіх архівах нататнік, дзе я аднаўляла тыя эпізоды, што скасавала цэнзура. А яшчэ — мае размовы з цэнзарам. Тамсама засталіся старонкі, якія я выкрасліла сама. Мая самацэнзура, мой уласны выбар. І маё тлумачэнне — чаму я гэта выкінула. Шмат з першага і другога ўжо адноўлена ў кнізе, але некалькі старонак хачу далучыць асобна — гэта ўжо дакумент. Мой шлях.

## З таго, што скасавала цэнзура

«Я ноччу вось-вось прачнуся… Як быццам нехта ну… плача побач… Я — на вайне…

Мы адступаем… Пасля Смаленска нейкая жанчына выносіць мне сваю сукенку, я адразу пераапранаюся. Іду адна… сярод мужыкоў. Толькі што была ў нагавіцах,

а цяпер іду ў летняй сукенцы. У мяне раптам пачаліся гэтыя справы… Жаночыя. Раней пачаліся, пэўна, ад хвалявання. Ад пакутаў, ад крыўды. Дзе тут што знойдзеш? Сорамна! Як мне было сорамна! Пад кустамі, у канавах, у лесе на пнях спалі. Столькі нас было, што месца ў лесе ўсім не хапала. Ішлі мы разгубленыя, падманутыя і нікому ўжо не верылі… Дзе нашыя самалёты, дзе нашыя танкі? Тое, што лётае, поўзае, грукоча — усё нямецкае.

Такая я трапіла ў палон. У апошні дзень перад палонам яшчэ перабіла абедзве нагі… Ляжала і пад сябе мачылася… Не ведаю, якімі сіламі адпаўзла ноччу ў лес. Выпадкова падабралі партызаны…

Мне шкада тых, хто гэтую кнігу прачытае, і хто яе не прачытае…»

«У мяне было начное дзяжурства… Пайшла ў палату для цяжка параненых. Ляжыць капітан… Дактары папярэдзілі перад дзяжурствам, што ноччу ён памрэ. Не дажыве да ранку… Пытаюся яго: "Ну як? Чым табе дапамагчы?" Ніколі не забуду… Ён раптам усміхнуўся, такая харошая ўсмешка на спакутаваным твары: "Расшпілі халат… Пакажы мне свае грудзі… Я даўно не бачыў жонкі…". Я разгубілася, я ж яшчэ нават не цалаваная была. Нешта я там яму адказала і збегла. Вярнулася праз гадзіну.

Ён ляжаў мёртвы. І тая ўсмешка на ягоным твары…»

«Гэта было ля Керчы… Ноччу пад абстрэлам мы ішлі на баржы. Загарэлася насавая частка… Агонь папоўз па палубе. Грымнулі баявыя запасы… Магутны выбух! Выбух такой моцы, што баржа нахілілася на правы бок і пачала тануць. А бераг ужо недалёка, мы разумеем, што ён недзе побач, і салдаты паскакалі ў ваду. З берага загрукаталі кулямёты. Крыкі, стогны, мат… Я добра плавала,

я хацела хоць бы аднаго ўратаваць. Хоць бы аднаго параненага… Гэта ж вада, а не зямля — паранены чалавек загіне адразу. Каменем пойдзе на дно… Чую — нехта побач то вынырне наверх, то зноў пад ваду схаваецца. Наверх — пад ваду. Я выгадала момант, схапіла яго… Нешта халоднае, слізкае… Падумала, што гэта моцна паранены, без адзення, бо яго сарвала выбухам. А я і сама голая… У бялізне засталася… Цемра. Хоць пальцам у вока. Вакол: "Э-эх! Ай-я-я". І мат... Даплыла з ім неяк да берага… У небе якраз у гэты момант загарэлася ракета, і я ўбачыла, што прывалакла на сабе вялізную параненую рыбіну, ростам з чалавека. Бялуга… Яна памірае… Я звалілася каля яе і абмацюкала ўвесь свет. А потым заплакала ад крыўды… І ад таго, што ўсе пакутуюць…»

«Выходзілі з аблогі… Куды ні ткнемся — усюды немцы. Вырашылі: на золку будзем прарывацца з боем. Усё роўна загінем, дык лепей памерці з гонарам. Пад кулямі.

У нас было тры дзяўчыны. Яны прыйшлі ноччу да кожнага, хто мог. Не ўсе, канечне, былі здольныя. Нервы, разумееце. Такая справа… Кожны рыхтаваўся да смерці…

Выратаваліся адзінкі… Мала хто… Ну, чалавек сем, а было пяцьдзясят, калі не болей. Пасеклі немцы кулямётамі… Згадваю тых дзяўчат з удзячнасцю. Ніводнай зранку не знайшоў сярод жывых… Ніколі потым не сустрэў…»

### Размовы з цэнзарам

— Хто пойдзе пасля такіх кніг на вайну? Вы ганіце жанчыну прымітыўным натуралізмам. Жанчыну-гераіню.

Пазбаўляеце яе арэолу. Ператвараеце ў звычайную жанчыну. У самку. А яны ў нас — святыя.

—Наш гераізм стэрыльны, ён не жадае лічыцца ні з фізіялогіяй, ні з біялогіяй. Яму не верыш. А выпрабоўваўся не толькі дух, але і цела. Матэрыяльная абалонка.

—Скуль у вас гэтыя думкі? Чужыя думкі. Не савецкія. Вы здзекуецеся з тых, хто ў брацкіх магілах. Рэмарка начыталіся… У нас рэмаркізм не пройдзе. Савецкая жанчына — не жывёліна…

* * *

«Нехта на нас паказаў… Немцы дазналіся, дзе партызанская стаянка. Ачапілі лес і падыходы да яго з усіх бакоў. Мы хаваліся ў дзікай гушчэчы, нас ратавалі балоты, куды карнікі не заходзілі. Багна. І тэхніку, і людзей яна праглынала ўмомант. Па некалькі дзён, тыднямі мы сталі па горла ў вадзе. З намі была радыстка, яна нядаўна нарадзіла. Дзіця галоднае… Просіць цыцку… А маці сама галодная, малака няма, і немаўля плача. Карнікі недалёка… З сабакамі… Калі сабакі пачуюць, дык усе загінем. Уся група — чалавек трыццаць…

Вам зразумела?

Камандзір прымае рашэнне…

Ніхто не адважваецца перадаць маці загад, але яна сама здагадваецца. Апускае скрутак у ваду і доўга там трымае… Болей дзіця не плача… Ні гуку… А мы не можам падняць вачэй. Ні на маці, ні адно на аднаго…»

«Мы бралі палонных, прыводзілі ў атрад… Іх не расстрэльвалі, занадта лёгкая смерць для іх, мы заколвалі іх, як свіней, шомпаламі, рэзалі на кавалкі. Я хадзіла

на гэта глядзець… Чакала! Доўга чакала таго моманту, калі ад болю ў іх пачнуць покацца вочы… Зрэнкі…

Што вы пра гэта ведаеце?! Яны маю маму з сястрычкамі спалілі на вогнішчы пасярод вёскі…»

«Я не запомніла ў вайну ні катоў, ні сабак, памятаю шчуроў… З жоўта-сінімі вачыма… Іх было хоць гаць гаці. Калі я параненая акрыяла, са шпіталя мяне вярнулі ў маю вайсковую частку. Яна стаяла ў акопах пад Сталінградам. Камандзір загадаў: "Пасяліце яе ў дзявочую зямлянку". Я зайшла туды і найперш здзівілася, што там няма ніякіх рэчаў. Пустыя пасцелі з хваёвага лапніка, і ўсё.

Мяне не папярэдзілі… Я пакінула ў зямлянцы свой рэчмяшок і выйшла, а калі вярнулася праз паўгадзіны, рэчмяшка не знайшла. І аніякага знаку рэчаў, ні грэбня, ні алоўка. Усё ўмомант згрызлі шчуры…

А зранку мне паказалі абгрызеныя рукі ў цяжка параненых…

Ні ў якім самым страшным кіно я не бачыла, як шчуры сыходзяць з горада перад артабстрэлам. Гэта было ўжо не ў Сталінградзе… Пад Вязьмай… Зранку па горадзе рухаліся зграі шчуроў, яны кіраваліся ў палі. Бо чулі смерць. Іх былі тысячы… Чорныя, шэрыя… Людзі ў жаху глядзелі на гэтае пачварнае відовішча і туліліся да сценаў дамоў. І як толькі шчуры зніклі з нашых вачэй, пачаўся абстрэл. Затым наляцелі самалёты. Замест дамоў і склепаў застаўся каменны друз…»

«Пад Сталінградам было столькі забітых, што коні іх ужо не палохаліся. Звычайна палохаюцца. Конь ніколі не ступіць на мёртвага чалавека. Сваіх забітых мы сабралі, а немцы валяліся ўсюды. Замёрзлыя… Ледзяныя… Я — кіроўца, вазіла скрыні са снарадамі для гармат. І чула,

як пад коламі трэскаліся іх чарапы… Косткі… І я была шчаслівая…»

## Размовы з цэнзарам

— Так, Перамога была цяжкай, але вы павінны шукаць гераічныя прыклады. Іх сотні. А вы зважаеце адно на бруд вайны. На споднюю. У вас наша Перамога жахлівая… Чаго вам не хапае?

— Праўды.

— А вы пэўныя, што праўда — гэта тое, што ў жыцці. Тое, што на вуліцы. Пад нагамі. Для вас яна такая прыземленая. Зямная. Не, праўда — гэта тое, пра што мы марым. Якімі хочам быць!

* * *

«Наступаем… Першыя нямецкія селішчы… Мы — маладыя. Дужыя. Чатыры гады без жанчын. У склепах — віно. Харч. Лавілі нямецкіх дзяўчат і… Дзесяць чалавек гвалцілі адну… Жанчын бракавала, бальшыня паўцякала ад Савецкага войска, то хапалі зусім юных. Дзяўчатак… Дванаццаці-трынаццаці гадоў… Калі нейкая плакала, яе білі, што-кольвек запіхвалі ў рот. Ёй балюча, а нам смешна. Цяпер не разумею, як я мог… Хлопчык з інтэлігентнай сям'і… Але гэта быў я…

Адзінае, чаго мы баяліся, каб нашыя дзяўчаты пра гэта не даведаліся. Нашыя медсёстры. Перад імі было сорамна…»

«Трапілі ў аблаву… Блукалі па лясах, па балотах. Жавалі лісце, грызлі кару дрэваў. Нейкія карэнні. Нас было пяцёра, адзін зусім хлопчык, толькі забралі ў войска.

Ноччу сусед шэпча: “Хлопец паўжывы, усё роўна памрэ. Разумееш...” — “Ты пра што?” — “Мне адзін зэк тлумачыў... Яны, калі з лагера ўцякалі, спецыяльна бралі з сабой маладога. Чалавечае мяса можна есці... Так ратаваліся...”.

Пусціць яму юшку сіл не хапіла. А назаўтра мы сустрэлі партызан...»

«Партызаны днём прыехалі на конях у вёску. Выцягнулі з хаты старасту і ягонага сына. Секлі па галовах жалезнымі прутамі, пакуль тыя не паваліліся. А на зямлі дабілі. Я сядзела ля акна. Усё бачыла... Сярод партызан быў мой старэйшы брат. Калі ён зайшоў у нашу хату і хацеў мяне абняць: “Сястрыца!” — я заенчыла: “Не падыходзь! Не падыходзь! Ты — забойца!” А потым знямела. Месяц не размаўляла.

Брат загінуў... А што было б, каб застаўся жывы. І вярнуўся дамоў...»

«Зранку карнікі падпалілі нашу вёску... Выратаваліся адно тыя, хто адразу пабег у лес. Уцякалі без нічога, з пустымі рукамі, нават хлеба з сабой не схапілі. Ні яек. Ні сала. Ноччу цётка Наста, наша суседка, біла сваю дзяўчынку, бо тая ўсю ноч плакала. З цёткай Настай было пяцёра яе дзяцей. Юленька, мая сяброўка, самая слабенькая. Яна заўсёды хварэла... І чатыры хлопчыкі, усе маленькія, і ўсе таксама прасілі есці. І цётка Наста звар’яцела: “У-у-у... У-у-у”. А ноччу я пачула... Юленька прасіла: “Матулечка, ты мяне не тапі. Я не буду... Я болей есцейкі прасіць у цябе не буду. Не буду...”.

Назаўтра Юленьку ўжо ніхто не бачыў...

Цётка Наста... Мы вярнуліся ў вёску на папялішча... Усё згарэла. Неўзабаве цётка Наста засілілася на чорнай

яблыні ў сваім садзе. Вісела нізка-нізка. Дзеці стаялі каля яе і прасілі есці…»

## Размовы з цэнзарам

—Гэта — хлусня! Гэта паклёп на савецкага салдата, які вызваліў палову Еўропы. На нашых партызанаў. На наш гераічны народ. Нам не патрэбная ваша маленькая гісторыя, нам патрэбная вялікая гісторыя. Гісторыя Перамогі. Вы не любіце нашых герояў! Вы не любіце нашыя вялікія ідэі. Ідэі Маркса і Леніна.

—Так, я не люблю вялікія ідэі. Я люблю маленькага чалавека…

## З таго, што выкінула я сама

«Сорак першы год… Мы ў акружэнні. З намі палітрук Лунін… Ён прачытаў загад, што савецкія салдаты ворагу не здаюцца. У нас, як сказаў таварыш Сталін, палонных няма, а ёсць здраднікі. Хлопцы дасталі пісталеты… Палітрук загадаў: "Не трэба. Жывіце, хлопцы, вы — маладыя". А сам застрэліўся…

А гэта ўжо сорак трэці… Савецкае войска наступае. Рухаліся па Беларусі. Згадваю маленькага хлопчыка. Ён выбег да нас аднекуль з-пад зямлі, са склепа, і закрычаў: "Забіце маю мамку… Забіце! Яна немца любіла…". У яго былі круглыя ад жаху вочы. За ім бегла чорная старэча. Уся ў чорным. Бегла і хрысцілася: "Не слухайце. Дзіця збажаволіла…"»

«Выклікалі мяне ў школу… Са мной размаўляла настаўніца, што вярнулася з эвакуацыі:

— Я хачу перавесці вашага сына ў іншы клас. У маім класе — самыя лепшыя вучні.

— Але ў майго сына толькі "пяцёркі".

— Гэта не істотна. Хлопчык жыў пад немцамі.

— Так, нам было цяжка.

— Я не пра гэта. Усе, хто быў у акупацыі... Яны ненадзейныя...

— Як гэта? Я не разумею...

— Ён пра немцаў дзецям гаворыць. І ён заікаецца.

— Гэта ад страху. Яго збіў нямецкі афіцэр, што ў нас кватараваў. Быў незадаволены, як сын наваксаваў яму боты.

— Вось бачыце... Самі сказалі... Вы жылі побач з ворагам...

— А хто гэтага ворага падпусціў да самай Масквы? Хто нас тут пакінуў з нашымі дзецьмі?

Са мной — гістэрыка...

Два дні баялася, чакала, што настаўніца данясе на мяне. Але яна пакінула сына ў сваім класе...»

«Днём мы баяліся немцаў і паліцаяў, а ноччу партызанаў. У мяне адзіную кароўку партызаны забралі, застаўся толькі кот. Партызаны галодныя, злосныя. Пацягнулі маю кароўку, а я — за імі. Кіламетраў дзесяць не адступала. Маліла — вярніце. Траіх дзетак галодных на печы пакінула. "Адчапіся, цётка! — прыстрашылі. — А то застрэлім".

Паспрабуй знайдзі ў вайну добрага чалавека...

Свой на свайго кідаўся. Дзеці кулакоў вярнуліся з высылкі. Бацькі іх загінулі, і яны паслугавалі нямецкай уладзе. Помсцілі. Адзін застрэліў у хаце старога настаўніка. Той калісьці ягонага бацьку раскулачваў. Быў зацяты камуніст.

Немцы спачатку распусцілі калгасы, далі людзям зямлю. Людзі ўсцешыліся пасля Сталіна. Мы плацілі падаткі… У свой час плацілі… А потым яны пачалі нас паліць. Нас і нашыя хаты. Скаціну адбіралі, а людзей палілі.

Вох, дачушка, я словаў баюся. Словы страшныя… Я дабром ратавалася, нікому не жадала злога. Усіх шкадавала…»

«Я да Берліна з войскам дайшла…

Вярнулася ў сваю вёску з двума ордэнамі Славы і медалямі. Пажыла тры дні, а на чацвёрты на золку мама падымае мяне з ложка, пакуль усе спяць: “Дачушка, я табе сабрала торбу. Сыходзь… Сыходзь… У цябе яшчэ дзве малодшыя сястры гадуюцца. Хто іх замуж возьме? Усе ведаюць, што ты чатыры гады была на фронце, з мужчынамі…”.

Не чапайце маю душу. Напішыце, як іншыя, пра мае ўзнагароды…»

«На вайне, як на вайне. Гэта вам не тэатр…

Пашыхтавалі на паляне атрад, мы сталі колам. А пасярэдзіне — Міхась К. і Мікола М. — нашыя хлопцы. Міхась быў адважны разведчык, на гармоніку граў. Ніхто лепей за Міколу не спяваў…

Прысуд чыталі доўга: у такой-та вёсцы запатрабавалі дзве бутэлькі самагону, а ноччу… дзвюх дочак гаспадароў згвалцілі… А ў іншай вёсцы… забралі ў людзей паліто і швейную машынку, якую тут жа прапілі, у суседзяў…

Прысуджаюцца да расстрэлу… Прысуд канчатковы і не можа быць абскарджаны.

Але хто будзе расстрэльваць? Цішыня… Хто? Атрад маўчыць… Тады камандзір сам выканаў прысуд…»

«Я была кулямётчыцай. Столькіх забіла…

Пасля вайны доўга баялася нараджаць. Нарадзіла, калі супакоілася. Праз сем гадоў…

Але я і дагэтуль нічога нікому не прабачыла. І не прабачу… Я цешылася, калі сустракала палонных немцаў. Я цешылася, што яны былі вартыя жалю: на нагах анучы замест ботаў, на галаве анучы… Іх гоняць праз вёску, яны канькаюць: “Маці, дай хлэба… Хлэба…”. Мяне дзівіла, што вяскоўцы выходзілі з хатаў і давалі ім — хто кавалак хлеба, хто бульбіну… Хлопчыкі беглі за калонай і кідалі камяні… А жанчыны плакалі…

Мне здаецца, што я пражыла два жыцці: адно — мужчынскае, другое — жаночае…»

«Пасля вайны… Чалавечае жыццё нічога не каштавала. Вось вам прыклад… Вяртаюся з працы на аўтобусе, раптам пачуліся крыкі: “Трымайце злодзея! Трымайце злодзея! Мая сумачка…”. Аўтобус спыніўся. Адразу — таўкатня. Малады афіцэр выцягвае на вуліцу падлетка, кладзе яго руку сабе на калена і — бах! — ломіць яе напалам. Заскоквае назад у аўтобус… І мы едзем далей… Ніхто не заступіўся за хлопчыка, не паклікаў міліцыянера. Не парупіўся пра доктара. А ў афіцэра ўсе грудзі ў баявых узнагародах… Я стала выходзіць на сваім прыпынку, ён саскочыў і падаў мне руку: “Калі ласка, дзяўчына…”. Такі галантны…

Гэта я цяпер так згадваю… А тады мы ўсе яшчэ былі вайсковымі людзьмі, жылі па законах ваеннага часу… Хіба яны чалавечыя?»

«Вярнулася Чырвоная армія…

Нам дазволілі раскопваць магілы, шукаць, дзе нашых сваякоў пастралялі. Паводле старых звычаяў,

побач са смерцю трэба быць у белым — у белай хустцы, у белай кашулі. Да апошняй сваёй хвіліны я гэта буду помніць! Людзі ішлі з белымі вышытымі ручнікамі… Апранутыя ва ўсё белае… Дзе яны ўсё гэта ўзялі?

Капалі… Хто што знайшоў — пазнаў, тое і забраў. Хто руку на тачцы вязе, хто на падводзе галаву… Чалавек доўга цэлым у зямлі не ляжыць, яны ўсе там змяшаліся адзін з адным. З глінай, з пяском.

Сястру не апазнала, толькі падалося мне, што адзін кавалачак сукенкі — гэта яе, нешта знаёмае… Дзед таксама сказаў — забяром, будзе што хаваць. Той кавалачак сукенкі мы ў невялічкую труну і паклалі…

На бацьку даслалі паперку "знік без вестак". Іншыя нешта атрымлівалі за тых, хто загінуў, а нас з мамай у сельсавеце напалохалі: "Вам ніякай дапамогі не прадугледжана. А можа, ён жыве ў раскошы з нямецкай фраў. Вораг народа".

Я пачала шукаць бацьку за Хрушчовым. Праз сорак гадоў. Адказалі мне толькі ў гарбачоўскія часы: "У спісах адсутнічае…". Але знайшоўся ягоны саслужывец, і я даведалася, што бацька загінуў як герой. Каля Магілёва скочыў з гранатай пад танк…

Шкада, што мая мама не дачакалася гэтай весткі. Яна памерла як жонка ворага народа. Здрадніка. І такіх, як яна, было шмат. Не дачакаліся праўды. Я пайшла да мамы на магілку з лістом. Прачытала…»

«Многія з нас верылі…

Мы думалі, што пасля вайны ўсё зменіцца… Сталін нарэшце дасць веры свайму народу. Але вайна яшчэ не скончылася, а эшалоны ўжо пацягнуліся ў Магадан. Эшалоны з пераможцамі… Арыштоўвалі тых, хто быў у палоне, хто застаўся жывым у нямецкіх лагерах, каго

вывезлі немцы на працу — усіх, хто бачыў Еўропу. Мог апавесці, як там жыве народ. Без камуністаў. Якія там дамы і якія дарогі. Пра тое, што нідзе няма калгасаў…

Пасля Перамогі ўсе змоўклі. Маўчалі і баяліся, як да вайны…»

«Я настаўніца гісторыі… На маёй памяці падручнік гісторыі перапісвалі тры разы. Я вучыла дзяцей па трох розных падручніках…

Спытайце нас, пакуль мы жывыя. Не перапісвайце потым без нас. Спытайце…

Ведаеце, як цяжка забіць чалавека. Я была ў падполлі. Праз паўгода атрымала загад — уладкавацца афіцыянткай у афіцэрскую сталоўку… Маладая, прыгожая… Мяне ўзялі. Я павінна была насыпаць атруты ў кацёл з супам і адразу збегчы да партызанаў. А ўжо я да іх прызвычаілася, яны ворагі, але кожны дзень ты іх бачыш, яны табе кажуць: “Данке шон… Данке шон…”. Гэта цяжка… Забіць цяжка… Забіць больш страшна, чым памерці…

Я усё жыццё выкладала гісторыю… І ніколі не ведала, як пра гэта апавесці. Якімі словамі…»

У мяне была свая вайна. Я прайшла доўгі шлях разам са сваімі гераінямі. Як і яны, доўга не верыла, што ў нашай Перамогі два аблічча — адно прыўкраснае, а другое — жахлівае, усё ў шнарах, аж невыносна глядзець. «У баі сам-насам, забіваючы чалавека, зазіраюць яму ў вочы. Гэта не бомбы скідаць ці страляць з акопа», — казалі мне.

Слухаць чалавека, як ён забіваў і паміраў, тое самае — глядзіш яму ў вочы…

## «НЕ ХАЧУ ЗГАДВАЦЬ...»

Стары трохпавярховік на ўскрайку Мінска, з тых, што спехам і, як тады здавалася, ненадоўга, будавалі адразу пасля вайны, даўно затуліўся кустамі язміну. З яго і пачаўся пошук, які не спыніцца сем гадоў, дзіўных і пакутлівых сем гадоў, калі я адкрыю для сябе свет вайны, свет з неразгаданым і да сёння сэнсам. Паспытаю боль, нянавісць, спакусу. Пяшчоту і разгубленасць... Паспрабую зразумець, чым розніцца смерць ад забойства і дзе мяжа паміж людскім і нялюдскім. Як чалавек застаецца сам-насам з вар'яцкай думкай, што ён можа забіць іншага чалавека? Нават мусіць забіць. І заўважу, што на вайне, акрамя смерці, ёсць шмат усяго іншага, там ёсць усё, што ёсць у нашым звыклым жыцці. Вайна — гэта таксама жыццё. Сутыкнуся з мноствам чалавечых праўдаў. Таямніцаў. Задумаюся над пытаннямі, пра існаванне якіх раней нават не здагадвалася. Прыкладам, чаму мы не дзівімся злу, з чаго ў нас няма здзіўлення перад злом?

Дарогі і дарогі... Дзясяткі выправаў па ўсёй краіне, сотні запісаных касет, тысячы метраў магнітафонных стужак. Пяцьсот сустрэч, а потым перастала лічыць, твары знікалі з памяці, засталіся толькі галасы. У маёй памяці гучыць хор. Вялізны хор, часам словаў амаль не чуваць, адно плач. Скажу шчыра: не заўсёды верыла, што гэты шлях для мяне, што я змагу яго адолець. Прайду да канца. Былі хвіліны сумневу і страху, калі хацелася спыніцца ці хаця б збочыць, але ўжо не магла. Я зрабілася палонніцай зла, зазірнула ў бездань, спрабуючы нешта істотнае для сябе зразумець. Цяпер, мне здаецца,

я прыдбала пэўныя веды, але пытанняў сталася яшчэ болей, а адказаў — яшчэ меней.

Але тады, на пачатку дарогі, я пра такое не думала…

Скіравала мяне да гэтага дома невялікая зацемка ў гарадской газеце пра тое, што нядаўна на Мінскім заводзе дарожных машын «Ударнік» праводзілі на пенсію старэйшую бухгалтарку Марыю Іванаўну Марозаву. А ў вайну, казалася ў той самай зацемцы, яна была снайперкай, мае адзінаццаць баявых узнагародаў, на яе снайперскім рахунку — семдзесят пяць забітых. Цяжка было злучыць у свядомасці вайсковую прафесію гэтай жанчыны з яе мірнай працай. З будзённым газетным здымкам. З усімі іншымі прыкметамі звычайнасці.

…Маленькая жанчына з дзявочай каронай доўгай касы вакол галавы сядзела ў фатэлі, схаваўшы твар рукамі:

—Не-не, не буду. Зноў вяртацца туды? Не магу… Дагэтуль фільмы пра вайну не гляджу. Я тады была зусім яшчэ дзяўчынкай. Марыла і расла, расла і марыла. І тут — вайна. Мне нават шкада цябе… Я ведаю, пра што кажу. Ты насамрэч хочаш пра гэта пачуць? Як у дачкі пытаюся…

Вядома ж, пры сустрэчы яна здзівілася:

—А чаму да мяне? Трэба да майго мужа, ён любіць згадваць. Як звалі камандзіраў, генералаў, нумары вайсковых частак — усё помніць. А я — не. Я памятаю адно тое, што са мной было. Сваю вайну. Вакол шмат людзей, але ты кожны раз адна, бо чалавек заўсёды самотны перад смерцю. Жахлівая адзінота.

Папрасіла прыбраць магнітафон:

—Мне патрэбныя твае вочы, каб расказваць, а ён будзе замінаць.

Але праз колькі хвілінаў забылася на яго.

*Марыя Іванаўна Марозава (Іванушкіна), ефрэйтар, снайперка:*

«Гэта будзе просты расказ... Расказ звычайнай рускай дзяўчыны, якіх тады было шмат...

Там, дзе была мая родная вёска Дзьякоўская, цяпер Пралетарскі раён Масквы. Вайна пачалася, мне яшчэ не было васямнаццаці гадоў. Косы доўгія-доўгія, да каленяў... Ніхто не верыў, што вайна зацягнецца, усе чакалі — вось-вось скончыцца. Прагонім ворага. Я хадзіла ў калгас, потым скончыла бухгалтарскія курсы, стала працаваць. А вайна доўжыцца... Мае сяброўкі... Мае дзяўчаты кажуць: "Трэба ісці на фронт". Гэта ўжо ў паветры было. Запісаліся на курсы пры ваенкамаце. Можа, хто і за кампанію, не ведаю. Нас там вучылі страляць з баявой вінтоўкі, кідаць гранаты. Спачатку, шчыра кажучы, баялася вінтоўку ў рукі браць, было непрыемна. Уявіць не магла, што пайду некага забіваць, проста хацелася на фронт і ўсё. Нас у гуртку займалася сорак чалавек. З нашай вёскі — чатыры дзяўчыны, ну, усе мы, сяброўкі, з суседняй — пяць, карацей кажучы, з кожнай вёскі быў нехта. І толькі дзяўчаты. Мужчыны ўжо ўсе пайшлі на вайну, хто мог. Часам пасыльны з'яўляўся сярод ночы, даваў дзве гадзіны на зборы, і іх звозілі. Здаралася, забіралі нават з поля. *(Маўчыць.)* Я цяпер не згадаю — ці былі ў нас танцы, калі і былі, дык дзяўчына танчыла з дзяўчынай, хлопцаў не засталося. Вёскі нашыя сцішыліся.

Неўзабаве з'явіўся заклік ЦК камсамола і моладзі ўсім стаць на абарону Радзімы, бо немцы ўжо былі пад Масквой. Як гэта Гітлер захопіць Маскву? Не дазволім! Не толькі я адна... Усе дзяўчаты загарэліся жаданнем ісці на фронт. У мяне ўжо бацька ваяваў. Мы думалі, што будзем адны такія... Адметныя... А прыйшлі

ў ваенкамат — там столькі дзяўчат. Я вохнула! Маё сэрца затахкала, моцна так. Да таго ж адбор быў вельмі строгі.

Па-першае, натуральна, трэба было мець моцнае здароўе. Я баялася, што мяне не возьмуць, бо ў дзяцінстве шмат хварэла, і костачка, як мама казала, была слабая. Таму мяне іншыя дзеці крыўдзілі ў маленстве… А яшчэ, калі ў хаце, акрамя той дзяўчыны, што сабралася на фронт, нікога болей з дзяцей не было, таксама адмаўлялі, бо нельга пакідаць адну маці. Ой, нашы матулі! Ад слёз не прасыхалі… Яны сварыліся на нас, яны малілі… Толькі ў мяне яшчэ былі дзве сястры і два браты, праўда, усе намнога меншыя за мяне, але ўсё роўна лічылася. Тут яшчэ адно — з калгаса ўсе сышлі, на полі няма каму працаваць, і старшыня не хацеў нас адпускаць. Карацей, нам адмовілі. Пайшлі мы ў райкам камсамола, і там — адмова. Тады мы дэлегацыяй з нашага раёна паехалі ў абкам камсамола. Ва ўсіх быў энтузіязм, сэрцы палалі. Нас зноў завярнулі дадому. Аднак супольна вырашылі, калі мы ў Маскве, дык трэба ісці ў ЦК камсамола, на самы верх, да першага сакратара. Змагацца да апошняга… Хто будзе дакладваць, хто з нас самы смелы? Думалі, што тут ужо напэўна адны апынемся, а там у калідор нельга ўплішчыцца, не тое што прабіцца да сакратара. Там з усёй краіны моладзь, шмат такіх, хто пабываў у акупацыі, за смерць блізкіх прагнулі адпомсціць. З усяго Саюза. Менавіта так… Мы нават разгубіліся на нейкі час…

Увечары усё-такі апынуліся ў сакратара. Нас пытаюць: “Ну што вы будзеце рабіць на фронце, калі не ўмееце страляць?”. Тут мы хорам адказваем, што ўжо навучыліся… “Дзе? Як? А перавязваць умееце?” А нас у гэтым жа гуртку пры ваенкамаце раённы доктар

вучыў перавязваць. Яны тады змоўклі і больш сур'ёзна на нас паглядзелі. Ну, і яшчэ адзін шанец у нашых руках, што мы не адны, а нас яшчэ сорак чалавек, і ўсе ўмеюць страляць і аказваць першую медыцынскую дапамогу. Сказалі: "Ідзіце і чакайце. Ваша пытанне будзе вырашанае станоўча". Якія мы вярталіся шчаслівыя! Не забыць... Праўда...

І літаральна праз некалькі дзён у нас былі павесткі на руках...

Прыйшлі ў ваенкамат, нас адразу ў адны дзверы завялі, а ў другія вывелі — я такую прыгожую касу заплятала, адтуль ужо без яе выйшла... Без касы... Пастрыглі як салдатаў... І сукенку забралі. Не паспела маме ні сукенку, ні касу перадаць. Яна моцна прасіла, каб нешта ад мяне, хоць што маё ў яе засталося. Тут жа нас апранулі ў гімнасцёркі, пілоткі, далі рэчмяшкі і ў таварны вагон пагрузілі — на салому. Але яна была свежая, яшчэ полем пахла.

Весела грузіліся. Бадзёра. Жартавалі. Памятаю, шмат было смеху.

Куды едзем? Не ведалі. Зрэшты, нам было не так і важна, кім мы будзем. Толькі б на фронт. Усе змагаюцца — і мы. Прыехалі на станцыю Шчолкава, недалёка ад яе была жаночая снайперская школа. Выяўляецца, нас туды. У снайперкі. Усе ўзрадаваліся. Гэта сапраўднае — будзем страляць.

Сталі вучыцца. Вывучалі статуты — гарнізоннай службы, дысцыплінарны, маскіроўку на мясцовасці, хімічную абарону. З заплюшчанымі вачыма навучыліся збіраць і разбіраць снайперскую вінтоўку, вызначаць хуткасць ветру, рух цэлі, адлегласць да цэлі, ячэйкі капаць, паўзці па-пластунску — усё-ўсё гэта мы вывучылі. Толькі б хутчэй на фронт. У агонь...

Так-так… Па сканчэнні курсаў агнявую і страявую падрыхтоўку я здала на выдатна. Самае цяжкае, памятаю, было падымацца па трывозе і збірацца за пяць хвілінаў. Боты мы бралі на адзін-два памеры большыя, каб не губляць часу, умомант абувацца. За некалькі хвілінаў трэба было апрануцца, абуцца і стаць у шэраг. Былі выпадкі, што ў ботах на босую нагу на пляц выбягалі. Адна дзяўчына ледзьве ногі сабе не адмарозіла. Старшына прыкмеціў, зрабіў заўвагу, а потым вучыў нас анучы накручваць. Стаіць над намі і гундосіць: “Як мне, дзяўчаткі, зрабіць з вас салдатаў, а не мішэні для фрыцаў?”. Дзяўчаткі, дзяўчаткі… Усе нас любілі і ўвесь час шкадавалі. А мы крыўдавалі, што нас шкадуюць. Хіба мы не такія ж салдаты, як і ўсе?

Ну, і вось апынуліся на фронце. Пад Воршай… У шэсцьдзесят другой стралковай дывізіі. Камандзір, да сёння памятаецца, палкоўнік Бародкін, як убачыў нас, раззлаваўся: дзяўчатак мне адгрузілі. Маўляў, што гэта за жаночы карагод? Кардэбалет! Тут вайна, а не танцулькі. Жахлівая вайна… Але запрасіў да сябе, пачаставаў абедам. І, потым, чуем, пытаецца ў свайго ад’ютанта: “Ці няма ў нас чаго салодкага да гарбаты?”. Ну, мы, натуральна, пакрыўдзіліся: за каго ён нас лічыць? Мы ваяваць прыехалі. А ён нас частаваў не як салдатаў, а як дзяўчатак. Паводле ўзросту мы яму ў дочкі пасавалі. “Што ж я з вамі рабіць буду, мілыя вы мае? Дзе вас такіх назбіралі?” Вось як ён да нас ставіўся, калі сустрэў. А мы ж уяўлялі, што ўжо ваякі. Так-так… На вайне!

Назаўтра загадалі паказаць, як умеем страляць, маскавацца на мясцовасці. Адстраляліся ўдала, нават лепей за мужчынаў-снайпераў, якіх адклікалі з перадавой на двухдзённыя курсы, і якія вельмі здзівіліся, што мы робім іхнюю працу. Яны, пэўна, упершыню ў жыц-

ці бачылі жанчын-снайперак. Пасля стрэльбаў — маскаванне на мясцовасці... З'явіўся палкоўнік, ходзіць, азірае паляну, потым залез на адну купіну — каб лепей было відаць. І тут "купіна" пад ім не вытрывала: "Ой, таварыш палкоўнік, не магу болей, цяжка". Ну, і смеху было! Ён не мог даць веры, што можна так лоўка замаскавацца. "Цяпер, — кажа, — свае словы наконт дзяўчатак бяру назад". Але ўсё роўна пакутаваў... Доўга не мог з намі звыкнуцца.

Выправіліся мы ўпершыню на "паляванне" (так у снайпераў гэта называецца), маёй напарніцай была Маша Казлова. Замаскаваліся, ляжым: я назіраю за мясцовасцю, Маша — з вінтоўкай. І раптам Маша мне:

— Страляй, страляй! Бачыш, немец...

Адказваю:

— Я назіраю. Ты страляй!

— Пакуль мы тут высвятляць будзем, — кажа яна, — ён сыдзе.

А я сваё:

— Спачатку трэба стралковую карту скласці, арыенціры пазначыць: дзе хлеў, бярозка...

— Ты будзеш як у школе абы-чым займацца? Я прыехала не паперу крэмзаць, а страляць!

Бачу, што Маша ўжо злуецца на мяне.

— Ну дык страляй сама, чаго ты?

Так мы спрачаліся. А ў гэты час нямецкі афіцэр нешта загадваў салдатам. Пад'ехаў воз, і салдаты па ланцужку перадавалі нейкі груз. Афіцэр яшчэ пастаяў, штосьці скамандаваў і сышоў. А мы ўсё дыскутуем. Бачу, ён ужо два разы аб'яўляўся, і калі мы яшчэ прамарудзім, дык застанемся ні з чым. І калі ён выставіўся ў трэці раз, гэта ж адно імгненне — то з'явіцца, то знікне, — я наважылася страляць. Наважылася, але раптам

думка мільганула: гэта ж чалавек, хоць ён вораг, але ж чалавек, і ў мяне затрэсліся рукі, па ўсім целе пабеглі дрыжыкі, заліхаманіла. Ахапіў страх... Да мяне ў снах і цяпер бывае, што вяртаецца гэты стан... Пасля фанерных мішэняў страляць у жывога чалавека было цяжка. Я ж яго бачу ў аптычны прыцэл, добра бачу. Як быццам ён блізка... І ўнутры мяне нешта супрацівіцца... Нешта не дазваляе, не магу адважыцца. Але я змусіла сябе, спусціла курок... Афіцэр ускінуў рукі і паваліўся. Ці быў забіты, ці не — не ведаю. Але пасля гэтага мяне яшчэ мацней затрэсла, нейкі страх ахапіў: я — забіла чалавека?! Да самой гэтай думкі яшчэ трэба было прызвычаіцца... Карацей, жах! Не забыць...

Калі мы вярнуліся і сталі ў сваім узводзе расказваць, што са мной здарылася, дык сабралі сход. У нас камсоргам была Клава Іванова, яна мяне пераконвала: "Іх не шкадаваць трэба, а ненавідзець". У яе фашысты бацьку забілі. Мы, бывала, пачынаем спяваць, а яна просіць: "Дзяўчаты, не трэба, вось пераможам гэтых гадаў, тады і спяваць будзем".

Не адразу... Не адразу ў нас атрымалася. Не жаночая гэта справа — ненавідзець і забіваць. Не наша... Трэба было сябе пераконваць. Угаворваць...»

Праз колькі дзён Марыя Іванаўна патэлефануе мне і запросіць да сваёй франтавой сяброўкі Клаўдзіі Рыгораўны Крохінай. І я яшчэ раз пачую...

*Клаўдзія Рыгораўна Крохіна, старшы сяржант, снайперка:*

«Першы раз страшна... Вельмі страшна...

Мы залеглі, і я назіраю. Раптам заўважаю: адзін немец з акопа прыўзняўся. Я шчоўкнула — і ён упаў. І вось, ведаеце, мяне ўсю затрэсла, я чула, як грукаюць мае

косткі. Стала плакаць. Калі па мішэнях стралялі — нічога, а тут: я — забіла! Я! Забіла нейкага незнаёмага мне чалавека. Я нічога пра яго не ведаю, але я яго забіла.

Потым гэта знікла. І вось як… Як гэта здарылася… Мы ўжо наступалі, рухаліся паўз невялікае мястэчка. Здаецца, ва Украіне. І там каля дарогі ўбачылі барак ці дом, немагчыма было ўжо адрозніць, бо ўсё гарэла, згарэла ўжо, толькі чорныя камяні засталіся. Падмурак… Не ўсе дзяўчаты падышлі, а мяне як пацягнула… У гэтых вуглях мы знайшлі чалавечыя косткі, сярод іх зорачкі абгарэлыя, гэта нашыя параненыя ці палонныя спапяліліся. Пасля, колькі я ні забівала, мне ўжо не было шкада. Як убачыла тыя чорныя зорачкі…

Вярнулася з вайны сівая. Дваццаць адзін год, а я ўся беленькая. Я была цяжка параненая, кантузія, дрэнна чула на адно вуха. Мама мяне сустрэла словамі: “Я верыла, што ты вернешся. Я за цябе малілася дзень і ноч”. Брат на фронце загінуў.

Мама плакала:

— Усё роўна цяпер — нараджай дзяўчатак ці хлопчыкаў. Але ён усё ж такі мужчына, ён абавязаны быў абараняць Радзіму, а ты ж дзяўчынка. Аб адным я Бога прасіла, калі цябе знявечаць, дык хай лепей заб’юць. Увесь час хадзіла на станцыю. Да цягнікоў. Аднойчы ўбачыла там дзяўчыну ў форме з абгарэлым тварам… Здрыганулася — ты! Я за яе таксама потым малілася.

У нас непадалёк ад дому, а родам я з Чалябінскай вобласці, былі рудныя кар’еры. Як толькі пачыналіся выбухі, а гэта адбывалася заўсёды толькі ноччу, я ўскоквала з ложка і адразу хапалася за шынель — і бегчы, мне трэба было хутчэй куды-небудзь бегчы. Мама мяне схопіць, прытуліць да сябе і ўпрошвае: “Прачніся — прачніся. Вайна скончылася. Ты дома”. Я ачуньвала ад

яе словаў: “Я — твая мама. Мама...”. Казала яна ціха. Ціха... Гучныя словы мяне палохалі...»

У пакоі цёпла, але Клаўдзія Рыгораўна захутвае сябе ў грубы баваўняны плед — ёй холадна. Працягвае:

«Хутка зрабіліся салдатамі... Ведаеце, не было асабліва часу думаць. Перажываць свае пачуцці...

Нашыя разведчыкі схапілі ў палон аднаго нямецкага афіцэра, ён быў моцна здзіўлены, што ў яго было выбіта шмат салдатаў і ўсе стрэлы толькі ў галаву. І амаль у адно і тое самае месца. Звычайны, казаў ён, стралок не здольны столькі разоў пацэліць у галаву. Гэта дакладна. “Пакажыце, — папрасіў, — мне гэтага снайпера, які столькі маіх салдатаў загубіў. Я вялікае папаўненне атрымліваў, бо кожны дзень каля дзесяці чалавек выбывала”. Камандзір палка адказвае: “На жаль, не магу паказаць, гэта была дзяўчына-снайперка, але яна загінула”. Гэта была Саша Шляхава. Яна прайграла ў снайперскім двубоі. І прычынай таму быў чырвоны шалік. Саша яго вельмі любіла. А чырвоны шалік на снезе моцна дэмаскаваў. І вось калі нямецкі афіцэр пачуў, што гэта дзяўчына, ён быў неймаверна ўражаны і нават не ведаў, як рэагаваць. Толькі маўчаў. На апошнім допыце перад тым, як яго адаслалі ў Маскву (высветлілася — важная птушка!), сказаў: “Мне ніколі не даводзілася ваяваць з жанчынамі. Вы ўсе прыгожыя... А наша прапаганда сцвярджае, што ў Чырвонай арміі ваююць не жанчыны, а гермафрадыты...”. Так нічога і не зразумеў. Так... Нельга забыць...

Мы хадзілі на заданне парамі, адной зранку да вечара сядзець цяжка, вочы стамляюцца, слязяцца, рук не чуеш, усё цела ад напругі дранцвее. Асабліва цяжка ўвесну. Снег, ён пад табой топіцца, ты ў вадзе цэлы

дзень. Плаваеш, а здараецца, што і прымерзнеш да зямлі. Выходзілі на досвітку, а вярталіся ўжо пад ноч. Дванаццаць, а то і болей гадзінаў ляжалі ў снезе ці залазілі на вершаліну дрэва, на хлеў ці паддашак разбуранага дома і там маскаваліся, каб ніхто не заўважыў, адкуль мы вызіраем цэль. Намагаліся як мага бліжэй знайсці пазіцыю: семсот-восемсот, а то і пяцьсот метраў нас адзяляла ад траншэяў, у якіх былі немцы. Зранку нават іхнія галасы было чуваць. Іхні смех.

Не ведаю, чаму мы не баяліся... Цяпер не разумею...

Наступалі, вельмі хутка наступалі... Зняможыліся, забеспячэнне ад нас адстала, скончыліся боепрыпасы, харч, кухню, і тую разбіла снарадам. Трэція суткі сядзелі на сухарах, языкі ўсе паабдзіралі так, што не маглі імі варушыць. Маю былую напарніцу забілі, я з "новенькай" рушыла на перадавую. І раптам бачым, на "нейтралцы" жарабя. Такое прыгожае, хвост у яго пушысты. Ходзіць сабе спакойна, як быццам нічога няма, ніякай табе вайны. І немцы, чуем, заварушыліся, яго ўбачылі. Нашыя салдаты таксама перамаўляюцца:

—Сыдзе. А супчык быў бы...

—З аўтамата на такой далечыні не дастаць.

Убачылі нас:

—Снайперкі ідуць. Яны яго зараз... Давай, дзяўчаты!

Я і падумаць не паспела, па звычцы прыцэлілася і стрэліла. У жарабяці ногі падагнуліся, зваліўся на бок. Мне падалося, можа, гэта была галюцынацыя, але мне падалося, што ён тоненька-тоненька заржаў.

Гэта потым я спахапілася: навошта так зрабіла? Такі прыгожы, а я яго забіла, а я яго ў суп. За спінай чую, нехта шморгае носам. Азірнулася, а гэта "новенькая".

—Чаго ты?

—Жарабятка шкада, — поўныя вочы слёз.

—Ах-ах, якая тонкая натура. А мы ўсе тры дні галодныя. Шкада таму, што яшчэ нікога ў зямлю не закопвала. Паспрабуй адтаптаць за дзень трыццаць кіламетраў з поўным рыштункам, ды яшчэ галоднай. Спачатку фрыцаў трэба выгнаць, а потым спачуваць будзем. Шкадаваць будзем. Потым… Разумееш, потым…

Гляджу на салдатаў, яны вось толькі што мяне падбадзёрвалі, крычалі. Прасілі. Вось толькі што… Некалькі хвілінаў таму… Ніхто на мяне не глядзіць, быццам мяне не заўважаюць, кожны ў нечым сваім корпаецца. Кураць, капаюць… Штосьці точаць… А мне як хочаш, так і жыві. Сядай і плач. Лямантуй. Быццам я жывадзёрка якая, быццам мне каго хочаш забіць, што плюнуць. А я з дзяцінства ўсё жывое любіла. У нас — я ўжо ў школу хадзіла — карова захварэла, і яе прырэзалі. Я два дні плакала. Не сціхаючы. А тут — бац! — і стрэліла па безабаронным жарабятку. І можна сказаць… За два гады першае жарабя пабачыла.

Сцямнела, нясуць вячэру. Кухары: “Ну і малайцом снайперка! Сёння мяса ў катле ёсць”. Паставілі нам кацялкі і пайшлі. А дзяўчаты мае сядзяць, вячэры не кранаюць. Я зразумела, у чым рэч — заплакала і выскачыла з зямлянкі… Дзяўчаты за мной, сталі мяне ў адзін голас суцяшаць. Хутка расхапалі свае кацялкі і давай сёрбаць…

Вось, такі выпадак… Вось… Не забыць…

Ноччу ў нас, вядома, размовы. Пра што мы гаварылі? Зразумела, пра дом, кожная сваю маму згадвала, пра бацьку і братоў, і дзе яны ваявалі. І пра тое, кім мы будзем пасля вайны. Як выйдзем замуж, і ці будуць нашыя мужы нас кахаць. Камандзір смяяўся:

—Эх, дзеўкі! Усім вы харошыя, але пасля вайны будуць палохацца з вамі жаніцца. Рука трапная, талеркай пусціш у лоб — і капцы.

Я мужа на вайне сустрэла, у адным палку служылі. Быў двойчы паранены, кантужаны. Ён вайну ад пачатку да канца вытрываў, і потым усё жыццё быў вайскоўцам. Яму не трэба тлумачыць, што такое вайна? Скуль я вярнулася? Якая? Калі я сваруся, ён або не заўважыць, або прамаўчыць. А я яму дарую. Таксама навучылася. Дваіх дзяцей выгадавалі, яны інстытуты пасканчалі. Сын і дачка.

А вось вам яшчэ раскажу… Ну, дэмабілізавалі мяне, прыехала я ў Маскву. А ад Масквы да дому яшчэ ехаць і потым некалькі кіламетраў пешкі. Гэта цяпер там метро, а тады былі старыя вішнёвыя сады, глыбокія лагчыны. Адна з іх была надта вялікая, а мне праз яе трэба перабрацца. Тым часам сцямнела, пакуль сюды дайшла. І я забаялася далей ісці. Стаю і не ведаю, што рабіць: ці мне вяртацца і чакаць світанку, ці набрацца адвагі і — рызыкнуць. Цяпер успомніць, дык смешна: фронт за спінай, чаго толькі не нагледзелася: і трупаў, і самага рознага страхоцця, а тут лагчыну прамінуць страшна. Я да гэтай пары памятаю пах трупаў, змяшаны з пахам махоркі… Але так дзяўчынкай і засталася. У вагоне, калі ехалі… Вярталіся ўжо з Нямеччыны дахаты… Мыш у некага з заплечніка выскачыла, дык усе нашыя дзяўчаты паўскоквалі, а тыя, што на верхніх паліцах, зваліліся ўніз і пішчаць. Быў з намі капітан, дык ён дзівіўся: "У кожнай ордэн, а мышэй баіцеся".

На маё шчасце, аб'явіўся грузавік. Я наважылася: прагаласую.

Машына спынілася.

—Мне да Дзьякоўскай, — крычу.

— І мне да Дзьякоўскай, — адкрывае дзверцы малады хлопец.

Я — у кабіну, ён — мой чамадан у кузаў, і паехалі.

Бачыць, што на мне форма, узнагароды. Пытаецца:

— Колькі немцаў забіла?

Я яму адказваю:

— Семдзесят пяць.

Ён трохі з посмехам:

— Хлусіш, можа, і ў вочы ніводнага не бачыла?

І тут я яго прызнала:

— Міколка Чыжоў? Ці ты гэта? Памятаеш, я табе чырвоны гальштук павязвала?

Нейкі час перад вайной я працавала ў сваёй школе піянерважатай.

— Маруська, ты?

— Я...

— Праўда? — затармазіў машыну.

— Да дому давязі, што ты пасярод дарогі тармозіш? — у мяне на вачах слёзы. Бачу, што ў яго таксама. Такая сустрэча!

Пад'ехалі да дому, ён бегма з чамаданам да маёй маці, танчыць па падворку з гэтым чамаданам:

— Хутчэй, я вам дачку прывёз!

Не забыць... Ну-у-у... Ну як такое забыць?

Вярнулася, і ўсё трэба было пачынаць спачатку. У туфлях вучылася хадзіць, на фронце ж тры гады ў ботах. Прызвычаіліся да рамянёў, заўсёды падцягнутыя, здавалася, што цяпер апратка на нас мехам вісіць, няўтульна неяк пачуваешся. З жахам глядзела на спадніцу... На сукенку... Мы ж увесь час на фронце ў штанах, увечары іх памыеш, пад сябе пакладзеш, паспіш, лічы папрасаваныя. Што праўда, не зусім сухія, і на марозе рабіліся закарэлымі. Як у спадніцы навучыцца хадзіць?

Ногі быццам спутаныя. Ідзеш у сукенцы, у туфлях, сустрэнеш афіцэра, міжволі рука да галавы цягнецца, каб чэсць аддаць. Прывыклі: паёк, на ўсім дзяржаўным… Прыходзіш у хлебную краму, бярэш хлеба, колькі табе патрэбна, і забываеш заплаціць. Прадавачка, яна ўжо цябе ведае, разумее, у чым рэч, і саромеецца нагадаць, а ты не заплаціла, узяла і сышла. Потым табе ўжо сорамна, на другі дзень просіш прабачэння, купляеш яшчэ нешта і расплачваешся за ўсё разам. Трэба было нанова вучыцца самаму простаму. Узгадваць звычайнае жыццё. Нармальнае! З кім параіцца? Прыбяжыш да суседкі… Да мамы…

Я вось яшчэ пра што думаю… Паслухайце. Колькі была вайна? Чатыры гады. Доўга… Ні птушак, ні кветак не памятаю. Яны, вядома, былі, але я іх не памятаю. Насамрэч… Дзіўна, праўда? Хіба могуць быць каляровымі фільмы пра вайну? Там усё чорнае. Толькі ў крыві іншы колер, толькі кроў чырвоная…

Мы зусім нядаўна, усяго гадоў восем таму, нашу Марыйку Алімханаву знайшлі. Параніла камандзіра артдывізіёна, а яна папаўзла яго ратаваць. Паперадзе выбухнуў снарад… Проста перад ёю… Камандзір загінуў, а ёй абедзве нагі пасекла, ды так, што мы ледзьве змаглі яе перавязаць. Намучыліся. І так, і гэтак спрабавалі. Неслі на насілках у медсанбат, а яна прасіла: “Дзяўчаты, прыстрэльце… Я не хачу такой жыць…”. Так прасіла і маліла… Выправілі яе ў шпіталь, а самі рушылі далей, у наступ. Калі пачалі шукаць… След яе ўжо згубіўся. Мы не ведалі, дзе яна, што з ёй? Шмат гадоў… Куды толькі ні пісалі, ніхто станоўча не адказаў. Дапамаглі следапыты 73-й школы горада Масквы. Гэтыя хлопчыкі, гэтыя дзяўчаткі… Яны знайшлі яе праз трыццаць гадоў пасля вайны, знайшлі ў доме інвалідаў, недзе на Алтаі. Вельмі

далёка. Усе гэтыя гады яна па інтэрнатах для інвалідаў, па шпіталях качавала, яе дзясяткі разоў аперавалі. Яна маці сваёй нават не прызналася, што жывая... Ад усіх схавалася... Мы яе прывезлі на нашу сустрэчу. У слязах усе выкупаліся. Потым звялі з маці... Праз трыццаць з гакам гадоў яны сустрэліся... Маці ледзь не звар'яцела: "Якое шчасце, што маё сэрца раней ад гора не разарвалася. Якое шчасце!". А Марыйка ўсё паўтарала: "Цяпер мне не страшна сустрэцца. Я ўжо старая". Вось як... Карацей... Гэта і ёсць вайна...

Памятаю, ляжу ноччу ў зямлянцы. Не сплю. Недзе артылерыя бухае. Нашыя пастрэльваюць... І так не хочацца паміраць... Я клятву дала, воінскую клятву, калі трэба, ахвярую жыццём, але так не хацелася паміраць. Адтуль, калі і вернешся жывой, душа скалечанай будзе. Часам думаю: лепей бы нагу ці руку параніла, хай бы цела балела. А то душа... Вельмі балюча. Мы ж зусім маладзенькія на фронт пайшлі. Дзяўчаткі. Я за вайну нават падрасла. Мама дома памерала... Я падрасла на дзесяць сантыметраў...»

На развітанне няўпэўнена працягвае мне гарачыя рукі і абдымае: «Прабач...».

# «ПАДРАСЦІЦЕ, ДЗЯЎЧАТКІ... ВЫ ЯШЧЭ ЗЯЛЁНЫЯ...»

Галасы... Дзясяткі галасоў... Яны абрынуліся на мяне, агаляючы нязвыклую праўду, і яна, гэтая праўда, не змяшчалася ў кароткую і знаёмую з дзяцінства формулу — мы перамаглі. Адбылася вокамгненная хімічная рэакцыя: пафас распусціўся ў жывой тканцы чалавечых лёсаў, ён аказаўся надзвычай няўстойлівым рэчывам. Лёс — гэта калі яшчэ нешта ёсць за словамі.

Што я хачу пачуць праз дзясяткі гадоў? Як гэта было пад Масквой ці пад Сталінградам, пераказ вайсковых аперацый, забытыя назвы захопленых вышыняў? Мне патрэбныя звесткі пра перарухі армій і франтоў, пра адступленні і наступы, пра колькасць падарваных эшалонаў і партызанскіх рэйдаў, — пра усё тое, аб чым ужо напісаныя тысячы тамоў? Не, я шукаю іншае. Я збіраю тое, што назвала б ведамі духу. Іду па слядах невідочнага жыцця, натую зрушэнні душы. Шлях душы для мяне больш важны за ўласна падзею, не так істотна ці не столькі істотна, не на першым месцы, «як гэта было», а хвалюе і трывожыць іншае — што там з чалавекам адбывалася? Што ён там убачыў і зразумеў? Пра жыццё і смерць увогуле. Пра самога сябе, урэшце. Пішу гісторыю пачуццяў... Гісторыю душы... Не гісторыю вайны ці дзяржавы і не жыцці герояў, а гісторыю маленькага чалавека, выхапленага са штодзённага жыцця і закінутага ў эпічную глыбіню тэктанічнай падзеі. У вялікую Гісторыю.

Дзяўчаты сорак першага... Перадусім хачу запытацца: адкуль яны такія? Чаму іх было так шмат? Як

наважыліся нароўні з мужчынамі ўзяць зброю ў рукі? Страляць, мініраваць, падрываць, бамбіць — забіваць?

Гэтае ж пытанне яшчэ ў дзевятнаццатым стагоддзі агучыў Пушкін, публікуючы ў часопісе «Современник» урывак з нататак «кавалерист-девицы» Надзеі Дуравай, якая ўдзельнічала ў вайне з Напалеонам: «Якія прычыны змусілі маладую дзяўчыну старажытнага дваранскага роду пакінуць бацькоўскі дом, адмовіцца ад свайго полу, узяць на сябе справы і абавязкі, якія палохаюць і мужчынаў, і з'явіцца на поле бітваў — і якіх яшчэ! Напалеонаўскіх. Што падштурхнула яе? Таемная сардэчная вярэда? Свавольнае ўяўленне? Натуральная неўтаймаваная прага? Каханне?»

Ну дык усё ж такі — што?! Праз сто з лішкам гадоў тое самае пытанне…

## Пра клятвы і малітвы

«Я хачу казаць… Казаць! Выказацца! Нарэшце і нас нехта хоча пачуць. Мы столькі маўчалі, нават дома. Дзясяткі гадоў. Першы год, калі вярнулася з вайны, я гаварыла-гаварыла. Ніхто не слухаў. І я змоўкла… Добра, што ты прыйшла. Я ўвесь час некага чакала, ведала, нехта прыйдзе. Мусіць прыйсці. Я была тады юная. Ну, зусім юная. Шкада. Ведаеш, чаму? Бо не ўмела тое нават запомніць…

За некалькі дзён да вайны размаўлялі з сяброўкай пра вайну, мы былі пэўныя — ніякай вайны не будзе. Пайшлі з ёю ў кіно, перад фільмам паказвалі хроніку: Рыбентроп і Молатаў пацiскалі адзін аднаму рукі. У памяці засталіся словы дыктара, што Германія — надзейны сябра Савецкага Саюза.

Не мінула і месяца, як нямецкія войскі ўжо былі пад Масквой…

У нас восем дзяцей у сям'і, першыя чатыры ўсе дзяўчаты, я самая старэйшая. Тата прыйшоў аднойчы з працы і плача: "Я раней цешыўся, што ў мяне першыя дзяўчаткі. Нявесты. А цяпер у кожнага нехта ідзе на вайну, а ў нас няма каму… Я стары, мяне не бяруць, вы — дзяўчаты, а хлопчыкі маленькія". Неяк у сям'і ў нас гэта моцна перажывалі.

Арганізавалі курсы медсёстраў, і тата адвёў нас з сястрой туды. Мне — пятнаццаць гадоў, а сястры — чатырнаццаць. Ён казаў: "Гэта ўсё, што я магу аддаць дзеля перамогі. Маіх дзяўчатак…". Другой думкі тады не было.

Праз год я патрапіла на фронт…»

*Наталля Іванаўна Сяргеева, радавая, санітарка*

«Першыя дні… У горадзе вэрхал. Хаос. Ледзяны жах. Нейкіх шпіёнаў усе лавілі. Запэўнівалі адно аднаго: "Не трэба паддавацца на правакацыю". Ніхто нават у думках не мог даць веры, што здарылася катастрофа — нашу армію спляжылі за некалькі тыдняў. Нас вучылі, што ваяваць мы будзем на чужой тэрыторыі. "Ні пядзі сваёй зямлі не аддамо…" А тут адступаем…

Да вайны хадзілі чуткі, што Гітлер рыхтуецца напасці на Савецкі Саюз, але пераказваць іх строга забаранялася. Адпаведнымі органамі… Вам зразумела, якія гэта органы? НКУС… Чэкісты… Калі людзі шапталіся, то дома, на кухні, а ў камуналках — толькі ў сваім пакоі за зачыненымі дзвярыма або каля ванны, адкрыўшы перад гэтым кран з вадой. Але калі Сталін загаварыў… Ён звярнуўся да нас: "Браты і сёстры…". Тут усе і забыліся на свае крыўды… У нас дзядзька сядзеў у лагеры, мамін

брат, чыгуначнік, стары камуніст. Яго арыштавалі на працы… Вы здагадаліся — хто? НКУС… Нашага любімага дзядзьку, а мы ведалі, што ён ні ў чым не павінны. Верылі. Ён меў узнагароды яшчэ з грамадзянскай вайны… Але пасля прамовы Сталіна мама сказала: “Абаронім Радзіму, а потым разбяромся”. Радзіму любілі ўсе.

Я пабегла адразу ў ваенкамат. З ангінай пабегла, у мяне яшчэ не зусім упала тэмпература. Але я не магла чакаць…»

*Алена Антонаўна Кудзіна, радавая, шафёр*

«У нашай мамы не было сыноў… Гадавалася пяць дочак. Аб’явілі: “Вайна!”. У мяне быў абсалютны музыкальны слых. Марыла паступаць у кансерваторыю. Я вырашыла, што слых мой спатрэбіцца на фронце, я буду сувязісткай.

Эвакуяваліся ў Сталінград. А калі Сталінград акружылі, дабравольна пайшлі на фронт. Усе разам: мама і пяць дочак, а бацька тады ўжо ваяваў…»

*Антаніна Максімаўна Князева,*
*малодшы сяржант, сувязістка*

«Адно жаданне ва ўсіх: трапіць на фронт… Страшна? Канешне, страшна… Але ўсё роўна… Пайшлі ў ваенкамат, а нам кажуць: “Падрасціце, дзяўчаткі, вы яшчэ зялёныя…”. Нам па шаснаццаць-сямнаццаць гадоў. Аднак я не адступілася і мяне ўзялі. Мы хацелі з сяброўкай у снайперскую школу, толькі нам сказалі: “Будзеце рэгуліроўшчыцамі. Няма калі вас вучыць”.

Мама некалькі дзён вартавала на станцыі, калі нас адправяць. Пабачыла, як мы ўжо рухаліся да вагонаў, перадала мне пірог, дзясятак яек і знепрытомнела…»

*Таццяна Яфімаўна Сямёнава, сяржант, рэгуліроўшчыца*

«Свет адразу змяніўся… Я памятаю першыя дні… Мама стаяла ўвечары ля акна і малілася. Я не ведала, што мая мама верыць у Бога. Яна глядзела і глядзела на неба…

Мяне мабілізавалі, я была доктаркай. Але выправілася я з пачуцця абавязку. Бацька быў шчаслівы, што дачка на фронце. Абараняе Радзіму. Бацька выбіраўся ў ваенкамат ці не першым. Ён ішоў атрымліваць мой атэстат зранку спецыяльна, каб уся вёска бачыла, што дачка ў яго на фронце…»

*Ефрасіння Рыгораўна Брэўс, капітан, доктарка*

«Лета… Апошні мірны дзень… Увечары мы на танцах. Нам па шаснаццаць гадоў. Мы ходзім яшчэ хаўрусам, праводзім да хаты разам аднаго, потым другога. У нас не было, каб адасабляліся парачкі. Вяртаемся, скажам, шэсць хлопцаў і шэсць дзяўчат.

І вось ужо праз два тыдні гэтых хлопцаў, курсантаў танкавай вучэльні, якія нас праводзілі з танцаў, прывозяць калекамі, у бінтах. Гэта быў жах! Жах! Калі пачую, што нехта весяліцца, я не магла гэтага даравацъ. Як можна смяяцца, як можна нечаму цешыцца, калі такая вайна ідзе?

Неўзабаве бацька падаўся ў добраахвотнікі. Дома засталася я з малымі братамі. Яны былі трыццаць чацвёртага і трыццаць восьмага года нараджэння. Я сказала маме, што пайду на фронт. Яна плакала, я і сама ноччу плакала. Але збегла з дому… Напісала маме з войска. Адтуль яна вярнуць мяне ўжо ніяк не магла…»

*Лілія Міхайлаўна Бутко, хірургічная медсястра*

«Загад: шыхтуйся… Сталі мы па росце, я самая маленькая. Камандзір ідзе, прыглядаецца. Спыняецца каля мяне:

— А гэта што за Дзюймовачка? Што ты будзеш тут рабіць? Можа, вернешся да мамы і падрасцеш?

А мамы ў мяне ўжо не было... Мама загінула пад бомбамі...

Самае моцнае ўражанне... На ўсё жыццё... Было гэта ў першы год, калі мы адступалі... Я ўбачыла — мы хаваліся за хмызамі — як наш салдат кінуўся з вінтоўкай на нямецкі танк і біў прыкладам па брані. Біў, крычаў і плакаў, пакуль не ўпаў. Пакуль яго не расстралялі нямецкія аўтаматчыкі. Першы год ваявалі з вінтоўкамі супраць танкаў і самалётаў...»

*Паліна Сямёнаўна Наздрачова, санінструктарка*

«Я прасіла маму... Я яе ўмольвала: толькі не трэба плакаць... Гэта было не ноччу, але было цёмна, і стаяў паўсюдны енк. Яны не плакалі, нашыя маці, калі праводзілі сваіх дочак, яны енчылі. Мая мама стаяла як каменная. Яна трымалася, яна баялася, каб я таксама не зараўла. Я ж была мамчына дачка, мяне дома песцілі. А тут пастрыглі пад хлопчыка, толькі маленькі чубчык пакінулі. Яны з татам мяне не адпускалі, а я толькі адным жыла: на фронт, на фронт! На фронт! Вось гэтыя плакаты, якія цяпер вісяць у музеі: “Родина-мать зовет!”, “Что ты сделал для фронта?” — на мяне моцна ўплывалііі. Увесь час стаялі перад вачыма. А песні?! “*Паўстань, краіна дужая... Паўстань на мужны бой...*”.

Калі мы ехалі, дык нас уразіла, што проста на перонах ляжалі забітыя. Гэта ўжо была вайна... Толькі маладосць брала сваё, і мы спявалі. Нават нешта вясёлае. Нейкія прыпеўкі.

Напрыканцы вайны ў нас уся сям'я ваявала. Бацька, маці, сястра — яны сталі чыгуначнікамі. Яны рухаліся адразу за фронтам і аднаўлялі чыгунку. Медаль

“За перамогу” ў нас атрымалі ўсе: бацька, маці, сястра і я…»

*Яўгенія Сяргееўна Сапронава,*
*гвардыі сяржант, авіямеханік*

«Да вайны я працавала ў войску тэлефаністкай… Наша частка стаяла ў горадзе Барысаве, куды вайна прыйшла ў першыя ж тыдні. Начальнік сувязі сабраў усіх нас. Мы не служылі, мы не салдаты, мы былі вольнанаёмныя.

Ён нам кажа:

—Пачалася вайна суворая. Вам будзе вельмі цяжка, дзяўчаты. І пакуль не позна, калі хто жадае, можа вярнуцца дахаты. А той, хто хоча застацца на фронце, крок наперад…

І ўсе дзяўчаты, як адна, крок наперад зрабілі. Нас чалавек дваццаць. Усе гатовыя былі абараняць Радзіму. Да вайны я нават ваенныя кніжкі не любіла, чытала пра каханне. А тут?

Сядзелі за апаратамі суткамі, цэлымі суткамі. Салдаты прынясуць нам кацялкі, перакусім, прыснём тут жа, ля апаратаў, і зноў насоўваем навушнікі. Не было калі памыць галаву, і тады я папрасіла: “Дзяўчаты, адрэжце мне косы…”»

*Паліна Дзмітрыеўна Запольская, тэлефаністка*

«Мы хадзілі і хадзілі ў ваенкамат…

І калі зноў прыйшлі, які ўжо раз, не помню, ваенкам ледзь нас не пагнаў: “Ну, калі б вы хоць якую спецыяльнасць мелі. Былі б вы медсёстры, шафёры… Ну што вы ўмееце? Што вы будзеце рабіць на вайне?”. А мы не разумелі. Перад намі такога пытання не стаяла: што мы будзем рабіць? Марылі ваяваць — і ўсё. Нам і не да галавы было, што ваяваць — гэта нешта

ўмець рабіць. Нешта канкрэтнае. Ён нас агаломшыў гэтым пытаннем.

Я і яшчэ некалькі дзяўчат пайшлі на курсы медсёстраў. Там сказалі, што трэба вучыцца шэсць месяцаў. Мы вырашылі: не, гэта нам не пасуе. Былі яшчэ курсы, дзе вучыліся тры месяцы. Што праўда, тры месяцы таксама, як мы лічылі, доўга. Але гэтыя курсы якраз блізіліся да заканчэння. Мы папрасілі, каб нас дапусцілі да экзаменаў. Яшчэ месяц цягнуліся заняткі. Ноччу былі на практыцы ў шпіталі, а ўдзень вучыліся. Атрымалася, што мы правучыліся ўсяго трохі больш за месяц...

Накіравалі нас не на фронт, а ў шпіталь. Гэта было напрыканцы жніўня сорак першага года... Школы, больніцы, клубы поўніліся параненымі. Але ў лютым я сышла са шпіталя, можна сказаць, збегла, дэзерціравала, інакш не скажаш... Без дакументаў, без нічога заскочыла на санітарны цягнік. Пакінула цыдулку: "На дзяжурства не прыйду. Еду на фронт". І ўсё...»

*Алена Паўлаўна Якаўлева, старшына, медсястра*

«У мяне ў той дзень было спатканне... Я ляцела туды на крылах... Я думала, што ён мне ў гэты дзень скажа: "Кахаю!", а ён прыйшоў сумны: "Вера, вайна! Нас адразу з заняткаў адпраўляюць на фронт". Ён вучыўся ў вайсковай вучэльні. Ну, і я, натуральна, тут жа ўявіла сябе ў ролі Жанны д'Арк. Толькі на фронт і толькі вінтоўку ў рукі. Мы мусім быць разам. Заўсёды разам. Пабегла ў ваенкамат, але там мне без аніякіх патлумачылі: "Патрэбныя пакуль толькі медыкі. І вучыцца трэба шэсць месяцаў". Шэсць месяцаў — здурнець! У мяне ж каханне...

Неяк мяне ўсё ж пераканалі, што трэба вучыцца. Добра, буду вучыцца, але не на медсястру... Я хачу

страляць! Страляць, як і ён. Да гэтага сэрцам ужо была падрыхтаваная. У нашай школе часта выступалі героі грамадзянскай вайны і тыя, хто ваяваў у Іспаніі. Дзяўчаты пачуваліся нароўні з хлопцамі, нас не дзялілі. Наадварот, з дзяцінства, са школы мы чулі: "Дзяўчына — за руль трактара!", "Дзяўчына — за штурвал самалёта!". Ну, а тут яшчэ і каханне! Я нават уяўляла, як мы з ім загінем разам. У адным баі…

Вучылася я ў тэатральным інстытуце. Марыла стаць актрысай. Мой ідэал — Ларыса Рэйснер. Жанчына-камісар у скураной куртцы… Мне падабалася, што яна прыгожая…»

*Вера Данілаўцава, сяржант, снайперка*

«Маіх сяброў, усе яны былі старэйшымі, забралі на фронт… Я моцна плакала, што засталася адна, што мяне не ўзялі. Мне сказалі: "Трэба, дзяўчынка, вучыцца".

Толькі правучыліся мы няшмат. Дэкан сабраў нас і сказаў:

— Скончыцца вайна, дзяўчаты, потым давучыцеся. А цяпер будзем абараняць Радзіму.

На фронт нас праводзілі шэфы з завода. Гэта было летам. Я памятаю, што ўсе вагоны былі ў зеляніне, у кветках. Прынеслі падарункі. Мне падаравалі неверагодна смачнае печыва хатняй выпечкі і прыгожы швэдрык. З якім узрушэннем я танчыла на пероне ўкраінскі гапак!

Ехалі шмат дзён… Выйшлі з дзяўчатамі на нейкай станцыі з вядром, каб вады набраць… Стаім і раты паразявілі… Адзін за адным ідуць цягнікі, і там толькі дзяўчаты. Махаюць нам — хто хусцінкамі, хто пілоткамі. Стала зразумелым: мужыкоў не хапае, палеглі яны… Ці ў палоне. Цяпер мы замест іх.

Мама напісала мне малітву. Я схавала яе ў медальён. Можа, і дапамагла — я вярнулася дадому. Я перад боем медальён цалавала...»

*Ганна Мікалаеўна Храловіч, медсястра*

«Я была лётчыцай...

Калі вучыліся яшчэ ў сёмым класе, да нас прыляцеў самалёт. Гэта ў тыя гады, уяўляеце, у трыццаць шостым. Неверагодна ўразіла. І тады ж прагучаў заклік: "Дзяўчаты і юнакі — на самалёт!". Я, як камсамолка, натуральна, усюды была сярод першых. Адразу запісалася ў аэраклуб. Бацька, праўда, катэгарычна быў супраць. У нашай сям'і ўсе былі металургі, некалькі пакаленняў металургаў-доменшчыкаў. І бацька лічыў, што металургам быць — жаночая праца, а лётчыкам — не. Начальнік аэраклуба даведаўся пра гэта і прапанаваў узяць бацьку на самалёт. Я так і зрабіла. Мы падняліся з бацькам у неба, і з таго дня ён маўчаў. Яму спадабалася. Скончыла аэраклуб на выдатна, добра скакала з парашутам. Да вайны яшчэ паспела выйсці замуж, нарадзіла дачку.

З першых дзён вайны ў нашым аэраклубе пачаліся змены: мужчынаў забіралі, а на іх месцы заступалі мы, жанчыны. Вучылі курсантаў. Працы было шмат, з ранку да ночы. Мой муж сышоў на фронт адным з першых. Застаўся ў мяне толькі фотаздымак: стаім мы з ім каля самалёта, у лётчыцкіх шлемах... Жылі мы цяпер удваіх з дачкой, увесь час у лагерах. А як жылі? Я зранку яе зачыню, дам кашы, і з чатырох гадзінаў раніцы мы з курсантамі ўжо лётаем. Вяртаюся пад вечар, а яна паесць ці не паесць, уся выпацканая гэтай кашай. Ужо нават не плача, а толькі глядзіць на мяне. Вочы ў яе вялікія, як у бацькі...

Напрыканцы сорак першага мне прыслалі пахаванку: муж загінуў пад Масквой. Ён быў камандзірам звяна.

Я любіла сваю дачку, але адвезла яе да сваякоў. І стала прасіцца на фронт…

У апошнюю ноч… Усю ноч прастаяла ля яе ложка на каленях…»

*Антаніна Рыгораўна Бондарава,*
*гвардыі лейтэнант, старшы лётчык*

«Мне роўна васямнаццаць гадоў… Я такая радасная, у мяне — свята. А ўсе вакол крычаць: “Вайна!”. Помню, як людзі плакалі. Колькі сустракала людзей на вуліцы, усе плакалі. Некаторыя нават маліліся. Было нязвыкла… Людзі на вуліцы моляцца і жагнаюцца. У школе нас вучылі, што Бога няма. Але дзе нашыя танкі і нашыя прыгожыя самалёты? Мы іх заўсёды бачылі на парадах. Ганарыліся. Дзе нашыя палкаводцы? Будзённы… Быў, што праўда, момант разгубленасці. А потым пачалі думаць: як перамагчы?

Вучылася я на другім курсе фельчарска-акушэрскай школы ў горадзе Свярдлоўску. Адразу падумала: “Калі вайна, дык трэба на фронт”. У мяне тата камуніст, з вялікім стажам, паліткатаржанін. Ён нас з дзяцінства запэўніваў, што Радзіма — гэта ўсё, Радзіму трэба абараняць. І я не вагалася: калі я не пайду, дык хто пойдзе? Я мушу…”»

*Серафіма Іванаўна Панасенка, малодшы лейтэнант, фельчарка мотастралковага батальёна*

«Мама прыбегла да цягніка… Мая мама была строгая. Яна ніколі нас не цалавала, не хваліла. Калі нешта добрае, дык яна толькі ласкава паглядзіць, і ўсё. А тут яна прыбегла, схапіла маю галаву і цалуе мяне, цалуе. І так глядзіць у вочы… Глядзіць… Доўга… Я зразумела, што ўжо ніколі не ўбачу сваю маму. Я адчула… Захацелася

кінуць усё, аддаць рэчмяшок і вярнуцца дадому. Мне зрабілася ўсіх шкада. Бабулю... І брацікаў...

Тут зайграла музыка... Каманда: "Ра-зый-дзіся! Сядай! Па ва-го-о-нах!.."»

*Тамара Ульянаўна Ладыніна, радавая, пехацінец*

«Залічылі мяне ў полк сувязі... Ніколі б не пайшла ў сувязь і не пагадзілася б, таму што я не разумела, што гэта таксама ваяваць. Прыехаў да нас камандзір дывізіі, усіх пашыхтавалі. Была ў нас Марусенька Сунгурава. І вось гэтая Марусенька выходзіць наперад:

—Таварыш генерал, дазвольце звярнуцца.

Ён кажа:

—Ну звяртайцеся, звяртайцеся, баец Сунгурава!

—Радавая Сунгурава просіць вызваліць яе ад службы ў сувязі і скіраваць туды, дзе страляюць.

Вы разумееце, мы былі ўсе так настроеныя. Нам уяўлялася, што тое, чым мы займаемся, — сувязь, гэта вельмі мала, гэта нават прыніжае нас, трэба быць толькі на пярэднім краі.

У генерала адразу знікла ўсмешка:

—Дзяўчаткі мае! (А вы б бачылі, якія мы былі тады — не еўшы, не спаўшы, адным словам, ён ужо не як камандзір, а як бацька загаварыў.) Вы, напэўна, не разумееце сваёй ролі на фронце, вы — нашыя вочы і вушы, армія без сувязі, як чалавек без крыві.

Марусенька Сунгурава першая не вытрывала:

—Таварыш генерал! Радавая Сунгурава, як штык, гатовая выконваць любое вашае заданне!

Мы яе потым так да канца вайны і звалі: "Штык".

...У чэрвені сорак трэцяга на Курскай дузе нам уручаюць сцяг палка, а наш полк, сто дваццаць дзявяты асобны полк сувязі шэсцьдзесят пятай арміі, ужо быў на

восемдзесят адсоткаў жаночым. І вось я хачу расказаць, каб вы мелі ўяўленне… Зразумелі… Што ў нашых душах адбывалася, такіх людзей, якімі мы былі тады, мабыць, больш ніколі не будзе. Ніколі! Такіх наіўных і такіх шчырых. З такой верай! Калі сцяг атрымаў наш камандзір палка і даў каманду: "Полк, пад сцяг! На калені!", усе мы адчулі сябе шчаслівымі. Нам аказалі давер, мы цяпер такі самы полк, як усялякі іншы — танкавы, стралковы. Стаім і плачам, у кожнай слёзы на вачах. Вы, напэўна, не дасцё веры, ад гэтага ўзрушэння ўвесь мой арганізм напяўся, а я хварэла на "курыную слепату", гэта ў мяне ад недахопу ежы, ад нервовай перанапругі здарылася, дык вось, мая курыная слепата знікла. Уявіце, я на другі дзень была здаровая, я вылечылася праз такую душэўную ўзнёсласць…»

*Марыя Сямёнаўна Каліберда,*
*старшы сяржант, сувязістка*

«Толькі што стала дарослай… Дзявятага чэрвеня сорак першага года мне споўнілася васямнаццаць гадоў. А праз два тыдні пачалася гэтая праклятая вайна, нават праз дванаццаць дзён. Нас паслалі на будаўніцтва чыгуначнай дарогі Гагра — Сухумі. Сабралі адну моладзь. Я запомніла, які мы елі хлеб. Мукі там амаль не было, усяго ўсялякага, а больш усяго — вады. Паляжыць гэты хлеб на стале, і вакол яго лужынка збіраецца, мы злізвалі яе языком…

У сорак другім годзе… Я з уласнага жадання запісалася на службу ў эвакасартыравальны шпіталь тры тысячы дзвесце першы. Гэта быў вельмі вялікі франтавы шпіталь, які ўваходзіў у склад Закаўказскага і Паўночна-Каўказскага франтоў і асобнай Прыморскай арміі. Баі былі вельмі жорсткія, параненых аказалася безліч.

Мяне паставілі на раздачу ежы — пасада кругласуткавая, ужо раніца і трэба падаваць сняданак, а мы яшчэ раздаём вячэру. Праз некалькі месяцаў параніла ў левую нагу — скакала на правай, але працавала. Потым яшчэ дадалі пасаду сястры-гаспадыні, гэта таксама трэба быць на месцы круглыя суткі. Жыла на працы.

Трыццатага мая сорак трэцяга года... Роўна а першай гадзіне быў масавы налёт на Краснадар. Я выскачыла з памяшкання паглядзець, ці паспелі адправіць параненых з чыгуначнага вакзала. Дзве бомбы трапілі ў будыніну, дзе захоўваліся баявыя прыпасы. На маіх вачах скрыні ляцелі вышэй за шасціпавярховік і там выбухалі. Мяне магутнай хваляй адкінула да цаглянай сцяны. Страціла прытомнасць... Акрыяла адно ўвечары. Прыпадняла галаву, паспрабавала сціснуць пальцы — здаецца, варушацца, ледзьве прадрала левае вока і пайшла ў шпіталь, уся ў крыві. У калідоры сустракаю нашу старэйшую сястру, яна не пазнала мяне, запыталася: "Хто вы? Адкуль?". Падсунулася бліжэй, вохнула: "Дзе цябе так доўга насіла, Ксеня? Параненыя галодныя, а цябе няма". Хутка забінтавалі галаву, левую руку вышэй локця, і я паспяшалася атрымліваць вячэру. У вачах цямнела, пот цячэ ручаямі. Пачала раздаваць ежу, упала. Дапамаглі ачуняць, і толькі адно чую: "Хутчэй! Шпарчэй!". І зноў — "Хутчэй! Шпарчэй!".

Праз некалькі дзён у мяне яшчэ бралі для цяжка параненых кроў. Людзі паміралі...

За вайну я так змянілася, што, калі вярнулася дадому, мама мяне не пазнала. Мне паказалі, дзе яна жыла, я падышла да дзвярэй, пастукала. Адказалі:

—Так- так...

Я зайшла, павіталася і кажу:

—Дазвольце пераначаваць.

Мама распальвала печ, а абодва мае малодшыя брацікі сядзелі на падлозе на купе саломы, голыя, не было чаго надзець. Мама мяне не пазнала і адказвае:

—Вы бачыце, грамадзяначка, як мы жывём. Пакуль не сцямнела, пашукайце далей.

Падыходжу бліжэй, яна зноў:

—Грамадзяначка, пашукайце далей, пакуль светла.

Нахіляюся да яе, абдымаю і шапчу:

—Мама-мамачка!

Тады яны ўсе на мяне як накінуцца… Як заенчаць…

Цяпер я жыву ў Крыме… У нас усё патанае ў кветках, я кожны дзень гляджу з акна на мора, а ўся курчуся ад болю, у мяне дагэтуль не жаночы твар. Я часта плачу, я штодня ў стогнах. У сваіх успамінах…»

*Ксенія Сяргееўна Асадчава, радавая, сястра-гаспадыня*

## Пра пах страху і чамадан цукерак

«Мяне чакаў фронт… Быў цудоўны дзень. Светлае паветра і дробны-дробны дожджык. Так прыгожа! Выйшла зранку, стаю: няўжо я болей сюды не вярнуся? Не пабачу наш сад… Нашу вуліцу… Мама плакала, схопіць мяне і не адпускае. Я ўжо пайду, яна дагоніць, абдыме і не адпускае…»

*Вольга Мітрафанаўна Ружніцкая, медсястра*

«Паміраць… Памерці я не баялася. Маладосць, пэўна, ці яшчэ што… Вакол смерць, заўсёды смерць побач, а я пра яе не думала. Мы пра яе не размаўлялі. Яна кружляла, кружляла недзе паблізу, але ўсё — міма.

Аднойчы ноччу разведку боем ад нашага палка ладзіла цэлая рота. На світанку яна адступіла,

а з нейтральнай паласы пачуўся стогн. Застаўся паранены. “Не хадзі, заб’юць, — не пускалі мяне салдаты, — бачыш, ужо віднее”.

Не паслухалася, папаўзла. Знайшла параненага, цягнула яго восем гадзінаў, прывязаўшы рэменем за руку. Прыцягнула жывога. Камандзір даведаўся, аб’явіў пад гарачую руку пяць сутак арышту за самавольную адлучку. А намеснік камандзіра палка адрэагаваў наадварот: “Заслугоўвае ўзнагароды”.

У дзевятнаццаць гадоў я мела ўжо медаль “За адвагу”. У дзевятнаццаць гадоў пасівела. У дзевятнаццаць у апошнім баі былі прастрэленыя абодва лёгкія, другая куля прайшла паміж пазванкоў. Паралізавала ногі… І мяне палічылі забітай…

У дзевятнаццаць… У мяне ўнучка цяпер такая. Гляджу на яе — і не веру. Дзіцё!

Калі я прыехала дамоў з фронту, сястра паказала мне пахаванку… Мяне пахавалі…»

*Надзея Васілеўна Анісімава,*
*санінструктарка кулямётнай роты…*

«Маму сваю я не помню… Засталіся ў памяці адно нейкія цені… Абрысы… Ці то яе твару, ці то яе фігуры, калі яна нахілялася нада мной. Была блізка. Так мне потым здавалася. Калі мамы не стала, мне было тры гады. Бацька служыў на Далёкім Усходзе, кадравы вайсковец. Навучыў мяне ездзіць на кані. Гэта было самае моцнае ўражанне дзяцінства. Бацька не хацеў, каб я вырасла расфуфыранай паненкай. У Ленінградзе — там я сябе памятаю з пяці гадоў — жыла з цёткай. А цётка мая ў руска-японскую вайну была сястрой міласэрнасці. Я яе любіла, як маму…

Якой я была ў дзяцінстве? Спрачаючыся, скакала з другога паверха школы. Любіла футбол, заўсёды абараняла браму ў хлопчыкаў. Пачалася фінская вайна, раз-пораз уцякала на вайну. А ў сорак першым якраз скончыла сем класаў і паспела аднесці дакументы ў тэхнікум. Цётка плача: "Вайна", а я ўзрадавалася, што пайду на фронт, буду ваяваць. Адкуль я ведала, што такое кроў?

Сфармавалася першая гвардзейская дывізія народнага апалчэння, і нас, некалькі дзяўчат, залічылі ў медсанбат.

Патэлефанавала цётцы:

—Іду на фронт.

На другім канцы дроту чую:

—Марш дадому. Абед ужо стыне.

Я павесіла слухаўку. Потым мне яе было шкада, вельмі шкада. Пачалася блакада, страшная ленінградская блакада, калі горад напалову вымер, а яна засталася адна. Старэнькая.

Памятаю, адпусцілі мяне ў звальненне. Перш чым ісці да цёткі, я зайшла ў краму. Да вайны моцна любіла цукеркі. Кажу:

—Дайце мне цукерак.

Прадавачка глядзіць на мяне, як на вар'ятку. Я не ведала: што такое карткі, што такое — блакада? Уся чарга павярнулася да мяне, а на мне вінтоўка большая, чым я сама. Нам іх выдалі, а я глядзела і думала: "Калі я дарасту да гэтай вінтоўкі?". І ўсе раптам сталі прасіць, уся чарга:

—Дайце ёй цукерак. Выражце ў нас талоны.

І мне далі.

На вуліцы збіралі дапамогу фронту. Проста на плошчы на сталах ляжалі вялікія падносы, людзі падыходзілі і здымалі, хто пярсцёнак залаты, хто завушніцы.

Гадзіннікі неслі, грошы... Ніхто нічога не запісваў, ніхто не распісваўся. Жанчыны здымалі з пальцаў пярсцёнкі шлюбныя...

Гэта карціны з маёй памяці...

І быў знакаміты сталінскі загад за нумарам дзвесце дваццаць сем — "Ні кроку назад!". Кінешся на ўцёкі — расстрэл! На месцы. Або — пад трыбунал і ў спецыяльна створаныя штрафныя батальёны. Тых, хто туды трапляў, называлі смяротнікамі. А тых, хто выбраўся з акружэння ці ўцёк з палону, — у фільтрацыйныя лагеры. Ззаду за намі ішлі заградатрады. Свае стралялі ў сваіх...

Гэта карціны з маёй памяці...

Звычайная паляна... Мокра, брудна пасля дажджу. Стаіць на каленях малады салдат. У акулярах, яны ўвесь час чамусьці падаюць, ён іх падымае... Інтэлігентны ленінградскі хлопчык. Трохлінейку ў яго ўжо забралі. Нас усіх пашыхтавалі. Усюды лужыны... Мы... Чуем, як ён просіць... Ён клянецца... Моліць, каб яго не расстрэльвалі, бо ў яго дома адна маці. Пачынае плакаць. І тут жа яго — проста ў лоб. З пісталета. Паказальны расстрэл. З кожным так будзе. Хай толькі на хвіліну дасць слабіну! На адну хвіліну...

Гэты загад адразу зрабіў з мяне дарослую. Пра гэта нельга было... Доўга не згадвалі... Так, мы перамаглі, але якім коштам! Якім страшным коштам!

Не спалі суткамі — столькі было параненых. Аднойчы трое сутак ніхто не спаў. Мяне паслалі з машынай параненых у шпіталь. Выгрузілі, назад машына ехала пустая, і я выспалася. Вярнулася, як агурочак, а нашыя ўсе з ног падаюць.

Сустракаю камісара:

— Таварыш камісар, мне сорамна.

— Што такое?

—Я спала.

—Дзе?

Паведамляю яму, як адвозіла параненых, назад машына ехала пустая і я выспалася.

—Ну і што? Малайцом! Хай хоць адзін чалавек будзе нармальны, а то ўсе засынаюць на хаду.

А мне было сорамна. І з такім сумленнем мы жылі ўсю вайну.

У медсанбаце да мяне добра ставіліся, але я хацела быць разведчыцай. Сказала, што ўцяку на перадавую, калі мяне не адпусцяць. Хацелі з камсамола за гэта выключыць, за тое, што не падначальваюся вайсковаму статуту. Але я ўсё роўна ўцякла…

Першы медаль “За адвагу”…

Пачаўся бой. Агонь — галавы не падняць. Салдаты ляжаць пластом. Каманда: “Наперад! За Радзіму!”, а яны не варушацца. Зноў каманда, зноў ляжаць. Я зняла шапку, каб бачылі: дзяўчына паднялася… І яны ўсе ўсталі, і мы пайшлі ў бой…

Узнагародзілі мяне медалём, і ў той жа дзень мы выправіліся ў разведку. І ў мяне ўпершыню здарылася… Нашае… Жаночае. Убачыла я ў сябе кроў, як заенчу:

—Мяне параніла… З намі быў фельчар, пажылы ўжо мужчына. Ён да мяне:

—Куды паранiла?

—Не ведаю куды… Але кроў…

Ён мне, як бацька, усё растлумачыў…

Я хадзіла ў разведку пасля вайны гадоў пятнаццаць. Кожную ноч. І сны такія: то ў мяне аўтамат заклініла, то мы ў аблозе… Прачнешся — зубы скрыгочуць. Згадваеш — дзе ты? Там ці тут?

Скончылася вайна, у мяне было тры жаданні: першае — нарэшце я не буду поўзаць на жываце, а стану

ездзіць на тралейбусе, другое — купіць і з'есці цэлы белы батон, трэцяе — выспацца ў белай пасцелі і каб прасціны хрумсцелі. Белыя прасціны...»

*Альбіна Аляксандраўна Ганцімурава,*
*старшы сяржант, разведчыца*

«Чакаю другое дзіця... У мяне сыну два гады, і я цяжарная. Тут вайна. І муж на фронце. Я паехала да сваіх бацькоў і зрабіла... Ну, вы разумееце? Аборт... Хаця гэта тады забаранялася... Як нараджаць? Кругом слёзы... Вайна! Як нараджаць сярод смерці?

Скончыла курсы шыфравальніц, накіравалі на фронт. Хацела адпомсціць за сваё дзіцятка, за тое, што я яго не нарадзіла. Маю дзяўчынку... Павінна была нарадзіцца дзяўчынка...

Прасілася на перадавую. Пакінулі пры штабе...»

*Любоў Аркадзеўна Чарная,*
*малодшы лейтэнант, шыфравальніца*

«Пакідалі горад... Усе сыходзілі... Апоўдні дваццаць восьмага чэрвеня сорак першага года мы, студэнты Смаленскага педінстытута, сустрэліся ў двары друкарні. Зборы былі кароткімі. Выйшлі з горада па старой Смаленскай дарозе ў напрамку горада Краснае. Трымаліся асцярожна, рухаліся асобнымі групамі. Падвячоркам спякоты паменела, стала лягчэй, пайшлі хутчэй, не азіраючыся. Азірацца баяліся... Спыніліся на прывал, і толькі тады паглядзелі на ўсход. Увесь далягляд быў ахоплены чырвоным полымем, з адлегласці сорак кіламетраў здавалася, што яно запаланіла ўсё неба. Сталася зразумела, што не дзесяць і не сто дамоў палаюць. Гарыць увесь Смаленск...

Была ў мяне такая летняя сукенка з фальбонамі. Падабалася яна Веры, маёй сяброўцы. Колькі разоў яна яе

прымервала. Я абяцала падарыць ёй на вяселле. Замуж яна збіралася. І хлопец у яе быў харошы.

А тут раптам вайна. Ідзём на акопы. Рэчы свае ў інтэрнаце здаем каменданту. А як жа сукенка? "Вазьмі, Вера", — казала я, калі мы сыходзілі з горада.

Не ўзяла. Маўляў, як і абяцала, падорыш на вяселле. Згарэла ў тым полымі сукенка.

Увесь час мы цяпер ішлі і азіраліся. Здавалася, што нам пячэ ў спіну. Усю ноч не спыняліся, а на світанку пачалі працу. Капаць супрацьтанкавыя равы. Сем метраў шырынёй і тры з паловай метры ўглыб. Капаю, а рыдлёўка агнём гарыць, пясок здаецца чырвоным. Стаіць перад вачыма наш дом з кветкамі і бэзам... Белым бэзам...

Жылі мы ў буданах на поплаве між дзвюх рэк. Задуха і вільгаць. Камароў процьма. Перад сном выкурым іх з буданоў, а на світанку ўсё роўна ўшчымліваюцца, спакойна не паспіш.

Адвезлі мяне адтуль у санчастку. Там на падлозе мы ўпокат ляжалі. Шмат нас тады захварэла. Тэмпература высокая. Ліхаманіць. Ляжу — плачу. Расхінуўся ўваход у палатку, доктарка адтуль (далей і прайсці нельга было, матрацы ўшчыльную ляжалі) кажа: "Іванова, плазмодый у крыві". Гэта ў мяне, значыцца. Яна не ведала, што для мяне страху большага не было, чым гэты плазмодый, з таго разу, як я пра яго ў падручніку яшчэ ў шостым класе прачытала. А тут рэпрадуктар зайграў: "*Паўстань, краіна дужая...*". Упершыню тады я пачула гэтую песню. "Вось акрыяю, — думаю, — і адразу пайду на фронт".

Прывезлі мяне ў Казлоўку — непадалёк ад Яраслаўля, выгрузілі на лаўку, сяджу, трымаюся з усіх сілаў, каб не зваліцца, чую быццам у сне:

— Гэтая?

—Так, — кажа фельчар.

—Звадзіце ў сталоўку. Спачатку накарміце.

І вось я ў ложку. Вы можаце зразумець, што гэта такое, не на зямлі ля вогнішча, не ў плашч-палатцы пад дрэвам, а ў шпіталі, у цяпле. На прасціне. Сем дзён я не прачыналася. Казалі: сёстры будзілі і кармілі мяне, а я не памятаю. А калі праз сем дзён прачнулася сама, з'явіўся доктар, агледзеў і сказаў:

—Арганізм моцны, адужае.

І я зноў правалілася ў сон.

...На фронце адразу трапіла са сваёй часткай у акружэнне. Норма харчавання — два сухары на дзень. Хаваць забітых не хапала часу, іх проста засыпалі пяском. Твар закрывалі пілоткай... "Калі выжывем, — сказаў камандзір, — адпраўлю цябе ў тыл. Я раней думаў, што жанчына тут і трох дзён не вытрывае. Як уяўлю сваю жонку...". Я расплакалася ад крыўды, для мяне гэта было горш за смерць — хавацца ў такі час у тыле. Розумам і сэрцам я вытрымлівала, я не вытрымлівала фізічна. Фізічныя нагрузкі... Памятаю, як цягалі снарады на сабе, цягалі гарматы па гразі, асабліва ва Украіне такая цяжкая зямля пасля дажджу ці ўвесну, яна як цеста. Нават выкапаць брацкую магілу і пахаваць таварышаў, калі мы ўсе трое сутак не спалі... нават гэта цяжка. Ужо не плакалі, плакаць таксама патрэбныя сілы, а хацелася спаць. Спаць і спаць.

На варце я хадзіла без спыну ўзад-уперад і вершы ўголас чытала. Іншыя дзяўчаты песні спявалі, каб не зваліцца і не заснуць...»

*Валянціна Паўлаўна Максімчук, зенітчыца*

«Вывозілі параненых з Мінска... Я была на высокіх абцасах, саромелася, што малая ростам. Адзін абцас зла-

маўся, а тут крычаць: “Дэсант!”. І я басанож бягу, а туфлі ў руцэ, шкада, вельмі прыгожыя туфлі.

Калі нас акружылі і стала відаць, што не вырвемся, то мы з санітаркай Дар’яй падняліся з канавы, ужо не хаваемся, стаім на поўны рост: хай лепей галовы снарадам адарве, чым яны возьмуць нас у палон, будуць здзекавацца. Параненыя, хто мог, таксама падняліся…

Калі я ўбачыла першага фашысцкага салдата, не змагла і слова вымавіць, мне мову заняло. А яны ідуць маладыя, вясёлыя і ўсміхаюцца. І дзе б яны ні спыніліся, дзе б ні ўбачылі калонку ці калодзеж, пачынаюць мыцца. Рукавы ў іх заўсёды закасаныя. Мыюцца, мыюцца… Кроў вакол, крыкі, а яны мыюцца, мыюцца… І такая нянавісць падымалася… Я вярнулася дахаты, я дзве блузкі змяніла. Так усё ўнутры пратэставала, што яны тут. Я не магла спаць начамі. Я-а-а-к?! А суседку нашу, цётку Клаву, спаралізавала, калі яна ўбачыла, што яны ходзяць па нашай зямлі. У ейным доме… Яна хутка памерла, бо не магла гэтага перажыць…»

*Марыя Васілеўна Жлоба, падпольшчыца*

«Немцы ўехалі ў вёску… На вялікіх чорных матацыклах… Я глядзела на іх вылупіўшы вочы: яны былі маладыя, вясёлыя. Увесь час смяяліся. Яны рагаталі! Сэрца сціскала, што яны тут, на тваёй зямлі, і яшчэ рагочуць.

Я пра адно марыла — адпомсціць. Уяўляла, як загіну і пра мяне напішуць кнігу. Застанецца маё імя. Гэта былі мае мары…

У сорак трэцім годзе нарадзіла дачку… Гэта ўжо мы з мужам прыйшлі ў лес да партызанаў. На балоце нараджала, у стозе сена. Пялюшкі на сабе сушыла, пакладу за пазуху, нагрэю і зноў абкручваю. Вакол усё гарэла, палілі вёскі разам з людзьмі. У школы зганялі, у цэрквы…

Аблівалі газай… У мяне мая пяцігадовая пляменніца — яна слухала нашыя размовы — запыталася: “Цётка Маня, калі я згару, што ад мяне застанецца? Толькі чаравічкі…”. Вось пра што нашыя дзеці ў нас пыталіся…

Я сама абгаркі збірала… Збірала сваёй сяброўцы яе сям'ю… Костачкі ў попеле знаходзілі, і калі застаўся кавалачак адзення, хоць які акраек, пазнавалі, хто гэта. Кожны свайго шукаў. Падняла я адзін шматок, сяброўка кажа: “Маміна кофта…”. І ўпала. Хто ў прасцінку, хто ў навалачку костачкі збіраў. Хто што меў. Мы з сяброўкай — у сумачку, і палову не набралі. У магілку агульную ўсё складвалі. Усё чорнае, толькі костачкі белыя. І попел з костак… Я яго пазнавала ўжо… Ён белы-бялюсенькі…

Пасля гэтага куды б мяне ні пасылалі, я не баялася. Дзіця ў мяне было маленькае, у тры месяцы я яго ўжо на заданне брала. Камісар мяне выпраўляў, а сам плакаў… Медыкаменты з горада прыносіла, бінты, сыроватку… Паміж ручак і паміж ножак пакладу, пялюшкамі агарну і нясу. У лесе параненыя паміраюць. Трэба ісці. Трэба. Ніхто іншы не мог прабрацца, не мог прайсці, усюды нямецкая і паліцэйская варта, адна я праходзіла. З дзіцем… Яно ў мяне ў пялюшках…

Цяпер прызнацца страшна… Ох, цяжка! Каб была тэмпература, дзіцё плакала, соллю яго націрала. Дачушка чырвоная ўся, па ёй сып пойдзе, яна енчыць, са скуры лезе. Спыняць ля варты: “Тыф, пан… Тыф…”. Яны гоняць, каб хутчэй сыходзіла: “Вэк! Вэк!”. І соллю націрала, і часнык клала. А дзіця маленькае, я яго яшчэ цыцкамі карміла.

Як мінем небяспеку, зайду ў лес, плачу-плачу. Енчу! Так дзіцятка шкада. А праз дзень-два зноў іду…».

*Марыя Цімафееўна Савіцкая-Радзюкевіч,*
*партызанская сувязная*

«Спазнала нянавісць... Упершыню зведала гэтае пачуццё... Як яны могуць хадзіць па нашай зямлі! Хто яны такія? У мяне падымалася тэмпература, калі пабачу. Чаму яны тут?

Пройдзе калона ваеннапалонных, і сотні трупаў заставаліся на дарозе... Сотні... Тых, хто валіўся без сілаў, адразу прыстрэльвалі. Іх гналі, як быдла. Па мёртвых ужо не плакалі. Не паспявалі хаваць — столькі іх было. Яны доўга ляжалі на зямлі... Жывыя жылі з мёртвымі.

Сустрэла зводную сястру. Іх вёску спалілі.

У яе было трое сыноў, усіх ужо няма. Іх дом спалілі і дзяцей спалілі. Яна прысядзе на зямлю і хістаецца з боку на бок, люляе сваю бяду. Падымецца — і не ведае, куды ісці. Да каго?

Мы сышлі ў лес усе: тата, браты і я. Ніхто нас не агітаваў, не змушаў, мы — самі. Мама засталася толькі з каровай...».

*Алена Фёдараўна Кавалеўская, партызанка*

«Я нават не думала... У мяне была спецыяльнасць, патрэбная фронту. І я ні хвіліны не вагалася. Увогуле я мала тады сустракала людзей, якія хацелі перасядзець гэты час. Перачакаць. Адну памятаю... Маладую жанчыну, нашу суседку... Яна мне шчыра прызналася: "Я люблю жыццё. Я хачу пудрыцца і фарбавацца, я не хачу паміраць". Больш такіх не сустракала. Можа быць, яны проста не казалі, таіліся. Не ведаю, што вам адказаць...

Згадваю, што вынесла кветкі са свайго пакоя і папрасіла суседзяў:

— Палівайце, калі ласка. Я хутка вярнуся.

А вярнулася праз чатыры гады...

Дзяўчаты, якія заставаліся дома, нам зайздросцілі, а жанчыны плакалі. Адна з дзяўчат, якая ехала са мной,

стаіць, усе плачуць, а яна не. Потым узяла і памачыла сабе вочы. Раз-другі. Насоўкай. А то, маўляў, няёмка, усе плачуць. Хіба мы разумелі, што такое вайна? Маладыя... Гэта цяпер я прачынаюся ноччу ад страху, калі мне прысніцца, што я на вайне... Самалёт ляціць, мой самалёт, набірае вышыню і... падае... Я разумею, што я падаю. Апошнія хвіліны... І так страшна, пакуль не прачнешся, пакуль гэты сон не знікне. Стары чалавек баіцца смерці, а малады смяецца. Ён — бессмяротны! Я не верыла, што памру...»

*Ганна Сямёнаўна Дубровіна-Чакунова,*
*гвардыі старшы лейтэнант, лётчыца*

«Скончыла медвучэльню... Прыехала дамоў, у мяне хварэў бацька. І тут — вайна. Запомніла, што была раніца... Я пачула гэтую страшную навіну зранку... Яшчэ раса на лісці дрэваў не высахла, а ўжо сказалі — вайна! І вось гэтая раса, якую я раптам убачыла на траве і на дрэвах, так ясна ўбачыла — мне і на фронце прыпаміналася. Прырода не звяртала ўвагі на тое, што адбывалася з людзьмі. Ярка свяціла сонца... Квітнелі рамонкі, мае любімыя, іх было відзьма-нявідзьма на паплавах...

Памятаю, хаваемся недзе ў пшаніцы, дзень сонечны. Аўтаматы нямецкія та-та-та-та — і цішыня. Толькі чуеш, як шуміць пшаніца. Зноў нямецкія аўтаматы та-та-та-та... І думаеш: ці пачуеш яшчэ калі-небудзь, як пшаніца шуміць? Гэты шум...»

*Марыя Афанасьеўна Гарачук, ваенфельчарка*

«Эвакуявалі нас з мамай у тыл... У Саратаў... Недзе за тры месяцы вывучылася на токара. Па дванаццаць гадзінаў стаялі каля станкоў. Галадалі. У думках адно — трапіць на фронт, там харч які-ніякі. Будуць сухары і гар-

бата з цукрам. Дадуць масла. Ад каго мы гэта пачулі, не памятаю. Можа, ад параненых на станцыі? Ратаваліся ад голаду, ну і, ясна, мы былі камсамолкі. Пайшлі з сяброўкай у ваенкамат, але не сказалі, што працуем на заводзе. Тады б нас не ўзялі. А так запісалі.

Скіравалі ў Разанскую пяхотную вучэльню. Выйшлі адтуль камандзірамі кулямётных аддзяленняў. Кулямёт цяжкі. На сабе яго цягнеш. Як конь. Ноч. Стаіш на варце і ловіш кожны гук. Як рысь. Кожны шолах пільнуеш… На вайне, як кажуць, ты напалову чалавек, а напалову звер. Гэта так… Іншым чынам не выжыць. Калі будзеш толькі чалавек — не ацалееш. Галаву не ўратуеш. На вайне трэба нешта ўспомніць. Нешта такое… Згадаць штосьці з таго, калі чалавек яшчэ быў не зусім чалавек… Я не лішне адукаваная, звычайная бухгалтарка, але гэта ведаю.

Да Варшавы дабрыла… І ўсё пехатою, пяхота, як кажуць, пралетарыят вайны. На пузе паўзлі… Не пытайцеся болей у мяне… Не люблю я кніг пра вайну. Пра герояў… Ішлі мы хворыя, кашлялі, былі заспаныя, брудныя, дрэнна апранутыя. Часта галодныя… Але перамаглі!»

*Любоў Іванаўна Любчык,*
*камандзір узвода аўтаматчыкаў*

«Мой бацька, я ведала, забіты… Брат загінуў. І загінуць ці не загінуць — ужо не мела для мяне значэння. Шкада было толькі нашу маму. З прыгажуні яна адразу ператварылася ў старую жанчыну, моцна пакрыўджаную на лёс, яна не магла жыць без таты.

— Навошта ты ідзеш на вайну? — запытала яна.

— Адпомсціць за тату.

— Ён бы не вытрываў, каб убачыў цябе з вінтоўкай.

А тата мне ў дзяцінстве коскі заплятаў. Банты завязваў. Ён і сам любіў прыгожую апратку болей, чым мама.

Служыла я тэлефаністкай. Наймацней запомнілася, як камандзір крычаў у трубку: “Папаўнення! Прашу папаўнення! Патрабую папаўнення!”. І так кожны дзень…»

*Ульяна Восіпаўна Немзер,*
*сяржант, тэлефаністка*

«Я — не гераіня… Я была прыгожая дзяўчынка, мяне ў дзяцінстве песцілі…

Прыйшла вайна… Паміраць было неахвота. Страляць страшна, я ніколі не думала, што буду страляць. Ой, што вы! Я цемнаты баялася, густога лесу. Натуральна, звяроў баялася… Ой… Не ўяўляла, як гэта можна сустрэцца з ваўком ці дзіком. Нават сабак з дзяцінства баялася, маленькую мяне ўкусіла вялікая аўчарка, і я іх баялася. Ой, што вы! Такая я. А ў партызанах усяму навучылася… Страляць навучылася — з вінтоўкі, пісталета і кулямёта. І цяпер, калі трэба, пакажу. Згадаю. Нас нават вучылі, што трэба рабіць, калі няма ніякай іншай зброі, акрамя нажа ці рыдлёўкі. Цемры перастала баяцца. І звяроў… Але змяю абыду, да змеяў не прызвычаілася. Па начах у лесе часта вылі ваўчыцы. А мы сядзелі ў сваіх зямлянках — і нічога. Ваўкі злосныя, галодныя. У нас былі такія маленькія зямлянкі, як норы. Лес наш дом. Партызанскі дом. Ой, што вы! Я пачала баяцца лесу пасля вайны… Я цяпер ніколі не езджу ў лес…

Але ўсю вайну думала, што магла б прасядзець дома, каля мамы. Маёй прыгожай мамы, мама была вельмі прыгожая. Ой, што вы! Я б не адважылася… Сама — не. Не адважылася… Але… Нам сказалі… Горад захапілі немцы, і я даведалася, што я габрэйка. А да вайны мы ўсе жылі дружна: рускія, татары, немцы, габрэі… Былі

аднолькавыя. Ой, што вы! Нават не чула гэтага слова “жыды”, бо жыла з татам, мамай і кнігамі. Мы апынуліся адрынутымі, нас адусюль праганялі. Баяліся нас. Нават некаторыя нашыя знаёмыя не віталіся. Іх дзеці не віталіся. А суседзі нам казалі: “Пакіньце ўсе свае рэчы, яны ўсё роўна вам ужо не спатрэбяцца”. Да вайны мы з імі сябравалі. Дзядзька Валодзя, цётка Ганна… Ой, што вы!

Маму застрэлілі… Здарылася гэта за некалькі дзён да таго, як мы мусілі перабрацца ў гета. Усюды па горадзе віселі загады: габрэям не дазваляецца — рухацца па ходніках, стрыгчыся ў цырульні, купляць што-кольвек у краме… Нельга смяяцца, нельга спяваць… Ой, што вы! Мама да гэтага яшчэ не прызвычаілася, яна заўсёды была няўважлівая. Пэўна, не паверыла… Можа, яна зайшла ў краму? Ёй што-небудзь грубае сказалі, і яна засмяялася. Як прыгожая жанчына… Да вайны яна спявала ў філармоніі, яе ўсе любілі. Ой, што вы! Я ўяўляю… Калі б яна не была такая прыгожая… Наша мама… Была б яна са мной ці татам… Я ўвесь час пра гэта думаю… Чужыя людзі прынеслі нам яе ноччу, прынеслі мёртвую. Ужо без паліто і чаравікаў. Гэта быў жах. Страшная ноч! Страшная! Паліто і чаравікі нехта зняў. Сцягнуў залаты шлюбны пярсцёнак. Татаў падарунак…

У гета мы не мелі свайго дома, нас пасялілі на паддашак чужога дома. Тата ўзяў скрыпку, самая дарагая наша даваенная рэч, тата хацеў яе прадаць. У мяне была цяжкая ангіна. Я ляжала… Ляжала з высокай тэмпературай і не магла размаўляць. Тата хацеў купіць якіх прадуктаў, ён баяўся, што я памру. Памру без мамы… Без маміных словаў, без маміных рук. Я, такая пешчаная… Любімая… Чакала тры дні, пакуль знаёмыя не перадалі, што тату забілі… Сказалі, што гэта дзеля скрыпкі… Не ведаю, ці была яна каштоўная, тата, калі сыходзіў,

сказаў: “Добра, калі дадуць слоік мёду і кавалак масла”. Ой, што вы! Я — без мамы… Без таты…

Пайшла шукаць тату… Хацела знайсці яго хаця б мёртвага, каб мы былі ўдваіх. Была я бялявая, а не чорная, бялявыя валасы, бровы, і мяне ў горадзе ніхто не запыніў. Я прыйшла на кірмаш… І сустрэла там татавага сябра, ён жыў у вёсцы, у сваіх бацькоў. Таксама музыка, як і мой тата. Дзядзька Валодзя. Я ўсё яму распавяла… Ён пасадзіў мяне на воз, накрыў кажухом. На возе пішчалі парасяты, кудахталі куры, ехалі мы доўга. Ой, што вы! Да вечара ехалі. Я спала, прачыналася…

Так апынулася ў партызанах…»

*Ганна Іосіфаўна Струміліна, партызанка*

«Быў парад… Наш партызанскі атрад злучыўся з Чырвонай арміяй, і пасля парада нам сказалі, каб здалі зброю і ішлі адбудоўваць горад. А мы ніяк не маглі зразумець: як гэта — яшчэ не скончаная вайна, яшчэ толькі адна Беларусь вызваленая, а мы мусім скласці зброю. Кожная з нас хацела ваяваць далей. І мы прыйшлі ў ваенкамат, усе нашыя дзяўчаты… Я сказала, што я медсястра і прашу скіраваць мяне на фронт. Мне паабяцалі: “Добра, мы вас возьмем на ўлік, і калі вы будзеце патрэбныя, дык паклічам. А пакуль ідзіце і працуйце”.

Чакаю. Не выклікаюць. Зноў іду ў ваенкамат… І так шмат разоў… Нарэшце мне шчыра сказалі, што няма вольных вакансіяў, ужо даволі медыцынскіх сёстраў. Трэба завалы ў Мінску разабраць… Горад у руінах… Якія ў нас былі дзяўчаты, пытаеце? У нас была Чарнова, ужо цяжарная, яна несла міну на баку, дзе побач тахкала сэрцайка будучага дзіцяці. Вось і разбірайцеся з гэтым, што мы былі за людзі. Нам навошта пра гэта думаць, мы такімі былі. Нас выхавалі, што Радзіма і мы — гэта

адно і тое. Ці другая мая сяброўка, яна вадзіла па горадзе сваю дзяўчынку, а ў той пад сукеначкай цела было агорнутае ўлёткамі, і яна паднімала ручкі і скардзілася: “Мама, мне горача. Мама, мне горача”. А на вуліцах усюды немцы. Паліцаі. Немца яшчэ можна падмануць, а паліцая цяжка. Ён — свой, ён тваё жыццё ведае, тваё нутро. Твае думкі…

І нават вось дзеці… Іх мы забралі да сябе ў партызаны, але гэта ж дзеці. Як выратаваць? Вярнулі іх за лінію фронту, дык яны з дзіцячых дамоў уцякалі на фронт. Іх лавілі ў цягніках, па дарогах. Яны зноў беглі, і зноў на фронт.

Гісторыя яшчэ сотні гадоў будзе тлумачыць: што гэта такое? Што гэта былі за людзі? Вы ўяўляеце: цяжарная ідзе з мінай… Ну, чакала ж яна дзіця… Любіла, хацела жыць. І, вядома, баялася. Але ішла… Не дзеля Сталіна, а дзеля сваіх дзяцей. Іх будучага жыцця. Яна не хацела жыць на каленях. Схіліцца перад ворагам… Можа быць, мы былі сляпыя, і нават не буду адмаўляць, шмат мы тады не ведалі і не разумелі, але мы былі сляпыя і чыстыя адначасова. Мы складаліся з дзвюх частак, з двух жыццяў. Вы павінны гэта зразумець…»

*Вера Сяргееўна Раманоўская, партызанская медсястра*

«Пачыналася лета… Я скончыла медвучэльню. Атрымала дыплом. Вайна! Адразу выклікалі ў ваенкамат і загадалі: “Вось вам дзве гадзіны часу на зборы. Адпраўляем на фронт”. Я склала ўсё ў адзін невялічкі чамаданчык.

—Што вы ўзялі з сабой на вайну?

—Цукеркі.

—Як?

—Цэлы чамадан цукерак. У той вёсцы, якую мне пасля вучэльні прызначылі, далі пад’ёмныя. Грошы

былі, і я на ўсе грошы купіла цэлы чамадан шакаладных цукерак. Я ведала, што на вайне грошы мне не спатрэбяцца. А наверх паклала фотаздымак курса, дзе ўсе мае дзяўчаты. Прыйшла ў ваенкамат. Ваенкам пытае: "Куды вас накіраваць?". Я яму кажу: "А сяброўка мая куды пойдзе?". Мы з ёй разам у Ленінградскую вобласць прыехалі, яна працавала ў суседняй вёсцы за пятнаццаць кіламетраў. Ён смяецца: "Яна дакладна гэтак жа запытала". Узяў мой чамадан, каб паднесці да палутаркі, якая везла нас на станцыю: "Што ў вас там такое цяжкае?" — "Цукеркі. Цэлы чамадан". Ён змоўк. Перастаў усміхацца. Я бачыла, што яму не па сабе, неяк нават сорамна. Гэта быў немалады чалавек… Ён ведаў, куды мяне выпраўляе…»

*Марыя Васілеўна Ціхамірава, фельчарка*

«Мой лёс адразу вырашыўся…

У ваенкамаце вісела аб'ява: "Патрэбныя кіроўцы". І я скончыла курсы шафёраў… Шасцімесячныя… Нават не звярнулі ўвагі, што я настаўніца (да вайны ў педтэхнікуме вучылася). Каму на вайне патрэбныя настаўнікі? Патрэбныя салдаты. Нас шмат дзяўчат было, цэлы аўтабат.

Аднойчы на вучэннях… Я не магу гэта без слёз чамусьці згадваць… Была вясна. Мы адстраляліся і вярталіся назад. І я нарвала братак. Маленькі такі букецік. Нарвала і прывязала да штыка. Так і іду.

Вярнуліся ў лагер. Камандзір пашыхтаваў усіх і выклікае мяне. Я выходжу… І забылася, што ў мяне браткі на вінтоўцы. А ён пачаў сварыцца: "Салдат мусіць быць салдатам, а не аматарам кветак". Яму было незразумела, як гэта ў такіх абставінах можна пра кветкі думаць. Мужчыну было незразумела… Але я браткі не выкінула.

Я іх неўпрыкмет зняла і ў кішэню засунула. Мне за гэтыя браткі далі тры нарады па-за чаргой…

Іншы раз стаю на варце. У дзве гадзіны ночы прыйшлі мяняць, а я адмовілася. Адправіла зменшчыка спаць: "Ты днём пастаіш, а я зараз". Гатовая была прастаяць усю ноч, да світанку, каб адно паслухаць птушак. Толькі ноч нечым нагадвала ранейшае жыццё. Мірнае.

Калі нас адпраўлялі на фронт, ішлі па вуліцы, людзі стаялі сцяной: жанчыны, старыя, дзеці. І ўсе плакалі: "Дзяўчаткі ідуць на фронт". Нас быў цэлы батальён дзяўчат.

Я — за рулём… Збіраем пасля бою забітых, яны па полі параскіданыя. Усе маладыя. Хлопчыкі. І раптам — дзяўчына ляжыць. Забітая дзяўчына. Тут усе змаўкаюць…»

*Тамара Іларыёнаўна Давідовіч, сяржант, шафёр*

«Як я збіралася на фронт… Вы не дасцё веры… Думала, што ненадоўга. Хутка ворага пераможам! Узяла адну спадніцу, прычым улюбёную, дзве пары шкарпэтак і адны туфлі. З Варонежа адступалі, але помню, як мы забеглі ў краму і я купіла сабе яшчэ туфлі на высокіх абцасах. Добра памятаецца, што адступаем, усё чорнае, задымленае (але крама адчыненая — дзіва), і мне чамусьці заманіла купіць туфлі. Такія зграбныя туфлікі… І парфуму яшчэ купіла…

Цяжка адразу адмовіцца ад жыцця, якое да гэтага было. Не толькі сэрца, увесь арганізм пратэстуе. Я тады радасная выбегла з крамы з гэтымі туфлікамі. Узнёслая. А ўсюды дым… Грымоты… Я ўжо была на вайне, але пра вайну яшчэ думаць не хацела. Не верыла.

А вакол усё палала…»

*Вера Іосіфаўна Хорава, ваенны хірург*

## Пра побыт і быццё

«Марылі… Праглі ваяваць…

Пасялілі нас у вагоне, і пачаліся заняткі. Усё было інакш, чым нам уяўлялася дома. Трэба было рана падымацца, і ўвесь дзень ты на нагах. А ў нас яшчэ жыло ранейшае жыццё. Мы абураліся, калі камандзір аддзялення, малодшы сяржант Гуляеў, які меў толькі чатыры класы адукацыі, навучаў нас статуту і вымаўляў з памылкамі многія словы. Нам здавалася: чаму ён можа навучыць? А ён вучыў нас, як не загінуць…

Пасля каранціну, перад прысягай, старшына прывёз нам абмундзіраванне: шынялі, пілоткі, гімнасцёркі, замест камбінацый — з бязі пашытыя па-мужчынску дзве кашулі з рукавамі, замест анучаў панчохі і амерыканскія цяжкія чаравікі з жалезнымі падкоўкамі на ўвесь абцас і насок. У роце я апынулася самай маленькай па росце, сто пяцьдзясят тры сантыметры, абутак трыццаць пятага памеру, і, натуральна, ваенная прамысловасцю такія малыя памеры не шыліся, а ўжо тым болей Амерыка нам іх не дасылала. Я атрымала чаравікі сорак другога памеру, насоўвала і здымала іх не расшнуроўваючы, і такія яны цяжкія, што я ногі цягнула па зямлі. Ад майго страявога кроку па бетонным пляцы выкрэсваліся іскры, і гэта было падобным да чаго заўгодна, акрамя салдацкага кроку. Балюча нават згадваць, якім жахлівым быў першы марш. Я гатовая была да подзвігу, але не гатовая была насіць чаравікі сорак другога памеру. Гэта так цяжка і так непрыгожа! Так непрыгожа!

Камандзір пабачыў і абурыўся:

—Смірнова, што гэта за крок? Хіба цябе не вучылі? Чаму ты не падымаеш ногі? Тры нарады па-за чаргой…

— Слухаюся, таварыш старшы лейтэнант, тры нарады па-за чаргой! — развярнулася, каб ісці, і звалілася. Выпала з чаравікаў… Ногі былі да крыві сцёртыя… Тады і высветлілася, што хадзіць я ўжо не магла. Ротны шавец Паршын атрымаў загад пашыць мне боты трыццаць пятага памеру…»

*Нона Аляксандраўна Смірнова, радавая, зенітчыца*

«А колькі было смешнага…

Дысцыпліна, статуты, знакі адрознення — усё гэтае вайсковае мудрагельства засвойвалася не адразу. Стаім, ахоўваем самалёты. А ў статуце сказана, калі хто ідзе, трэба спыняць словамі: "Стой, хто ідзе?". Сяброўка мая пабачыла камандзіра палка і крычыць: "Стойце, хто ідзе? Вы мне прабачце, але буду страляць!". Уявіце гэта сабе. Яна крычыць: "Вы мне прабачце, але буду страляць!". Вы мне прабачце… Ха-ха-ха…»

*Антаніна Рыгораўна Бондарава,*
*гвардыі лейтэнант, старшы лётчык*

«Дзяўчаты прыехалі ў вучэльню з доўгімі косамі… З прычоскамі… У мяне таксама косы вакол галавы… А як іх прамыць? Сушыць дзе? Вы іх толькі памылі, а трывога, трэба бегчы. Наш камандзір Марына Раскава загадала ўсім косы зрэзаць. Дзяўчаты зрэзвалі і плакалі. А Ліля Літвяк, потым славутая лётчыца, ніяк не хацела заставацца без касы.

Я іду да Раскавай:

— Таварыш камандзір, ваш загад выкананы, толькі Літвяк адмовілася.

Марына Раскава, нягледзячы на сваю жаночую мяккасць, магла быць вельмі строгім камандзірам. Яна мяне жорстка паўшчувала:

—Які ты парторг, калі не здольная змусіць выканаць загад. Кругом, крокам руш!

Сукенкі, туфлікі на высокіх абцасах… Як нам шкада іх, у мяшэчкі пахавалі. Днём у ботах, а ўвечары хоць трохі ў туфліках перад люстэркам. Раскава ўбачыла — і праз некалькі дзён загад: усё жаночае адзенне адправіць дамоў у пасылках. Вось так! Затое новы самалёт мы вывучылі за паўгода замест двух гадоў, як гэта было ў мірны час.

У першыя дні трэніровак загінулі два экіпажы. Паставілі чатыры труны. Усе тры палкі, усе мы плакалі ад жалю.

Выступіла Раскава:

—Сябры, вытрыце слёзы. Гэта першыя нашыя страты. Іх будзе шмат. Сцісніце свае сэрцы ў кулак…

Потым, на вайне, хавалі без слёз. Перасталі плакаць.

Лёталі на знішчальніках. Сама вышыня была страшэннай нагрузкай для ўсяго жаночага арганізма, часам жывот наўпрост да хрыбціны прыціскала. А дзяўчаты нашыя лёталі і збівалі асаў, ды яшчэ якіх асаў! Вось так! Ведаеце, калі мы ішлі, на нас мужчыны глядзелі, як на дзіва: лётчыцы ідуць. Яны захапляліся намі…»

*Клаўдзія Іванаўна Церахава, капітан авіяцыі*

«Восенню мяне выклікалі ў ваенкамат… Сустрэў ваенкам і пытаецца: “Скакаць з дрэваў падабаецца?” Я шчыра сказала, што баюся. Доўга агітаваў за дэсантныя войскі: прыгожая форма, шакалад кожны дзень. Але я з дзяцінства баялася вышыні. “А мо жадаеце ў зенітную артылерыю?”. Хіба я ведала, што гэта такое — зенітная артылерыя? Тады ён прапаноўвае: “Давайце адашлем вас у партызанскі атрад”. — “А як адтуль маме

пісаць у Маскву?”. Тады ён крэмзае на маім накіраванні: “Стэпавы фронт…”.

У цягніку закахаўся ў мяне малады капітан. Усю ноч каля мяне прастаяў. Ён ужо быў апалены вайной, некалькі разоў паранены. Глядзеў-глядзеў на мяне і ўрэшце кажа: “Верачка, толькі трымайцеся, не рабіцеся грубай. Вы такая цяпер пяшчотная. Я ўжо шмат усяго пабачыў!”. І далей нешта ў тым жа сэнсе, маўляў, цяжка вярнуцца чыстым з вайны. З пекла.

Месяц дабіраліся мы з сяброўкай да чацвёртай гвардзейскай арміі Другога Украінскага фронту. Нарэшце прыехалі. Галоўны хірург выйшаў на некалькі хвілінаў, паглядзеў на нас, завёў у аперацыйную: “Вось ваш аперацыйны стол…”. Санітарныя машыны адна за другой пад’язджаюць, машыны вялікія, “студэбекеры”, параненыя ляжаць на зямлі, на насілках. Мы запыталіся толькі: “Каго браць першым?” — “Тых, хто маўчыць…”. Праз гадзіну я ўжо стаяла за сваім сталом, аперавала. І пачалося… Працуеш суткамі, пасля трохі прыснеш, хуценька пратрэш вочы, памыешся — і зноў за свой стол. Праз два чалавекі трэці — мёртвы. Не паспявалі ўсім дапамагчы. Трэці — мёртвы…

На станцыі ў Жмерынцы трапілі пад жахлівую бамбёжку. Цягнік спыніўся, і мы пабеглі. Зампаліт наш, учора яму выразалі апендыцыт, а сёння ўжо бег. Усю ноч прасядзелі ў лесе, а цягнік наш разнесла на кавалкі. Пад раніцу нямецкія самалёты пачалі скідаць бомбы на лес. Куды падзецца? У зямлю, як крот, не схаваешся. Я абхапіла бярозу і стаю: “Мама-мамачка! Няўжо я загіну? Выжыву, буду самым шчаслівым чалавекам на свеце”. Каму потым ні апавядала, як за бярозу трымалася, усе смяяліся. Ну, як у мяне не трапіць? Стаю на ўвесь рост, бяроза белая… Ваяка!

Дзень перамогі сустрэлі ў Вене. Мы паехалі ў заапарк, вельмі ў заапарк хацелася. Можна было паехаць у канцэнтрацыйны лагер, усіх вазілі, паказвалі. Не пагадзілася… Цяпер дзіўлюся, чаму? Відаць, хацелася чагосьці радаснага. Смешнага. Пабачыць нешта з іншага жыцця…»

*Вера Уладзіміраўна Шавалдышава,*
*старшы лейтэнант, хірург*

«Мы ваявалі ўтраіх… Мама, тата і я… Першым выправіўся на фронт тата. Мама хацела быць разам з татам, але яго на адзін фронт скіравалі, яе — на іншы. А мне толькі шаснаццаць гадоў… Мяне не хацелі браць. Я хадзіла-хадзіла ў ваенкамат, і праз год мяне ўзялі.

Мы доўга ехалі цягніком. Разам з намі вярталіся салдаты са шпіталяў, былі там і маладыя хлопцы. Яны распавядалі нам пра фронт, а мы слухалі, адкрыўшы рот. Казалі, што цягнік будуць абстрэльваць, і мы сядзім, чакаем: калі ж абстрэл пачнецца. Маўляў, прыедзем і скажам, што ўжо абстраляныя.

Прыехалі, а нас не да вінтовак, а да катлоў прыставілі, да ночваў. Дзяўчаты ўсе майго ўзросту, бацькі нас любілі, песцілі. Я была адзіным дзіцём у сям'і. А тут цягаем дровы, палім печы. Потым попел гэты бяром і ў катлы замест мыла, бо мыла не хапала. Бялізна брудная, вашывая. У крыві… Узімку цяжкая ад крыві…»

*Святлана Васілеўна Катыхіна, баец палявога*
*лазнева-пральнага атрада*

«Я дагэтуль памятаю свайго першага параненага… Твар памятаю… У яго быў адкрыты пералом сярэдняй трэціны сцягна. Уяўляеце, тырчыць костка, аскепкам вывернула. Гэтая костка… Я ведала тэарэтычна, што рабіць,

але калі да яго падпаўзла і вось гэта пабачыла, мне зрабілася млосна, мяне званітавала. І раптам чую: "Сястрыца, глыні вадзічкі". І гэта мне паранены кажа. Шкадуе. Я тую карціну як цяпер бачу. Як ён сказаў, я ачуняла: "Ах, думаю, чортава тургенеўская паненка! Чалавек гіне, а яе, далікатнае стварэнне, бачыце, званітавала". Разгарнула індывідуальны пакет, закрыла рану — і мне зрабілася лягчэй, і як трэба — дапамагла.

Гляджу цяпер фільмы пра вайну: медсястра на перадавой, акуратная, чысценькая, не ў ватных штанах, а ў спадніччы, у яе пілотачка на патыліцы. Ну, падман! Хіба мы маглі б выцягнуць параненага, каб былі такія... Не надта ў спадніцы напоўзаешся, калі адны мужчыны вакол. Насамрэч, спадніцы нам адно ў канцы вайны выдалі, як святочнае. Тады ж мы атрымалі і трыкатаж ніжні замест мужчынскай бялізны. Не ведалі, куды падзецца ад шчасця. Гімнасцёркі расшпілялі, каб відно было...»

*Сафія Канстанцінаўна Дубнякова,*
*старшы сяржант, санінструктарка*

«Бомбы і бомбы, бомбы і бомбы, бомбы і бомбы... Усе кінуліся некуды бегчы... І я бягу. Чую нечы стогн: "Дапамажыце... Дапамажыце...". Але бягу... Праз колькі хвілінаў нешта пачынае муляць, я адчуваю на плячы санітарную сумку. І яшчэ — сорам. Куды падзеўся страх! Бягу назад: стогне паранены салдат. Кідаюся да яго перавязваць. Затым другога, трэцяга...

Бой скончыўся ноччу. А зранку выпаў свежы снег. Пад ім забітыя... У многіх рукі паднятыя дагары... Да неба... Запытайцеся мяне: што такое шчасце? Я адкажу... Раптам знайсці сярод забітых — жывога чалавека...»

*Ганна Іванаўна Бяляй, медсястра*

«Пабачыла першага забітага… Стала над ім і плачу… Аплакваю… Тут паранены кліча: “Перавяжы нагу!”. Нага ў яго на калашыне боўтаецца, нагу адарвала. Адразаю калашыну, а ён: “Пакладзі мне нагу! Пакладзі побач!”. Паклала. Яны, калі ў свядомым стане, не дазваляюць пакінуць ні сваю руку, ні сваю нагу. Забіраюць. А калі паміраюць, просяць пахаваць разам.

На вайне думала: ніколі нічога не забуду. Але забываецца…

Малады такі, цікавы хлопец. І ляжыць забіты. Я ўяўляла, што ўсіх забітых хаваюць з ваеннымі рытуаламі, а яго падхапілі і пацягнулі да арэшніка. Выкапалі яміну… Без труны, без нічога паклалі ў зямлю, проста так засыпалі. Сонца ярка свяціла, і на яго таксама… Цёплы летні дзень… Не было ні плашч-палаткі, нічога, яго паклалі ў гімнасцёрцы, у галіфэ, як ён быў, і ўсё гэта яшчэ новае, ён, відаць, нядаўна тут апынуўся. Так паклалі і засыпалі. Ямінка была неглыбокая, адно каб ён лёг. І рана невялічкая, але смяротная — у скронь. Крыві мала, і чалавек ляжыць, як жывы, толькі моцна збялелы.

Пасля абстрэлу пачалося бамбаванне. Не ведаю, што там засталося ад гэтага месца…

А як у аблозе людзей хавалі? Тут жа, побач каля акопчыка, дзе мы самі сядзім, закапалі — і ўсё. Грудок адно застаўся. Яго, вядома, калі следам немцы прыйдуць ці танкі, тут жа і затопчуць. Проста зямля застанецца, ніякага следу. Часта закопвалі ў лесе пад дрэвамі… Пад дубамі, пад бярозамі…

Я ў лес дагэтуль не магу хадзіць. Асабліва, дзе растуць старыя дубы ці бярозы… Не магу там прысесці…»

*Вольга Васілеўна Корж,*
*санінструктарка кавалерыйскага эскадрона*

«На фронце ў мяне знік голас... Прыгожы голас...

Вярнуўся, толькі калі я прыехала дамоў. Увечары сабраліся сваякі, выпілі: “Ну, Верка, заспявай”. І я заспявала...

Выпраўлялася на фронт матэрыялісткай. Атэісткай. Харошай савецкай школьніцай паехала, якую правільна вучылі. А там... Там я пачала маліцца. Я заўсёды малілася перад боем, чытала свае малітвы. Словы простыя. Мае словы... Сэнс адзін, каб я вярнулася да мамы і таты. Сапраўдных малітваў я не ведала і Біблію не чытала. Ніхто не бачыў, як я малілася. Я — сам-насам. Хаваючыся малілася. Сцярожка. Таму што... Мы былі тады іншыя, тады жылі зусім іншыя людзі. Вы — разумееце? Мы думалі інакш, адчувалі інакш... Таму што... Я згадаю выпадак... Аднойчы сярод навабранцаў апынуўся вернік, і салдаты смяяліся, калі ён маліўся: “Ну што, табе твой Бог дапамог? Калі ён ёсць, дык як ён усё гэта трывае?”. Яны не давалі веры, як той чалавек, што крычаў каля ног укрыжаванага Хрыста, маўляў, калі Ён цябе любіць, дык чаму Ён цябе не ратуе? Пасля вайны я прачытала Біблію... Усё жыццё яе цяпер чытаю... І гэты салдат, ён быў ужо немалады мужчына, не хацеў страляць. Адмаўляўся: “Не магу! Я не буду забіваць!”. Усе пагадзаліся забіваць, а ён не. А час? Час які... Жахлівы час... Таму што... Аддалі пад трыбунал і праз два дні расстралялі... Бах! Бах!

Час іншы... Людзі іншыя... Як вам растлумачыць? Як...

На маё шчасце, я... Я не бачыла тых людзей, якіх забівала... Але... усё адно... Цяпер я разумею, што забівала. Думаю пра гэта... Таму што... Таму што старая зрабілася. Пра сваю душу турбуюся. Загадала дачцэ, каб пасля смерці ўсе мае ордэны і медалі не ў музей,

а ў царкву аднесла. Перадала бацюшку… Яны прыходзяць да мяне ў сне… Мёртвыя… Мае мёртвыя… Хаця я іх і не бачыла, але яны прыходзяць і глядзяць на мяне. Я шукаю-шукаю вачыма, можа, хто паранены, хай і цяжка паранены, але яшчэ магчыма выратаваць. Не ведаю, як сказаць… Толькі ўсе яны мёртвыя…»

*Вера Барысаўна Сапгір, сяржант, зенітчыца*

«Самае невыноснае для мяне былі ампутацыі… Часта такія высокія ампутацыі рабілі, што адрэжуць нагу, і я яе ледзьве трымаю, ледзьве нясу, каб пакласці ў таз. Помніцца, што яны вельмі цяжкія. Возьмеш ціхенька, каб паранены не чуў, і нясеш, як дзіця… Як немаўля… Асабліва, калі высокая ампутацыя, далёка за калена. Я не магла прызвычаіцца. Параненыя пад наркозам стогнуць ці брыдка лаюцца. Трохпавярховым рускім матам. Я заўсёды была ў крыві… Яна вішнёвая… Чорная…

Маме я нічога не пісала пра гэта. Я пісала, што ўсё добра, што я цёпла адзетая, абутая. Яна ж траіх на фронт адправіла, ёй было цяжка…»

*Марыя Селівестраўна Бажок, медсястра*

«Нарадзілася і вырасла я ў Крыме… Каля Адэсы. У сорак першым годзе скончыла дзясяты клас Слабадской школы Кардымскага раёна. Калі пачалася вайна, у першыя дні слухала радыё. Зразумела — адступаем… Пабегла ў ваенкамат, выправілі дахаты. Яшчэ двойчы хадзіла туды і двойчы адмаўлялі. Дваццаць восьмага чэрвеня адступалі праз нашу Слабодку войскі, і я разам з імі без усялякай позвы пайшла на фронт.

Як упершыню ўбачыла параненага, страціла прытомнасць. Потым звыклася. Калі першы раз палезла пад

кулі за байцом, крычала так, што, здавалася, мацней за грукат бою. Потым таксама звыклася. Праз дзесяць дзён мяне параніла, аскепак выцягнула сама, сама сябе перавязала...

Дваццаць пятага студзеня сорак другога года... Наша трыста трыццаць трэцяя дывізія пяцьдзясят шостай арміі заняла вышыню на подступах да Сталінграда. Вораг вырашыў яе любой цаной вярнуць. Пачаўся бой. На нас рушылі танкі, але іх спыніла артылерыя. Немцы вярнуліся назад, на нічэйнай зямлі застаўся паранены лейтэнант, артылерыст Косця Хлудаў. Санітараў, якія спрабавалі вынесці яго, забілі. Папаўзлі дзве аўчаркі-санітаркі (я іх там пабачыла ўпершыню), але іх таксама забілі. І тады я, зняўшы вушанку, стала на ўвесь рост і спачатку ціха, а потым усё мацней заспявала нашу ўлюбёную даваенную песню "*Я на подзвіг цябе выпраўляла*". Змоўкла ўсё з абодвух бакоў — і з нашага, і з нямецкага. Падышла да Косці, нагнулася, паклала на санкі-валакушы і пацягнула да нашых. Цягну, а сама думаю: «Толькі б не ў спіну, хай лепей у галаву страляюць». Вось зараз... зараз... Апошнія хвіліны майго жыцця... Зараз! Цікава: я адчую боль ці не? Як страшна, мамачка! Але не было ніводнага стрэлу...

Формы на нас было не запасціся: толькі што далі новенькую, а праз некалькі дзён яна ўся ў крыві. Мой першы паранены — старшы лейтэнант Бялоў, мой апошні паранены — Сяргей Пятровіч Трафімаў, сяржант мінамётнага ўзвода. У сямідзясятым годзе ён прыязджаў да мяне ў госці, і я паказала дочкам вялікі шнар, які і цяпер на ягонай галаве. Усяго з-пад агню я вынесла чатырыста восемдзесят аднаго параненага. Нехта з журналістаў падлічыў: цэлы стралковы батальён... Цягалі на сабе мужчын, у два-тры разы цяжэйшых за нас. А параненыя

яшчэ больш цяжкія. Яго самога цягнеш і ягоную зброю, а на ім яшчэ шынель, боты. Узваліш на сябе восемдзесят кіло і цягнеш. Скінеш… Вяртаешся за наступным, і зноў семдзесят-восемдзесят кілаграмаў. І так разоў пяць-шэсць за адну атаку. А ў цябе самой сорак восем кілаграмаў — балетная вага. Цяпер ужо не верыцца… Самой не верыцца…»

*Марыя Пятроўна Смірнова (Кухарская), санінструктарка*

«Сорак другі год… Кіруем у тыл да немцаў. Прамінулі лінію фронту, спыніліся каля нейкіх могілак. Немцы, мы ведалі, за пяць кіламетраў ад нас. Была ноч, але яны ўвесь час кідалі ў неба светлавыя ракеты. Парашутныя. Гэтыя ракеты трымаюцца доўга і асвятляюць далёка ўсю мясцовасць. Узводны прывёў мяне на край могілак, паказаў, адкуль страляюць ракетамі, дзе хмызняк, з якога могуць аб'явіцца немцы. Я не баюся мерцвякоў, з дзяцінства могілак не баялася, але мне было дваццаць два гады, я першы раз стаяла на варце… І за гэтыя дзве гадзіны я пасівела… Першыя сівыя валасы, цэлую пасму заўважыла ў сябе днём. Я стаяла і ўглядалася ў тыя хмызы, яны шаргаталі, рухаліся, мне здавалася, што адтуль выходзяць немцы… І яшчэ нехта… Нейкія пачвары… А я — адна…

Хіба гэта жаночая справа — стаяць ноччу на варце на ўскрайку могілак? Мужчыны прасцей да гэтага ставіліся, яны ў думках ужо гатовыя былі, што трэба будзе вартаваць, страляць… А для нас і на вайне гэта было як бы нечаканасцю. Ці рабіць пераходы ў трыццаць кіламетраў. З баявым рыштункам. У спякоту. Коні падалі…»

*Вера Сафронаўна Давыдава, радавы пехацінец*

«Ты пытаеш, што на вайне найстрашнейшае? Чакаеш ад мяне… Я ведаю, чаго ты чакаеш… Думаеш, я адкажу: найстрашнейшае на вайне — смерць. Памерці.

Ну, так? Ведаю я вашага брата… Усе гэтыя журналісцкія штучкі… Хі-хі-хі… Чаму не смяешся? Га?

А я іншае скажу… Найстрашнейшае для мяне на вайне — насіць мужчынскія трусы. Вось гэта было страшна. І гэта мне неяк… Не ведаю, як сказаць… Ну, па-першае, вельмі непрыгожа… Ты на вайне збіраешся памерці за Радзіму, а на табе мужчынскія трусы. Карацей, ты выглядаеш смешна. Недарэчна. Мужчынскія трусы тады насілі доўгія. Шырокія. Шылі з саціну. Дзесяць дзяўчат у нашай зямлянцы, і ўсе ў мужчынскіх трусах! О, Божа мой! Узімку і ўлетку. Чатыры гады.

Перакрочылі савецкую мяжу… Дабівалі, як казаў на палітзанятках наш камісар, звяругу ва ўласнай бярлозе. Каля першай польскай вёскі нас пераапранулі, выдалі новае абмундзіраванне і… І! І! І! Прывезлі ўпершыню жаночыя трусы і станікі. За ўсю вайну ўпершыню. Х-а-а… Ну, зразумела… Мы ўбачылі нармальную жаночую бялізну…

Чаму не рагочаш? Плачаш… Ну, чаму?»

*Лола Ахметава, радавы, стралок*

«Мяне на фронт не бралі… Толькі шаснаццаць гадоў, да сямнаццаці яшчэ далёка. А ўзялі ў нас фельчарку, ёй прынеслі позву. Яна моцна плакала, у яе дома хлопчык маленькі заставаўся. Я пабегла ў ваенкамат: “Вазьміце мяне замест яе”. Мама не пускала: “Ніна, ну колькі табе гадкоў? Можа, там і вайна хутка скончыцца”. Мама ёсць мама.

Байцы хто сухарык, хто цукру кавалачак пакіне. Бераглі. Я не ведала, што ў нас “кацюша” ёсць, схаваная

за намі стаіць. Пачала яна страляць, перуны і маланкі вакол, усё палае. І так гэта мяне ўразіла, так я спалохалася гэтых грымотаў, агню, гуду, што ўпала ў лужыну, пілотку згубіла. Байцы рагочуць: "Ты што, Нінок? Ты што, мілая?".

Атакі ўрукапашную... Я што запомніла? Я запомніла хруст... Пачынаецца разаніна: і адразу гэты хруст — храсткі ламаюцца, косткі чалавечыя трашчаць. Звярыны рык... Калі атака, я з байцамі іду, але трошкі ззаду, лічы — побач. Усё на маіх вачах... Мужчыны заколваюць адзін аднаго. Дабіваюць. Даломваюць. Цэляць штыком у рот, у вока... У сэрца, у жывот... І гэта... Як выказаць? Я не змагу... Не разумею як... Інакш кажучы, жанчыны не ведаюць такіх мужчын, яны іх такімі дома не бачаць. Ні жанчыны, ні дзеці. Жудасна ўвогуле робіцца...

Пасля вайны вярнулася дамоў у Тулу. Па начах увесь час крычала. Ноччу мама з сястрой сядзелі каля мяне... Я прачыналася ад уласнага крыку...»

*Ніна Уладзіміраўна Кавяленава, старшы сяржант, санінструктарка стралковай роты*

«Апынуліся мы пад Сталінградам... Там смяротныя баі працягваліся. Самае смяротнае месца... Вада і зямля былі чырвонымі... І вось з аднаго берага Волгі нам трэба перабрацца на другі. Нас ніхто бачыць не хоча: "Што? Дзяўчаты? На халеру вы тут патрэбныя! Нам стралкі і кулямётчыкі патрэбныя, а не сувязісткі". А нас шмат, восемдзесят чалавек. Пад вечар дзяўчат, якія вышэйшымі ростам былі, узялі, а нас удзвюх з адной дзяўчынай не бяруць. Малыя. Не дараслі. Вырашылі ў рэзерве пакінуць, але я такі енк усчала...

У першым баі афіцэры сцягвалі мяне з бруствера, я высоўвала галаву, каб усё самой бачыць. Нейкая

цікаўнасць была, дзіцячая цікаўнасць… Наіў! Камандзір крычыць: “Радавая Сямёнава! Радавая Сямёнава, ты з глузду з'ехала, трасца на цябе… Заб'е ж!”. Гэтага я зразумець не магла: як мяне можа забіць, калі я толькі што прыехала на фронт? Я яшчэ не здагадвалася, якая смерць абыякавая і непераборлівая. Яе не ўпросіш, не ўгаворыш.

Падвозілі на старых палутарках народнае апалчэнне. Старых і хлопчыкаў. Ім выдавалі па дзве гранаты і выпраўлялі ў бой без вінтоўкі, вінтоўку трэба было здабыць у баі. Пасля бою і перавязваць не было каго… Усе забітыя…»

*Ніна Аляксееўна Сямёнава, радавая, сувязістка*

«Я вайну прайшла з канца ў канец…

Першага параненага цягнула, у самой ногі згіналіся… Цягну і шапчу: “Толькі б не памёр… Толькі б не памёр”. Перавязваю яго і плачу, і нешта кажу яму пяшчотнае. А побач праходзіць камандзір. І ён крычыць на мяне, нават нейкае такое з мацюкамі…

—Чаму ён накрычаў на вас?

—Нельга было так шкадаваць, плакаць, як я. Дарэмна марную сілы, а параненых шмат.

Едзем, ляжаць забітыя, стрыжаныя, і галовы ў іх зялёныя, як бульба ад сонца. І рассыпаныя, як бульба… Як беглі, так і ляжаць па ўзараным полі… Як бульба…»

*Кацярына Міхайлаўна Рабчаева,*
*радавая, санінструктарка*

«Нават не скажу, дзе гэта было… У якім месцы… Адзін раз чалавек дзвесце ў гумне, а я адна. Параненых прывозілі адразу з поля бою, вельмі шмат. Было гэта ў нейкай вёсцы… Ну, не памятаю, столькі гадоў мінула…

Помню, што чатыры дні не спала, не прысела, кожны крычаў: "Сястра! Сястрычка! Дапамажы, міленькая!". Я бегала ад аднаго да другога, адзін раз спатыкнулася, упала і адразу заснула. Прачнулася ад крыку, камандзір, маладзенькі лейтэнант, таксама паранены, прыпадняўся на здаровы бок і крычыць: "Маўчаць! Маўчаць, я загадваю!". Ён зразумеў, што я без сілаў, а ўсе клічуць, ім балюча: "Сястра! Сястрычка!". Я як падскочыла, як пабегла — не разумеючы куды, чаго. І тады я першы раз, як трапіла на фронт, заплакала.

І вось… Ніколі не ведаеш свайго сэрца. Узімку вялі паўз нашую частку палонных нямецкіх салдатаў. Ішлі яны замёрзлыя, з парванымі коўдрамі на галовах, прапаленымі шынялямі. А мароз такі, што птушкі з неба падалі. Птушкі ў палёце замярзалі. У гэтай калоне быў адзін салдат… Хлопчык… У яго на твары льдзінкамі слёзы… А я везла на тачцы хлеб у сталоўку. Ён вачэй адвесці не можа ад гэтай тачкі, мяне не бачыць, толькі гэтую тачку. Хлеб… Хлеб… Я бяру і адломваю ад аднаго бохана і даю яму. Ён бярэ… Бярэ і не верыць… Не верыць… Не верыць!

Я была шчаслівая… Я была шчаслівая, што не магу ненавідзець. Я сама сабе тады здзівілася…»

*Наталля Іванаўна Сяргеева, радавая, санітарка*

# «АДНА Я ВЯРНУЛАСЯ ДА МАМЫ...»

Еду ў Маскву... Тое, што ведаю пра Ніну Якаўлеўну Вішнеўскую, пакуль займае некалькі радкоў у маім нататніку: у сямнаццаць гадоў пайшла на фронт, была санінструктарам у першым батальёне трыццаць другой танкавай брыгады пятай арміі. Удзельнічала ў знакамітай танкавай бітве пад Прохараўкай, дзе з абодвух бакоў — савецкага і нямецкага — сышліся тысяча дзвесце танкаў і самаходных гармат. Адна з самых вялікіх танкавых бітваў у сусветнай гісторыі.

Падказалі адрас школьныя следапыты з Барысава, якія сабралі вялікі матэрыял для свайго музея пра трыццаць другую танкавую брыгаду, якая вызваляла іх родны горад. Санінструктарамі ў танкавых войсках служылі звычайна мужчыны, а тут — дзяўчаты. Я адразу выправілася ў дарогу...

Пачынаю ўжо разважаць: як выбіраць сярод дзясяткаў адрасоў? Першы час запісвала ўсіх, каго сустракала. Перадавалі мяне па ланцужку, тэлефанавалі адна адной. Запрашалі на свае сустрэчы, а то і проста да каго-небудзь на гарбату з пірагамі. Я пачала атрымліваць лісты з усёй краіны, адрас таксама перадаваўся па франтавой пошце. Пісалі: «Ты ўжо наша, ты ўжо таксама франтавая дзяўчынка». Неўзабаве я зразумела: немагчыма запісаць усіх, патрэбны нейкі іншы прынцып адбору і пошуку. Які? Сістэматызаваўшы ўсе адрасы, сфармулявала яго для сябе наступным чынам: найперш запісваць жанчын розных вайсковых прафесіяў. Бо кожны з нас бачыць жыццё праз сваю справу, праз сваё месца ў жыцці ці падзеі, у якіх удзельнічае. Бадай

будзе слушна памеркаваць, што медсястра бачыла адну вайну, пекарка — другую, дэсантніца — трэцюю, лётчыца — чацвёртую, камандзір узвода аўтаматчыкаў — пятую… У кожнай з іх быў на вайне як бы свой радыус бачнага: у адной — аперацыйны стол: «Столькі бачыла адрэзаных рук і ног… Нават не верылася, што недзе ёсць цэлыя мужчыны. Здавалася, што ўсе яны ці параненыя, ці загінулі…» (А. Дземчанка, старшы сяржант, медсястра); у другой — катлы паходнай кухні: «Пасля бою, бывала, нікога не заставалася… Кацёл кашы, кацёл супу наварыш, а няма каго карміць…» (І. Зініна, радавая, кухарка); у трэцяй — кабіна лётчыка: «Наш лагер стаяў у лесе. Я вярнулася з палёту і вырашыла схадзіць у лес, гэта ўжо сярэдзіна лета, суніцы паспелі. Пайшла па сцежцы і ўбачыла: ляжыць немец… Ужо счарнелы… Мяне ахапіў жах. Я ніколі да гэтага не бачыла забітых, а ўжо год ваявала. Там, наверсе, іншае… Калі ляціш, у цябе адна думка: знайсці цэль, адбамбаваць і вярнуцца. Нам не даводзілася бачыць мёртвых. Гэтага страху ў нас не было…» (А. Бондарава, гвардыі лейтэнант, старшы лётчык). А ў партызанкі вайна дагэтуль асацыюецца з пахамі вогнішча: «Усё на вогнішчы — і хлеб пяклі, і стравы гатавалі, вуглі застануцца — пакладзем кажухі, валёнкі сушыць. Начамі грэліся…» (А. Высоцкая).

Але доўга заставацца сам-насам са сваімі думкамі ў мяне не атрымліваецца. Правадніца прыносіць гарбату. Купэ тут жа шумна і весела знаёміцца. На стале з'яўляецца традыцыйная бутэлька «Маскоўскай», хатняя закуска, і пачынаецца, як зазвычай у нас, шчырая гамана. Пра свае сямейныя таямніцы і палітыку, пра любоў і нянавісць, пра кіраўнікоў і суседзяў.

Даўно зразумела, што мы — людзі дарогі і размовы… Я таксама выказваюся: да каго еду, навошта. Двое

з маіх спадарожнікаў ваявалі — адзін дайшоў да Берліна камандзірам сапёрнага батальёна, другі тры гады партызаніў у беларускіх лясах. Тут жа загаварылі пра вайну.

Потым я запісала нашу размову, як яна захавалася ў памяці:

—Нашае племя ўжо вымірае. Маманты! Мы — з пакалення, якое верыла, што ёсць у жыцці нешта большае, чым чалавечае жыццё. Радзіма ёсць і вялікая ідэя. Ну, і Сталін. Навошта хлусіць. З песні, як кажуць, слова не выкінеш.

—Гэта так... У нас у атрадзе была смелая дзяўчына... Хадзіла на чыгунку. Падрываць. Да вайны ў яе ўсю сям'ю рэпрэсавалі: бацьку, маці і двух старэйшых братоў. Яна жыла з цёткай, матчынай сястрой. З першых дзён вайны шукала партызанаў. У атрадзе бачылі — на злом галавы кідалася ў вайну... Хацела давесці... Усіх узнагароджвалі, а яе ні разу. Ніякага медаля не далі, бо бацькі — ворагі народа. Перад самым прыходам нашай арміі ёй нагу адарвала. Я наведаў яе ў шпіталі... Яна плакала... «Але цяпер, — казала, — мне ўсе дадуць веры». Прыгожая была...

—Калі да мяне прыйшлі дзве дзяўчынкі, камандзіры сапёрных узводаў, нейкі дурань скіраваў з аддзела кадраў, я тут жа адправіў іх назад. Яны былі моцна незадаволеныя. Хацелі трапіць на перадавую і рабіць мінныя праходы.

—Чаму ж вы ім адмовілі?

—З розных прычынаў. Першая — у мяне было даволі здольных сяржантаў, якія маглі зрабіць тое, дзеля чаго прыслалі гэтых дзяўчат, другая — я лічыў, што няма чаго жанчыне лезці на пярэдні край. У пекла. Хапае нас, мужыкоў. Яшчэ я ведаў, што трэба будзе будаваць ім асобны бліндаж, абстаўляць іх камандную дзейнасць

шэрагам умоўнасцяў, звязаных з рознымі жаночымі справамі. Шмат непатрэбшчыны.

—Значыць, вы лічыце, што жанчыне не месца на вайне?

—Калі ўзгадаць гісторыю, дык ва ўсе часы руская жанчына не толькі праводзіла на бітву мужа, брата, сына, гаравала і чакала іх. Яшчэ княжна Яраслаўна падымалася на крапасны мур і ліла расплаўленую смалу на галовы ворагаў. Але ў нас, у мужчынаў, было пачуццё віны, што дзяўчаты ваююць, і яно ў мяне засталося. Згадваю, мы адступаем. А гэта восень, дажджы дзень і ноч. Каля дарогі ляжыць забітая дзяўчына… У яе доўгая каса, і яна ўся ў брудзе…

—Гэта так… Калі я чуў, што нашыя медыцынскія сёстры, трапіўшы ў аблогу, стралялі, баронячы параненых, бо яны бездапаможныя, як дзеці, я гэта разумеў. А цяпер такая карціна: дзве жанчыны паўзуць па нейтральнай зямлі са «снайперкай» кагосьці забіваць. Ну вось… Не магу адсланіцца ад думкі, што гэта ўсё ж такі «паляванне». Я сам страляў, дык я ж мужчына…

—Але яны абаранялі родную зямлю? Ратавалі айчыну…

—Ну так… У разведку з такой, можа быць, і пайшоў, але замуж не ўзяў бы. Ну так… Мы звыкліся думаць пра жанчыну як пра маці і нявесту. Прыўкрасную пані, урэшце. Мой малодшы брат распавядаў, як вялі па горадзе палонных немцаў, ну і яны, хлопчыкі, стралялі па калоне з рагатак. Маці пабачыла і дала яму кухталя. А ішлі малакасосы, з тых, каго Гітлер апошнімі падбіраў. Брату было сем гадоў, але ён запомніў, як маці глядзела на гэтых немцаў і плакала: «Каб асляплі вашыя мацеры, калі яны вас такіх на вайну адпусцілі!». Вайна — справа мужчынская. Мужчынаў хіба мала, пра якіх можна напісаць?

—Н-не... Я — сведка. Не! Згадаем катастрофу першых месяцаў вайны: авіяцыя ўся была зніштожаная на зямлі, нашыя танкі гарэлі як карабкі запалак. Вінтоўкі старыя. Мільёны салдатаў і афіцэраў трапілі ў палон. Некалькі мільёнаў! Праз паўтара месяца Гітлер ужо быў пад Масквой... Прафесары запісваліся ў апалчэнне. Старыя прафесары! І дзяўчаткі спяшаліся на фронт з уласнай волі, а баязлівец сам ваяваць не пойдзе. Гэта былі смелыя, незвычайныя дзяўчаткі. Ёсць статыстыка: страты сярод медыкаў перадавога краю займаюць другое месца пасля стратаў у стралковых батальёнах. У пяхоце. Што такое, прыкладам, вывалачы параненага з бою? Я вам зараз распавяду...

Мы падняліся ў атаку, а нас давай касіць з кулямётаў. І батальёна не стала. Усе палеглі. Не ўсе былі забітыя, шмат параненых. Немцы малоцяць, агню не спыняюць. Зусім нечакана для ўсіх з траншэі выскоквае спачатку адна дзяўчына, потым другая, трэцяя... Яны сталі перавязваць і адцягваць параненых, нават немцы на нейкі час спынілі страляніну ад здзіўлення. Да дзесяці вечара ўсе дзяўчаты былі цяжка параненыя, але кожная выратавала як найменей два-тры чалавекі. Узнагароджвалі іх нячаста, на пачатку вайны ўзнагародамі не раскідваліся. Выцягнуць параненага трэба было з яго ўласнай зброяй. Першае пытанне ў медсанбаце: дзе зброя? Тады яе яшчэ не хапала. Вінтоўку, аўтамат, кулямёт — гэта таксама трэба было цягнуць. У сорак першым быў выдадзены загад нумар дзвесце восемдзесят адзін аб узнагародах за выратаванне салдатаў: за пятнаццаць цяжкапараненых, вынесеных з поля бою разам з уласнай зброяй, — медаль «За баявыя заслугі», за выратаванне дваццаці пяці чалавек — ордэн Чырвонай Зоркі, за выратаванне сарака — ордэн Чырвонага

Сцяга, за выратаванне васьмідзесяці — ордэн Леніна. А я ўжо згадваў, што значыла выратаваць у баі хаця б аднаго... З-пад куляў...

—Гэта так, безумоўна... Я таксама памятаю... Паслалі нашых разведчыкаў у вёску, дзе стаяў нямецкі гарнізон. Двое пайшлі... Следам яшчэ адзін... Ніхто не вярнуўся. Камандзір выклікае адну з нашых дзяўчат: «Люся, ты пойдзеш». Апранулі яе як пастушку, вывелі на дарогу... А што рабіць? Якое выйсце? Мужчыну заб'юць, а жанчына, можа, і пройдзе. Гэта так... Але бачыць у руках жанчыны вінтоўку...

—Дзяўчына вярнулася?

—Прозвішча забыў... Помніцца імя — Люся. Яна загінула... Гэта потым вяскоўцы нам сказалі...

Усе на нейкі час змоўклі. Затым гучыць тост за загіблых. Гутарка збочвае ў зусім іншым кірунку — абмяркоўваюць Сталіна, як ён знішчыў напярэдадні вайны найлепшыя камандзірскія кадры, вайсковую эліту. Потым успамінаюць бязлітасную калектывізацыю і трыццаць сёмы год. Лагеры і высылкі. Разважаюць, што без трыццаць сёмага, можа, не было б і сорак першага. Не адступалі б да Масквы. Але пасля вайны забыліся пра гэта. Усё засланіла Перамога.

—А каханне было на вайне? — пытаюся.

—Сярод франтавых дзяўчат я сустракаў шмат прыгожых, толькі мы не бачылі ў іх жанчын. Хаця, як на мой погляд, гэта былі цудоўныя дзяўчаты. Але яны былі проста нашыя сяброўкі, якія вывалаквалі нас з поля бою. Ратавалі, лекавалі. Мяне двойчы выцягвалі параненага. Як я мог да іх інакш ставіцца? Вы маглі б выйсці замуж за брата? Мы называлі іх сястрычкамі.

—А пасля вайны?

— Скончылася вайна, яны апынуліся страшэнна безабароннымі. Вось мая жонка — разумная жанчына, але і яна да вайсковых дзяўчат дрэнна ставіцца. Лічыць, што яны ехалі на вайну па жаніхоў, што ўсе круцілі там раманы. Хаця насамрэч, у нас жа шчырая размова, найбольш гэта былі беззаганныя дзяўчаты. Чыстыя. Але пасля вайны… Пасля бруду, пасля вошай, пасля смерцяў… Хацелася нечага адметнага. Светлага. Прыгожых жанчын… У мяне быў сябра, яго на фронце кахала адна цудоўная, як я цяпер разумею, дзяўчына. Медсястра. Але ён з ёю не пабраўся шлюбам, дэмабілізаваўся і знайшоў сабе іншую, больш прыкметную. Але нічога добрага з гэтага не атрымалася. Цяпер ён згадвае тое, сваё вайсковае каханне, яна была б яму сябрам. А пасля фронту ён яе пакінуў, бо чатыры гады бачыў яе толькі ў стаптаных ботах і мужчынскай фуфайцы. Мы праглі хутчэй забыцца на вайну. І дзяўчат нашых таксама забылі…

— Ну што тут казаць… Былі ўсе маладыя. Хацелася жыць…

Так ніхто і не заснуў у тую ноч. Прагаманілі да раніцы.

…Адразу з метро трапляю ў ціхі маскоўскі дворык. З пясочніцай і дзіцячымі арэлямі. Іду і згадваю здзіўлены голас па тэлефоне: «Прыехалі? І адразу да мяне? Удакладняць у Савеце ветэранаў нічога не будзеце? У іх ёсць усе звесткі пра мяне, яны правераныя». Я нават разгубілася. Раней думала, што перажытыя пакуты робяць чалавека вольным, ён належыць ужо толькі самому сабе. Яго абараняе ўласная памяць. Цяпер заўважаю — не, не заўсёды. Часам гэтае веданне і нават звышведанне (у звычайным жыцці такога няма) існуе асобна, як нейкі недатыкальны запас ці як драбкі золата ў шматслойнай рудзе. Трэба доўга адсейваць пустую

пароду, поркацца разам у наносах мітусні, і нарэшце — выблісне. Як падарунак!

—Дык якія мы насамрэч — з чаго выштукаваныя, з якога матэрыялу? Якая ў яго трываласць, хачу зразумець. За гэтым і прыйшла...

Дзверы адчыняе невысокая поўная жанчына. Адну руку па-мужчынску працягвае мне дзеля вітання, за другую трымаецца маленькі ўнук. Паводле яго спакойнай і звыклай цікаўнасці разумею, што гасцей у гэтым доме бывае шмат. Іх тут чакаюць.

У вялікім пакоі свабодна, амаль няма мэблі. На саматробнай паліцы кнігі, пераважна ваенныя мемуары, шмат павялічаных франтавых фотаздымкаў, вісіць на ласіным рагу танкавы шлем, на паліраваным століку шэраг маленькіх танкаў з дарункавымі надпісамі: «Ад воінаў Н-скай часткі», «Ад курсантаў танкавай вучэльні»... Побач са мной на канапе «сядзяць» тры лялькі — у вайсковай форме. І нават шторы і шпалеры ў пакоі мілітарных колераў.

Я разумею, што тут вайна не скончылася і не скончыцца ніколі.

*Ніна Якаўлеўна Вішнеўская, старшына, санінструктарка танкавага батальёна:*

«З чаго пачаць? Я табе тут нават тэкст падрыхтавала... Ну добра, буду казаць ад душы. Вось як яно было... Распавяду, як сяброўцы...

Пачну з таго, што ў танкавыя войскі дзяўчат бралі без ахвоты. Можна нават сказаць, што амаль зусім не бралі. Як я туды трапіла? Жылі мы ў горадзе Канакава Калінінскай вобласці. Я толькі паспела здаць экзамены за восьмы клас і перайсці ў дзявяты. Ніхто тады не ўяўляў, што такое вайна, для нас гэта была нейкая

гульня, нешта кніжнае. Мы выхоўваліся на рамантыцы рэвалюцыі, на ідэалах. Верылі газетам: вайна хутка скончыцца нашай перамогай. Ну вось-вось…

Жыла наша сям'я ў вялікай камунальнай кватэры, там было шмат сем'яў, і кожны дзень выпраўляліся на вайну суседзі: дзядзька Пеця, дзядзька Вася. Мы іх праводзілі, і нам, дзецям, было нават цікава. Мы ішлі за імі да самага цягніка… Гучала музыка, жанчыны плакалі, але ўсё гэта нас не палохала, а, хутчэй, узрушала. Духавы аркестр заўсёды граў марш "Развітанне славянкі". Марылася заскочыць у цягнік і таксама паехаць. Пад гэтую музыку. Вайна, як нам уяўлялася, была недзе далёка. Мне, напрыклад, падабаліся вайсковыя гузікі, іхні бляск. Я ўжо хадзіла на курсы сандружынніц, але ўсё гэта неяк па-дзіцячы ўспрымалася. Як гульня. Потым закрылі школу, і нас мабілізавалі на падрыхтоўку абарончых умацаванняў. Засялілі ў хлявы, у чыстым полі. Мы нават ганарыліся, што едзем рабіць нейкую справу, звязаную з вайной. Залічылі нас у батальён слабасільных. Працавалі з васьмі раніцы да васьмі вечара, па дванаццаць гадзін у суткі. А былі ўсе дзяўчаты і хлопчыкі пятнаццаці-шаснаццаці гадоў… І вось аднойчы падчас працы чуем галасы: хто крычаў "Самалёты!", хто крычаў "Немцы!". Дарослыя пабеглі хавацца, а нам цікава — што такое нямецкія самалёты, што такое немцы? Яны праляцелі далей, мы нічога не паспелі разгледзець. Нават пачуліся расчараванымі… Праз нейкі час яны вярнуліся і ляцелі ўжо ніжэй. Усе пабачылі чорныя крыжы. Страху ніякага не было, зноў адна цікаўнасць. Раптам яны абрынулі на нас кулямётны агонь, і на нашых вачах падалі аднакласнікі, з якімі мы вучыліся і працавалі. Мы здранцвелі і ніяк не маглі зразумець: што гэта такое? Стаялі і глядзелі… Як укапаныя… І ўжо дарослыя

падбеглі да нас і пакідалі на зямлю, а ў нас страху ўсё роўна не было…

Неўзабаве немец падышоў зусім блізка да горада, недзе кіламетраў за дзесяць быў, чулася гарматная кананада. Мы з дзяўчатамі пабеглі ў ваенкамат: ну, таксама трэба ісці бараніць, быць разам. Ніякіх сумневаў. Але бралі не ўсіх, бралі дзяўчат цягавітых, моцных, і найперш тых, хто меў васямнаццаць гадоў. Добрых камсамолак. Нейкі капітан адбіраў для танкавай часткі. Мяне, натуральна, ён адхіліў, паколькі мне было сямнаццаць і я мела ўсяго метр шэсцьдзесят.

— Пехацінца параніць, — тлумачыў мне капітан, — ён на зямлю ўпадзе. Можна да яго падпаўзці, на месцы перавязаць ці куды падалей адцягнуць. А танкіст іншае… Калі яго параніць у танку, дык яго адтуль трэба выцягнуць праз люк. А хіба ты зможаш? Ты ведаеш, якія танкісты ўсе мацакі? Калі на танк у баі даводзіцца лезці, па ім страляюць, кулі, аскепкі лятуць. А ты ведаеш, што гэта такое, калі танк гарыць?

— Дык хіба я таксама не камсамолка, як усе? — я стала плакаць.

— Ты, зразумела, таксама камсамолка. Толькі вельмі маленькая.

А маіх сяброўак, з якімі я вучылася на курсах сандружынніц і ў школе, — яны былі рослыя, моцныя дзяўчаты, — іх узялі. Мне было крыўдна, што яны едуць, а я застаюся.

Бацькам я, вядома, нічога не сказала. Прыйшла праводзіць, і дзяўчаты мяне пашкадавалі: схавалі ў кузаве пад брызентам. Ехалі на адкрытай палутарцы, сядзім усе ў розных хустках — у каго чорная, у каго сіняя, чырвоная… А ў мяне маміна кофта замест хусткі. Як быццам не на вайну сабралася, а на канцэрт

мастацкай самадзейнасці. Відовішча! Ну, кіно... Цяпер без смеху не згадаць... Шура Кісялёва нават гітару з сабой узяла. Едзем, ужо сталі бачныя акопы, салдаты заўважылі нас і крычаць: "Артысты прыехалі! Артысты прыехалі!".

Спыніліся каля штаба, капітан даў каманду пашыхтавацца. Выраўняліся ўсе, я апошняя стала. Дзяўчаты з рэчамі, а я так. Паколькі нечакана паехала, то нічога ў мяне не было. Шура дае мне сваю гітару: "Ну што ты будзеш без нічога".

Выходзіць начальнік штаба, капітан дакладвае:

—Таварыш падпалкоўнік! Дванаццаць дзяўчат прыбылі вам у падначаленне дзеля праходжання службы.

Той паглядзеў:

—Тут жа не дванаццаць, а цэлых трынаццаць.

Капітан сваё:

—Ды не, дванаццаць, таварыш падпалкоўнік, — настолькі ён быў пэўны, што дванаццаць. А калі азірнуўся, дык адразу да мяне: — Ты адкуль узялася?

Я адказваю:

—Ваяваць прыехала, таварыш капітан.

—Падыдзі сюды!

—Я разам з сяброўкай прыехала...

—З сяброўкай трэба хадзіць на танцы. А тут — вайна. Марш сюды, бліжэй.

Як была ў мяне маміна кофта на галаве, так я і падышла да іх. Паказваю пасведчанне сандружынніцы. Пачынаю ўпрошваць:

—Вы не сумнявайцеся, дзядзечкі, я моцная. Я медсястрой працавала... Я кроў здавала... Калі ласка...

Прагледзелі яны ўсе мае дакументы, і падпалкоўнік загадаў:

—Адправіць дамоў! З першай машынай!

А пакуль з'явіцца машына, часова прызначылі мяне ў медсанбат. Я рабіла марлевыя тампоны. Як толькі пабачу, што да штаба едзе якая машына, адразу — у лес. Хаваюся там гадзіну-дзве, яна паехала — вяртаюся. І так тры дні, пакуль наш батальён не быў кінуты ў бой. Першы танкавы батальён трыццаць другой танкавай брыгады. Усе пайшлі ваяваць, а я рыхтавала зямлянкі для параненых. Паўгадзіны не прамінула, як іх пачалі прывозіць… І забітых… У гэтым баі загінула і адна наша дзяўчына. Ну, усе і забылі, што мяне трэба адправіць дамоў. Звыкліся. Начальства ўжо не згадвала…

Далей што? Далей патрэбнае вайсковае адзенне. Далі нам рэчавыя мяшкі, каб мы ўсё сваё туды склалі. Новенькія рэчмяшкі. Я лямкі адрэзала, донца распарола і надзела на сябе. Атрымалася армейская спадніца. Знайшла недзе гімнасцёрку не вельмі парваную, падперазалася папругай і вырашыла пахваліцца перад дзяўчатамі. І толькі я перад імі пакруцілася, як у нашую зямлянку заходзіць старшына, а за ім камандзір часці.

Старшына:

—Зва-жай!

А затым:

—Таварыш падпалкоўнік, дазвольце звярнуцца! З дзяўчатамі праблема. Я ім рэчмяшкі выдаў, а яны самі туды залезлі.

І тут мяне пазнаў камандзір часткі:

—А, дык гэта ты. "Заяц"! Ну што ж, старшына, трэба абмундзіраваць дзяўчат.

Што мы атрымалі? У танкістаў брызентавыя штаны, ды яшчэ з накладкай на каленях, а нам далі тонкія, як з паркалю, камбінезоны. А зямля напалову з жалезам перамяшаная, камяні ўсе павывarочаныя — зноў мы абадраныя ходзім, бо не ў машыне сядзім, а па гэтай

зямлі поўзаем. Танкі часта гарэлі. Танкіст, калі застанецца жывы, увесь у апёках. І мы абгаралі, бо выцягваеш з танка абгарэлага, у агонь лезеш. Гэта праўда… Вельмі цяжка чалавека выцягнуць з люка, асабліва стралка з танкавай вежы. А мёртвы чалавек цяжэйшы за жывога. Нашмат. У гэтым я хутка ўпэўнілася…

Ніхто нас не вучыў, як разрозніваць званні, а старшына ўвесь час папярэджваў, што цяпер мы сапраўдныя салдаты і павінныя вітаць першымі кожнага, хто старэйшы за нас па званні, хадзіць падцягнутымі, шынель зашпілены на ўсе гузікі.

А салдаты, бачачы нашую маладосць, любілі пажартаваць. Паслалі мяне аднойчы з медсанузвода па гарбату. Я прыходжу да кухара. Ён на мяне глядзіць:

—Чаго прыйшла?

Я кажу:

—Па гар-ба-ту…

—Яна яшчэ не згатаваная.

—А чаму?

—Кухары ў катлах мыюцца. Хутка памыюцца, будзем кіпень рабіць…

Я дала веры. Паставілася цалкам сур'ёзна. Узяла свае вёдры, вяртаюся. Сустракаю доктара:

—А чаго пустая ідзеш? Дзе гарбата?

—Ды кухары ў катлах мыюцца…

Ён за галаву схапіўся:

—Якія кухары ў катлах мыюцца?

Вярнуў мяне, добра аблаяў кухара, налілі мне два вядры гарбаты. Нясу яе, а насустрач ідуць начальнік палітаддзела і камандзір брыгады. Я тут жа згадала, як нас вучылі, што трэба першымі вітаць кожнага, бо мы радавыя байцы. А яны ідуць удвох. Як жа я іх дваіх буду вітаць? Іду і думаю. Зраўняліся, стаўлю вёдры, абедзве

рукі да галавы і кланяюся аднаму і другому. Яны ішлі, мяне не заўважалі, а тут аслупянелі ад здзіўлення:

—Хто цябе так вучыў чэсць аддаваць?

—Старшына вучыў, ён кажа, што кожнага трэба вітаць. А вы ўдвох разам…

Усё для нас, дзяўчат, у войску выглядала складаным. Вельмі цяжка было засвоіць знакі разрознення. Калі мы прыехалі ў войска, яшчэ былі ромбікі, кубікі, шпалы, і вось здагадайся, якое там званне. Скажуць — перадай пакет капітану. А як яго вылічыць? Пакуль шукаеш, нават слова "капітан" з галавы выскачыць. Прыходжу:

—Дзядзечка, а дзядзечка, мне дзядзечка загадаў перадаць вам вось гэта…

—Які яшчэ дзядзечка?

—А той, што заўсёды ў гімнасцёрцы ходзіць без кіцеля.

Запаміналася не тое, што гэты лейтэнант, а той капітан, нам запаміналася іншае: прыгожы ці непрыгожы, рыжы ці высокі. "А, той высокі!" — згадваеш.

Калі я ўбачыла абгарэлыя камбінезоны, абгарэлыя рукі, абгарэлыя твары… Я… Гэта дзіўна… Я страціла слёзы… Дар слёз, жаночы дар… Танкісты выскокваюць з вогненных машынаў, на іх усё гарыць. Дыміцца. У іх часта былі перабітыя рукі ці ногі. Гэта — цяжка параненыя. Ён ляжыць і просіць: памру — напішы маёй маме, напішы маёй жонцы… А я не ўмела. Я не ведала, як гэта некаму напісаць пра смерць…

Калі танкісты мяне саму падабралі з пакалечанымі нагамі і прывезлі ва ўкраінскае сяло, гэта было на Кіраваградчыне, гаспадыня хаты, дзе месціўся медсанузвод, загаласіла:

—Які ж маладзенькі хлопчык!…

Танкісты смяюцца:

—Які ж то хлопчык, бабка, то ж дівка!

Яна прысела каля мяне і аглядае:

—Яка ж то дівка? Яка ж то дівка? То ж хлопчык маладзенькі!

Я стрыжаная, у камбінезоне, у танкашлеме — хлопчык. Яна на палацях мне месца саступіла і нават парася закалола, каб я хутчэй паправілася. І ўсё шкадавала:

—Няўжо мужыкоў не хапіла, што дітэй такіх пабралі... Дівчаток...

Ад яе словаў, ад яе слёз на нейкі час мяне пакінула ўся мая мужнасць, стала сябе шкада, і маму шкада. Ну, што я тут раблю сярод мужчынаў? Я — дзяўчынка? А калі вярнуся без ног? Былі розныя думкі... Так, былі... Я не хаваю...

У васямнаццаць год на Курскай дузе мяне ўзнагародзілі медалём “За баявыя заслугі” і ордэнам Чырвонай Зоркі, у дзевятнаццаць год — ордэнам Айчыннай вайны другой ступені. Калі прыходзіла новае папаўненне, хлопцы ўсе былі маладыя, зразумела, яны дзівіліся. Ім гэтаксама па васямнаццаць-дзевятнаццаць гадоў, і яны насмешліва пыталіся: “А за што ты атрымала свае медалі?” ці “Няўжо ты была ў баі?”. Або жартавалі: “А кулі прабіваюць браню танка?”.

Аднаго такога я потым перавязвала на полі бою, пад абстрэлам, я і прозвішча яго запомніла — Шчэгалеватых. У яго была перабітая нага. Я яму шыну накладаю, а ён у мяне даравання просіць:

—Сястрычка, прабач, што я цябе тады пакрыўдзіў. Ты мне спадабалася, калі шчыра.

Што мы ведалі тады пра каханне? Калі што і было, дык школьная любоў, а яна яшчэ дзіцячая... Аднойчы мы патрапілі ў акружэнне. Рукамі ўкопваліся ў зямлю,

больш нічога ў нас не было. Ні рыдлёвак... Нічога... Нас з усіх бакоў ціснуць і ціснуць. Мы ўжо дамаўляемся: ноччу або праскочым, або загінем. Думалася, напэўна, загінем... Не ведаю, казаць пра гэта ці не казаць? Не ведаю...

Замаскаваліся. Сядзім. Чакаем ночы, каб усё-такі кінуцца ў прорву. Лейтэнант Міша Т., камбат быў паранены, і ён выконваў абавязкі камбата, гадоў яму было недзе з дваццаць, стаў згадваць, як ён любіў танчыць, граць на гітары. Потым пытаецца:

—Ты хоць пакаштавала?

—Што? Што пакаштавала? — А есці хацелася страшэнна.

—Не што, а каго... Бабу!

А да вайны пірожныя такія былі. З такой назвай.

—Н-е-е...

—І я таксама не каштаваў. Вот памрэш і не зведаеш, што такое каханне... Заб'юць нас ноччу...

—Ды пайшоў ты, дурань! — Я нарэшце дапяла, пра што ён.

Паміралі за жыццё, яшчэ не ведаючы, што такое жыццё. Пра ўсё толькі ў кнігах чыталі. Я кіно пра каханне вельмі любіла...

Санінструктары ў танкавых войсках гінулі хутка. Для нас месца ў танку не было. Прылепішся паўзверх брані, і толькі пра адно думка, каб не зацягнула ногі ў тракі. І трэба сачыць, дзе які танк падаб'юць... Саскочыць і туды бегчы, паўзці... На фронце нас было пяць сяброvак: Люба Ясінская, Шура Кісялёва, Тоня Бабкова, Зіна Латыш і я. Канакоўскія дзяўчаты — звалі нас танкісты. І ўсе сяброўкі загінулі...

Перад боем, у якім Любу Ясінскую забіла, мы з ёй сядзелі ўвечары, абняўшыся. Размаўлялі. Гэта быў со-

рак трэці год… Дывізія падышла да Дняпра. Яна мне раптам кажа: “Ты ведаеш, я заўтра загіну. Маю нейкае прадчуванне. Хадзіла да старшыны, прасіла даць новую бялізну, а ён пашкадаваў: ‘Ты ж нядаўна атрымлівала’. Пайшлі зранку папросім разам”. Я яе супакойваю: “Мы ўжо два гады з табой на фронце, нас самі кулі баяцца”. Але зранку яна ўсё-такі зацягнула мяне да старшыны, і мы выпрасілі ў яго пару новай бялізны. І вось у яе новая кашуля ніжняя. Бялюткая, з матузкамі такая… Яна ўся была залітая крывёю… Вось гэтае спалучэнне белага з чырвоным, з пунсовай крывёю, — да гэтай пары ў мяне ў памяці. Яна сабе так гэта і ўяўляла…

Мы неслі яе ўчатырох на плашч-палатцы, Люба была такая цяжкая. У нас у тым баі шмат народу палегла. Выкапалі вялікую брацкую магілу. Паклалі ўсіх, паклалі без трунаў, як заўсёды, а Любу зверху. Я ніяк не магла даць веры, што яе ўжо няма і я яе больш не пабачу. Думаю: хоць што-небудзь вазьму на памяць. А ў яе на руцэ быў пярсцёнак, які ён, залаты ці просты, — не ведаю. Я яго ўзяла. Хаця хлопцы мяне спынялі: не бяры, гэта дрэнная прыкмета. І вось калі ўжо сталі развітвацца, кожны паводле звычаю кідае жменю зямлі, я таксама кінула, і гэты пярсцёнак таксама паляцеў у магілу… Да Любы… І я тады ўзгадала, што яна яго вельмі любіла… У іх у сям’і бацька ўсю вайну адваяваў і жывым вярнуўся. І брат з вайны прыйшоў… Мужчыны вярнуліся… А Люба загінула…

Шура Кісялёва… Яна была самая прыгожая. Як актрыса. Згарэла. Шура хавала цяжка параненых у тарпе саломы, пачаўся абстрэл, салома загарэлася. Шура магла сама выратавацца, але тады трэба было кінуць параненых… Яна згарэла разам з імі…

Толькі нядаўна я даведалася, як загінула Тоня Бабкова. Яна засланіла ад аскепка міны любага чалавека. Аскепкі лятуць — гэта нейкія долі секунды… Як яна паспела? Яна выратавала Пецю Байчэўскага, яна яго кахала. І ён застаўся жывы.

Праз трыццаць гадоў Пеця Байчэўскі прыехаў з Краснадара. Знайшоў мяне. І ўсё гэта мне пераказаў. Мы з'ездзілі з ім у Барысаў і адшукалі тую паляну, дзе Тоня загінула. Ён узяў зямлю з яе магілы… Нёс і цалаваў…

Было нас пяць канакоўскіх дзяўчат… А я адна вярнулася да мамы…»

Нечакана для мяне пераходзіць на вершы:

Дзяўчынка смелая залазіць на браню,
Радзіму захінаючы сваю.
Не страшныя ёй кулі і гранаты —
Палаюць сэрцы мужныя ў дзяўчатаў.
Запомні гэтую някідкую красу,
Калі яе на плашч-палатцы панясуць…

Удакладняе, што склала гэты верш на фронце. Я ўжо ведаю, многія з іх там пісалі вершы. Яны і цяпер старанна перапісваюцца, захоўваюцца ў сямейных архівах — няўмелыя і шчымлівыя. Іх франтавыя альбомы, а мне іх паказваюць у кожным доме, часта нагадваюць звычайныя альбомы дзяўчатак. Толькі там — пра каханне, а тут — пра смерць.

«У мяне дружная сям'я. Добрая. Дзеці, унукі… Але я жыву на вайне, я ўвесь час там… Дзесяць гадоў таму свайго сябра Ваню Пазнякова расшукала. Мы думалі:

ён загінуў, а ён, выявілася, жывы. Ягоны танк — ён быў камандзірам — два нямецкія танкі пад Прахараўкай знішчожыў, але і ягоны падпалілі. Экіпаж загінуў, адзін Ваня застаўся — без вачэй, увесь абпалены. Адправілі яго ў шпіталь, толькі не думалі, што застанецца жывы. На ім нічога цэлага не было. Уся скура… уся… Кавалкамі злазіла… Плевачкай… Я знайшла ягоны адрас праз трыццаць гадоў… Праз паўжыцця… Памятаецца, падымаюся па лесвіцы, ногі млеюць: ён — не ён? Дзверы адчыніў сам і рукамі мяне кранае, пазнае: "Нінка, ты? Нінка, ты?" Праз столькі гадоў пазнаў…

Маці яго, зусім старэнькая, ён з ёю жыў, сядзіць з намі за сталом і плача. Я дзіўлюся:

—Што ж вы плачаце, радавацца трэба, аднапалчане сустрэліся.

Яна мне адказвае:

—У мяне тры сыны на вайну пайшлі. Двое загінулі, толькі Ваня жывы дамоў вярнуўся.

А ў Вані вачэй няма. Яна ўсё жыццё яго за руку водзіць.

Я ў яго запыталася:

—Ваня, апошняе, што ты бачыў — гэта прахараўскае поле, танкавы бой… Што ты памятаеш пра той дзень?

І ведаеце, які быў яго адказ?

—Пра адно толькі шкадую, што рана загадаў экіпажу пакінуць падпаленую машыну. Усё роўна хлопцы загінулі. А мы маглі б яшчэ адзін нямецкі танк падбіць…

Вось аб чым ён шкадуе… Дагэтуль…

А мы з ім на вайне былі шчаслівыя… Не было яшчэ ніякіх словаў паміж намі. Нічога. Але я помню…

Чаму я засталася жывая? Дзеля чаго? Я думаю… Я так думаю — каб пра гэта распавесці…»

Наша сустрэча з Нінай Якаўлеўнай мела працяг, але ўжо пісьмовы. Перапісаўшы яе гісторыю з магнітафоннай стужкі і адабраўшы тое, што мяне найболей здзівіла і ўразіла, я, як і абяцала, даслала ёй адзін экзэмпляр. Праз некалькі тыдняў з Масквы прыходзіць важкая заказная бандэроль. Распакоўваю: газетныя выразкі, артыкулы, афіцыйныя справаздачы пра ваенна-патрыятычную працу, якую праводзіць у маскоўскіх школах ветэран вайны Ніна Якаўлеўна Вішнеўская. Тут і мой матэрыял, толькі ад яго мала што засталося — увесь абкрэмзаны: выкінутыя смешныя старонкі пра кухараў, якія ў катлах мыюцца, і нават бяскрыўднае: «Дзядзечка, а дзядзечка, мне дзядзечка загадаў вам перадаць вось гэта...». А на старонках з гісторыяй пра лейтэнанта Мішу Т. стаялі «абураныя» пытальнікі і зацемкі на палях: «Я для свайго сына — гераіня. Багіня! Што ён падумае пра мяне пасля такога?».

Потым я не аднойчы сутыкалася з гэтымі дзвюма праўдамі, што жывуць у адным чалавеку: уласнай праўдай, загнанай у падполле, і агульнай, набрынялай духам часу. Пахам газетаў. Першая рэдка магла вытрымаць перад націскам другой. Калі ў кватэры, прыкладам, акрамя апавядальніцы, апынаўся яшчэ нехта са сваякоў ці знаёмых, суседзяў (асабліва мужчынаў), яна была менш шчырай і даверлівай, чым калі б мы засталіся ўдзвюх. Гэта была ўжо размова на публіку. Дзеля слухачоў. Дабрацца да яе ўласных уражанняў было немагчымым, я тут жа адчувала моцную персанальную абарону. Самакантроль. Ён трымаўся ўвесь час. І нават выявілася заканамернасць: чым болей слухачоў, тым больш адцягнены і стэрыльны аповед. Азіраючыся на тое, як трэба казаць правільна. Страшнае ўжо выглядала вялікім, а незразумелае і цёмнае ў чалавеку — імгненна

вытлумачаным. Я трапляла ў пустэчу мінулага, дзе былі толькі помнікі. Подзвігі. Ганарлівыя і недатыкальныя. Гэтаксама як з Нінай Якаўлеўнай: адну вайну яна пераказвала дзеля мяне — «як дачцэ, каб ты зразумела, што нам, зусім дзяўчатам, трэба было перажыць», іншую рыхтавала для вялікай аўдыторыі — «як іншыя ўспамінаюць і як у газетах пішуць — пра герояў і подзвігі, каб выхоўваць моладзь на высокіх прыкладах». Кожны раз мяне дзівіў гэты недавер да простага і чалавечага, гэтае жаданне падмяніць жыццё ідэалам. Звычайнае чалавечае цяпло — халодным ззяннем.

А я не магла забыць, як мы пілі гарбату па-хатняму на кухні. І разам плакалі.

# «У НАШЫМ ДОМЕ ДЗВЕ ВАЙНЫ ЖЫВУЦЬ»

Шэры панэльны дом на вуліцы Кахоўскай у Мінску, палова горада ў нас забудаваная такімі невыразнымі, з кожным годам усё больш панылымі шматпавярховікамі. Але гэты дом усё ж такі адметны. «Тут у нас у адной кватэры дзве вайны жывуць», — пачую я, калі мне адчыняць дзверы. Ваявала на балтыйскім флоце старшына першага рангу Вольга Васілеўна Падвышэнская. У пяхоце сяржантам быў яе муж Саул Генрыхавіч.

Усё як заўсёды... Я зноў доўга гартаю сямейныя фотаальбомы, старанна і з любоўю аформленыя — яны ўвесь час на бачным месцы дзеля гасцей. Але і для сябе таксама. У кожнага з гэтых альбомаў ёсць назва: «Наш род», «Вайна», «Вяселле», «Дзеці», «Унукі». І мне падабаецца гэтая павага да ўласнага жыцця, задакументаваная любоў да былога і перажытага. Досыць рэдка сустракаюся з такім пачуццём уласнага дому, з тым, каб людзі ўглядаліся ў свой род, у яго лучнасць, хоць наведала ўжо сотні кватэр, была ў розных сем'ях — інтэлігентных і простых. Гарадскіх і вясковых. Відаць, частыя войны ды рэвалюцыі адвучылі нас трымаць сувязь з мінулым, беражліва ткаць павуту роду. Азірацца далёка ў мінулае. Ганарыцца. Спяшаліся забыць, сцерці сляды, бо гэтыя сведчанні часта каштавалі жыцця. Далей за бабулю і дзядулю ніхто нікога не ведае і не шукае сваіх каранёў. Тварылі гісторыю, а жылі адным днём. Кароткай памяццю.

А тут усё інакш...

—Няўжо гэта я? — весяліцца Вольга Васілеўна і сядае побач са мной на канапе, бярэ ў рукі здымак, дзе яна

ў матроскай форме з баявымі ўзнагародамі. — Колькі гляджу на гэтыя здымкі, столькі дзіўлюся. Саул паказаў нашай шасцігадовай унучцы, дык яна запыталася: «Бабуля, ты раней была хлопчыкам, праўда?».

—Вольга Васілеўна, вы адразу пайшлі на фронт?

—Вайна мая пачалася з эвакуацыі… Я пакінула свой дом, сваё юнацтва. Усю дарогу па цягніку стралялі, бамбавалі, самалёты лёталі нізка-нізка. Я памятаю, як з вагона выскачыла гурма хлопчыкаў з рамесніцкай вучэльні ў чорных шынялях. Гэта такая мішэнь! Іх усіх расстралялі — самалёты лёталі нізка-нізка. Здавалася, што расстрэльвалі і лічылі… Уяўляеце?

Мы працавалі на заводзе, нас кармілі, нам было нядрэнна. Але сэрца палала… І я пісала лісты ў ваенкамат. Адзін — другі — трэці… У ліпені сорак другога атрымала позву. Нас праз Ладагу на адкрытых баржах пад абстрэлам пераправілі ў блакадны Ленінград. З першага дня мне запомнілася белая ноч і атрад маракоў, ідуць у чорным. У горадзе адчуваецца напруга, людзей няма, неба крэсляць пражэктары, і крочаць матросы, як у грамадзянскую вайну, аперазаныя кулямётнымі стужкамі. Уяўляеце? Як у кіно…

Горад быў у шчыльнай аблозе. Фронт побач. На трэцім нумары трамвая можна было даехаць да завода імя Кірава, а там ужо пачыналася лінія фронту. Як неба яснае, так і артабстрэл. Білі прамой наводкай… Білі, білі, білі… Вялікія караблі стаялі каля пірса, іх, вядома, замаскавалі, але ўсё роўна маглі трапіць. Мы ўсе зрабіліся дымазавесчыкамі. Быў створаны асобны атрад дымамаскавання, якім камандаваў былы камандзір дывізіёна тарпедных катэраў капітан-лейтэнант Аляксандр Багданаў. Дзяўчаты, пераважна з сярэдне-тэхнічнай адукацыяй ці пасля першых курсаў інстытута. Наша

задача — зберагчы караблі, засланіць іх дымам. Пачнецца абстрэл, маракі чакаюць: «Хутчэй бы дзяўчаты дым павесілі. За ім спакайней». Выязджалі на машынах з адмысловай сумессю, а ўсе іншыя ў гэты час хаваліся ў бомбасховішчах. Мы ж, як кажуць, выклікалі агонь на сябе. Бо немцы стралялі па гэтай дымавой заслоне...

У нас харчаванне, ведаеце, таксама было блакаднае, але неяк вытрымлівалі. Ну, па-першае, маладосць, гэта істотна, а па-другое, мы дзівіліся самім ленінградцам. Нас хаця б трохі нечым падтрымлівалі, кармёжка была, хай і нішчымная, а яны ішлі і ад голаду падалі. На хаду паміралі. Да нас прыходзілі з горада дзеці, мы іх падкормлівалі са сваіх бедных пайкоў. Гэта былі не дзеці, гэта былі нейкія маленькія старэчы. Муміі, яны нам пераказвалі блакаднае меню, калі можна так сказаць: суп са скураных рамянёў ці скураных чаравікаў, халадзец са сталярнага клею, блінцы з гарчыцы... У горадзе з'елі ўсіх катоў і сабак. Зніклі вераб'і, сарокі. Нават пацукоў і мышэй лавілі, каб з'есці... На чымсьці іх там смажылі... Потым дзеці перасталі прыходзіць, а мы іх доўга чакалі. Хутчэй за ўсё, памерлі. Я так мяркую... А ўзімку, калі Ленінград застаўся без паліва, нас скіравалі бурыць дамы ў адзін з раёнаў горада, дзе яшчэ засталіся драўляныя пабудовы. Самы цяжкі момант — калі падыходзіш да дома. Дом стаіць добры, там памерлі людзі ці з'ехалі, але часцей паўміралі. Гэта адчувалася па кінутым на стале посудзе, рэчах. Напэўна, з паўгадзіны ніхто не браўся за працу. Уяўляеце? Усе стаялі і нечага чакалі. Толькі калі камандзір ускіне лом, тады і мы пачыналі варушыцца.

Былі на лесанарыхтоўках, цягалі скрыні са снарадамі. Помніцца, цягнула адну скрыню і бразнулася, яна была цяжэйшая за мяне. Гэта — адно. А другое — як

цяжка было для нас як для жанчын. Я потым стала камандзірам аддзялення. Усё яно складалася з маладзенькіх хлопцаў. Мы цэлы дзень на катэры. Катэр невялікі, там няма ніякіх гальюнаў. Хлопцам справіць патрэбу можна праз борт, і ўсё. Ну, а як мне? Пару разоў я да таго трывала, што потым скакала проста за борт і плавала. Хлопцы крычаць: «Старшына за бортам». Выцягнуць. Вось такая элементарная драбніца... Толькі ніякая гэта не драбніца. Я потым нават лекавалася... Уяўляеце? А сам цяжар зброі? Гэта для жанчыны таксама нядобра. Нам спачатку далі вінтоўкі, а яны былі вышэйшыя за нас саміх. Дзяўчаты ідуць — штыкі над імі на паўметра.

Мужчынам было лягчэй да ўсяго прыстасавацца. Да гэтага аскетычнага побыту... Да гэткіх стасункаў... А мы тужылі, страшэнна тужылі па доме, па маме, па камфорце. У нас была адна масквічка, Наталка Жыліна, яе ўзнагародзілі медалём «За адвагу» і ў дадатак — адпусцілі дамоў на некалькі дзён. Дык калі яна вярнулася, мы яе абнюхвалі. Ну, літаральна ставалі ў чаргу і абнюхвалі, казалі, што яна домам пахне. Такая туга была па доме... Такая радасць толькі ад канверта з лістом... Ад татавага почырку... Калі выпадала вольная хвіліна, нешта вышывалі, нейкія хусцінкі. Выдадуць нам новыя анучы, а мы іх абвяжам і шалікі выштукуем. Хацелася нейкага жаночага занятку. Вось гэтага жаночага нам не хапала, аж да свербу. Шукаеш хоць-якую падставу, каб голку ўзяць у рукі, зашыць што-кольвек, хоць бы на які час вярнуцца ў свой натуральны стан. Зразумела, і смяяліся, і радаваліся, але ўсё гэта было неяк іначай, чым да вайны. Нейкае не такое...

Магнітафон запісвае словы, захоўвае інтанацыю. Паўзы. Плач і разгубленасць. Я разумею, што калі чалавек прамаўляе, адбываецца нешта большае, чым

застаецца потым на паперы. Увесь час шкадую, што не магу «запісаць» вочы, рукі. Іх жыццё падчас размовы, іх уласнае жыццё. Асобнае. Іх «тэксты».

—У нас дзве вайны… Гэта дакладна… — адгукаецца Саул Генрыхавіч… — Пачнем згадваць, і я адчуваю: яна сваю вайну запомніла, а я сваю. Вось і ў мяне нешта такое было, як яна вам пра дом казала ці як яны станавіліся ў чаргу і абнюхвалі дзяўчыну, што вярнулася ад бацькоў. Толькі я гэтага не памятаю… Праслізнула… Тады гэта здавалася драбязой. Не вартым увагі. А яшчэ яна вам пра бесказыркі не распавяла. Вольга, як жа ты на такое забылася?

—Не забылася. Яно з самага-самага… Заўсёды пабойваюся гэтай гісторыі. Кожны раз… А было так — на світанку нашыя катэры выйшлі ў мора… Некалькі дзясяткаў катэраў… Хутка мы пачулі, як пачаўся бой. Мы чакалі… Прыслухоўваліся… Бой доўжыўся шмат гадзінаў, і быў момант, калі ён наблізіўся да самага горада. Але потым недзе непадалёку сцішыўся. У сутонні я выйшла на бераг: па Марскім канале плылі бесказыркі. Адна за другой. Бесказыркі і вялікія чырвоныя плямы на хвалях… Трэскі нейкія… Гэта нашых мёртвых хлопцаў пахавалі ў моры… Колькі я стаяла, столькі гэтыя бесказыркі плылі. Я спачатку лічыла, а потым спынілася. І не магла сысці, і не магла глядзець. Марскі канал стаў брацкай магілай…

Саул, дзе мая насоўка? Я толькі што яе ў руках трымала… Ну, дзе ж яна?

—Я шмат чаго з яе гісторый запомніў, як кажуць, «зарубіў на носе» дзеля ўнукаў. Часта ім не сваю, а яе вайну апавядаю. Ім яна больш цікавая, вось што я заўважыў, — працягвае Саул Генрыхавіч. — У мяне болей канкрэтнага ваеннага ведання, а ў яе пачуцці. А пачуцці

выглядаюць больш ярка, яны заўсёды мацнейшыя за факты. У нас таксама ў пяхоце былі дзяўчаты. Варта было хоць адной з іх з'явіцца сярод нас, як мы падцягваліся. Вы сабе не ўяўляеце… Не ўяўляеце! — І адразу: Гэтае слоўка я таксама ў яе падхапіў. Вы сабе ўявіць не зможаце, як хораша гучыць жаночы смех на вайне! Жаночы голас.

Ці было на вайне каханне? Было! І тыя жанчыны, якіх мы сустрэлі там, цудоўныя жонкі. Верныя сяброўкі. Хто пабраўся шлюбам на вайне, гэта самыя шчаслівыя людзі, самыя шчаслівыя пары. Вось мы таксама пакахалі адно аднаго на фронце. Сярод агню і смерці. Гэта — моцная сувязь. Не буду адмаўляць, што было і іншае, бо доўгая была вайна і шмат нас было на вайне. Але я болей памятаю светлага. Высакароднага.

На вайне я зрабіўся лепшым… Безумоўна! Як чалавек я стаўся лепшым, бо там шмат пакутаў. Я бачыў многа гора і сам пакутаваў. Там неістотнае адразу адкідаецца, яно не вартае ўвагі. Там гэта разумееш… Але вайна нам адпомсціла… Хаця ў гэтым мы самі сабе баімся прызнацца… Яна дагнала нас… Не ва ўсіх нашых дочак склаліся асабістыя лёсы. І вось чаму: іх мамы, франтавічкі, выхоўвалі так, як яны самі выхоўваліся на фронце. І таты таксама. Па той самай маралі. А на фронце чалавек, я вам ужо казаў, адразу быў бачны: які ён, чаго варты. Там не схаваешся. Нашыя дзяўчаткі ўяўлення не мелі пра тое, што ў жыцці можа быць зусім інакш, чым дома. Іх не папярэдзілі пра жорсткую рэальнасць гэтага свету. Яны, пабраўшыся шлюбам, лёгка траплялі ў абдымкі прайдзісветаў, тыя іх без сораму падманвалі, бо падмануць гэтых дзяўчатак было нескладана. Так здарылася са многімі дзецьмі нашых франтавых сяброў. І з нашай дачкой таксама…

—Дзецям мы пра вайну чамусьці не распавядалі. Напэўна, баяліся і шкадавалі іх. Ці мелі мы рацыю? — задумваецца Вольга Васілеўна. — Я і ордэнскія калодкі не насіла. Быў выпадак, калі сарвала іх і больш не прышпільвала. Пасля вайны працавала дырэктарам хлебазавода. Прыходжу на пасяджэнне, і начальнік трэста, таксама жанчына, пабачыўшы мае калодкі, пры ўсіх сказала: «Што ты іх начапіла, як мужчына?». У самой быў працоўны ордэн, ён заўсёды ў яе на пінжаку, а мае баявыя ўзнагароды чамусьці не спадабаліся. І калі мы засталіся сам-насам у кабінеце, я ўсё выказала па-марскому, ёй было няёмка, але ў мяне знікла жаданне насіць узнагароды. І цяпер не прышпільваю. Хаця ганаруся.

Толькі праз дзесяць гадоў вядомая журналістка Вера Ткачэнка напісала ў цэнтральнай газеце «Праўда», напісала пра нас, пра тое, што мы таксама былі на вайне. І што ёсць жанчыны-франтавічкі, якія засталіся адзінотніцамі, не ўладкавалі сваё жыццё і да гэтай пары не маюць кватэраў. І мы перад гэтымі святымі жанчынамі вінаватыя. Пасля таго матэрыялу патроху сталі на жанчын-франтавічак звяртаць увагу. Ім было па сорак-пяцьдзясят гадоў, яны жылі ў інтэрнатах. Нарэшце ім сталі даваць асобныя кватэры. Мая сяброўка... Не стану называць яе прозвішча, раптам пакрыўдзіцца... Ваенфельчарка, тройчы параненая. Скончылася вайна, паступіла ў медыцынскі інстытут. Нікога са сваякоў не знайшла, усе загінулі. Дапамогі ніадкуль не было, мыла па начах пад'езды, каб пракарміцца. Але нідзе не казала, што інвалід вайны і мае льготы, усе дакументы парвала. Я пытаю: «Навошта ты парвала?». А яна плача: «А хто б мяне замуж узяў?» — «Ну што ж, — кажу, — слушна зрабіла». Яшчэ мацней

плача: «Мне б гэтыя паперкі цяпер дапамаглі. Хварэю цяжка». Уяўляеце? Плача.

На святкаванне трыццаціпяцігоддзя Перамогі першы раз у Севастопаль, горад марской рускай славы, запрасілі сто маракоў — ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны з усіх флатоў, сярод іх — тры жанчыны. Две з іх — гэта мы з сяброўкай. І адмірал флоту кожнай з нас пакланіўся, усенародна дзякуй сказаў і руку пацалаваў. Як забыць?!

—А хацелася забыць вайну?

—Забыць? Забыць... — перапытвае Вольга Васілеўна.

—Мы не зможам яе забыць. Не ў нашых сілах, — парушае доўгую паўзу Саул Генрыхавіч. — У Дзень Перамогі, памятаеш, Вольга, як сустрэлі мы старэнькую маці, і вісеў у яе на шыі такі ж старэнькі плакацік: «Шукаю Кульнева Томаса Уладзіміравіча, знік без вестак у 1942 годзе ў блакадным Ленінградзе». Па твары бачна, што ёй даўно за восемдзесят. Гэта ж колькі год яна яго шукае? І да апошняга свайго дня будзе шукаць. Так і мы.

—А я хацела б забыць. Я хачу... — павольі, амаль шэптам вымаўляе Вольга Васілеўна. — Я хачу хаця б адзін дзень пражыць без вайны... Без нашай памяці пра яе... Хаця б адзін такі дзень...

Яны запамінаюцца мне ўдваіх, як і на франтавых здымках, адзін з якіх дораць мне. Там яны маладыя, нашмат маладзейшыя за мяне. Усё адразу набывае іншы сэнс. Набліжаецца. Я гляджу на гэтыя маладыя твары і ўжо інакш адчуваю тое, што толькі чула і запісвала. Паміж намі знікае час.

# «ТЭЛЕФОННАЯ ТРУБКА НЕ СТРАЛЯЕ...»

Сустракаюць і апавядаюць па-рознаму...

Адна пачынае адразу, ужо па тэлефоне: «Я памятаю... Я ўсё трымаю ў памяці, як быццам гэта было ўчора...». Іншая доўга адкладае сустрэчу і размову: «Трэба падрыхтавацца... Не хачу зноў трапіць у тое пекла...». Валянціна Паўлаўна Чудаева з тых, хто доўга палохаецца, праз сілу пускае ў свой развярэджаны свет, некалькі месяцаў я час ад часу ёй тэлефанавала, але аднойчы мы прагаварылі па тэлефоне дзве гадзіны і, нарэшце, дамовіліся сустрэцца. Адразу — на заўтра.

І вось я — прыйшла...

— Будзем есці пірагі, ад ранку завіхаюся, — весела абдымае мяне ля дзвярэй гаспадыня. А з размовай паспеецца. Яшчэ наплачуся... Я даўно жыву са сваёй тугой... Але найперш — пірагі. З чаромхай. Як у нас у Сібіры. Давай, распранайся.

Прабач, што адразу на «ты». Гэта франтавое: «А ну, дзяўчаты! Давай, дзяўчаты!». Таму мы ўсе такія, ты ўжо ведаеш... Чула... Крышталю, бачыш, не нажылі. Усё, што маем з мужам, у бляшанцы з-пад цукерак беражэм: некалькі ордэнаў ды медалі. Ляжаць у серванце, потым пакажу. — Праводзіць у пакой. — Мэбля, бачыш, таксама старая. Шкада мяняць. Калі рэчы доўга жывуць у доме, дык у іх з'яўляецца душа. Я веру.

Знаёміць са сваёй сяброўкай Аляксандрай Фёдараўнай Зенчанка, камсамольскім работнікам у блакадным Ленінградзе.

Я сядаю за накрыты стол: пірагі дык пірагі, тым болей сібірскія, з чаромхай, якія я ніколі не каштавала.

Тры жанчыны. Гарачыя пірагі. А размова адразу — пра вайну.

—Вы яе толькі не запыняйце пытаннямі, — папярэджвае Аляксандра Фёдараўна. — Калі спыніцца, плакаць пачне. А пасля слёз змоўкне… Не перапыняйце…

*Валянціна Паўлаўна Чудаева, сяржант, камандзір зенітнай установкі:*

«Я — з Сібіры… Што падштурхнула мяне, дзяўчынку з далёкай Сібіры, пайсці на фронт? З канца свету, як кажуць. Дарэчы, наконт канца свету мяне на адной сустрэчы французскі журналіст запытаўся. Ён неяк пільна ў мяне ўглядаўся ў музеі, я нават захвалявалася. Што яму трэба? Чаму ён так глядзіць? Напрыканцы сустрэчы падышоў і праз перакладчыка папрасіў, каб спадарыня Чудаева дала інтэрв'ю. Я, натуральна, моцна расхвалявалася. Думаю: ну чаго ён хоча? Ён жа мяне ў музеі слухаў? Але яго, відаць, не гэта цікавіла. Найперш я пачула ад яго камплімент: "Вы сёння так молада выглядаеце… Як гэта вы маглі прайсці вайну?". Я яму адказваю: "Гэта сведчанне таго, што мы вельмі юнымі пайшлі на фронт". Але ён пра іншае пытаўся: як гэта я трапіла на фронт з Сібіры — гэта ж канец свету! "Не, — здагадалася я, — вас, пэўна, хвалюе, ці не было ў нас татальнай мабілізацыі, чаму я, школьніца, пайшла на фронт? Тут ён ківае галавой, маўляў, так. "Добра, — пагаджаюся, — я вам адкажу на гэтае пытанне". І я яму распавяла ўсё сваё жыццё, як і табе зараз перакажу. Ён плакаў… Француз плакаў… Потым прызнаўся: "Вы не крыўдуйце на мяне, спадарыня Чугаева. Для нас, французаў, Першая сусветная вайна была мацнейшым узрушэннем, чым Другая сусветная. І мы больш пра яе памятаем — усюды магілы і помнікі. А пра вас мы мала ведаем. Многія

сёння думаюць, што гэта адна Амерыка перамагла Гітлера, асабліва маладыя людзі. Пра той кошт, які савецкія людзі заплацілі за перамогу — дваццаць мільёнаў чалавечых жыццяў за чатыры гады — мала вядома. Як і пра вашыя пакуты. Невымерныя. Дзякуй вам — вы скаланулі маё сэрца".

...Я не памятаю сваёй маці. Яна рана загінула. Бацька быў упаўнаважаным Новасібірскага выканкама, у дваццаць пятым годзе яго накіравалі ў вёску, адкуль ён родам, па хлеб. Краіна бедавала, а кулакі хавалі хлеб, нішчылі. Мне было тады дзевяць месяцаў. Маці захацелася на радзіму бацькі, і ён яе ўзяў. Яна прыхапіла разам і маю сястрычку, не было куды нас падзець. Тата там некалі батрачыў у таго кулака, якога ўвечары на сходзе папярэдзілі: мы ведаем, дзе хлеб схаваны, калі сам не аддасі, знойдзем і возьмем сілай. Адбяром у імя рэвалюцыі.

Скончыўся сход, сваякі сабраліся, а ў таты было пяць братоў, усе яны потым не вярнуліся з Вялікай Айчыннай вайны, як і бацька. Ну, значыць, селі яны за стол — традыцыйныя сібірскія пяльмені. Лаўкі ўздоўж вокнаў стаяць... І маці трапіла ў прасценак, адным плячом да акна, другім — да бацькі, а бацька сядзеў, дзе якраз не было акна. Красавік месяц... У Сібіры ў гэтую пару яшчэ замаразкі бываюць. Маці, мусіць, ахаладзела. Я гэта ўжо потым, дарослай зразумела. Яна паднялася, накінула бацькаў кажух і пачала мяне карміць цыцкай. У гэты момант прагучаў стрэл з абрэза. Стралялі, зразумела, у бацьку, па кажуху цэлілі... Маці толькі сказала: "Па..." і выпусціла мяне на гарачыя пяльмені... Было ёй дваццаць чатыры гады...

І ў той жа вёсцы потым старшынёй сельсавета быў мой дзядуля. Яго атруцілі стрыхнінам, у ваду падсыпалі.

У мяне фотаздымак застаўся, як дзядулю хаваюць. Палатніна над трунай, і на ёй напісана: "Загінуў ад рукі класавага ворага".

Бацька мой — герой грамадзянскай вайны, камандзір бронецягніка, які душыў мяцеж чэхаславацкага корпуса. У трыццаць першым годзе ён быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. У той час гэты ордэн мелі адзінкі, асабліва ў нас, у Сібіры. Гэта быў вялікі гонар і вялікая павага. У бацькі на целе дзевятнаццаць ранаў, не заставалася жывога месца. Маці апавядала — не мне, канешне, а сваякам, што бацьку белачэхі прысудзілі да дваццаці гадоў катаргі. Яна папрасіла сустрэчы з ім. Маці тады была на апошнім месяцы цяжарнасці Тасяй, маёй старэйшай сястрой. Там, у турме, быў такі доўгі калідор, ёй не далі прайсці да бацькі, сказалі: "Бальшавіцкая свалата! Паўзі…". І яна за некалькі дзён да родаў паўзла па гэтым доўгім цэментным калідоры. Вось якую яна атрымала сустрэчу. Маці бацьку не пазнала, у яго ўся галава зрабілася сівой. Сівы стары. А яму было трыццаць гадоў.

Ці магла я абыякава чакаць ворага, калі расла ў такой сям'і, з такім бацькам? Я ж ягонай крыві… Крывінка… Ён шмат перажыў… На яго быў данос у трыццаць сёмым годзе, яго хацелі зняславіць. Зрабіць з яго ворага народа. Ну, гэтыя жахлівыя сталінскія чысткі… Яжоўшчына… Як сказаў таварыш Сталін, лес сякуць, трэскі лятуць. Была абвешчаная новая класавая барацьба, каб краіна не пераставала жыць у страху. У пакоры. Аднак бацька дамогся прыёму ў Калініна, і яго апраўдалі. Бацьку ведалі ўсе.

Але пра гэтае мне потым блізкія распавялі…

І вось — сорак першы год… У мяне апошні школьны званок. У нас ва ўсіх былі нейкія планы, мары, ну,

вядома, дзяўчаткі. Пасля выпускной вечарыны мы паплылі па Абі на востраў. Такія вясёлыя, шчаслівыя... Яшчэ, як кажуць, нецалаваныя, у мяне нават хлопчыка не было. Вяртаемся, світанак на востраве сустрэлі... Горад увесь бурапеніць, людзі плачуць. Кругом: "Вайна! Вайна!". Усюды радыё на поўную моц. Мы нічога не разумелі. Якая вайна? Мы такія шчаслівыя, у нас такія вялізныя планы: хто куды пойдзе вучыцца, хто кім стане. І раптам вайна! Дарослыя плакалі, а мы не спалохаліся, мы запэўнівалі адно аднаго, што не праміне і месяца, як "увалім па мазгаўні фашыстам". Спявалі гераічныя песні. Ніякага сумневу, наша войска спляжыць ворага на ягонай тэрыторыі. Ну, ні кроплі сумневу...

Пачалі разумець, што не ўсё так проста, калі сталі прыходзіць пахаванкі. Я аж захварэла: "Ну як жа так, атрымліваецца, што ўсё хлусня?". Немцы ўжо рыхтаваліся да параду на Чырвонай плошчы...

Бацьку майго на фронт не бралі. Толькі ён зацята хадзіў у ваенкамат. Урэшце, дамогся свайго. Гэта пры яго здароўі, пры яго сівой галаве, пры яго лёгкіх: у бацькі быў застарэлы туберкулёз. Адно трохі падлечаны. І гады якія? Але ён пайшоў з дому. Запісаўся ў Стальную, ці, як яе называлі, Сталінскую дывізію, там было шмат сібіракоў. Нам таксама здавалася, што без нас вайна не вайна, мы таксама мусім ваяваць. Тут жа зброю нам давай! Пабеглі ўсім класам у ваенкамат. І дзясятага лютага я пайшла на фронт. Мачаха моцна плакала: "Валя, не ідзі. Што ты робіш? Ты такая слабая, такая худая, ну які з цябе ваяка?". Я сапраўды была рахітычная, доўга, вельмі доўга. Гэта пасля таго, як маму забілі. Я да пяці гадоў не хадзіла... А тут адкуль сілы ўзяліся!

Два месяцы нас везлі ў цяплушках. Дзве тысячы дзяўчат, цэлы эшалон. Сібірскі эшалон. Што мы бачылі,

калі пад'язджалі да фронту? Ніколі не забуду адзін момант: разбітая станцыя, а ўздоўж перона скачуць на руках матросы. У іх няма ні ног, ні мыліц. Яны ходзяць на руках… Іх цэлы перон… І яны яшчэ кураць… Пабачылі нас — рагочуць. Жартуюць. Сэрца тук-тук… Тук-тук… Куды мы сабраліся? Едзем? Куды? Дзеля адвагі спявалі, шмат спявалі.

З намі былі камандзіры, яны нас адукоўвалі. Падтрымлівалі. Мы вывучалі сувязь. Прыехалі ва Украіну, і нас там упершыню бамбілі. А мы якраз былі ў санпрапускніку, у лазні. Калі ішлі мыцца, там дзядзечка дзяжурыў, ён за лазню адказваў. Мы яго саромеліся, дзяўчаткі, зусім маладзенькія. А як пачалі бамбаваць, мы ўсе разам да таго дзядзечкі, толькі б уратавацца. Сяк-так апрануліся, я абкруціла галаву ручніком, у мяне чырвоны ручнік быў, выскачылі. Старшы лейтэнант, таксама маладзенькі, крычыць:

—Дзяўчына, у бамбасховішча! Кідайце ручнік! Дэмаскуеце…

А я ад яго ўцякаю:

—Нічога не дэмаскую! Мне мама не дазваляе з мокрай галавой хадзіць.

Ён потым мяне знайшоў:

—Чаму мяне не слухаеш? Я твой камандзір.

Я яму не дала веры:

—Яшчэ не хапала, які ты мне камандзір…

Сваруся з ім, як з хлопчыкам. Адналеткі.

Шынялі нам далі вялікія, тоўстыя, мы ў іх, як снапы, не ходзім, а валімся. Спярша нават ботаў на нас не шылі. Боты ёсць, але памеры ўсе мужчынскія. Потым абмянялі нам боты, далі іншыя — галоўка чырвоная, а халява — кірза чорная. Тут ужо мы фарсілі! Усе худыя, мужчынскія гімнасцёркі на нас вісяць. Хто ўмеў шыць,

трохі на сябе падагнаў. А нам жа яшчэ сёе-тое патрэбнае. Дзяўчаты, як-ніяк! Ну, старшына пачаў нам абмер рабіць. І смех і грэх. З'яўляецца камбат: "Ну што, старшына ўсе вашыя жаночыя штуковіны выдаў?". Старшына кажа: "Абмераў. Будуць".

І стала я ў зенітнай частцы сувязісткай. На камандным пункце дзяжурыла, на сувязі, і, можа быць, так бы і да канца вайны засталася сувязісткай, каб не атрымала вестку, што бацька загінуў. Няма ў мяне болей майго любага таты. Самага роднага мне чалавека. Адзінага. Я пачала прасіць: "Хачу помсціць. Хачу разлічыцца за смерць майго бацькі". Хацела забіваць... Страляць хацела... Не зважаючы, што мне даводзілі, маўляў, тэлефон у артылерыі — гэта вельмі важна. Але тэлефонная трубка сама не страляе... Я напісала рапарт камандзіру палка. Ён адмовіў. Я тады, не марудзячы, звярнулася да камандзіра дывізіі. Прыязджае да нас палкоўнік Красных, пашыхтаваў усіх і пытаецца: "Дзе тут тая, што хоча быць камандзірам зенітнай батарэі?". Я зрабіла крок наперад: шыя худая, тонкая, а на гэтай шыі аўтамат вісіць, аўтамат цяжкі, семдзясят адзін патрон. І, відаць, у мяне быў такі варты жалю выгляд, што ён пасміхнуўся. Другое пытанне: "Ну, чаго ж ты хочаш?". Я адказваю: "Страляць хачу". Не ведаю, што ён там сабе падумаў. Доўга маўчаў. Ні слова. Потым рашуча развярнуўся і сышоў. Ну, думаю, усё, адмовіць. Тут падыходзіць камандзір: "Дазволіў палкоўнік...".

Табе гэта зразумела? Гэта можна зразумець цяпер? Я хачу, каб ты мае пачуцці зразумела... Без нянавісці страляць не будзеш. Гэта — вайна, а не паляванне. Я памятаю, як на палітзанятках нам чыталі артыкул Іллі Эрэнбурга "Забі яго!". Колькі разоў сустрэнеш немца, столькі разоў забі. Знакаміты артыкул, яго тады ўсе

чыталі, вучылі на памяць. Ён мяне моцна ўразіў, у рэчмяшку ўсю вайну быў гэты артыкул і татава "пахаронка"... Страляць! Страляць! Я мушу помсціць...

Скончыла кароткатэрміновыя курсы, вельмі кароткія — усяго тры месяцы правучылася. Страляць. І вось я камандзір зенітнай батарэі. Залічылі мяне ў тысяча трыста пяцьдзясят сёмы зенітны полк. Спярша з вушэй і носа кроў цякла, страўнік дарэшты сапсаваўся... Горла перасыхала да ванітаў... Ноччу яшчэ не так страшна, а днём — жах. Здаецца, што самалёт якраз на цябе ляціць, менавіта на тваю батарэю. Цябе спляжыць! Яшчэ адно імгненне... Зараз ён усю, усю цябеператворыць у нішто. Усё — капец! Гэта не для дзяўчыны... Не для яе вушэй, не для яе вачэй...

У нас спачатку "васьмідзясяткі" былі, яны сябе добра пад Масквой паказалі, іх потым кінулі супраць танкаў, а нам далі "трыццацісяміміліметроўкі". Гэта на Ржэўскім напрамку... Там такія баі былі... Увесну крыгаход пачаўся на Волзе... І што мы бачылі? Мы бачылі, як плыве чырвона-чорная крыга і на ёй два-тры немцы і адзін рускі салдат. Гэта яны так загінулі, учапіўшыся адзін у аднаго. Іх замарозіла ў гэтай крызе, і яна ўся ў крыві. Уся матухна Волга была ў крыві...».

І раптам спынілася: «Трэба адпачыць... А то плакаць пачну, сапсую нашую сустрэчу...». Адвярнулася да акна, каб супакоіць сябе. Праз хвіліну ўжо ўсміхалася: «Шчыра кажучы, не люблю плакаць. З дзяцінства вучылася не плакаць...».

«А я блакадны Ленінград згадала, пакуль слухала Валю, — адгукнулася, дагэтуль маўклівая, *Аляксандра Фёдараўна Зенчанка*. — Найперш выпадак, які ўсіх нас

агаломшыў. Нам распавялі, што нейкая сталая жанчына кожны дзень адчыняе акно і з конаўкі плюхае на вуліцу ваду, і з кожным разам яна плюхае ўсё далей і далей. Спачатку падумалі: ну, пэўна, кранулася розумам, чаго толькі мы ў блакаду не бачылі, — і пайшлі да яе высвятляць, у чым справа. Паслухайце, што яна нам сказала: "Калі заявяцца ў Ленінград фашысты, скіруюць на маю вуліцу, я буду іх шпарыць кіпнем. Я старая, ні на што больш не здатная, дык буду іх шпарыць кіпнем". І яна трэніравалася… Кожны дзень… Блакада толькі пачалася, яшчэ не знікла гарачая вада… Гэта была надзвычай інтэлігентная жанчына… Я нават памятаю яе твар.

Яна абрала сабе спосаб змагання, на які ў яе хапала сілаў. Трэба ўяўляць той момант. Вораг ужо быў побач з горадам, баі ішлі каля Нарваўскіх варотаў. Абстрэльвалі Кіраўскі завод… Кожны думаў, што ён можа зрабіць дзеля абароны горада. Памерці было залішне проста, трэба было нешта зрабіць. Нейкі ўчынак. Тысячы людзей так думалі…».

«Я хачу знайсці словы… Як мне выказаць усё? — пытае ці то нас, ці то сябе Валянціна Паўлаўна. — З вайны вярнулася скалечанай. Мяне параніла аскепкам у спіну. Рана была невялікая, але мяне закінула ў гурбу снегу. А я нешта колькі дзён запар не сушыла валёнкі, можа, дроваў не было, а можа, мая чарга ноччу сушыць не падышла, печка маленькая, а нас вакол яе шмат. І пакуль мяне знайшлі, я моцна памарозіла ногі. Мяне, відаць, снегам засыпала, але я дыхала, і ў снезе адтала палонка… Знайшлі мяне санітарныя сабакі. Разрыхлілі снег і вушанку маю прынеслі. Там у мяне быў пашпарт смерці, ва ўсіх былі такія пашпарты: хто сваякі, куды паведамляць. Мяне адкапалі, паклалі на плашч-палатку,

кажушок быў поўны крыві… Таму ніхто не звярнуў увагі на мае ногі…

Шэсць месяцаў я ляжала ў шпіталі. Збіраліся ампутаваць нагу, ампутаваць вышэй за калена, бо пачыналася гангрэна. І я тут трохі збаялася, не хацела заставацца жыць калекай. Навошта мне жыць? Ні бацькі, ні маці. Ну каму я такая, без нагі, патрэбная. Лішні цяжар! Засілюся… І я папрасіла ў санітаркі замест кароткага ручніка доўгі… А мяне ў шпіталі ўсе дражнілі: “А тут бабуля, бабуля старая ляжыць”. Бо калі начальнік шпіталя мяне пабачыў першы раз, дык запытаўся: “Ну, а колькі ж табе гадоў?”. Я яму хуценька: “Дзевятнаццаць. Дзевятнаццаць хутка будзе”. Ён засмяяўся: “О! Старая, старая, гэта ўжо ўзрост”. Таму санітарка цётка Маня так мяне дражніла. Яна кажа: “Я дам табе ручнік, паколькі цябе да аперацыі рыхтуюць. Але буду за табой наглядаць. Нешта не падабаюцца, дзеўка, мне твае вочы. Ці не надумала ты чаго кепскага?”. Я маўчу… Але бачу, што і праўда: рыхтуюць да аперацыі. Я хаця і не ведала, што такое аперацыя, ніколі не рэзаная, гэта цяпер геаграфічная карта на целе, але здагадалася. Схавала ручнік пад падушку і чакаю, калі ўсе сціхнуць. Паснуць. А ложкі былі жалезныя, думаю: прывяжу ручнік да ложка і задушуся. Толькі каб моцы хапіла… Толькі цётка Маня не адступілася ад мяне ўсю ноч. Зберагла мяне, маладую. Не заснула… Зберагла дурненькую…

А мой палатны доктар, малады лейтэнант, ходзіць за начальнікам шпіталя і просіць: “Дайце я паспрабую. Дайце я паспрабую…”. А той яму: “Што ты паспрабуеш? У яе ўжо адзін палец чорны. Дзяўчынцы дзевятнаццаць год. А мы яе загубім”. Як высветлілася потым, мой палатны доктар быў супраць аперацыі, ён прапаноўваў іншы спосаб, новы на той час. Спецыяльнай голкай

уводзіць пад скуру кісларод. Кісларод мацуе… Ну, я дакладна не скажу як, я ж не медык… І ён, гэты малады лейтэнант, угаварыў начальніка шпіталя. Не сталі яны мне нагу рэзаць. Пачалі лекаваць гэтым новым спосабам. І праз два месяцы я пачала ўжо хадзіць. На мыліцах, натуральна, ногі як анучы, ніякага з іх апірышча. Я іх не адчувала, я іх толькі бачыла. Потым навучылася хадзіць нагамі. Мяне віншавалі: нарадзілася другі раз. Пасля шпіталя адправілі ў адпачынак. А які адпачынак? Куды? Да каго? Вярнулася ў свой батальён, да сваёй батарэі. Уступіла там у партыю. У дзевятнаццаць гадоў…

Дзень Перамогі сустрэла ва Усходняй Прусіі. Ужо некалькі дзён было ціха, ніхто не страляў, а сярод ночы раптам каманда: "Трывога!". Мы ўсе ўскочылі. І тут крычаць: "Перамога! Капітуляцыя!". Капітуляцыя — гэта хай сабе, а вось Перамога… Гэта значыць: вайна скончылася! Вайна скончылася! Усе пачалі страляць, хто з чаго, у каго што было: аўтамат, пісталет… З гармат стралялі… Адзін слёзы выцірае, другі танчыць: "Я — жывы. Я — жывы". Трэці зваліўся на зямлю і абдымае, абдымае камяні, купіны. З радасці. А я стаю і раптам разумею: калі вайна скончылася, дык мой тата ўжо не вернецца дамоў ніколі. Вайна скончылася… Камандзір потым пагражаў: "Дык вось, дэмабілізацыі не будзе, пакуль за снарады не заплаціце. Што вы нарабілі? Колькі снарадаў змарнавалі?". А нам здавалася, што на зямлі цяпер заўсёды будзе мір, што ніхто не зажадае вайны, што ўсе снарады мусяць быць знішчаныя. Навошта яны? Мы стаміліся ненавідзець. Стаміліся страляць.

І нечакана мне так захацелася дамоў. Хай там і таты не было, і мамы не было. Дом — гэта нешта такое, што большае за людзей, якія там жывуць, і большае за сам дом. Гэта нешта такое… У чалавека мусіць быць дом…

Зямны паклон маёй мачысе, яна мяне як мама сустрэла. Я яе пасля мамай называла. Яна мяне чакала, моцна чакала. Хаця начальнік шпіталя паспяшаўся напісаць, што мне ампутуюць нагу, прывязуць да яе калеку. Каб яна падрыхтавалася. Абяцаў, што я трохі ў яе пажыву, а потым мяне забяруць… Але яна хацела, каб я вярнулася дамоў…

Яна мяне чакала… Я была вельмі падобная да таты…

Мы ў васямнаццаць-дваццаць гадоў сышлі на фронт, а вярнуліся ў дваццаць — дваццаць чатыры. Спачатку радасць, а потым страшна: што нам тут рабіць? Страх перад мірным жыццём… Сяброўкі інстытуты паспелі скончыць, а хто мы? Ні да чаго не прыстасаваныя, без спецыяльнасцяў. Усё, што ведаем, — вайна, усё, што ўмеем, — вайна. Хацелася хутчэй ад яе адсланіцца. З шыняля змайстравала сабе паліто, гузікі перашыла. На кірмашы прадала кірзавыя боты і купіла туфлікі. Надзела першы раз сукенку, слязьмі ўмылася. Сама сябе ў люстэрку не пазнала, мы ж чатыры гады — у штанах. Каму я магла сказаць, што я параненая, кантужаная. Паспрабуй скажы, а хто цябе потым на працу прыме, замуж возьме? Мы як рыбы маўчалі. Нікому не прызнаваліся, што былі на фронце. Адно між сабой сувязь трымалі, ліставаліся. Гэта потым нас ганараваць сталі, праз трыццаць гадоў… Запрашаць на сустрэчы… А першы час мы сябе ўтойвалі, нават узнагарод не насілі. Мужчыны насілі, а жанчыны — не. Мужчыны — пераможцы, героі, жаніхі, у іх была вайна, а на нас глядзелі зусім іншымі вачыма… У нас, скажу я вам, адабралі перамогу. Неўпрыкмет падсунулі замест яе звычайнае жаночае шчасце. Перамогу з намі не падзялілі. І было крыўдна… Незразумела… Таму што на фронце мужчыны ставіліся да нас надзвычайна, заўсёды аберагалі, я не сустракала

ў мірным жыцці, каб яны так ставіліся да жанчын. Калі адступалі, ляжам адпачыць — зямля голая, яны самі застануцца ў гімнасцёрках, а нам аддадуць свае шынялі: "Дзяўчатак... Дзяўчатак трэба накрыць...". Знойдуць дзе кавалачак ваты, бінта: "На, вазьмі, табе спатрэбіцца...". Сухарык апошні падзеляць. Акрамя дабрыні, акрамя цеплыні мы нічога іншага ад іх на вайне не бачылі. Не ведалі. А пасля вайны? Я маўчу... Маўчу... Што замінае нам згадваць? Невыноснасць успамінаў...

Прыехалі з мужам у Мінск. У нас нічога няма: ні прасціны, ні кубка, ні відэльца... Два шынялі, дзве гімнасцёркі... Знайшлі карту, яна харошая была, на бязі, мы яе адмочвалі... Вялікая карта... Вось гэтая бязевая прасціна — першая прасціна ў нас была. Потым, калі дачка ў нас нарадзілася, на пялюшкі яе скарысталі. Карту гэтую... Як цяпер памятаю, палітычная карта свету... А спала дачка ў чамадане... Фанерны чамадан, з якім муж вярнуўся з фронту, быў замест калыскі. Акрамя любові, нічога ў доме не было. Так скажу... Муж неяк прыйшоў: "Хадзем, я бачыў выкінутую старую канапу...". І мы пайшлі па тую канапу ноччу, каб ніхто не бачыў. Прыцягнулі і нацешыцца не маглі!

Усё ж такі мы былі шчаслівыя. У мяне з'явілася столькі сяброўак. Час цяжкі, але мы не нэндзілі. Атаварым карткі і тэлефануем адна адной: "Прыходзь, я цукар атрымала. Будзем гарбату піць". Нічога над намі не было, нічога пад намі не было, ні ў каго яшчэ гэтых дываноў, крышталю... Нічога... Але мы былі шчаслівыя. Шчаслівыя, бо засталіся жывымі. Размаўляем, смяемся. Гуляем па вуліцах... Я ўвесь час любавалася, хоць любавацца не было чым — вакол друз, нават дрэвы пакалечаныя. Але нас цешыла пачуццё любові. Неяк моцна патрэбны тады быў чалавеку чалавек, усе адно

да аднаго цягнуліся. Гэта потым мы разбегліся, кожны сам да сябе, у свой дом, у сваю сям'ю, а тады яшчэ былі разам. Плячом да пляча, як у акопе на фронце…

Цяпер мяне часта запрашаюць на сустрэчы ў ваенны музей… Просяць правесці экскурсію. Цяпер — так. Праз сорак гадоў! Сорак! Надоечы я выступала перад маладымі італьянцамі. Яны доўга распытвалі: у якога доктара я лекавалася? На што хварэла? Чамусьці высвятлялі, ці звярталася я да псіхіятра? І якія сны мне сняцца? Ці сніцца вайна? Маўляў, руская жанчына, якая ваявала са зброяй у руках, для іх — загадка. Што гэта за жанчына, якая не толькі ратавала, перавязвала раны, але сама страляла, падрывала… Забівала мужчынаў… Іх цікавіла: ці пабралася я шлюбам? Яны былі пэўныя, што не. Адзінокая. А я жартавала: "Усе трафеі везлі з вайны, а я везла мужа. Ёсць у мяне дачка. Цяпер унукі падрастаюць…".

Я пра любоў табе не распавяла… Ужо не змагу, бо сэрца не хопіць. Іншым разам… Была любоў! Была! Хіба без любові чалавек можа жыць? Можа выжыць? На фронце закахаўся ў мяне наш камбат… Усю вайну бярог, нікога не падпускаў, а дэмабілізаваўся і адшукаў у шпіталі. Там і прызнаўся… Але пра гэта потым… Ты прыходзь, абавязкова прыходзь. Другой дачкой будзеш. Я марыла мець шмат дзяцей, я люблю дзяцей. Але адна ў мяне дачка… Дачушка… Не мела здароўя, не хапала сіл. І вучыцца я не змагла — часта хварэла. Мае ногі, усё мае ногі… яны ў мяне нічога не вартыя. Працавала да пенсіі лабаранткай у Політэхнічным інстытуце, але мяне ўсе любілі. Прафесары і студэнты. Таму што ў мяне самой было шмат любові, шмат радасці. Я толькі так разумела жыццё, я толькі так хацела жыць пасля вайны. Бог стварыў чалавека не дзеля таго, каб ён страляў, ён стварыў яго дзеля любові. Як ты лічыш?

Два гады таму гасцяваў у нас начальнік штаба Іван Міхайлавіч Грынько. Ён ужо даўно на пенсіі. За гэтым жа сталом сядзеў. Я тады таксама пірагоў напякла. Сумоўнічаюць яны з мужам, успамінаюць... Пра дзяўчат нашых загаварылі... А я як усхапілася: "Гонар, кажаце, павага. А дзяўчаты амаль усе самотныя. Незамужнія. Жывуць у камуналках. Хто іх пашкадаваў? Абараніў? Куды вы падзеліся пасля вайны? Здраднікі!". Карацей, святочны настрой я ім сапсавала...

Начальнік штаба вось на тваім месцы сядзеў. "Ты мне пакажы, — грукаў кулаком па стальніцы, хто цябе крыўдзіў. Ты мне толькі пакажы!". Прабачэння прасіў: "Валя, я нічога табе не магу сказаць, акрамя слёз". А не трэба нас шкадаваць. Мы — маем гонар. Хай сабе хоць дзесяць разоў гісторыю перапішуць. Са Сталіным ці без Сталіна. Але гэта застанецца — мы перамаглі! І нашыя пакуты. Тое, што мы перажылі. Гэта — не рыззё і не попел. Гэта — нашае жыццё.

І ні слова болей...».

Перад сыходам мяне нагружаюць пакетам з пірагамі: «Сібірскія. Адмысловыя. У краме такіх не знойдзеш...». Я атрымліваю яшчэ адзін доўгі спіс з адрасамі і тэлефонамі: «Усе табе будуць радыя. Чакаюць. Я табе патлумачу: страшна ўспамінаць, але не ўспамінаць яшчэ страшней».

Цяпер я разумею, чаму яны ўсё-такі апавядаюць...

# «НАС УЗНАГАРОДЖВАЛІ МАЛЕНЬКІМІ МЕДАЛЯМІ...»

Зазіраю зранку ў паштовую скрыню...

Мая персанальная пошта ўсё болей нагадвае пошту ваенкамата ці музея: «Вітанні ад лётчыц авіяпалка Марыны Раскавай», «Пішу Вам паводле даручэння партызанак брыгады «Жалязняк»», «Віншуюць... мінскія падпольшчыцы... Жадаем поспеху ў распачатай працы...», «Звяртаюцца радавыя палявога лазнева-пральнага атрада...». За ўсе гады пошукаў было ўсяго некалькі эмацыйных адмоваў: «Не, гэта як жахлівы сон... Не магу! Не буду!». Або: «Не хачу ўспамінаць! Не хачу! Столькі часу забывала...».

Згадваецца яшчэ адзін ліст без зваротнага адраса:

«Мой муж, кавалер ордэнаў Славы, пасля вайны атрымаў дзесяць гадоў лагераў... Так радзіма сустракала сваіх герояў. Пераможцаў! Напісаў у лісце да свайго ўніверсітэцкага таварыша, што яму цяжка ганарыцца нашай перамогай — сваю і чужую зямлю завалілі рускімі трупамі. Залілі крывёю... Яго тут жа арыштавалі... Сарвалі пагоны...

Вярнуўся з Казахстана пасля смерці Сталіна... Хворы. Дзяцей у нас не было. Мне няма чаго згадваць вайну, я ваюю ўсё жыццё...».

Напісаць свае ўспаміны наважваюцца не ўсе, ды і не ва ўсіх атрымліваецца — перакласці на паперу свае пачуцці і думкі. «Слёзы замінаюць...» (*А. Буракова, сяржант, радыстка*). І ліставанне, супраць спадзеваў, узбагачае толькі новымі адрасамі ды імёнамі.

«Жалеза ўва мне хапае... Аскепак з-пад Віцебска нашу ў лёгкім за тры сантыметры ад сэрца. Другі аскепак — у правым лёгкім. Два — у жываце...

Вось мой адрас... Прыязджайце. Не магу болей пісаць, нічога не бачу скрозь слёзы...»

*В. Громава, санінструктарка*

«Узнагарод вялікіх не маю, толькі медалі. Не ведаю, ці будзе цікавае вам маё жыццё, але хацелася б некаму пераказаць...»

*В. П. Воранава, тэлефаністка*

«...Жылі мы з мужам на Крайняй Поўначы, у Магадане. Ён працаваў шафёрам, я — кантралёркай. Як толькі пачалася вайна, мы абое папрасіліся на фронт. Нам сказалі: працуйце там, дзе вы патрэбныя. Тады мы паслалі тэлеграму на імя таварыша Сталіна, што ахвяруем пяцьдзясят тысяч рублёў (на той час вялікія грошы, гэта ўсё, што ў нас было) на будаўніцтва танка і жадаем разам ісці на фронт. Нам даслалі ліст падзякі ад імя ўраду. І ў сорак трэцім годзе мяне з мужам накіравалі ў Чалябінскую танкава-тэхнічную вучэльню, якую мы скончылі экстэрнам.

Там жа атрымалі танк. Мы абое былі старшымі механікамі-кіроўцамі, а ў танку можа быць толькі адзін механік-кіроўца. Камандаванне вырашыла прызначыць мяне камандзірам танка "ІС-122", а мужа — старшым механікам-кіроўцам. І так мы з ім даехалі да Германіі. Абое параненыя. Маем узнагароды.

Хапала дзяўчат-танкістак на сярэдніх танках, а вось на цяжкім — я адна. Часам думаю, каб хто з пісьменнікаў запісаў маё жыццё, сама я не ўмею...»

*А. Бойка, малодшы лейтэнант, танкістка*

«Сорак другі год… Мяне прызначылі камандзірам дывізіёна. Камісар палка папярэдзіў: “Улічыце, капітан, вы атрымалі не звычайны, а “жаночы” дывізіён. У ім палова складу дзяўчаты, і яны патрабуюць іншага падыходу, іншай увагі і клопату”. Я, безумоўна, ведаў, што у нас у войску ёсць і дзяўчаты, але дрэнна сабе гэта ўяўляў. Мы, кадравыя афіцэры, насцярожана сачылі, як “слабы пол” засвойвае вайсковую справу, якая адвеку лічылася мужчынскай. Ну, скажам, медыцынскія сёстры — гэта звыкла. Яны добра сябе паказалі яшчэ ў Першую сусветную вайну, а затым у грамадзянскую. А што будуць рабіць дзяўчаты ў зенітнай артылерыі, дзе трэба цягаць пудовыя снарады? Як змясціць іх на батарэі, дзе ўсяго адна зямлянка, а ў нас ёсць і мужчыны? Ім трэба будзе гадзінамі сядзець на прыборах, а яны металёвыя, сядалішчы на зенітных гарматах таксама металёвыя, а гэта ж дзяўчаты, ім так нядобра. Урэшце, дзе яны будуць мыць і сушыць валасы? Паўставала мноства нечаканых пытанняў, такая гэта была нязвыклая справа…

Пачаў на батарэях больш пільна прыглядацца. Шчыра скажу, спачатку адчуваў нейкую няёмкасць: дзяўчына на варце з вінтоўкай, дзяўчына на вышцы з біноклем — я ж з перадавой прыйшоў, з фронту. І такія розныя яны — сарамлівыя, палахлівыя, капрызлівыя і адважныя, як кажуць, з аганьком. Падпарадкоўвацца вайсковай дысцыпліне не ўсе ўмеюць, жаночая натура супраціўляецца вайсковаму парадку. То забылася, што ёй загадана было зрабіць, то атрымала з дому ліст і ўвесь ранак праплакала. Пакараеш, а потым скасуеш пакаранне — шкада. Нават думкі былі: “Напакутуюся я з гэтым народам!”. Але хутка ўсе сумневы і перасцярогі зніклі. Дзяўчаты зрабіліся сапраўднымі салдатамі. Мы

з імі адолелі ўсе выпрабаванні. Прыязджайце. Будзем доўга размаўляць…».

*І. А. Лявіцкі, былы камандзір пятага дывізіёна*
*семсот восемдзесят чацвёртага*
*зенітна-артылерыйскага палка*

Адрасы самыя розныя — Масква, Кіеў, горад Апшаронск Краснадарскага краю, Віцебск, Валгаград, Ялутараўск, Суздаль, Галіч, Смаленск… Як ахапіць? Краіна бязмежная. І тут дапамагае выпадак. Нечаканая падказка. Пошта прыносіць запрашэнне ад ветэранаў шэсцьдзесят пятай арміі генерала П. І. Батава: «Збіраемся мы звычайна шаснаццатага-сямнаццатага мая ў Маскве на Чырвонай плошчы. І традыцыя, і абрад. Збіраюцца ўсе, хто яшчэ мае моц. Едуць з Мурманска і Караганды, з Алма-Аты і Омска. Адусюль. З усёй нашай неабдымнай Радзімы… Карацей кажучы, чакаем…».

Гасцініца «Масква». Месяц май — месяц Перамогі. Усюды абдымаюцца, плачуць, фатаграфуюцца. Не зразумець, дзе кветкі, прытуленыя да грудзей, а дзе ордэны і медалі. Я ўваходжу ў гэтую плынь, яна падхоплівае мяне і нястрымна цягне за сабой — хутка я апынаюся ў амаль незнаёмым свеце. На незнаёмым востраве. Сярод людзей, якіх пазнаю і не пазнаю, але ведаю адно — я іх люблю. Звычайна яны губляюцца сярод нас, непрыкметныя, таму што ўжо сыходзяць, іх робіцца ўсё меней і меней, а нас болей, але раз на год яны збіраюцца разам, каб хоць на трохі вярнуцца ў свой час. А іх час — гэта іх успаміны.

На сёмым паверсе ў пяцьдзясят другім пакоі згуртаваўся пяць тысяч дзвесце пяцьдзясят сёмы шпіталь. Рэй вядзе Аляксандра Іванаўна Зайцава, вайсковы доктар, капітан. Узрадавалася і знаёміць мяне з усімі, як быццам

мы з ёй даўно ведаем адна адну. А я зусім выпадкова адчыніла гэтыя дзверы. Не ведаючы, хто за імі.

Запісваю: Галіна Іванаўна Сазонава, хірург, Лізавета Міхайлаўна Айзенштэйн, доктар, Валянціна Васілеўна Лукіна, хірургічная медсястра, Ганна Ігнатаўна Гарэлік, старшая аперацыйная медсястра, і медсёстры Надзея Фёдараўна Патужная, Клаўдзія Прохараўна Барадуліна, Алена Паўлаўна Якаўлева, Ангеліна Мікалаеўна Цімафеева, Сафія Камалдзінаўна Матрэнка, Тамара Дзмітрыеўна Марозава, Сафія Філімонаўна Семянюк, Ларыса Ціханаўна Дзяйкун.

## Пра лялькі і вінтоўкі

«Эх-эх, дзеванькі, якая яна паскудная, гэтая вайна... Зірнеш на яе нашымі вачыма. Бабінымі... Дык яна жахоцце жахлівае. Таму нас і не пытаюцца...»

«Памятаеце, дзяўчаты: едзем у цяплушках... І салдаты смяюцца, як мы трымаем вінтоўкі. Трымаем не так, як зброю трымаюць, а вось так... Цяпер нават і не пакажу... Як лялькі трымаем...»

«Людзі плачуць, крычаць... Я чую слова: “Вайна!”. І думаю: “Якая вайна, калі заўтра ў інстытуце экзамен? Экзамен — гэта так важна. Якая можа быць вайна?”.

А праз тыдзень пачалі бамбаваць, мы ўжо ратавалі людзей. Тры курсы медінстытута — гэта ўжо нешта ў такі час. Але ў першыя дні я пабачыла столькі крыві, што пачала яе баяцца. Вось табе і палова доктара, вось табе і “пяцёрка” па практыцы. Але людзі паводзілі сябе неверагодна. І гэта ўзрушала.

Дзяўчаты, я вам пераказвала... Скончылася бамбаванне — зямля паперадзе мяне варушыцца. Бягу туды і пачынаю рукамі капаць. Намацала твар, валасы... Гэта была жанчына... Адкапала яе і пачала над ёй плакаць. А яна, калі расплюшчыла вочы, не запыталася, што з ёй, яна захвалявалася:

—Дзе мая сумачка?

—Што вам цяпер сумачка? Знойдзецца.

—У мяне там дакументы.

Яе думкі былі не пра тое, як яна, ці цэлая, а дзе яе партбілет і вайсковы білет. Я адразу пачала шукаць тую сумачку. Знайшла. Яна паклала сабе на грудзі і заплюшчыла вочы. Хутка пад'ехала санітарная машына, і мы яе пагрузілі. Я яшчэ раз праверыла, як там яе сумачка.

А ўвечары вяртаюся дадому, распавядаю пра ўсё маме і кажу, што вырашыла пайсці на фронт...»

«Адступалі нашыя... Мы ўсе выйшлі на дарогу... Праходзіць пажылы салдат, спыніўся каля нашай хаты, проста ў ногі кланяецца маёй маме: “Прабач, маці... А дзяўчынку ратуй! Ой, ратуй дзяўчынку!”. Мне тады было шаснаццаць гадоў, у мяне каса вялікая... І вось такія! — вейкі чорныя...»

«Згадваю, як мы ехалі на фронт... Поўная машына дзяўчат, вялікая крытая машына. Была ноч, цёмна, галіны лупяць па брызенце, і такая напруга, што, здаецца, гэта кулі, нас абстрэльваюць... З вайной змяніліся і словы, і гукі... Вайна... Дык цяпер яна заўсёды побач! Кажаш “мама”, і гэта ўжо зусім іншае слова, кажаш “дом”, і гэта таксама зусім іншае. Нешта да іх яшчэ дадалося. Дадалося болей любові, болей страху. Нечага яшчэ...

Але з першага дня я была пэўная, што яны нас не перамогуць. Такая вялікая наша краіна. Бясконцая...»

«Маміна дачка... Я ніколі не пакідала свайго горада, не начавала ў чужым доме, а трапіла малодшым доктарам у мінамётную батарэю. Што са мной рабілася! Пачнуць мінамёты страляць, я адразу глухну. Мяне ўсю як бы абпальвае. Сяду і шапчу: "Мама, мамачка... Мамачка...". Стаялі мы ў лесе, зранку выйдзеш — ціха, раса вісіць на траве... Няўжо гэта вайна? Калі так прыгожа, калі так хораша...

Сказалі надзець усё ваеннае, а я метр пяцьдзясят. Залезла ў штаны, дзяўчаты мне пад грудзямі іх завязалі... Таму я хадзіла ў сваёй сукенцы, а ад начальства хавалася. Ну, і мяне за парушэнне вайсковай дысцыпліны пасадзілі на гаўптвахту...»

«Ніколі б не дала веры... Я і ўявіць не магла, што буду спаць на нагах. Ідзеш з аддзяленнем і спіш, уткнешся ў таго, хто спераду, прачнешся на хвіліну — і зноў спіш. Салдацкі сон усюды салодкі. Аднойчы ў цемры мяне не наперад, а ўбок хіснула, я і пайшла па полі, іду і сплю. Пакуль у нейкую канаву не звалілася, тады прачнулася — і бегма даганяць сваіх.

Салдаты сядуць на прывале — адна самакрутка на траіх. Пакуль першы курыць, другі і трэці спяць. Нават пахропваюць...»

«Не забуду: прывезлі параненага, знялі з насілак... Нехта ўзяў яго руку: "Не, ён мёртвы". Адступіліся. І тут паранены ўздыхнуў. Я стала на калені перад ім, калі ён уздыхнуў. Плачу і крычу: "Доктара! Доктара!". Яго падымаюць, трасуць, а ён зноў валіцца, як сноп, так моцна

спіць. Не змаглі яго разбудзіць нават нашатырам. Ён перад гэтым трое сутак не спаў.

А якія цяжкія параненыя ўзімку… Задубелыя гімнасцёркі ад крыві і снегу, кірзавыя боты поўныя крывавага лёду — не разрэзаць. Усе яны халодныя, як мерцвякі.

У акно зірнеш — зіма і прыгажосць казачная. Чароўныя белыя яліны. На хвіліну на ўсё забудзешся… І зноў…»

«Гэта быў лыжны батальён… Там адны дзесяцікласнікі… Іх з кулямёта паклалі… Яго такога прывозяць, ён плача. Мы з ім аднагодкі, але ўжо старэйшымі пачуваемся. Абдымеш яго: "Дзіця мілае". А ён: "Каб пабыла там, не сказала б тады — дзіця". Ён памірае і крычыць усю ноч: "Мама! Мама!". Там былі курскія два хлопцы, мы іх звалі "курскія салаўі". Прыйдзеш будзіць, ён спіць, у яго сліна на губах. Зусім дзеткі…»

«Суткамі стаялі ля аперацыйнага стала… Стаіш, а рукі самі падаюць. Бывае, уткнешся галавой у таго, хто на стале. Спаць! Спаць! Спаць! У нас апухалі ногі, не лезлі ў кірзавыя боты. Да таго вочы натомяцца, што цяжка іх заплюшчыць…

У маёй вайны тры пахі: крыві, хлараформу і ёду…»

«Вох! А раны… Шырокія, глыбокія, ірваныя… Можна было звар'яцець… Кулі, аскепкі ад гранат, снарадаў у галаве, у кішках — ва ўсім целе. А разам з імі салдацкія гузікі, кавалкі гімнасцёркі, шынялёў, скураных папругаў. У аднаго салдата ўсе грудзі раскірэчаныя, сэрца відаць… Яшчэ пульсуе, але ён памірае… Раблю апошнюю перавязку і ледзьве трымаюся, каб не заплакаць.

Хутчэй, думаю, скончыць і схавацца куды ў закутак, каб наплакацца. А ён мне: “Дзякуй, сястрычка...” і працягвае ў руцэ нешта маленькае, металёвае. Я разгледзела: скрыжаваныя шабля і стрэльба. “Навошта аддаеш?” — пытаю. — “Мама сказала, што гэты талісман мяне выратуе. Але ён мне ўжо не патрэбны. Можа, ты больш шчаслівая за мяне?” — сказаў так і адвярнуў галаву.

Пад вечар кроў у валасах, прасочваецца праз халат да цела, яна на шапачках і масках. Чорная, цягучая, змяшаная з усім, што ёсць у чалавеку. З мачой, з калам...

А іншым разам пакліча хто-небудзь: “Сястрычка, у мяне нага баліць”. А нагі няма. Болей за ўсё баялася насіць мёртвых, вецер падыме прасціну, і ён на цябе глядзіць. Не магла несці, калі быў з расплюшчанымі вачыма, вазьму і заплюшчу...»

«Прывезлі параненага... Ляжыць на насілках, амаль уся галава забінтаваная, толькі трохі твар відаць. Ледзь-ледзь. Але, мабыць, я яму некага нагадала, ён да мяне звяртаецца: “Ларыса... Ларыса... Лорачка”. Напэўна, гэта імя дзяўчыны, якую ён кахаў. А гэта — маё імя, толькі я ведаю, што ніколі такога чалавека не сустракала, а ён кліча мяне. Я наблізілася і ўсё прыглядаюся: “Ты прыйшла? Ты прыйшла?”. Я за руку яго ўзяла, нахілілася... “Я ведаў, што ты прыйдзеш...”. Ён нешта шэпча, але я не разумею, што ён шэпча. І цяпер не магу спакойна казаць, як згадаю той выпадак, слёзы цякуць. “Я, — шэпча мацней, — калі ішоў на фронт, не паспеў цябе пацалаваць. Пацалуй мяне...”.

І я нахілілася да яго і пацалавала. У яго сляза выкацілася і паплыла ў бінты, схавалася. І ўсё. Ён памёр...»

## Пра пах крыві і здзіўленне перад смерцю

«Людзі не хацелі паміраць... Мы на кожны стогн адгукаліся, на кожны крык. Мяне адзін паранены, як адчуў, што памірае, вось так за плячо абхапіў, абняў і не адпускае. Яму здавалася, што калі поруч з ім нехта, калі сястра побач, дык ад яго жыццё не сыдзе. Ён прасіў: "Яшчэ б пяць хвілінак пажыць. Яшчэ б дзве хвілінкі...". Адны паміралі нячутна, неўпрыкмет, іншыя енчылі: "Не хачу паміраць!". Лаяліся: маць тваю... Адзін раптам заспяваў... Заспяваў малдаўскую песню. Чалавек памірае, але ўсё роўна не думае, не верыць, што ён памірае. А ты бачыш, як з-пад валасоў расплывецца жоўты-жоўты цень, як ён спачатку пакрывае твар, а потым праслізгвае пад апратку... Ён ляжыць мёртвы, і на ягоным твары нейкае здзіўленне, быццам ён думае: як гэта я памёр? Няўжо я памёр?

Пакуль ён чуе... Да апошняга моманту кажаш яму, што не-не, хіба можна памерці. Цалуеш яго, абдымаеш: што ты, што ты? Ён ужо мёртвы, вочы ў столь, а я яму яшчэ нешта нашэптваю... Супакойваю... Прозвішчы забыліся, сышлі з памяці, а твары засталіся...»

«Нясуць параненых... Яны плачуць... Плачуць не ад болю, ад бездапаможнасці. Першы дзень, як іх прывезлі на фронт, некаторыя ні разу не стрэлілі. Ім не паспелі выдаць вінтоўкі, бо зброя на пачатку вайны была на вагу золата. А ў немцаў танкі, мінамёты, самалёты. Таварышы падалі, яны падбіралі іх вінтоўкі. Гранаты. З голымі рукамі ішлі ў бой... Як у хлапечую бойку...

А тут танкі...»

«Калі яны паміралі... Як яны глядзелі... Як яны...»

«Мой першы паранены… Куля трапіла яму ў горла, ён жыў яшчэ некалькі дзён, але не мог гаварыць…

Адразаюць нагу ці руку, крыві няма… А ёсць белае, чыстае мяса, кроў потым. Я і цяпер не магу разбіраць курыцу, калі белае чыстае мяса. У мяне салёна-салёна ў роце робіцца…»

«У палон вайсковых жанчын немцы не бралі… Адразу расстрэльвалі. Альбо вадзілі перад сваімі салдатамі і паказвалі: вось, маўляў, не жанчыны, а пачвары. І мы заўсёды два патроны для сябе трымалі, два — на выпадак асечкі.

У нас трапіла ў палон медсястра… Праз дзень, калі мы вярнулі тую вёску, усюды валяліся мёртвыя коні, падбітыя матацыклы, бронетранспарцёры. Знайшлі яе: вочы выкалатыя, грудзі адрэзаныя… Яе пасадзілі на кол… Мароз, і яна белая-белая, і валасы ўсе сівыя. Ёй было дзевятнаццаць гадоў.

У заплечніку мы знайшлі лісты з дому і гумовую зялёную птушачку. Дзіцячую цацку…»

«Мы адступаем… Нас закідаюць бомбамі. Першы год адступалі і адступалі. Фашысцкія самалёты лёталі нізка-нізка, ганяліся за кожным чалавекам. А заўсёды здаецца — за табой. Я бягу… Бачу і чую, што самалёт кіруецца на мяне… Бачу лётчыка, ягоны твар, і ён бачыць, што дзяўчаты… Санітарны абоз… Кулямётныя чэргі па вазах, і яшчэ ўсміхаецца. Ён гуляўся… Такая нахабная, ашчэраная ўхмылка… І прыгожы твар…

Я не вытрымліваю… Крычу… Уцякаю ў кукурузу — ён туды, я да лесу — ён мяне прыціскае да зямлі. Ужо — хмызы… Заскочыла ў лес, звалілася ў леташнюю лістоту. У мяне цячэ кроў з носа ад жаху, не

ведаю: жывая ці не жывая? Ды не, жывая… З той пары вельмі баялася самалётаў. Ён яшчэ недзе далёка, а я ўжо страшуся, я ўжо ні пра што не думаю, а толькі што ён ляціць, дзе мне схавацца, куды ўкрыцца, каб не бачыць і не чуць. Дагэтуль ад гуку самалёта трывожуся. Не лётаю…»

«Эх-эх, дзеванькі…»

«Перад вайной я збіралася замуж… За свайго настаўніка музыкі… Вар'яцкая гісторыя. Я моцна закахалася… І ён… Але мама не пусціла: "Малая яшчэ!".

Неўзабаве пачалася вайна. Я папрасілася на фронт. Хацелася з'ехаць з дому, хутчэй стаць дарослай. Дома плакалі, але збіралі ў дарогу. Цёплыя шкарпэткі, бялізна…

Першага забітага пабачыла ў першы дзень… Выпадкова ў двор школы, дзе быў шпіталь, заляцеў аскепак і смяротна параніў нашага фельчара. І я падумала: для шлюбу, мама вырашыла, я малая, а для вайны не… Мая любая мама...».

«Толькі спынімся… Разгорнем шпіталь, загрузяць нас параненымі, і тут — загад: эвакуявацца. Параненых каго пагрузім, а каго — не. Не хапае машынаў. Нас прыспешваюць: "Пакідайце. Ратуйцеся самі". Ты збіраешся, а яны на цябе глядзяць. Праводзяць вачыма. У іхніх вачах: пакора, крыўда… Просяць: "Браткі! Сястрычкі! Не пакідайце нас немцам. Забіце". Такая туга! Такая туга!! Хто можа рухацца, той ідзе з намі. Не можа — застаецца. І ты нікому з іх ужо не ў стане дапамагчы, баішся вочы падняць… Маладая была, плачу-плачу…

Калі ўжо наступалі, мы ніводнага нашага пакалечанага не пакінулі. Нават нямецкіх параненых падбіралі. І я нейкі час з імі працавала. Звыкнуся, перавязваю, як быццам нічога. А як згадаю сорак першы год, як сваіх параненых пакідалі і што яны з імі... Як яны з імі... Мы бачылі... Здаецца, да ніводнага болей не дакрануся... А назаўтра іду і перавязваю...»

«Мы ратавалі... Але многія шкадавалі, што яны медыкі і могуць толькі перавязваць, а не трымаць у руках зброю. Што не страляюць... Я не забылася... Я памятаю гэтае пачуццё. Памятаю, што на снезе пах крыві асабліва моцны... Забітыя... Яны валяліся на палях. Птушкі павыдзяўбалі ім вочы, знявечылі твар, рукі. Вой, немагчымае жыццё...»

«Напрыканцы вайны... Я баялася пісаць дамоў лісты. Не буду, думаю, пісаць, а то раптам мяне заб'юць і мама будзе плакаць, што вайна скончылася, а я загінула перад самай Перамогай. Ніхто пра гэта не казаў, але ўсе пра гэта думалі. Ужо мы адчувалі, што хутка пераможам. Ужо вясна пачалася.

Я раптам убачыла, што неба сіняе...»

«Што мне помніцца? Што засталося ў памяці? Гэта цішыня, незвычайная цішыня ў палатах, дзе ляжалі цяжка параненыя... Самыя цяжкія... Яны не размаўлялі паміж сабой. Нікога не клікалі. Шмат хто ў бяспамяцтве. А найчасцей ляжыць і маўчыць. Думае. Некуды ўбок глядзіць і думае. Клікнеш — не чуе.

Пра што яны думалі?»

## Пра коней і птушак

«А мы ехалі, ехалі…

Стаяць на станцыі побач два цягнікі… Адзін з параненымі, другі — з коньмі. І вось пачалі бамбаваць. Цягнікі загарэліся… Мы сталі адчыняць дзверы, ратаваць параненых, каб яны ўцякалі, а яны ўсе кінуліся да падпаленых вагонаў ратаваць коней. Як скалечаныя людзі енчаць — страшна, але няма нічога страшнейшага, калі ржуць параненыя коні. Яны ж ні ў чым не вінаватыя, яны за людскія справы не адказваюць. І ніхто не пабег у лес, а ўсе кінуліся ратаваць коней. Усе, хто мог. Усе!

Я хачу сказаць… Я хачу сказаць, што фашысцкія самалёты лёталі каля зямлі. Нізка-нізка. Я потым разважала: нямецкія лётчыкі ўсё бачылі, няўжо ім не было сорамна? Пра што яны думалі…»

«Запомніўся адзін выпадак… Прыйшлі мы ў мястэчка, а там каля лесу ляжаць забітыя партызаны. Як з іх здзекаваліся, я пераказаць не змагу, сэрца не вытрывае. Іх рэзалі па кавалках… Кішкі вывалілі, як у свіней… Яны ляжаць… А побач коні пасуцца. Бачна, коні партызанскія, нават з сёдламі. Ці яны ўцяклі ад немцаў, ці іх тыя не паспелі забраць, — незразумела. Яны далёка не адышлі. Травы шмат. І яшчэ думка: як гэта людзі такое пры конях вычваралі? Пры жывёлах. Коні на іх глядзелі…»

«Гарэлі поле і лес… Дыміўся поплаў. Я бачыла згарэлых кароваў і сабак… Пах нязвыклы. Незнаёмы. Бачыла згарэлыя бочкі з памідорамі, з капустай. Птушкі гарэлі. Коні… Шмат… Шмат усяго чорнага валялася на дарогах. З гэтым пахам таксама трэба было звыкнуцца…

Я тады зразумела, што гарэць можа ўсё... Нават кроў гарыць...»

«Падчас бамбавання прыбілася да нас каза. З намі легла. Проста побач легла і гучна мэкае. Адляцелі самалёты, яна з намі ідзе і ўсё ціснецца да ног, ну, жывое, таксама баіцца. Дайшлі да нейкай вёскі і кажам адной жанчыне: "Забярыце, шкада". Хацелася выратаваць...»

«У маёй палаце было двое... Ляжалі — немец і наш абпалены танкіст. Я заходжу:

— Як вам пачуваецца?

— Мне добра, — адказвае наш танкіст. — А гэтаму дрэнна.

— Гэта ж фашыст...

— Не, я нічога, а яму дрэнна.

Ужо яны не ворагі, а людзі, проста два параненыя чалавекі побач ляжаць. Паміж імі з'яўляецца чалавечае. Не аднойчы бачыла, як гэта хутка адбываецца...»

«Гэта як жа... Ну, як... Самі ўзіраліся... Ляцяць позняй восенню птушкі... Доўгія-доўгія чароды. Артылерыя наша і нямецкая страляе, а яны ляцяць. Як ім крыкнуць? Як папярэдзіць: "Сюды нельга! Тут страляюць!". Як?! Птушкі падаюць, падаюць на зямлю...»

«А нам прывезлі на перавязку эсэсаўцаў... Эсэсаўскіх афіцэраў. Падыходзіць да мяне медсястра:

— Як мы іх будзем перавязваць? Ірваць ці нармальна?

— Нармальна. Гэта параненыя...

І мы іх перавязвалі нармальна. Двое потым уцяклі. Іх злавілі, і каб яны не збеглі яшчэ раз, я ім гузікі зрэзала на кальсонах...»

«Калі мне сказалі… Вось гэтыя словы: “Скончылася вайна”. Я ўзяла і села на стэрыльны стол. Мы з доктарам дамовіліся, што калі аб’явяць пра канец вайны, мы сядзем на стэрыльны стол. Зробім нешта такое, неверагоднае. Я ж нікога не падпускала да стала, не падпускала на гарматны стрэл. У мяне пальчаткі, я ў масцы, на мне стэрыльны халат, і я сама падавала ўсім што трэба: тампоны, інструменты… А тут узяла і села на гэты стол…

Пра што мы марылі? Першае, зразумела, — перамагчы, другое — застацца жывымі. Адна — “Скончыцца вайна, і я панараджаю гурму дзяцей”, другая — “Я паступлю ў інстытут”, трэцяя — “А я з цырульні не буду вылазіць. Стану прыгожа апранацца, сябе даглядаць”. Або: “Куплю найлепшую парфуму. Шалік куплю і брошачку”.

І вось гэты час настаў. Усе раптам сцішыліся…»

«Адбілі вёску… Шукаем, дзе набраць вады. Зайшлі на падворак, над якім заўважылі калодзежны журавель. Разны драўляны калодзеж… Ляжыць у двары расстраляны мужчына… А каля яго сядзіць сабака. Пабачыў нас, стаў павіскваць. Не адразу зразумелі, а ён клікаў. Павёў у хату… Пайшлі за ім. На ганку ляжыць жанчына і трое дзетак…

Сабака сеў каля іх і плача. Па-сапраўднаму плача. Па-чалавечы…»

«Мы рушылі праз нашыя сёлы… Там адно коміны засталіся — і ўсё. Толькі коміны! Ва Украіне мы вызвалялі месцы, дзе акрамя кавуноў нічога не расло, людзі елі гэтыя кавуны, і болей нічога ў іх не было. Яны сустракалі нас і неслі кавуны… Замест кветак…

Я вярнулася дахаты. У зямлянцы — маці, трое дзяцей, сабачка ў нас вараную лебяду еў. Наварыць лебяды,

самі ядуць, дадуць сабачку. І ён еў... У нас да вайны столькі салаўёў было, а пасля вайны два гады іх ніхто не чуў, уся зямля была перавернутая, паднялі, як кажуць, дзедаўскі гной. Перааралі. Салаўі на трэці год толькі з'явіліся. Дзе яны былі? Ніхто не ведае. На свае месцы вярнуліся адно праз тры гады.

Людзі хаты паставілі, тады і салаўі прыляцелі...»

«Як пабачу палявыя кветкі — вайну згадаю. Тады мы кветак не рвалі. А як збіралі букеты, дык адно тады, калі хавалі... Калі развітваліся...»

«Эх-эх, дзеванькі, якая яна паскудная... Гэтая вайна... Памянём нашых сябровак...»

# «ГЭТА БЫЛА НЕ Я...»

Што больш за ўсё запамінаецца?

Запамінаецца ціхі, часта няўпэўнены голас чалавека. Чалавек адчувае здзіўленне перад самім сабой, перад тым, што з ім было. Мінулае знікла, засціла вочы палымянай віхурай і згасла, а ён застаўся. Застаўся сярод штодзённага жыцця. Усё вакол шараговае, акрамя яго памяці. І я таксама раблюся яе сведкай. Сведкай таго, што людзі ўспамінаюць і як успамінаюць, пра што прагнуць казаць, а што спрабуюць забыць ці адсунуць у самы далёкі закутак памяці. Занавесіць. Як яны пакутуюць у пошуках словаў, але імкнуцца аднавіць зніклае ў надзеі, што на адлегласці змогуць зразумець яго сапраўдны сэнс. Убачыць і зразумець тое, чаго не ўбачылі і не зразумелі тады. Там. Разглядаюць самі сябе, наноў сустракаюцца самі з сабой. Часта гэта ўжо два чалавекі — той чалавек і гэты, малады і стары. Чалавек на вайне і чалавек пасля вайны. Даўно пасля вайны. Мяне ўвесь час не пакідае адчуванне, што я чую адразу два галасы...

Там жа, у Маскве, на дзень Перамогі, я сустрэла Вольгу Якаўлеўну Амельчанка. Усе жанчыны былі ў вясенніх сукенках, светлых хустках, а яна — у вайсковай форме і ў вайсковым берэце. Высокая, моцная. Не прамаўляла і не плакала. Увесь час маўчала, але гэта была нейкая адметная моўча, у ёй адчувалася больш сказанага, чым у словах. Яна як быццам увесь час размаўляла сама з сабой. Ніхто ёй ужо не быў патрэбны.

Мы пазнаёміліся, а потым я прыехала да яе ў Полацк.

Тут разгарнулася яшчэ адна старонка вайны, перад якой зніякавее любая фантазія…

*Вольга Якаўлеўна Амельчанка, санінструктарка стралковай роты:*

«Мамін талісман… Мама хацела, каб я эвакуявалася разам з ёй, яна ведала, што я прагну трапіць на фронт, і прывязала мяне да падводы, на якой везлі нашыя рэчы. Але я неўпрыкмет адвязалася і сышла, кавалак гэтай вяроўкі ў мяне на руцэ застаўся…

Усе едуць… Бягуць… Куды падзецца? І як трапіць на фронт? Па дарозе сустрэлася з групай дзяўчат. Адна з іх кажа: "Тут мая мама недалёка, хадзем да мяне". Прыйшлі мы ноччу, пастукалі. Адчыняе яе маці, як зірнула на нас, а мы брудныя, абарваныя, — загадала: "Стойце на ганку". Мы стаім. Яна прыцягнула вялізныя чыгуны, з нас усё паздымала. Вымылі мы галовы попелам (мыла ўжо не было) ды палезлі на печку, я імгненна заснула. Зранку маці гэтай дзяўчыны наварыла капусты, хлеба напякла з вотруб'я і бульбы. Якім смачным падаўся нам той хлеб, а гарачая капуста такой салодкай! І так былі мы там чатыры дні, яна нас падкормлівала. Давала патроху, бо баялася, што аб'ямося і памром. На пяты дзень сказала: "Ідзіце". А перад гэтым завітала суседка, мы сядзелі на печцы. Маці паказала нам пальцам, каб маўчалі. Нават суседзям яна не сказала, што дачка ў хаце, усе ведалі — дачка яе на фронце. А гэтая дзяўчынка ў яе адна-адзіная, і яна яе не шкадавала, не магла дараваць ганьбы, што тая вярнулася. Не змагаецца.

Ноччу яна нас пабудзіла, дала торбачкі з харчам і кожнай сказала: "Ідзіце…".

—І нават не спрабавала ўтрымаць сваю дачку?

—Не, яна яе пацалавала са словамі: “Бацька ваюе, і ты ідзі ваяваць”.

Ужо дарогай гэтая дзяўчына прызналася, што яна медсястра, трапіла ў акружэнне…

Доўга мяне кідала па розных месцах, і нарэшце я апынулася ў горадзе Тамбове, уладкавалася ў шпіталь. Там было добра, я пасля галадавання ад'елася, такая кругленькая зрабілася. І вось калі споўнілася шаснаццаць гадоў, мне сказалі, што я магу, як усе медсёстры і дактары, здаваць кроў. Пачала я здаваць кроў рэгулярна. Шпіталю патрэбныя былі сотні літраў, крыві не хапала. Здавала адразу па пяцьсот кубікаў, па паўлітра крыві два разы на месяц. Атрымлівала донарскі паёк: кіло цукру, кіло манкі, кіло каўбасы, каб аднавіць сілы. Я сябравала з нянечкай цёткай Нюрай, у яе было сямёра дзяцей, а муж загінуў на пачатку вайны. Старэйшы хлопчык, якому адзінаццаць гадкоў, пайшоў па харчы і згубіў картачкі, дык я свой донарскі паёк аддавала ім. Адзін раз доктар мне кажа: “Давай напішам твой адрас, раптам адгукнецца той, хто скарыстаецца з тваёй крыві”. Мы напісалі адрас і прыклеілі гэтую паперку да бутэлечкі.

І вось праз нейкі час, месяцы два мінула, не болей, я змянілася пасля дзяжурства і пайшла, спаць легла. Раскатурхалі мяне:

—Падымайся! Падымайся, да цябе брат прыехаў.

—Які брат? Няма ў мяне брата.

Наш інтэрнат быў на апошнім паверсе, я сышла ўніз, гляджу: стаіць лейтэнант малады, прыгожы. Пытаюся:

—Хто тут шукаў Амельчанка?

Ён адказвае:

—Я шукаю. — І паказвае мне паперчыну, якую мы з доктарам напісалі. — Вось… Я твой брат па крыві…

Прынёс мне два яблыкі, пакуначак цукерак, тады цукерак нідзе немагчыма было купіць. Божухна! Якія гэта былі смачныя цукеркі! Пайшла да начальніка шпіталя: "Брат прыехаў!". Той даў мне звальненне. Ён запрасіў: "Хадзем у тэатр". А я яшчэ ні разу ў жыцці не была ў тэатры, а тут у тэатр ды яшчэ з хлопцам. З прыгожым. З афіцэрам.

Праз некалькі дзён ён з'ехаў, у яго было накіраванне на Варонежскі фронт. Калі прыйшоў развітвацца, я расчыніла акно і памахала рукой. Да яго мяне не пусцілі — якраз прывезлі шмат параненых.

Ні ад каго лістоў не атрымлівала, нават не ўяўляла, што гэта такое — атрымаць ліст. І раптам мне прыносяць трыкутнік, раскрыла, а там напісана: "Ваш сябар, камандзір кулямётнага ўзвода... загінуў смерцю мужных...". Гэта той, мой брат па крыві. Ён сам з дзіцячага дома, і, відаць, адзіны адрас, які ў яго быў, — гэта мой. Мой адрас... Калі ад'язджаў, дык моцна прасіў, каб я заставалася ў гэтым шпіталі, пасля вайны будзе лягчэй мяне знайсці. "На вайне, — перасцерагаў, — лёгка згубіцца". І вось праз месяц я атрымліваю гэты ліст... І мне зрабілася так страшна... Сэрца сцялася... Я вырашыла зрабіць усё, што ў маіх сілах, каб пайсці на фронт і адпомсціць за маю кроў, цяпер я ведала, што недзе там пралілася мая кроў...

Але на фронт трапіць было няпроста. Тры рапарты напісала начальніку шпіталя, а на чацвёрты раз пайшла сама на прыём:

—Калі вы не адпусціце, дык збягу без дазволу...

—Ну, добра. Дам табе накіраванне, калі такая зацятая.

Самае страшнае, канешне, першы бой. Ну, таму, што ты яшчэ нічога не ведаеш... Неба гудзе, зямля

гудзе, здаецца, сэрца разарвецца, скура на табе ось-вось пэнкне. Не думала, што зямля можа трашчаць. Усё трашчала, усё грукатала. Калыхалася... Уся зямля... Я проста знемагала... Як мне ўсё гэта пераажыць... Думала, што не вытрываю. Мне так дрэнна зрабілася, і вось што я вырашыла: каб не самлець, выняла свой камсамольскі білет, абмакнула ў кроў параненага і паклала сабе ў кішэньку каля сэрца, зашпіліла. І вось гэтым я дала сабе клятву, што мушу вытрываць, самае галоўнае — не перапалохацца, бо калі я збаюся ў першым баі, то далей ужо нічога не будзе. Мяне выганяць з перадавой, вернуць у медсанбат. А я хацела быць толькі тут, мне трэба было пабачыць хоць аднаго фашыста ў твар... На свае вочы... І мы наступалі, ішлі па траве, а трава вырасла да пояса. Там ужо некалькі год не сеялі. Ісці было вельмі цяжка. Гэта на Курскай дузе...

Пасля бою выклікаў мяне начальнік штаба. Нейкая хацінка напаўразбураная, там нічога няма.. Стаіць адно крэсла, і ён стаіць. Пасадзіў мяне на гэтае крэсла:

—Ну вось гляджу я на цябе і думаю: што змусіла дзяўчыну пайсці ў гэтае пекла? Заб'юць, як муху. Гэта ж вайна. Крывавая сячкарня! Давай адпраўлю хаця б у санчастку. Ну, добра, калі заб'юць, а калі застанешся без вачэй, без рук? Ты падумала пра гэта?

А я адказваю:

—Таварыш палкоўнік, я падумала. І пра адно прашу: не чапайце мяне.

—Ну, хай сабе, ідзі! — як крыкне на мяне, я нават спалохалася. І адвярнуўся да акна...

Баі цяжкія. У рукапашнай была... Гэта жах... Гэта не для чалавека... Б'юць, колюць штыхом, душаць за горла адзін аднаго. Ломяць косткі. Енк стаіць, крык. Стогн. І гэты хруст... Гэты хруст! Яго не забыць. Хруст костак...

Ты чуеш, як чэрап трашчыць. Разломваецца… Нават для вайны гэта болей, чым жах, нічога чалавечага тады няма. Нікому не дам веры, калі скажа, што на вайне не страшна. Вось немцы падняліся і рушаць, яны заўсёды ідуць з закасанымі па локаць рукавамі, яшчэ пяць-дзесяць хвілінаў і атака. Цябе пачынае ліхаманіць. Па скуры мурашкі. Але гэта да першага стрэлу… А там… Як пачуеш каманду, ужо нічога не памятаеш, разам з усімі падымаешся і бяжыш. І ўжо не думаеш пра страхі. А вось на другі дзень ты ўжо не спіш, табе ўжо страшна. Усё згадваеш, усе падрабязнасці, і ты разумееш, што цябе маглі забіць, цябе ахоплівае млосць. Адразу пасля разаніны лепей не глядзець на твары, гэта нейкія зусім іншыя твары, не такія, як звычайна ў людзей. Яны і самі не могуць адзін на аднаго вочы падняць. Нават на дрэвы не глядзяць. Падыдзеш да яго, а ён: “Ад-ды-дзі!”. Я не магу выказаць, што гэта такое. Здаецца, што ўсе трохі ашалелі, і нават нешта звярынае бачна. Лепей не глядзець. Я дагэтуль не даю веры, што жывая засталася… І параненая, і кантужаная, але цэлая, не веру…

Вочы заплюшчу, усё зноў перад сабой бачу…

Снарад трапіў у склад з боепрыпасамі, палыхнуў агонь. Салдат стаяў побач, ахоўваў, яго апаліла. Ён умомант зрабіўся чорным кавалкам мяса… Але падскоквае… Падскоквае на адным месцы… Усе глядзяць з акопчыкаў, аднак ніхто з месца не зварухнецца, разгубіліся. Схапіла я прасціну, накінула на салдата і адразу звалілася на яго. Прыціснула да зямлі. Зямля халодная… Вось так. Ён кідаўся пада мной, пакуль не разарвалася сэрца, і тады сцішыўся…

Я ў крыві ўся… Нехта са старых салдатаў падышоў, абняў, чую — кажа: “Скончыцца вайна, і калі яна застанецца жывой, з яе чалавека ўсё роўна ўжо не будзе”.

Маўляў, што я сярод такога жаху, і як перажыць яго, ды яшчэ ў такіх маладых гадах? Мяне трэсла, як у прыпадку, адвялі пад рукі ў зямлянку. Ногі не трымалі... Трэсла, быццам праз мяне ток прапусцілі... Гэтага словамі не перадаць...

А тут зноў бой пачаўся... Пад Сеўскам немцы атакавалі нас па сем-восем разоў на дзень. Я яшчэ ў гэты дзень выносіла параненых з іх зброяй. Да апошняга падпаўзла, а ў яго рука зусім перабітая. Боўтаецца на кавалачках мяса... На жылах... У крывішчы ўвесь... Яму трэба як хутчэй адрэзаць руку, каб перавязаць. Інакш ніяк. А ў мяне ні нажа, ні нажніц. Сумка на спіне боўталася, боўталася, і яны выпалі. Што рабіць? І я зубамі грызла гэтую чырвоную мякаць. Перагрызла, забінтавала... Бінтую, а паранены: "Хутчэй, сястра. Я яшчэ пavaюю". У гарачцы...

Праз некалькі дзён, калі на нас рушылі танкі, двое не вытрывалі. Пабеглі. І ўвесь парадак зламаўся. Загінула шмат нашых. Параненыя, якіх я сцягвала ў варонку, трапілі ў палон. Іх павінна была забраць машына... А калі гэтыя двое спалохаліся, пачалася паніка. І параненых кінулі. Мы вярнуліся потым на тое месца, дзе яны ляжалі: хто з выкалатымі вачыма, хто з распоратым жыватом... Я, як гэта пабачыла, за ноч счарнела. Гэта ж я іх у адно месца сцягнула... Я... Мне зрабілася кепска.

Зранку сабралі ўвесь батальён, вывелі гэтых двух наперад. Зачыталі загад, што расстрэл ім. І трэба сем чалавек, каб выканаць загад. Тры чалавекі выступілі наперад, астатнія стаяць. Я ўзяла аўтамат і таксама далучылася. Калі я выйшла... Дзяўчына... Усе за мной... Нельга было ім даравацъ. Такія хлопцы праз іх загінулі!

І мы выканалі загад... Апусціла аўтамат і спалохалася. Падышла да іх... Яны ляжалі... У аднаго на твары была жывая ўсмешка.

Не ведаю, ці прабачыла б ім цяпер? Не скажу… Не буду хлусіць. Іншы раз хачу паплакаць. Не атрымліваецца…

Я на вайне ўсё забыла. Усё сваё ранейшае жыццё. Усё… І каханне забыла…

Закахаўся ў мяне камандзір роты разведчыкаў. Запісачкі праз сваіх салдатаў перасылаў. Я прыйшла аднойчы на спатканне. “Не, — кажу. — Я люблю чалавека, якога ўжо даўно няма ў жывых”. Ён вось так блізка да мяне падсунуўся, проста ў вочы паглядзеў, развярнуўся і пайшоў. Стралялі, а ён ішоў і нават не нахіляўся… Потым — гэта ўжо ва Украіне было — вызвалілі мы вялікую вёску. Я думаю: “Дай пагуляю, пагляджу”. Надвор’е лагоднае, хаткі белыя. І за вёскай — магілкі, зямля свежая… Тых, хто ў баі за гэтую вёску загінуў, там пахавалі. Сама не ведаю, чаму пацягнула мяне. А там фотаздымкі на дошчачцы і прозвішчы. На кожнай магілцы… І раптам бачу — знаёмы твар… Камандзір роты разведчыкаў, які мне ў каханні прызнаўся. І прозвішча яго… І так мне нядобра зрабілася. Страх ахапіў… Быццам ён мяне бачыць, быццам ён жывы… У гэты час ідуць да магілы хлопцы, з яго роты. Яны ўсе мяне ведалі, запіскі мне насілі. Ніводзін у мой бок не паглядзеў, як быццам мяне не было. Здань. Потым, калі іх сустракала, мне здаецца… Ну, я так думаю… Яны хацелі, каб і я загінула. Ім цяжка было бачыць, што я… жывая… Я так адчувала… Быццам я перад імі вінаватая… І перад ім…

Вярнулася з вайны і цяжка захварэла… Шмат бальніцаў змяніла, пакуль не трапіла да старога прафесара… Ён лекаваў мяне больш словамі, чым лекамі, тлумачыў мне маю хваробу. Казаў, каб я пайшла на фронт у васямнаццаць-дзевятнаццаць гадоў, арганізм быў бы мацнейшы, а паколькі я трапіла ў шаснаццаць — гэта

вельмі маладыя гады — мяне моцна траўмавала. “Ну так, лекі — гэта не лішне, — разважаў ён, — можна падлячыцца, але калі хочаце аднавіць здароўе, прагнеце жыць, мая адзіная парада: трэба пабрацца шлюбам і мець як мага болей дзяцей. Толькі гэта выратуе. З кожным дзіцём арганізм будзе адраджацца”.

—А колькі вам было гадоў?

—Як скончылася вайна, ішоў дваццаты год. Але я і не думала пра замуства.

—Чаму?

—Я пачувалася вельмі стомленай, нашмат старэйшай за сваіх аднагодкаў, нават старой. Сяброўкі танчаць, цешацца, а я не магу, я глядзела на жыццё старымі вачыма. Як з іншага свету… Старэча! Каля мяне маладыя хлопцы завіхаліся. Лічы падлеткі. Але яны не бачылі маю душу, што там спадыспаду робіцца. Вось я вам распавяла пра адзін дзень… Бой пад Сеўскам. Усяго адзін дзень… Пасля якога ноччу з вушэй у мяне пацякла кроў. Зранку прачнулася, як пасля цяжкай хваробы. Падушка ў крыві…

А ў шпіталі? У нас за заслонай у аперацыйным пакоі стаялі вялікія ночвы, куды мы складалі адрэзаныя рукі, ногі… З перадавой прыехаў капітан, прывёз свайго параненага таварыша. Як ён там апынуўся, не ведаю, але пабачыў гэтыя ночвы і… страціў прытомнасць.

Магу згадваць і згадваць, не спыніцца… Але што самае галоўнае?

Гукі вайны. Усё вакол гудзе, бразгае, трэскае ад агню… У чалавека на вайне старэе душа. Пасля вайны я ўжо ніколі не была маладой… Вось галоўнае. Так я думаю…

—Замуж выйшлі?

—Выйшла. Нарадзіла і выхавала пяцёх сыноў. Пяць хлопчыкаў. Дзяўчатак Бог не даў. Для мяне самае

дзіўнае, што пасля такіх жахаў я змагла нарадзіць прыгожых дзяцей. І харошай мамай зрабілася, і добрай бабуляй…

Я цяпер згадваю мінулае, і мне здаецца, што гэта была не я, а нейкая іншая дзяўчынка…»

Я вярталася дамоў, везла чатыры касеты (два дні размовы) з "яшчэ адной вайной". Пачуцці былі самыя розныя: узрушэнне і страх, няўцямнасць і захапленне. Цікаўнасць і разгубленасць, пяшчота. Дома пераказвала некаторыя эпізоды сябрам. Нечакана для мяне ўсе рэагавалі аднолькава: "Занадта страшна. Як яна вытрывала? Не звар'яцела?". Або: "Мы звыкліся з іншай вайной. На гэтай вайне ёсць выразная мяжа: яны — мы, дабро — зло. А тут?". Але ва ўсіх я заўважала слёзы на вачах, і ўсе задумваліся. Напэўна, пра тое, пра што і я. Вось ужо былі на зямлі тысячы войнаў (неяк прачытала, што іх налічылі болей як тры тысячы — вялікіх і малых), аднак вайна як была, можа быць, адной з галоўных чалавечых таямніцаў, так ёю і засталася. Нічога не змянілася. Я спрабую вялікую гісторыю згарнуць да памераў чалавека, каб паспрабаваць хоць нешта зразумець. Знайсці словы. Але на гэтай, здавалася б, ужо невялікай і зручнай дзеля агляду тэрыторыі — прасторы адной чалавечай душы — усё робіцца яшчэ больш незразумелым і менш прадказальным, чым у вялікай гісторыі. Можа, таму што перада мной — жывыя слёзы, жывыя пачуцці. Жывы чалавечы твар, па якім падчас размовы слізгаюць цені болю і страху. Часам нават мільгане крамольная думка пра амаль няўлоўную прыгажосць чалавечай пакуты. Тады я палохаюся сама сябе…

Шлях толькі адзін — палюбіць чалавека. Зразумець яго любоўю.

# «Я ГЭТЫЯ ВОЧЫ І СЁННЯ ПАМЯТАЮ...»

Пошук працягваецца... Але гэтым разам мне не трэба далёка ехаць...

Вуліца, на якой я жыву ў Мінску, мае імя Героя Савецкага Саюза Васіля Захаравіча Каржа — удзельніка грамадзянскай вайны, героя вайны ў Іспаніі, партызанскага камбрыга ў Вялікую Айчынную. Кожны беларус чытаў кнігу пра яго, хаця б у школе, ці бачыў кінафільм. Карацей, беларуская легенда. Сотні разоў натуючы яго прозвішча на канвертах і бланках тэлеграмаў, я ніколі не думала пра яго як пра рэальнага чалавека. Бо чалавека ўжо даўно засланіў міф. Стаўся ягоным двайніком. Але гэтым разам я рушыла па знаёмай вуліцы з жывой эмоцыяй: трыццаць хвілінаў на тралейбусе ў іншы канец горада, і я пабачу яго дочак — абедзве ваявалі на фронце, — пабачу жонку. На маіх вачах легенда ажыве і зноў ператворыцца ў чалавека, вернецца на зямлю. Вялікае станецца малым. Як бы я ні любіла глядзець на неба ці на мора, усё роўна болей мяне зачароўвае пясчынка пад мікраскопам. Свет адной кроплі. Тое вялікае і неверагоднае жыццё, якое я там знаходжу. Як можна называць малое малым, а вялікае вялікім, калі тое і другое настолькі бясконцае? Я ўжо даўно іх не разрозніваю. Для мяне адзін чалавек — гэта так шмат. У ім ёсць усё — можна згубіцца.

Знаходжу патрэбны адрас, гэта зноў груваcткі і няўклюдны шматпавярховік. Вось і трэці пад'езд, націскаю ў ліфце кнопку сёмага паверха...

Дзверы адчыніла малодшая з сясцёр — Зінаіда Васілеўна. Тыя ж шырокія цёмныя бровы, і адкрыта, упарта глядзяць вочы, як у бацькі на фотаздымках.

—Мы ўсе сабраліся. Зранку сястра Вольга прыехала з Масквы. Яна там жыве. Выкладае ва Універсітэце імя Патрыса Лумумбы. І наша мама з намі. Вось, дзякуючы вам, і сустрэліся.

Сёстры, Вольга Васілеўна і Зінаіда Васілеўна Корж, былі санінструктаркамі ў кавалерыйскіх эскадронах. Селі побач і паглядзелі на маці Феадосію Аляксееўну.

Яна і пачала:

—Гарыць усё... Сказалі эвакуявацца... Доўга ехалі. Даехалі да Сталінградскай вобласці. Жанчыны з дзецьмі ў тыл, а мужчыны адтуль. Камабайнёры, трактарысты, усе едуць. Палутаркі на платформах. Адзін, помніцца, падхапіўся з дошак і крычыць: «Матулі, сястрычкі! Паязджайце да нас, збірайце хлеб, каб мы перамаглі ворага!». І вось яны ўсе шапкі паздымалі і глядзяць на нас. А мы — усё, што паспелі з сабой узяць, — гэта сваіх дзяцей. Трымаем іх. Хто на руках, хто за рукі. Ён просіць: «Матулі, сястрычкі! Паязджайце да нас, збірайце хлеб...».

Болей за ўвесь час нашай размовы яна не скажа ні слова. А дочкі будуць зрэдчас ціхенька лашчыць яе рукі, супакойваючы.

*Зінаіда Васілеўна:*

—Жылі мы ў Пінску. Мне было чатырнаццаць з паловай гадоў, Вользе — шаснаццаць, а брату Лёню — трынаццаць. Вольгу мы якраз у гэтыя дні адправілі ў дзіцячы санаторый, а з намі тата хацеў ехаць у вёску. Да ягоных сваякоў... Але ў тую ноч ён дома амаль не начаваў. Тата працаваў у абкаме партыі, ноччу яго выклікалі,

а вярнуўся да нас толькі зранку. Забег на кухню, трохі пад'еў і кажа:

—Дзеці, пачалася вайна. Нікуды з хаты. Чакайце мяне.

Ноччу мы з'язджалі. У таты была самая дарагая памяць пра Іспанію — паляўнічая стрэльба, вельмі багатая, з патранташам. Гэта была ўзнагарода за мужнасць. Ён кінуў стрэльбу брату:

—Ты цяпер галоўны, ты мужчына, мусіш даглядаць маму, сястрычак…

Гэтую стрэльбу мы збераглі праз усю вайну. Усё, што было ў нас з каштоўных рэчаў, прадалі ці абмянялі на хлеб, а стрэльбу зберагл. Не маглі яе аддаць. Гэта была наша памяць пра тату. Яшчэ ён кінуў нам на машыну вялікі такі кажух, гэта ў яго была самая цёплая рэч.

На станцыі перасел на цягнік, але каля Гомеля трапілі пад моцны абстрэл. Каманда: «З вагонаў па кустах — кладзіся!». Калі абстрэл скончыўся… Спачатку цішыня, а потым крыкі… Усе бягом… Мама з братам паспелі заскочыць у вагон, а я засталася. Вельмі спалохалася… Вельмі! Я ніколі адна не заставалася. А тут — адна. Мне здаецца, што я на нейкі час знямела… Нехта ў мяне нешта пытаўся, а я маўчала… Потым прыстала да нейкай жанчыны, дапамагала ёй перавязваць параненых. Яе называлі «таварыш капітан». І я паехала далей з яе санітарным вагонам. Яны прытулілі, накармілі мяне, але хутка спахапіліся:

—А колькі табе гадоў?

Я зразумела, што калі скажу праўду, скіруюць у які-небудзь дзіцячы дом. Тут жа здагадалася. А я ўжо не хацела губляць гэтых моцных людзей. Я хацела, як і яны, ваяваць. Нам жа ўвесь час казалі, і бацька запэўніваў, што ваяваць мы будзем на чужой тэрыторыі,

а гэта ўсё часовае, вайна хутка скончыцца перамогай. І як такое без мяне? Вось якія ў мяне былі дзіцячыя думкі. Я сказала, што мне шаснаццаць, і мяне пакінулі. Неўзабаве скіравалі на курсы. Месяцы чатыры я вучылася на тых курсах. Вучылася і ўвесь час даглядала параненых. Звыкалася з вайной… Так, трэба было прызвычаіцца… Навучалася не ў вучэльні, а тут жа, у медсанбаце. Мы адступалі, параненых забіралі з сабой.

Дарогі мы абміналі, бо іх бамбавалі, абстрэльвалі. Рухаліся па ўзбочынах, па балотах. У каго як атрымлівалася. Розныя вайсковыя часткі. Недзе гуртаваліся, часам уступалі ў баі. І вось так рушылі, рушылі і рушылі. Па палях таксама. Тапталі жыта. А ўраджай у тым годзе быў надзвычай багаты, жыта стаяла высока-высока. Зялёная трава, сонца лагоднае — і забітыя ляжаць, кроў… Забітыя і людзі, і жывёлы. Дрэвы чорныя… Разбураныя станцыі… На чорных вагонах вісяць спаленыя людзі. Дайшлі мы так да Растова. Там, пад бомбамі, я была параненая. Акрыяла ў цягніку, чую — пажылы салдат-украінец ганіць маладога: «Жынка твоя так нэ плакала, калі нараджала, як ты плачаш». А мне, калі пабачыў, што я вочы расплюшчыла, кажа: «А ты пакрычы, мілая, пакрычы. Лягчэй будзе. Табе можна». Я маму згадала і заплакала…

Пасля шпіталя мяне адправілі ў адпачынак, і я паспрабавала адшукаць сваю маму. А мама мяне шукала, і сястра Вольга нас шукала. І гэта цуд! Мы ўсе знайшліся праз адных знаёмцаў у Маскве. Усе на іхні адрас напісалі і так знайшліся. Цуд! Мама жыла пад Сталінградам у калгасе. І я туды паехала.

Гэта быў канец сорак першага года…

Як яны жылі? Брат на трактары працаваў, яшчэ зусім хлопчык, трынаццаць гадоў. Спачатку быў

прычэпшчыкам, а калі забралі на фронт усіх трактарыстаў, ён сеў на трактар. І днём, і ноччу працаваў. Мама хадзіла па полі ці сядзела непадалёк, яна баялася, каб ён не заснуў і не зваліўся. Яны ўдваіх на падлозе ў некага спалі… Не распраналіся, бо не было чым накрыцца. Вось такое жыццё… Хутка прыехала Вольга, яе ўладкавалі рахункаводам. Але яна пісала ў ваенкамат, прасілася на фронт, а ёй адмаўлялі. І мы вырашылі — я ўжо бывалы ваяка, — пойдзем разам у Сталінград і там знойдзем якую вайсковую частку. Маму мы супакоілі, падманулі, што паедзем на багатую Кубань, там у таты былі знаёмыя…

У мяне стары шынель, гімнасцёрка, дзве пары штаноў. Адну аддала Вользе, у яе зусім нічога не было. І боты ў нас таксама адны на дзвюх. Мама нам звязала з авечай воўны ці то тоўстыя шкарпэткі, ці то нешта падобнае на тэпці, штосьці цёплае. Мы адолелі шэсцьдзесят кіламетраў пешшу, да самага Сталінграда: адна боты нацягне, другая — у маміных тэпцях, потым наадварот. Па марозе ішлі, у лютым, абмерзлі, галадалі. Што мама нам згатавала ў дарогу? З нейкіх костак халадзец і некалькі праснакоў. І мы такія галодныя-галодныя… Калі засыналі і снілі сны, дык абавязкова з нейкай ежай. У сне боханы хлеба нада мной лёталі.

Прыцягнуліся ў Сталінград, а там не да нас. Ніхто нас нават слухаць не хоча. Тады мы вырашылі ехаць, як мама параіла, на Кубань, па адрасе да татавых знаёмцаў. Залезлі ў нейкі таварняк: я надзену шынель, сяджу, а Вольга ў гэты час пад паліцамі. Потым пераапранемся, і ўжо я лезу пад паліцы, а Вольга наверсе. Вайсковых не чапалі. А ў нас грошай жа ніякіх.

Трапілі на Кубань… Нейкім цудам… І адшукалі тых татавых знаёмцаў. Ад іх даведаліся, што фармуецца

добраахвотны казачы корпус. Гэта быў чацвёрты кавалерыйскі казачы корпус, потым ён стаў гвардзейскім. Яго фармавалі толькі з добраахвотнікаў. Там былі людзі ўсіх узростаў: і казакі, якіх калісьці Будзённы з Варашылавым у атакі вадзілі, і моладзь. Нас узялі. Дагэтуль не ведаю, чаму. Можа, таму, што мы шмат разоў прасіліся. І нам не было куды падзецца. Залічылі ў адзін эскадрон. Далі кожнай абмундзіраванне і каня. Яго трэба было карміць, паіць, даглядаць і ўсё астатняе. Добра, што ў нас у дзяцінстве быў конь, я прызвычаілася да яго, палюбіла. І калі тут далі мне каня, села — і нічога страшнага. Не адразу ўсё атрымалася, але я не баялася. У мяне быў маленькі конік, хвост да зямлі, аднак хуткі, паслухмяны, і я нават не заўважыла, як навучылася на ім скакаць. Неўзабаве ўжо фарсіла… Потым мела румынскіх, венгерскіх коней. І настолькі іх любіла, настолькі разумела, што і цяпер каня абыякава не праміну. Абдыму. Мы пад нагамі ў іх спалі, ён акуратна нагу пераставіць, але чалавека не закране. Конь на мёртвага ніколі не наступіць, а ад жывога чалавека, калі той паранены, нікуды не адыдзе, не кіне яго. Надзвычай разумная істота. Для кавалерыста конь — гэта сябар. Адданы сябар.

Першае баявое хрышчэнне… Гэта калі наш корпус пад станцыяй Кушчаўская атакаваў танкі. Пасля Кушчаўскай бітвы — гэта была знакамітая атака кубанскіх казакоў — корпусу надалі званне гвардзейскага. Бой быў страшны… А для нас з Вольгай тым болей страшны, бо мы яшчэ моцна баяліся. Я, хаця лічыла, што ўжо ваявала і ведаю, што гэта такое… Але тут… Калі кавалерысты пайшлі лавінай — чаркескі крыламі, шаблі над галовамі, коні хрыпяць, а конь, калі імчыць, ён такую сілу мае… Вось гэтая лавіна пайшла на танкі, на артылерыю — гэта было як у замагільным сне. У нерэальнасці…

А фашыстаў рухалася шмат, іх было болей, яны ішлі з аўтаматамі, побач з танкамі ішлі — і яны не вытрывалі, разумееце, яны не вытрывалі гэтай лавіны… Яны кідалі аўтаматы… Кідалі гарматы і ўцякалі… Вось такая была бітва…

*Вольга Васілеўна пра той бой:*

— Я перавязвала параненых… Побач ляжаў фашыст, я думала, ён мёртвы, і не звярнула на яго ўвагу, а ён паранены… І ён хацеў мяне забіць… Я як пачула, быццам нехта мяне падштурхнуў, азірнулася. Паспела адпіхнуць нагой аўтамат. Я яго не забіла, але і не перавязала, пайшла. Ён быў паранены ў жывот…

*Зінаіда Васілеўна працягвае:*

— А я вяду параненага і раптам бачу: два немцы з-за танкеткі выходзяць. Танкетку падбілі, а яны, відаць, паспелі выскачыць. Адна секунда! Каб я не паспела чаргу даць раней, яны б мяне з параненым расстралялі. Так нечакана ўсё здарылася. Я пасля бою падышла да іх, яны ляжалі з расплюшчанымі вачыма. Я гэтыя вочы і цяпер памятаю… Адзін такі прыгожы, малады немец… Было шкада, хоць гэта быў фашыст, але ўсё роўна. Неяк доўга дрэнна пачувалася: не хочацца забіваць, разумееце. У душы такая нянавісць: навошта яны прыйшлі на нашую зямлю? Але паспрабуй сама забіць, і гэта страшна… Вельмі страшна. Калі сама…

Бой скончыўся. Казачыя сотні здымаюцца са сваіх месцаў, а Вольгі няма. Я еду за ўсімі, еду апошняй, усё азіраюся. Ужо вечар. А Вольгі няма… Перадаюць па ланцужку, што яны — яна і яшчэ некалькі чалавек — засталіся падбіраць параненых. Я нічога не магла рабіць, я толькі яе чакала. Адстану ад сваёй сотні, пачакаю,

потым зноў усіх даганяю. Плачу: няўжо ў першым баі страціла сястру? Дзе яна? Што з ёй? Можа, недзе памірае, кліча мяне…

Вольга… Вольга таксама ўся ў слязах… Знайшла мяне ноччу. Усе казакі плакалі, калі пабачылі, як мы сустрэліся. Павіслі на шыі адна ў адной, не можам разлучыцца. І тады мы зразумелі, што нельга нам, неразумна быць разам. Лепей развітацца. Сэрца не вытрывае, калі адна загіне на вачах у другой. Вырашылі, што мне трэба папрасіцца ў іншы эскадрон. Але як разысціся… Як?

Аднак далей ваявалі паасобку, спачатку ў розных эскадронах, потым нават у розных дывізіях. Толькі прывітанне перадасі, калі выпадкова атрымаецца, даведаешся, ці жывая… Смерць на кожным кроку таілася. Чакала… Не забуду, як пад Араратам… Мы стаялі ў пясках… Арарат захапілі немцы. І былі Каляды, немцы святкавалі. Сярод нас адабралі эскадрон і батарэю саракаміліметровак. Недзе гадзіне а пятай мы рушылі, усю ноч ішлі. І на світанку сустрэлі нашых разведчыкаў, якія выправіліся раней.

Паселішча было ўнізе… Як у глыбокай місе… Немцы і падумаць не маглі, што мы ў такіх пясках зможам прайсці, і абарону арганізавалі малую. Мы прабраліся праз іх тылы зусім неўпрыкмет. Спусціліся з гары, знішчылі ахову і ўвайшлі ў Арарат, уварваліся. Немцы выскоквалі зусім голыя, толькі аўтаматы ў руках. Там у іх стаялі ялінкі… Яны ўсе п'яныя… А ў кожным двары не менш за два-тры танкі. Танкеткі стаялі, бронетраспарцёры… Уся тэхніка. Мы тут жа на месцы яе падрывалі, і гэта такая кананада, такі грукат, такая паніка… Усе мітусіліся… Усё зблыталася, кожны ў сваіх баяўся трапіць. Усюды пажарышчы… І гарэлі калядныя ялінкі…

У мяне восем параненых… Падняла іх наверх, на гару… Але мы, пэўна, зрабілі адну памылку: не перарэзалі сувязь. І нямецкая артылерыя накрыла нас агнём — і мінамётным, і дальнабойным. Я сваіх параненых хутчэй на санітарную фурманку пасадзіла, яны паехалі… І на маіх вачах снарад трапіў у яе, фурманка разлецелася на кавалкі. Калі я паглядзела, там толькі адзін чалавек жывы застаўся. А тут ужо немцы падымаюцца на гару… Паранены просіць: «Пакінь мяне, сястра… Пакінь мяне, сястра… Я ўсё адно паміраю…». У яго жывот раздзерла… Ну, кішкі… Усё гэта… Ён сам збірае і назад запіхвае…

Думала, што конь мой ад гэтага параненага ўвесь у крыві, а паглядзела: ён таксама паранены ў бок, увесь індывідуальны пакет на яго скарыстала. Было ў мяне некалькі кавалкаў цукру, дала яму гэты цукар. Ужо з усіх бакоў страляюць, не зразумела: дзе немцы, а дзе нашыя? Метраў дзесяць праедзеш — і ляжыць паранены. Думаю: трэба фурманку шукаць, каб падабраць усіх. Бачу спуск, а ўнізе — тры дарогі: і туды дарога, і туды дарога, і наўпрост дарога. Я разгубілася… Куды ехаць? А я трымала цуглі моцна. Конь ішоў туды, куды я кіравала. Ну, а тут, не ведаю, нейкі інстынкт мне падказаў ці нехта раней апавядаў, што коні чуюць дарогу, і перад гэтым раздарожжам я адпусціла лейцы… І конь рушыў у кірунку, які я і не мелася абіраць. Крочыць сабе і крочыць.

Я ўжо сяджу без сілаў, мне ўжо ўсё роўна, куды ён мяне прывязе. Што будзе, тое і будзе. Конь марудна ішоў ды ішоў, звесіўшы галаву, а потым весялей-весялей, ужо матляе галавой, я і лейцы падняла, учапілася. Нахілюся і яму павязку на ране прытрымаю рукой. Ён весялей, весялей: і-і-і… заржаў так, пачуўшы некага.

Я насцярожылася: раптам гэта немцы. Толькі вырашыла, каб пусціць наперад сябе каня, як убачыла свежы след: коні натапталі, ад тачанкі кола — прайшло не менш за паўсотню чалавек. І метраў праз дзвесце-трыста конь утыкнуўся проста ў падводу наперадзе. На ёй былі параненыя, і неўзабаве я пабачыла рэшткі нашага эскадрона.

Між тым да нас ужо рухалася дапамога, падводы, тачанкі… Быў загад: забраць усіх. Пад кулямі, пад снарадамі збіралі сваіх, усіх да апошняга забралі — і параненых, і забітых. Я таксама паехала на тачанцы. Усіх там знайшла, і таго з разарваным жыватом, усіх вывезла. Толькі коні застрэленыя засталіся. Ужо добра развіднела, едзеш і бачыш — табун цэлы ляжыць… Прыгожыя, моцныя коні… Вецер раздзімае грывы…

Сцяна ў вялікім пакоі, дзе мы сядзім, завешаная павялічанымі даваеннымі і франтавымі фотаздымкамі сясцёр. Вось яны яшчэ школьніцы — у капялюшыках з кветкамі. Здымак зроблены за два тыдні да пачатку вайны. Звычайныя дзіцячыя твары, насмешлівыя, але трохі стрыманыя значнасцю моманту і жаданнем здавацца дарослымі. А тут яны ўжо ў казацкіх чаркесках, кавалерыйскіх бурках. Сфатаграфаваныя ў сорак другім годзе. Па часе год розніцы, а твар ужо іншы, чалавек іншы. А гэты здымак Зінаіда Васілеўна даслала маці з фронту: на гімнасцёрцы першы медаль «За адвагу». На наступным — абедзве сфатаграфаваныя ў дзень Перамогі. Запамінаю змены на твары: ад мяккіх дзіцячых рысаў — да ўпэўненага жаночага позірку, нават некаторай жорсткасці, суворасці. Цяжка даць веры, што гэтая перамена адбывалася ў лічаныя месяцы, кароткія гады. Звычайна час такую працу выконвае куды больш няспешна і незаўважна. Доўга выштукоўваецца

чалавечы твар. Паволі малюецца на ім душа. А вайна хутка стварала вобразы людзей, калі пісала свае партрэты.

*Вольга Васілеўна:*

—Мы занялі вялікую вёску, хатаў трыста. І там быў пакінуты нямецкі шпіталь. У будынку мясцовай бальніцы. Першае, што я пабачыла: у двары выкапаная вялізная яма і там ляжаць расстраляныя — перад адыходам немцы самі расстралялі сваіх моцна скалечаных. Яны, відаць, вырашылі, што лепей будзе, калі расстраляюць самі, а не рускія. Бо так яны рабілі з нашымі параненымі. Толькі адна палата засталася, да гэтых ці то не дайшлі, не паспелі, а можа, проста кінулі, бо ўсе яны былі без ног.

Калі мы завярнулі да іх у палату, яны з нянавісцю глядзелі на нас: напэўна, думалі, што прыйшлі забіваць. Перакладчык сказаў, што мы параненых не забіваем, а лекуем. Тады адзін нават пачаў патрабаваць: маўляў, яны тры дні нічога не елі, іх тры дні не перавязвалі. Я паглядзела — насамрэч, гэта быў жах. Іх даўно не аглядаў доктар. Раны загнаіліся, бінты ўраслі ў цела.

—І вам іх было шкада?

—Я не магу назваць тое, што адчувала, шкадобай, жалем — гэта ўсё-такі спагада. Яе не было. Гэта іншае… У нас быў такі выпадак… Адзін салдат збіў палоннага… Дык вось, мне гэта здавалася не вартым нас, і я заступілася, хаця і разумела… Гэта ў яго крык душы… Той салдат мяне ведаў, ён быў, канешне, старэйшым, вылаяўся. Але не стаў болей біць… Толькі мацюкаўся: «Ты забыла, ё… маць! Ты забыла, як яны… ё… маць…». Я нічога не забыла, я памятала тыя боты… Калі немцы выставілі перад сваімі траншэямі шэрагі ботаў

з адрэзанымі нагамі. Гэта было ўзімку, яны стаялі як бярвенцы… Гэтыя боты… Усё, што засталося ад нашых таварышаў… Што засталося…

Згадваецца, як прыйшлі нам на дапамогу маракі… І многія з іх падарваліся на мінах, там былі вялікія мінныя палі. Гэтыя маракі, яны ляжалі доўга. Ляжалі на сонцы… Трупы набухлі, і ад цяльняшак здавалася, што гэта кавуны. Вялізныя кавуны на вялікім полі. Аграмадныя.

Я не забыла, я нічога не забыла. Але я не магла б здзекавацца з палоннага, хаця б таму, што ён безабаронны. Вось гэта кожны вырашаў сам для сябе, і тое было істотна.

*Зінаіда Васілеўна:*

— Бой пад Будапештам. Гэта была зіма… і я цягнула, значыць, сяржанта параненага, камандзіра кулямётнага разліку. Сама я была апранутая ў штаны, фуфайку, на мне шапка-вушанка. Цягну і бачу: чорны снег такі… Абвуглены… Адразу зразумела, што тут яміна ад снарада, тое, што мне і трэба. Спускаюся спінай, а там нехта жывы — я адчуваю, што жывы, і скрыгат нейкага жалеза… Азіраюся, а там нямецкі афіцэр паранены, у ногі, ляжыць і аўтамат на мяне нацэліў. А ў мяне валасы з-пад шапкі выбіліся, сумка санітарная праз плячо, і на ёй чырвоны крыж. Калі я азірнулася, ён убачыў мой твар, зразумеў, што гэта дзяўчына, і вось так: «Ха-а-а». У яго, значыць, нервовая напруга апала, і ён свой аўтамат адкінуў. Яму абыякавым усё зрабілася…

І мы ўтраіх у адной яміне — наш паранены, я і гэты немец. Яна невялікая, ногі ў нас разам. Я ўся ў іхняй крыві, кроў наша змяшалася. У немца вялізныя такія вочы, і ён глядзіць на мяне гэтымі вачыма: што я буду рабіць? Фашыст праклятьі! Аўтамат ён адкінуў адразу, уяўляеце?

Гэтую сцэну... Наш паранены не разумее, у чым справа, за пісталет хапаецца... То кідаецца, каб задушыць немца... А той на мяне глядзіць... Я гэтыя вочы і сёння памятаю... Перавязваю нашага, а ён ляжыць у крыві, кроў яшчэ цячэ, адна нага ў яго перабітая зусім. Яшчэ трохі, і ён памрэ. Добра гэта разумею. І, не скончыўшы перавязваць нашага параненага, разрываю яму, гэтаму немцу, адзежу, перавязваю і накладаю жгут. А потым ужо зноў вяртаюся да свайго. Немец кажа: «Гут. Гут». Толькі гэтае слова паўтарае. Наш паранены, пакуль не страціў прытомнасць, нешта мне крычаў... Пагражаў... Я гладзіла яго, супакойвала. Пад'ехала санітарная фурманка, выцягнулі іх абодвух... І пагрузілі. Немца таксама. Разумееце?

*Вольга Васілеўна:*

— Калі мужчыны бачылі жанчыну на перадавой, у іх твары рабіліся іншымі, нават гук жаночага голасу іх перайначваў. Неяк ноччу я села каля зямлянкі і ціхенька заспявала. Я думала, што ўсе спяць, ніхто мяне не чуе, а зранку мне камандзір сказаў: «Мы не спалі. Такі сум па жаночым голасе...».

Перавязваю танкіста... Бой працягваецца, страляніна... Ён пытаецца: «Дзяўчына, як вас завуць?». Нават камплімент нейкі далучыў. Мне так дзіўна было называць сярод гэтага землятрусу, сярод гэтага жаху сваё імя — Вольга. Заўсёды я намагалася быць падцягнутай, акуратнай. І мне, здаралася, казалі: «Хіба яна была ў баі, такая чысценькая». Я вельмі баялася, што калі мяне заб'юць, дык буду ляжаць непрыгожая. Я бачыла шмат забітых дзяўчат... У брудзе, у вадзе... Ну... Як гэта... Мне не хацелася так памерці... Іншым разам хаваешся ад абстрэлу і не столькі думаеш пра тое, каб цябе не забілі, колькі

хаваеш твар. Рукі. Мне здаецца, што ўсе нашыя дзяўчаты пра гэта думалі. А мужчыны з нас смяяліся, ім гэта здавалася пацешным. Маўляў, не пра смерць думаюць, а чорт ведама пра што. Пра нейкую жаночую дурноту.

*Зінаіда Васілеўна:*

—Смерць нельга прыручыць… Не… Прызвычаіцца да яе нельга… Мы адступалі ад немцаў у горы. І заставаліся пяць цяжка параненых у жывот. Гэтыя раны смяротныя, дзень, другі — і яны памруць. А забраць іх не маглі, не было на чым везці. Мяне і іншую санінструктарку, Аксанку, пакінулі з імі ў гумне, паабяцаўшы: «Праз два дні вернемся, забяром вас». Прыйшлі за намі праз тры дні. Трое сутак мы былі з гэтымі параненымі. Яны ў яснай свядомасці, моцныя мужыкі. Не хацелі паміраць… А ў нас толькі нейкія парашкі, болей нічога няма. Увесь час яны прасілі піць, а піць нельга. Адны разумелі, а іншыя лаяліся. Стаяў мат-перамат. Нехта кубкам кіне, іншы ботам. Гэта былі тры самыя страшныя дні ў маім жыцці. Паміралі яны на нашых вачах, адзін за адным, а мы толькі глядзелі…

Першая ўзнагарода… Мне далі медаль «За адвагу». Але я не пайшла яе атрымліваць. Я пакрыўдзілася. Смешна, далібог! І ўяўляеце, чаму? Маю сяброўку ўзнагародзілі медалём «За баявыя заслугі», а мяне медалём «За адвагу». Яна толькі ў адным баі была, а я ўжо пад станіцай Кушчэўская і ў іншых аперацыях удзельнічала. І мне зрабілася крыўдна: у яе за адзін бой ужо «баявыя заслугі», шмат заслугаў, а ў мяне, атрымліваецца, толькі за «адвагу», як бы адзін раз я сябе праявіла. Прыехаў камандзір, ну і весяліўся, калі даведаўся, у чым справа. Патлумачыў мне, што медаль «За адвагу» — самы значны медаль, гэта амаль што ордэн.

Пад Макееўкай, на Данбасе, мяне параніла, параніла ў сцягно. Уджаліў вось такі аскепачак, як каменьчык, і сядзіць. Адчуваю — кроў, я індывідуальны пакет склала і туды. І далей бегаю, перавязваю. Сорамна каму сказаць, раніла дзяўчынку, і куды — у клубы. У срачку... У шаснаццаць гадоў гэта сорамна каму сказаць. Няёмка. Ну, так і бегала, перавязвала, пакуль не знепрытомнела ад страты крыві. Поўныя боты націякло...

Нашыя паглядзелі і, відаць, вырашылі: забітая. Прыйдуць санітары, падбяруць. Бой пайшоў далей. Яшчэ трохі, і я б загінула. Але ехалі ў разведку танкісты і заўважылі — дзяўчына на полі бою. Я без шапкі ляжала, шапка звалілася. І кроў з-пад мяне цячэ, значыць, жывая. Прывезлі ў медсанбат. Адтуль мяне перапраўлілі ў шпіталь, адзін, потым другі. А-а-а... Хутка скончылася мая вайна... Праз паўгода мяне камісавалі паводле стану здароўя. Мне васямнаццаць гадоў... А здароўя ўжо няма: тройчы параненая, цяжкая кантузія. Але ж я дзяўчына, і я, зразумела, гэта ўтойвала, пра раненні казала, а кантузію хавала. І яна пра сябе нагадала. Мяне зноў паклалі ў шпіталь. Далі інваліднасць... Ну, і я? Я гэтыя дакументы парвала і выкінула, нават грошы нейкія не стала атрымліваць. Там трэба было хадзіць на камісіі, перакамісоўвацца. Распавядаць пра сябе: калі кантузіла, куды параніла. Куды?

У шпіталь прыйшлі мяне наведаць камандзір эскадрона і старшына. Камандзір эскадрона мне моцна падабаўся на вайне, але там ён мяне не заўважаў. Прыгожы мужчына, яму вельмі пасавала вайсковая форма. Мужчынам усім форма пасуе. А жанчыны як выглядалі? У штанах, косы — нельга, усе стрыжаныя пад хлопчыкаў. Гэта ўжо напрыканцы вайны нам часам фрызуры дазвалялі рабіць, не стрыгчыся. У шпіталі ў мяне валасы

зусім адраслі, я ўжо заплятала доўгую касу, акрыяла, і яны… Смешна, далібог! Абодва закахаліся ў мяне… Адразу! Усю вайну разам агоралі, нічога такога не было, а тут удвох: і камандзір эскадрона, і старшына прапанавалі мне шлюб. Любоў! Любоў… Як нам усім жадалася любові! Шчасця!

Гэта быў канец сорак пятага года…

Пасля вайны хацелася хутчэй забыць вайну. Нам з сястрой бацька дапамог. Ён быў мудры чалавек. Узяў нашыя медалі, ордэны, удзячнасці ад камандавання, схаваў і сказаў:

— Была вайна, ваявалі. А цяпер забудзьцеся. Пачынаецца іншае жыццё. Туфлі надзеньце. Вы ў мяне прыгожыя дзяўчаты. Трэба вучыцца, трэба замуж выходзіць.

Вольга неяк не магла адразу да іншага жыцця прызвычаіцца, з гонарам была. Не хацела здымаць салдацкі шынель. І я памятаю, як бацька казаў маці: «Гэта я вінаваты, што дзяўчаткі такія малыя на вайну трапілі. Як бы яна іх не зламала… Тады праваюць усё жыццё».

Далі мне за мае медалі і ордэны нейкія такія спецыяльныя талоны, каб я магла пайсці ў ваенторг і купіць што-небудзь. Я купіла сабе боцікі гумовыя, тады самыя модныя, купіла паліто, сукенку, чаравікі. Шынель вырашыла прадаць. Іду на кірмаш… Я была ў летняй, светлай сукенцы… З заколкай у валасах… І што я там пабачыла? Маладыя хлопцы без рук, без ног… Усе ваявалі… З ордэнамі, з медалямі… У каго рукі цэлыя, самаробныя лыжкі прадае. Жаночыя станікі, трусікі. А другі… Без рук, без ног… Сядзіць і слязьмі абліваецца. Капейчыну просіць… Ніякіх інвалідных вазкоў у іх не было, яны рухаліся на самаробных дошках, штурхалі іх рукамі, калі яны былі. П'яныя. Спявалі «Я забыты, закінуты». Вось такія сцэны… Я сышла, я не прадала

свой шынель. І колькі жыла ў Маскве, гадоў пяць, напэўна, не магла хадзіць на кірмаш. Я баялася, што хтонебудзь з тых калек мяне пазнае і крыкне: «Навошта ты мяне тады з агню выцягнула? Навошта ратавала?». Я згадала аднаго маладога лейтэнанта… У яго ногі… Адна адсечаная аскепкам, другая таксама ледзьве віселa… Я яго перавязвала… Пад бомбамі… А ён крычаў мне: «Не цягні! Дабі! Дабі… Я табе загадваю…». Разумееце? І вось я ўвесь час баялася сустрэць гэтага лейтэнанта…

А калі ў шпіталі ляжала, там усе ведалі маладога прыгожага хлопца. Танкіст Міхась… Ніхто не згадваў яго прозвішча, усе называлі толькі імя… Яму ногі ампутавалі, правую руку, адна левая засталася. У яго была высокая ампутацыя, ногі адрэзалі па сцёгны, так што пратэзы немагчыма насіць. Яго вазілі на вазку. Зрабілі спецыяльна для яго вазок і вазілі ўсе, кожны, хто мог. Прыходзіла ў шпіталь шмат цывільных, памагалі даглядаць, асабліва такіх цяжка параненых, як Міхась. І жанчыны, і школьнікі. Нават дзеці. Гэтага Міхася на руках насілі. І ён не нэндзіў. Ён так хацеў жыць. Яму толькі дзевятнаццаць гадоў, ён зусім яшчэ не жыў. Не згадаю, ці меў ён каго з сваякоў, але быў пэўны — яго ў бядзе не пакінуць, ён верыў — яго не забудуць. Хаця, канешне, вайна жорстка прайшлася па нашай зямлі, усё разбуранае. Калі мы вызвалялі вёскі, яны ўсе былі спаленыя. Толькі зямля ў людзей засталася. Адна зямля.

Мы з сястрой не парабіліся доктаркамі, хаця да вайны пра гэта марылі. Маглі паступіць у мединстытут без усякіх экзаменаў, як франтавічкі. Але столькі нагледзеліся, як пакутавалі, як паміралі, што болей бачыць гэтага не маглі. Нават уявіць. І ўжо праз трыццаць гадоў я сваю дачку адгаварыла паступаць у медыцынскі,

хоць яна вельмі хацела. Праз дзясяткі гадоў... Толькі заплюшчу вочы — бачу... Вясна... Мы ідзём па нейкім полі, дзе толькі што бой быў, шукаем параненых. Поле вытаптанае. Знаходжу двух забітых — малады наш салдат і малады немец. У маладой пшаніцы ляжаць і ў неба ўглядаюцца. На іхніх тварах яшчэ нават смерці не бачна. Проста ў неба глядзяць... Я на гэтыя вочы ніколі не забудуся...

*Вольга Васілеўна:*

— А мне з апошніх дзён на вайне вось што запомнілася. Едзем мы — і раптам аднекуль музыка. Скрыпка... Вось у гэты дзень для мяне скончылася вайна... Гэта быў такі цуд: раптам музыка. Зусім іншыя гукі... Як быццам прачнулася... Нам усім здавалася, што пасля вайны, пасля такога мора слёз будзе прыўкраснае жыццё. Прыгожае. Пасля Перамогі... Пасля гэтага дня... Нам верылася, што ўсе людзі стануць вельмі добрымі, будуць толькі любіць адно аднаго. Як браты і сёстры. Як мы чакалі гэтага дня...

# «МЫ НЕ СТРАЛЯЛІ...»

Мноства людзей на вайне... І даволі працы на вайне...

Шмат працы не толькі вакол смерці, але і вакол жыцця. Там не толькі страляюць і расстрэльваюць, мініруюць і размінірваюць, бамбуюць і падрываюць, кідаюцца з штыкамі адзін на аднаго — там яшчэ мыюць бялізну, гатуюць кашу, пякуць хлеб, чысцяць кухонныя катлы, даглядаюць коней, рамантуюць машыны, габлююць і збіваюць труны, разносяць пошту, правяць боты, прывозяць тытунь. Нават на вайне жыццё больш чым на палову складаецца з проста жыцця. І з усялякай драбязы, натуральна. Нязвыкла так думаць, праўда? «Там горы нашай штодзённай бабскай працы», — кажа санітарка Аляксандра Восіпаўна Мішуціна. Войска рухалася паперадзе, а за ім «другі фронт» — прачкі, кухары, аўтаслесары, паштальёны...

Нехта з іх напісаў мне: «Мы не героі, мы былі за кулісамі». Што ж там, за кулісамі?

## Пра чаравічкі і клятую кавялу

«Брыдзём па твані, коні ў ёй загразаюць ці падаюць мёртвымі... Палутаркі захлёбваюцца... Салдаты на сабе цягнуць гарматы. Цягнуць падводы з хлебам і бялізнай. Скрыні махоркі. Бачу, як адна скрыня валіцца ў твань, — адчайныя рускія мацюкі... Берагуць снарады, берагуць махорку...

Муж мне кажа, раз-пораз: “Глядзі ва ўсе вочы! Гэта — эпас! Эпас!”»

*Тацяна Аркадзеўна Смялянская, ваенная журналістка*

«Да вайны я жыла радасна... З татам, з мамай. Тата ў мяне быў на фінскай вайне. Ён вярнуўся без аднаго пальца на правай руцэ, і я ў яго пыталася: "Тата, навошта вайна?".

А вайна хутка прыйшла і сюды, я яшчэ не падрасла як трэба. З Мінска эвакуяваліся. Прывезлі нас у Саратаў. Там я ў калгасе працавала. Выклікае мяне старшыня сельсавета, замест адной нагі драўляны пратэз:

—Я думаю пра цябе, дзяўчынка, увесь час.

Я здзівілася:

—А што вы, дзядзечка, думаеце?

—Каб не гэтая клятая кульгаўка! Усё гэтая праклятая кавяла...

Стаю, нічога не разумею. Ён тлумачыць:

—Даслалі паперу, трэба дваіх на фронт, а мне няма каго паслаць. Сам бы пайшоў, ды куды з такой нагой? А табе нельга: ты эвакуяваная. А мо пойдзеш? Дзве дзяўчыны ў мяне: ты ды Маруся Уткіна.

Маруся была такая высокая, дзеўка што трэба, а я не вельмі. Я — так сабе.

—Пойдзеш?

— А мне абмоткі дадуць?

Мы былі такія абарваныя — што там паспелі з сабой узяць!

—Ты такая прыгожанькая, табе чаравічкі ў войску дадуць.

І я пагадзілася.

...Выгрузілі нас з эшалона, тут ужо чакаў дзядзька, здаровы, вусаты, але ніхто з ім не паехаў. Не ведаю чаму, я не пыталася, я не была актывісткай, першай нікуды не лезла. Карацей, не спадабаўся нам гэты дзядзька. Потым з'яўляецца прыгожы афіцэр. Лялька! Ён пераканаў, і мы пагадзіліся. Прыехалі, а там гэты вусаты дзядзька рагоча: "Ну што, кірпаносыя, са мной не паехалі?".

Маёр выклікаў нас паасобку і пытаўся: "Што ты ўмееш?".

Адна казала: "Кароў даіць". Другая: "Бульбу абірала і варыла, маме дапамагала".

Запрашае мяне:

—А ты?

—Мыць умею.

—Бачу, дзеўка харошая. Калі б тыварыць умела.

—Умею.

Цэлы дзень гатую стравы, а вярнуся ноччу — салдатам памыць трэба. На варце стаяла. Мне крычаць: "Вартавы! Вартавы!" — а я адказаць не маю сілаў. Моцы няма нават адгукнуцца...»

*Ірына Мікалаеўна Зініна, радавая, кухарка*

«Ваявала я на санітарным цягніку... Памятаецца, першы тыдзень праплакала: ну, па-першае, без мамы, а па-другое, апынулася на трэцяй паліцы, куды цяпер багаж кладуць. Там быў мой "пакой".

—Колькі вам было, калі вы пайшлі на фронт?

—Я вучылася ў восьмым класе, але да канца года не датрывала. Збегла на фронт. Амаль усе дзяўчаты мае раўналеткі.

—А што вы там рабілі?

—Даглядалі параненых, паілі, кармілі, падавала судна. Са мной разам адна старэйшая дзяўчына дзяжурыла, дык яна мяне першы час аберагала: "Калі будуць судна прасіць, ты мяне кліч". Параненыя цяжка: у каго рукі, у каго нагі няма. Я першы дзень клікала, а потым — яна ж не можа са мной быць і ўвесь дзень, і ўсю ноч — засталася я адна. І вось мяне гукае паранены: "Сястрычка, судна!".

Я працягваю яму судна, а ён яго не бярэ. Гляджу: у яго няма рук. У галаве нешта пранеслася, неяк я даўмелася, што трэба рабіць, але на пэўны момант знерухомела, бо не ўяўляла, як паводзіцца. Вы мяне разумееце? Я мусіла дапамагчы… Але не ведала, што гэта такое, я яшчэ гэтага не бачыла. Гэтаму нават на курсах нас не вучылі…»

*Святлана Мікалаеўна Любіч, сандружынніца*

«Я не страляла… Кашу салдатам варыла. За гэта далі медаль. Я пра яго і не згадваю: хіба я ваявала? Кашу варыла, салдацкі суп. Цягала катлы, бакі. Цяжкія-цяжкія… Камандзір, бывала, злаваўся: “Я б пастраляў гэтыя бакі… Як ты нараджаць пасля вайны будзеш?”. А потым узяў і сапраўды пастраляў. Наўзамен у нейкім мястэчку адшукалі меншыя.

Вернуцца салдацікі з перадавой, адпачынак ім дадуць. Бедненькія, усе брудныя, змучаныя, ногі, рукі — усё абмарожанае. Асабліва баяліся маразоў узбекі, таджыкі. У іх жа сонца заўсёды, цёпла, а тут трыццаць-сорак градусаў марозу. Не можа адагрэцца, корміш яго. Ён сам лыжкі не паднясе да рота…»

*Аляксандра Сямёнаўна Масакоўская,*
*радавая, кухарка*

«Мыла… Праз усю вайну з ночвамі прайшла. Мыла рукамі. Фуфайкі, гімнасцёркі… Бялізну прывязуць, яна заношаная, завашыўленая. Маскхалаты наскрозь у крыві, не белыя, а чырвоныя. Чорныя ад старой крыві. У першай вадзе мыць нельга — яна чырвоная ці чорная… Гімнасцёрка без рукава, і дзірка на ўсю грудзіну, штаны без калашыны. Слязьмі адмываеш і слязьмі палошчаш…

І горы, горы гэтых гімнасцёрак… Фуфаек… Як згадаю, дык рукі і цяпер баляць. Узімку фуфайкі цяжкія, кроў на іх замёрзлая… Я часта гэта ў снах бачу… Ляжыць чорная гара…»

*Марыя Сцяпанаўна Дзятко, радавая, прачка*

«На вайне было столькі таямнічага… Вось, скажам…

Ляжыць на траве Ганна Кабурава… Наша сувязістка. Яна памірае — куля трапіла ў сэрца. У гэты момант заўважылі над намі клін жураvоў. Усе паднялі галовы да неба, і яна адплюшчыла вочы. Паглядзела: “Як шкада, дзяўчаты”. Потым змоўкла і ўсміхнулася нам: “Дзяўчаты, няўжо я памру?”. У гэты час бяжыць наш паштавік, наша Клава, яна крычыць: “Не памірай! Не памірай! Табе ліст з дому…”. Ганна не заплюшчвае вачэй, яна чакае…

Клава села каля яе, разарвала канверт. Ліст ад мамы: “Дарагая мая, любімая дачушка…”. Побач са мной стаіць доктар, ён кажа: “Гэта цуд. Цуд! Яна жыве насуперак усім законам медыцыны. Клава дачытала ліст… І толькі тады Ганна стуліла павекі…»

*Марыя Мікалаеўна Васілеўская,*
*сяржант, сувязістка*

«Мая спецыяльнасць… Мая спецыяльнасць — мужчынская стрыжка…

Каля мяне дзяўчына… Я не ведаю, як стрыгчы. У яе багатыя валасы, хвалямі. Заходзіць у зямлянку камандзір:

—Стрыгчы “пад мужчыну”.

—Але яна — жанчына.

—Не — яна салдат. Жанчынай яна зноў будзе пасля вайны.

Усё роўна… Усё роўна ледзь валасы трохі падрастуць, і я дзяўчатам ноччу дапамагала. Замест бігудзі ў нас былі яловыя шышкі… Сухія яловыя шышкі… Ну, хаця б трошкі накруціць…»

*Васіліса Южніна, радавая, цырульніца*

«Кніг я мала чытала… І апавядаць прыгожа не ўмею… Мы апраналі салдатаў, абстрыгалі, даглядалі — вось якое наша геройства. На конях ехалі, мала дзе цягніком, коні змучаныя, можна сказаць, пешшу да самага Берліна дайшлі. І калі так падлічыць, дык усё што трэба рабілі: параненых дапамагалі цягаць, на Дняпры снарады падносілі, бо нельга было падвезці, на руках валаклі некалькі кіламетраў. Зямлянкі капалі, масты масцілі…

Трапілі ў акружэнне, бегла, страляла, як усе. Забіла ці не забіла, не скажу. Бегла і страляла, як усе.

Мне здаецца, я вельмі мала прыпомніла. А колькі ўсяго ў мяне было! Я згадаю… Прыйдзі яшчэ раз…»

*Ганна Захараўна Горлач, радавая, прачка*

«Гісторыя ў мяне маленькая…

Старшына пытае:

— Дзяўчынка, колькі табе гадоў?

— Шаснаццаць, а што?

— А тое, — кажа, — нам непаўнагадовых не трэба.

— Што загадаеце, буду рабіць. Хоць хлеб пячы.

Узялі…»

*Наталля Мухаметдзінава, радавая, пекарка*

«Я была залічаная пісарам… Перараканалі мяне такім чынам пайсці ў штаб… Сказалі: мы ведаем, што да вайны вы працавалі фатографам, будзеце і ў нас фатографам.

Што добра запомнілася, дык гэта тое, што я не хацела фатаграфаваць смерць. Забітых. Здымала, калі салдаты адпачывалі, курылі, смяяліся, калі ўзнагароджвалі. Шкада, тады не было ў мяне каляровай стужкі, адно чорна-белая… Вынас сцяга палка… Я магла б гэта прыгожа зняць…

А сёння… Прыходзяць да мяне журналісты і пытаюцца: "Вы здымалі забітых? Поле бою…". Я стала шукаць… У мяне мала фотаздымкаў смерці… Калі каго забівалі, дык хлопцы мяне прасілі: "А ці ёсць ён у цябе жывы?". Мы шукалі яго жывога… Каб ён усміхаўся…»

*Алена Віленская, сяржант, пісарка*

«Мы будавалі… Будавалі чыгунку, пантонныя масты, бліндажы. Фронт побач. Капалі зямлю ноччу, каб нас не заўважылі.

Лес валілі. Збольшага дзяўчаты ў мяне ў аддзяленні, усе маладзенькія. Мужчынаў некалькі, што не трапілі ў баявыя часткі. Дрэва як з лесу выносілі? Бяромся за яго і нясём. Усім аддзяленнем адно дрэва. Крывавыя мазалі на руках… На плячах…»

*Зоя Лук'янаўна Вяржбіцкая,*
*камандзір аддзялення будаўнічага батальёна*

«Скончыла педвучэльню… Дыплом атрымала, калі ўжо была вайна. Паколькі вайна, накіравання нам не далі, а адпусцілі дахаты. Там праз некалькі дзён мяне выклікалі ў ваенкамат. Зразумела, мама не адпускала, маладая яшчэ, толькі васямнаццаць гадоў: "Выпраўлю цябе да брата, скажу, дома няма". Нагадваю: "Я ж камсамолка". У ваенкамаце сабралі нас і кажуць: патрэбныя жанчыны для франтавых хлебапякарняў.

Гэта вельмі цяжкая праца. У нас было восем жалезных печаў. Прыязджаем у разбураны пасёлак ці горад, ставім іх. Паставілі печы, патрэбныя дровы, дваццацьтрыццаць вёдраў вады, пяць мяхоў мукі. Васямнаццацігадовыя дзяўчаткі, мы цягалі мяхі з мукой па семдзесят кілаграмаў. Ухопімся ўдзвюх і валачом. Ці сорак буханаў хлеба на насілкі пакладуць. Я, прыкладам, не магла падняць. Дзень і ноч ля печы, дзень і ноч. Толькі гэтыя начоўкі замясілі, іншыя ўжо трэба падымаць. Бамбяць, а мы хлеб пячом…»

*Марыя Сямёнаўна Кулакова, радавая, пекарка*

«А я ўсе чатыры гады вайны на колах… Ездзіла, паводле ўказальнікаў: "Гаспадарка Шчукіна", "Гаспадарка Кажуры". Атрымаем на базе тытунь, папяросы, крэсіва — усё, без чаго байцу не абысціся на перадавой, — і ў дарогу. Дзе на машынах, дзе на фурманках, а найчасцей пешкі з адным ці двума салдатамі. На сабе валачом. Да траншэі конымі не праедзеш, немцы пачуюць. Усё на сабе. На сваіх плячах, мая міленькая…»

*Алена Нікіфараўна Іеўская, радавая, забеспячэнка*

«Перад пачаткам вайны мне было дзевятнаццаць гадоў… Я жыла ў горадзе Мураме Уладзімірскай вобласці. У кастрычніку сорак першага нас, камсамольцаў, паслалі будаваць аўтамабільную дарогу Мурам — Горкі — Кулябакі. Калі мы вярнуліся з працоўнага фронту, нас мабілізавалі.

Мяне скіравалі ў школу сувязі на паштовыя курсы. Пасля заканчэння была адпраўленая ў шасцідзясятую стралковую дывізію. Служыла афіцэрам у палкавой пошце. Сваімі вачыма бачыла, як людзі плакалі, цалавалі канверты, атрымаўшы лісты на перадавой. А ў многіх родныя загінулі ці жылі на тэрыторыі, захопленай

ворагам. Не маглі напісаць. У такім разе мы пісалі лісты ад Незнаёмай: "Дарагі салдат, піша табе Незнаёмая дзяўчына. Як ты змагаешся з ворагам? Калі вернешся з Перамогай?". Начамі сядзелі і прыдумлялі… Я за вайну сотні такіх лістоў напісала…»

*Марыя Аляксееўна Рамнёва,*
*малодшы лейтэнант, паштовая работніца*

## Пра адмысловае мыла «К» і гаўптвахту

«Першага мая я пабралася шлюбам. А дваццаць другога чэрвеня пачалася вайна. Прыляцелі першыя нямецкія самалёты. Я працавала ў дзіцячым доме для іспанскіх малых, якіх прывезлі да нас у Кіеў. Гэта — трыццаць сёмы год… Грамадзянская вайна ў Іспаніі. Мы не разумелі, што рабіць, а іспанскія дзеці пачалі капаць у двары акопы. Яны ўжо ўсё ведалі… Дзяцей выправілі ў тыл, а я паехала ў Пензенскую вобласць. Мне даручылі арганізаваць курсы медсясцёр. Напрыканцы сорак першага года я сама прымала экзамены на гэтых курсах, бо ўсіх дактароў паслалі на вайну. Выдала пасведчанні і таксама папрасілася на фронт. Скіравалі пад Сталінград, у вайсковы палявы шпіталь. Апынулася сярод дзяўчат найстарэйшай. Маёй сяброўцы Соні Удругавай, мы ўсё яшчэ сябруем, тады было шаснаццаць, яна скончыла адно дзевяць класаў — і гэтыя медычныя курсы. Тры дні мінула, як мы ўжо на фронце, і вось Соня сядзіць у лесе ды плача. Падыходжу:

—Сонечка, чаго ты плачаш?

—Як ты не разумееш? Я тры дні мамы не бачыла.

Калі цяпер я ёй гэты выпадак нагадаю, дык яна рагоча.

На Курскай дузе мяне перавялі са шпіталя ў палявы пральны атрад зампалітам. Прачкі былі вольнанаёмныя. Вось, бывала, едзем мы на фурманках: грувасцяцца тазы, начоўкі, самавары — нграваць ваду, а зверху сядзяць дзяўчаты ў чырвоных, зялёных, сініх, шэрых спадніцах. Ну, і ўсе весяліліся: "Вунь, паехала пральнае войска!". А мяне звалі "камісар прачак". Гэта ўжо потым мае дзяўчаты апрануліся больш прыстойна, як цяпер кажуць, "прыбарахліліся".

Праца была вельмі цяжкай. Ніякіх пральных машынаў тады не было і згадкі. Усё рукамі... Жаночымі ручкамі. Вось мы прыязджаем на месца, даюць нам адну якую-небудзь хату ці зямлянку. Мы і мыем там бялізну, але перш чым сушыць, дэзінфікуем яе адмысловым мылам "К", каб не было вошай. Быў яшчэ дуст, толькі ён не дапамагаў, таму карысталіся мылам "К", надзвычай смярдзючым, пах проста жахлівы. Там, у тым памяшканні, дзе мыем, мы і сушым, і тут жа спім. Давалі нам дваццаць — дваццаць пяць грамаў мыла — на аднаго салдата памыць бялізну. А яна чорная, як зямля. І ў многіх дзяўчат ад цяжару, ад напругі былі грыжы, экзэмы рук ад мыла "К", злазілі пазногці, думалі, што ніколі яны ўжо не будуць расці. Але ўсё роўна дзень-два адпачнуць — і трэба зноў за працу.

Дзяўчаты слухаліся мяне...

Прыязджаем мы аднойчы ў прызначанае месца, а там стаяць лётчыкі, цэлая частка. Уяўляеце, пабачылі нас, а мы ўсе ў брудным, заношаным, і гэтыя хлопцы ганарыста: "Ха-ха, прачкі...". Мае дзяўчаты ледзь не плачуць:

—Зампаліт, чуеце...

—Нічога, мы ім адпомсцім.

І мы дамовіліся. Увечары апранаюць мае дзяўчаты, што ў іх было найлепшае, ідуць на поплаў. Адна ім грае

на гармоніку, і яны танчаць. Умова: ні з адным лётчыкам не танчыць. Тыя падыходзяць, а яны ні з кім не ідуць. Увесь вечар адна з адной танчылі. Нарэшце тыя выбачыліся: "Нейкі дурань сказаў, а вы на ўсіх пакрыўдзіліся".

Увогуле, паводле статута, вольнанаёмных нельга было садзіць на гаўптвахту, аднак што паробіш, калі сто дзяўчат разам? У нас у адзінаццаць — адбой, без варыянтаў. Яны спрабавалі ўцякаць — ну, дзяўчаты ёсць дзяўчаты. І я саджала іх на гаўптвахту. Неяк прыехала кіраўніцтва з суседняй часткі, а ў мяне дзве сядзяць.

—Як гэта так? Вольнанаёмных саджаеце на гаўптвахту? — пытаюцца ў мяне.

Я спакойна адказваю:

—Пішыце, таварыш палкоўнік, рапарт камандаванню. Ваша рацыя. Але я павінна змагацца за дысцыпліну. І ў мяне выключны парадак.

З тым яны і паехалі.

Дысцыпліна была моцная. Неяк сустрэла аднаго капітана — праходзіў паўз маю хату, і я выходжу. Ён нават прыпыніўся:

—Божа мой! Вы адсюль, а вы ведаеце, хто тут жыве?

—Ведаю.

—Тут жа зампаліт жыве. Вы хіба не чулі, яна такая злосная?

Я кажу, што ніколі такога не чула.

—Божа мой! Яна ніколі не ўсміхаецца, заўсёды начапураная.

—А вы хацелі б з ёй пазнаёміцца?

—Божа мой! Не!

Ну, і тут я прызналася:

—Дык будзем знаёмыя, я зампаліт!

—Не, не можа быць! Пра яе мне такое казалі…

Я берагла сваіх дзяўчат. У нас была такая прыгожая — Валя. Выклікалі мяне неяк на дзесяць дзён у штаб. Вяртаюся, мне дакладаюць, што Валя ўсе гэтыя дні позна прыходзіла, што была з нейкім капітанам. Два месяцы мінае, і я даведваюся, што яна цяжарная. Выклікаю: "Валя, як гэта магло здарыцца? Куды ты паедзеш? Твая мачаха (у яе не маці, а мачаха была) у зямлянцы жыве". Яна плача. "Гэта вы вінаватыя, калі б вы не паехалі, нічога б не здарылася". Яны са мной — як з маці, старэйшай сястрой.

У яе нейкае паліто лёгкае, а ўжо холадна, то я аддала свой шынель. Паехала мая Валя...

Восьмага сакавіка сорак пятага года. Мы зладзілі сабе свята. Гарбату. Нейкія цукеркі знайшлі. Выходзяць мае дзяўчаты на вуліцу і раптам бачаць: ідуць з лесу два немцы. Валакуць за сабой аўтаматы... Параненыя... Мае дзяўчаты акружылі іх. Ну, і я, як зампаліт, натуральна, напісала рапарт, што сёння, восьмага сакавіка, прачкі паланілі двух немцаў.

Назаўтра ў нас быў сход камандзіраў, начальнік палітаддзела перадусім кажа:

— Ну, таварышы, у мяне ёсць добрая навіна: хутка канец вайне. Учора прачкі з дваццаць першага палявога пральнага атрада ўзялі ў палон двух немцаў.

Усе запляскалі.

Пакуль была вайна, нас не ўзнагароджвалі, а калі скончылася, мне сказалі: "Узнагародзіць двух чалавек". Я абурылася. Узяла слова, выступіла, сказала, што я зампаліт пральнага атрада, і якая гэта цяжкая праца ў прачак, у многіх грыжы, экзэмы рук і гэтак далей... Дзяўчаткі маладыя, а працавалі як машыны, цягачы. У мяне пытаюцца: "Можаш да заўтра падрыхтаваць свой спіс? Мы яшчэ ўзнагародзім". І мы з камандзірам атрада ўсю

ноч карпелі над гэтым спісам. Тады многія дзяўчаты атрымалі медалі "За адвагу", "За баявыя заслугі", а адну прачку ўзнагародзілі ордэнам Чырвонай Зоркі. Найлепшую прачку, што не адыходзіла ад ночваў: бывала, усе ўжо без сілаў валяцца, а яна мые. Гэта была сталая жанчына, у яе ўся сям'я загінула.

Калі прыйшоў час адпраўляць дзяўчат дадому, мне захацелася чаго-кольвек даць ім з сабой. Яны пераважна з Беларусі і Украіны былі, а там усё разбурана, спалена. Як ты іх адпусціш з пустымі рукамі? А мы тады спыніліся ў нейкай нямецкай вёсцы, дзе была швейная майстроўня. Я пайшла паглядзець: машынкі стаялі, на маё шчасце, цэлыя. І вось кожнай дзяўчыне, якая выпраўлялася дамоў, мы зрабілі падарунак. Я была такая радая, такая шчаслівая. Гэта ўсё, што я магла зрабіць для сваіх дзяўчат.

Усе хацелі на радзіму і баяліся туды вяртацца. Ніхто не ведаў, што нас там чакае...»

*Валянціна Кузьмінічна Братчыкава-Баршчэўская, лейтэнант, зампаліт палявога пральнага атрада*

«Мой тата... Мой любы тата быў камуніст, святы чалавек. Я не сустракала ў жыцці лепшага за яго чалавека. Ён мяне выхоўваў: "Ну, хто б я быў без савецкай улады. Бядняк. Батрачыў бы на кулака. Савецкая ўлада дала мне ўсё, я атрымаў адукацыю. Зрабіўся інжынерам, будую масты. Я ўсім гэтым абавязаны нашай роднай уладзе".

Я любіла савецкую ўладу. Любіла Сталіна. І Варашылава. Усіх нашых герояў любіла. Так мяне навучыў тата.

Доўжылася вайна, я падрастала. Вечарамі мы з ім спявалі "Інтэрнацыянал" і "Свяшчэнную вайну". Тата акампанаваў на акардэоне. Калі мне споўнілася васямнаццаць гадоў, ён разам са мной пайшоў у ваенкамат...

З войска я напісала ліст, што будую і ахоўваю масты. Якая гэта была радасць у нашай сям'і! Тата нас усіх зачараваў мастамі, мы любілі іх з дзяцінства. Калі я бачыла разбураны мост — на яго скінулі бомбы ці падарвалі — я перажывала як за жывую істоту, а не як за стратэгічны аб'ект. Я плакала... Я сустракала сотні пабураных мастоў, вялікіх і маленькіх, іх нішчылі ў першую чаргу. Мішэнь нумар адзін. Калі мы ехалі паўз руіны, я заўсёды думала: колькі гэта спатрэбіцца часу, каб адбудаваць усё наноў? Вайна забівае час, каштоўны чалавечы час. Я добра запомніла, што кожны мост тата будаваў некалькі гадоў. Начамі сядзеў над чарцяжамі, нават у выходныя дні. Болей за ўсё на вайне я шкадавала час. Татаў час...

Таты даўно няма, але я яго па-ранейшаму люблю. Не слухаю, калі пра такіх, як ён, кажуць, што яны былі дурнымі і сляпымі — верылі ў Сталіна. Баяліся Сталіна. Былі адданыя ленінскім ідэям. Думалі аднолькава. Не, яны былі шчырыя і сумленныя людзі, яны верылі не ў Сталіна і Леніна, а ў камуністычную ідэю. У сацыялізм з чалавечым тварам, як потым будуць казаць. У шчасце дзеля ўсіх. Дзеля кожнага. Рамантыкі, ідэалісты — так, сляпыя — не. Ніколі не пагаджуся. Ні за што! Пасярэдзіне вайны ў нас з'явіліся выдатныя танкі і самалёты, увогуле добрая зброя, але ўсё роўна без веры такога страшэннага ворага, як гітлераўскае войска — магутнае, дысцыплінаванае, што скарыла ўсю Еўропу, — мы б ніколі не адолелі. Не пераламалі б яму хрыбта. Галоўнай нашай зброяй была вера, даю чэснае партыйнае слова (я на вайне ўступіла ў партыю і дагэтуль камуністка). Я не саромеюся свайго партбілета і не адмаўляюся ад яго. Мая вера не аслабла з сорак першага...»

*Тамара Лук'янаўна Торап,*
*радавая, інжынер-будаўнік*

«Пад Варонежам нямецкае войска спынілі. Яны доўга не маглі захапіць горад. Бамбавалі і бамбавалі. Самалёты лёталі над нашай вёскай Маскоўка. Я яшчэ не бачыла ворага, я бачыла толькі ягоныя самалёты. Але неўзабаве я дазналася, што такое вайна…

У наш шпіталь паведамілі, што пад самым Варонежам бомбамі разбілі цягнік, мы прыехалі на месца — убачылі… Што мы ўбачылі? Толькі фарш… Пераказаць не магу… Вой-вой-вой! Першым апамятаўся камандзір шпіталя. Ён гучна крыкнуў: “Насілкі!”. Я была самая маладая, мне толькі шаснаццаць, і ўсе прыглядалі за мной, каб я не самлела. Мы скакалі па шпалах, лазілі па вагонах. На насілкі не было каго пакласці: вагоны гарэлі, але не чулася ні стогнаў, ні крыкаў. Людзей цэлых не было. Я трымалася за сэрца, у мяне ад жаху заплюшчваліся вочы. Калі вярнуліся ў шпіталь, усе паваліліся хто дзе: хто на стол галаву паклаў, хто на крэслы — і так паснулі.

У мяне скончылася дзяжурства, і я пайшла дахаты. Уся заплаканая легла на кушэтку і толькі стулю павекі — усё зноў бачу… Вярнулася з працы мама, прыйшоў дзядзька Міця. Чую мамін голас:

— Не ведаю, што з Аленкай станецца. Ты паглядзі, які ў яе твар зрабіўся, калі яна ў шпіталь трапіла. Яна не падобная сама да сябе, ні з кім не размаўляе, у сне крычыць. І куды знікла весялосць, куды падзеўся смех? А ты сам ведаеш, якая яна была весялуха. А цяпер ніколі не жартуе.

Я слухаю маму, і ў мяне слёзы цякуць.

Калі ў сорак трэцім годзе вызвалілі Варонеж, я пайшла ў ваенізаваную ахову. Там адны дзяўчаты. Усім было па сямнаццаць-дваццаць гадоў. Маладыя, прыгожыя, ніколі столькі прыгожых дзяўчат разам не бачыла. Першай я пазнаёмілася з Марусяй Прохаравай, яна сябравала з Таняй Фёдаравай. Яны з адной вёскі. Таня была

сур'ёзнай, любіла чысціню, парадак, а Маруся была ахвочая спяваць, танчыць. Спявала саромныя прыпеўкі. А болей за ўсё любіла фарбавацца, сядзе перад люстэркам і сядзіць гадзінамі. Таня дакарала яе: "Чым твар песціць, лепей папрасуй сваю форму і прыбяры ложак". Была яшчэ ў нас Паша Літаўрына, вельмі рызыкоўная дзяўчынка. Сябравала яна з Шурай Бацішчавай. Шура была сарамлівая і сціплая, самая непрыкметная сярод нас. А Люся Ліхачова любіла накручваць свае кудзеркі, накруціць — і адразу за гітару. Яна з гітарай клалася спаць і з гітарай падымалася. Старэйшай за ўсіх была Паліна Няверава, у яе муж загінуў на фронце, і яна заўсёды была засмучанай.

Хадзілі мы ўсе ў вайсковай форме. Калі мама ўпершыню пабачыла мяне ў форме, дык адразу спалатнела:

—Ты вырашыла на фронт пайсці?

Я яе супакоіла:

—Ды не, мама. Я ж табе казала, што ахоўваю масты.

Мама заплакала:

—Хутка вайна скончыцца. І ты адразу здымеш шынель.

Я таксама так думала.

Праз два дні пасля таго, як мы даведаліся, што скончылася вайна, у нас быў сход у чырвоным кутку. Выступіў начальнік аховы таварыш Навумаў.

—Дарагія мае байцы, — сказаў ён, — вайна скончылася. Але ўчора я атрымаў загад: на Заходнюю дарогу патрабуюцца байцы ваенізаванай аховы.

Нехта з залы крыкнуў:

—Дык там жа бандэраўцы!...

Навумаў змоўк, а потым сказаў:

—Так, дзяўчаты, там бандэраўцы. Яны ваююць з Чырвонай арміяй. Але загад ёсць загад, яго трэба

выконваць. Хто згодны паехаць, прашу падаць заяву начальніку варты. Паедуць толькі добраахвотнікі.

Мы вярнуліся ў казарму, і кожная легла на свой ложак. Зрабілася ціха-ціха. Нікому не хацелася ехаць далёка ад родных мясцінаў. І нікому не хацелася паміраць пасля вайны. Назаўтра нас зноў сабралі. Я сядзела за сталом прэзідыума, стол накрылі чырвоным абрусам. І я думала, што апошні раз сяджу за гэтым сталом.

Начальнік аховы зрабіў прамову:

—Я ведаў, Бабіна, што ты згодзішся першая. І вы ўсе, дзяўчаты, малайцы, не спалохаліся. Скончылася вайна, можна вяртацца дахаты, а вы вырашылі далей абараняць Радзіму.

Праз два дні мы паехалі. Падалі нам таварняк, на падлозе было сена — пахучае.

Ніколі раней я не чула, што ёсць такі горад Стрый, цяпер гэта было месца нашай службы. Горад мне не спадабаўся — маленькі і страшны, кожны дзень грала музыка і каго-небудзь хавалі, то міліцыянера, то камуніста, то камсамольца. Зноў мы пабачылі смерць. Я там пасябравала з Галяй Каробкінай. Яна там і загінула. І яшчэ з адной дзяўчынай… Яе ноччу зарэзалі… І я там зусім перастала жартаваць і смяяцца…»

*Алена Іванаўна Бабіна, баец ваенізаванай аховы*

## Пра расплаўленыя падшыпнікі і рускі мат…

«Уся я ў бацьку… Ягоная дачка…

Бацька мой, Мірон Лянкоў, прайшоў шлях ад неадукаванага падлетка да камандзіра ўзвода ў грамадзянскую вайну. Быў сапраўдным камуністам. Калі ён памёр, мы засталіся з мамай жыць у Ленінградзе, усё

найлепшае ўва мне ад гэтага горада. Маёй жарсцю былі кнігі. Плакала над раманамі Лідзіі Чарскай, зачытвалася Тургеневым. Любіла паэзію…

Лета сорак першага… У чэрвені мы з сястрой паехалі да бабулі на Дон. Вайна заспела нас у дарозе. Па стэпе адразу панесліся конныя з ваенкамаўскімі позвамі. Спявалі, пілі і плакалі з адчаю казачкі, выпраўляючы казакоў на вайну. Я паспяшалася ў станіцу Бокаўскую ў райваенкамат. Сказалі коратка і жорстка:

—Дзяцей на вайну не бяром. Камсамолка? Вось і цудоўна. Дапамагай калгасу. Перасыпалі хлеб, каб не гарэў у буртах. Потым выбіралі гародніну. Мазалі на руках зацвярдзелі, вусны парэпаліся, твар абпаліўся стэпавым загарам. І калі я чым адрознівалася ад хутарскіх дзяўчатак, дык толькі тым, што ведала шмат вершаў і магла чытаць іх на памяць усю доўгую дарогу з поля да хаты.

А вайна набліжалася. Сямнаццатага кастрычніка фашысты акупавалі Таганрог. Многія эвакуяваліся. Бабуля засталася, а нас з сястрой выправіла: “Вы з сястрой маладыя. Ратуйцеся”. Да станцыі Абліўская ішлі пяць сутак. Зношаныя сандалі выкінулі, на станцыю прыйшлі басанож. Начальнік станцыі ўсіх папярэджваў: “Не чакайце крытых вагонаў, сядайце на платформы. Зараз будзе цягнік на Сталінград”. Нам пашанцавала — мы апынуліся на платформе з аўсом. Засунулі ногі ў зерне, накрыліся хусткай… Шчыльна прытуліліся адна да адной і заснулі… Хлеб у нас даўно скончыўся, мёд таксама. У апошнія дні нас падкормлівалі казачкі. Мы саромеліся браць, заплаціць не было чым, а яны ўпрошвалі: “Ешце, небаракі. Усім цяпер бяда, дапамагаць трэба адно аднаму”. Я дала сабе зарок ніколі не забыць гэтай людской дабрыні. Ніколі! Ні за што! І не забылася.

Ад Сталінграда параходам, потым зноў цягнікам даехалі ў дзве гадзіны ночы да станцыі Мядзведзіцкае. З людской хваляй нас выплюхнула на перон. А паколькі мы ператварыліся ў два ледзяшы і не маглі рухацца, дык стаялі, трымаючы адна адну, каб не зваліцца. Не рассыпацца на аскепкі, як на маіх вачах аднойчы рассыпалася жабка, калі яе з вадкага кіслароду кінулі на падлогу. На нашае шчасце, нехта, з кім мы былі ў дарозе, пра нас згадаў. Пад'ехала поўная людзей фурманка, нас прывязалі да яе ззаду. Надзелі фуфайкі і сказалі: "Рухайцеся, інакш замерзнеце. На фурманцы вам не адагрэцца". Мы спачатку падалі, але рухаліся, потым нават беглі. І так шаснаццаць кіламетраў...

Вёска Франк — калгас "1-га мая". Старшыня калгаса быў моцна ўсцешаны, калі даведаўся, што я з Ленінграда і паспела скончыць дзевяць класаў:

— Выдатна. Будзеш мне тут дапамагаць. За бухгалтарку.

На нейкі момант я нават узрадавалася. Але тут убачыла за спінай старшыні плакат: "Дзяўчаты, за руль!".

— Не буду сядзець у канторы, — сказала старшыні. — Калі мяне навучаць, хацела б кіраваць трактарам.

Трактары стаялі, засыпаныя снегам. Мы адкопвалі іх, разбіралі, абпальвалі пальцы на замёрзлым жалезе, пакідаючы на ім кавалачкі скуры. Пражавелыя, моцна зацягнутыя гайкі здаваліся прыварانымі. Калі не атрымлівалася скрануць іх з месца супраць гадзіннікавай стрэлкі, спрабавалі круціць паводле яе руху. Як на грэх... Менавіта ў гэты момант... Быццам з-пад зямлі, вырастаў брыгадзір Іван Іванавіч Нікіцін, адзіны сапраўдны трактарыст і наш настаўнік. Ён хапаўся за галаву і не мог стрымацца ад рускага мату. Эх, ты! Тваю

мацьу… Лаянка яго была як стогн. Толькі ўсё роўна адзін раз я нават заплакала…

У поле выехала заднім ходам: у каробцы хуткасцяў майго СТЗ бальшыня шасцерняў была "бяззубая". Разлік быў просты: за дваццаць кіламетраў які-небудзь трактар сапсуецца, і тады з яго пераставяць каробку хуткасцяў на мой. Так і здарылася. Такая ж, як я, трактарыстка Сарачка Газенбук, не заўважыўшы, што з радыятара выцекла вада, сапсавала рухавік. Эх, ты! Тваю мацьу…

Я да вайны на ровары не навучылася ездзіць, а тут — трактар. Праграvала рухавік супраць правілаў — адкрытым агнём. Даведалася і што такое перацяжка. І як заводзіць трактар, калі не заводзіцца — колам не пакруціш, у палову абароту не запусціш. Матэрыялы для змазкі і паліва — паводле нормаў вайны. За кожную кроплю адказваеш галавой, гэтаксама як і за расплаўлены падшыпнік. Эх, ты! Тваю мацьу… За кожную кроплю…

У той дзень… Перад выхадам у поле адкрыла кранік картэра — праверыць аліву. Пацякла нейкая сыроватка. Крычу брыгадзіру, ён падышоў, кроплю ў руках расцёр, панюхаў чамусьці і кажа: "Не бойся! Яшчэ дзень папрацаваць можна". Спрачаюся: "Нельга, самі казалі…". Ён заводзіцца з паловы абароту: "Навучыў на сваю галаву — ратунку ад вас няма. Лялькі гарадскія! Надта пісьменныя. Эх, ты! Тваю мацьу…". Варушыся, так тваю разгэтак. Паехала. Спякота, трактар курoдыміць, дыхаць няма чым, але ўсё гэта драбяза: як там падшыпнікі? Падобна, што пагрукваюць. Спынілася — здаецца, не. Дадам нагрузкі — грукаюць! І раптам — пад самае сядалішча — стук, стук, стук!

Спыняю рухавік, падбягаю да назіральных люкаў — два шатунныя падшыпнікі расплавіла дазвання! Асела

на зямлю, абняла кола і другі раз за вайну заплакала. Сама вінаватая: бачыла ж, якая аліва! Мату спалохалася. Яго б абмацюкаць у адказ, дык не, гнілая інтэлігенцыя.

Падняла галаву на нейкія гукі. Вось табе і маеш! Старшыня калгаса, дырэктар МТС, начальнік палітаддзела і, зразумела, наш брыгадзір. Нарабіў бяды!

А ён стаіць і зварухнуцца не можа. Усё зразумеў. Маўчыць. Эх, ты! Тваю маць…

Дырэктар МТС таксама ўсё зразумеў:

—Колькі?

—Два, — адказваю.

Па законах вайны — трэба ісці пад суд. Артыкул: халатнасць і шкодніцтва.

Начальнік палітаддзела звяртаецца да брыгадзіра:

—Што ж ты сваіх дзяўчатак не беражэш? Як я магу гэтае дзіця аддаць пад суд!

Неяк яно абышлося. Размовамі. Але — брыгадзір болей пры мне не мацюкаўся. А я дык навучылася… Эх, ты! Тваю маць… Такое выкідвала…

А потым здарылася шчасце: знайшлася наша мама. Яна прыехала, і ў нас зноў была сям'я. Мама раптам сказала:

—Я думаю: табе трэба ісці ў школу.

Я не адразу зразумела:

—Куды?

—А хто за цябе будзе заканчваць дзясяты клас?

Пасля ўсяго перажытага дзіўна было зноў апынуцца за школьнай партай, рашаць задачкі, пісаць дыктоўкі, вучыць нямецкія дзеясловы, замест таго каб біць фашыстаў. І гэта тады, калі вораг падступіўся да Волгі!

Мне трэба было пачакаць зусім няшмат: праз чатыры месяцы — сямнаццаць гадоў. Не васямнаццаць, дык хаця б сямнаццаць. І ўжо тады ніхто не верне мяне да-

моў. Ніхто! У райкаме ўсё абышлося, а ў ваенкамаце мне давялося паваяваць. І гады таму прычынай, і зрок. Але першае дапамагло другому... Калі мяне папікнулі ўзростам, я абазвала ваенкама бюракратам... І абвясціла галадоўку... Села з ім побач і двое сутак не зварухнулася з месца, а кавалак хлеба і кубак з кіпнем адсунула. Палохала, што памру з голаду, але спачатку напішу цыдулку, хто вінен у маёй смерці. Не думаю, што ён паверыў і спалохаўся, але ўсё-такі скіраваў мяне на медкамісію. Усё гэта адбывалася ў адным пакоі. Побач. І калі доктарка, праверыўшы зрок, развяла рукамі, ваенкам развесяліўся і сказаў, што я дарэмна галадала. Пашкадаваў мяне. А я адказала, што гэта я праз галадоўку нічога не бачу. Адышла да акна, бліжэй да той няшчаснай табліцы, і разраўлася. І плакала датуль... Доўга плакала... Пакуль не вывучыла ніжнія радкі табліцы. Потым выцерла слёзы і сказала, што гатовая яшчэ раз прайсці табліцу. І прайшла.

Дзясятага лістапада сорак чацвёртага года, набраўшы харчу, як было загадана, на дзесяць сутак, мы (чалавек дваццаць пяць дзяўчат) залезлі ў кузаў абадранага грузавіка і заспявалі “Дан приказ”, замяніўшы словы “на гражданскую войну” словамі “защищать свою страну”. З Камышына, дзе мы прынялі прысягу, па левым беразе Волгі рухаліся пешым маршам да самага Капусціна Яра. Там месціўся запасны полк. І там, сярод тысяч мужчынаў, мы нават неяк згубіліся. Прыязджалі “пакупнікі” з розных вайсковых частак, збіралі папаўненне. Нас яны старанна не заўважалі. Увесь час праходзілі паўз нас...

Па дарозе я здружылася з Ганнай Ракшэнка і Асяй Басінай. Абедзве яны ніякай спецыяльнасці не мелі, я ж сваю лічыла мірнай. І таму, на якую спецыяльнасць ні

быў запыт, мы ўтраіх рабілі тры крокі наперад, упэўненыя, што на месцы хутка засвоім любую спецыяльнасць. Толькі нас яны абміналі.

Але калі мы зрушылі на каманду: "Шафёры, трактарысты, механікі — тры крокі наперад!", "пакупніку", а гэта быў малады старшы лейтэнант, не атрымалася абмінуць нас. Я зрабіла не тры крокі, а пяць, і ён спыніўся:

—Чаму вы адбіраеце толькі мужчынаў? Я таксама трактарыстка!

Ён здзівіўся:

—Не можа быць. А ну — рытм працы рухавіка.

—Адзін, тры, чатыры, два.

—А падшыпнікі плавіла?

Я шчыра прызналася, што два шатуны расплавіла дарэшты.

—Добра. Бяру. За шчырасць. — І, кіўнуўшы, пайшоў далей.

Упарадкаваліся каля мяне і мае сяброўкі. Старшы лейтэнант зрабіў выгляд, быццам так і трэба. Эх, ты! Тваю маць...

Камандзір часткі, калі знаёміўся з новенькімі, запытаўся ў лейтэнанта:

—Ты навошта прывёз гэтых дзяўчат?

Той збянтэжыўся і сказаў, што яму зрабілася нас шкада: трапяць яшчэ невядома куды, пастраляюць, як курапатак.

Камандзір уздыхнуў:

—Добра. Адну — на кухню, другую — на склад, а якая больш пісьменная — пісаркай. Пасля паўзы дадаў: — Шкада, прыгожыя.

Самай "пісьменнай" была я, але ваяваць пісаркай! І прычым тут наша прыгажосць? Забыўшыся на вайсковую дысцыпліну, я ўмомант абурылася:

—Мы — добраахвотнікі. Прыйшлі абараняць Радзіму. Пойдзем толькі ў баявыя падраздзяленні…

Чамусьці палкоўнік нават не запярэчыў:

—У баявыя, дык у баявыя. Дзвюх — у лятучку, на станцыю, а гэтую, языкастую, — на зборку рухавікоў.

Так пачалася наша служба ў сорак чацвёртай аўтабранятанкавай палявой майстэрні. Мы былі заводам на колах. На машынах, іх звалі лятучкі, — стаялі станкі: фрэзерныя, расточныя, шліфавальныя, такарныя; электрастанцыя, заліўка, вулканізацыя. На станках працавалі па два чалавекі. Кожны па дванаццаць гадзін, без хвіліны перапынку. На сняданак, абед, вячэру падмяняў напарнік. Калі надыходзіла чарга каму ісці ў нарад, другі шчыраваў дваццаць чатыры гадзіны. Працавалі ў снезе, у брудзе. Пад бомбамі. І ўжо ніхто не казаў, што мы — прыгожыя. Што праўда, прыгожых дзяўчат на вайне больш шкадавалі. Іх больш шкада было хаваць… Выпісваць пахаванку… Эх, ты! Тваю маць…

Мне цяпер часта сняцца сны… Я ведаю, што яны сняцца, толькі рэдка іх запамінаю. Але застаецца адчуванне, што я недзе была… І вярнулася… У сне ў хвіліну ўкладаецца столькі, што ў жыцці патрабуе гадоў. А іншым разам пераблытаю, дзе сон, а дзе рэальнасць… Бадай, гэта было ў Зімоўніках, я толькі зайшла прылегчы на колькі гадзінаў, як пачалі скідаць бомбы. Эх, ты! Тваю маць… Лепей хай мяне заб'юць, чым сапсую сабе такую радасць, як дзве гадзіны сну. Недзе побач моцны выбух. Дом хіснуўся. Але я ўсё роўна засынаю…

Я не мела страху, не ведала такога пачуцця. Слова гонару. Толькі пасля самых бязлітасных налётаў ныў зуб, у якім была дзірка. Дый тое нядоўга. Я б дагэтуль лічыла сябе вельмі адважнай, каб праз некалькі гадоў пасля вайны не была змушаная праз бясконцыя,

нясцерпныя і зусім незразумелыя болі ў самых розных месцах свайго арганізма звярнуцца да спецыялістаў. І вельмі дасведчаны неўрапатолаг, запытаўшы, колькі мне гадоў, здзівіўся:

—Да дваццаці чатырох разбурыць усю сваю вегетатыўную нервовую сістэму! Як жа вы збіраецеся жыць?

Я адказала, што жыць збіраюся добра. Па-першае, я — жывая. Я так хацела выжыць! І я засталася жывой. Што праўда, не мінула і некалькіх месяцаў мірнага жыцця, як у мяне апухлі суставы, знерухомела і пачала страшна балець правая рука, яшчэ болей сапсаваўся зрок, апусцілася нырка, зрушылася пячонка і, як найперш высветлілася, у мяне была цалкам разбураная вегетатыўная нервовая сістэма. Але я ўсю вайну марыла, што буду вучыцца. І ўніверсітэт стаўся для мяне другім Сталінградам. Я скончыла яго на год раней, інакш не хапіла б сілаў. Чатыры гады ў адным шынялі — узімку, увесну, увосень — і да белі палінялай гімнасцёрцы... Эх, ты! Тваю маць...»

*Антаніна Міронаўна Лянкова,*
*аўтаслесар палявой аўтабронетанкавай майстэрні*

# «ПАТРЭБНЫ БЫЎ САЛДАТ... А ХАЦЕЛАСЯ БЫЦЬ ЯШЧЭ ПРЫГОЖАЙ...»

За некалькі гадоў запісала ўжо сотні ўспамінаў... На кніжных паліцах упарадкаваныя сотні касет і друкаваных старонак. Услухоўваюся і ўчытваюся...

Свет вайны ўсё болей адкрываецца мне з нечаканага боку. Раней я не задавала сабе пытанняў: як можна было, напрыклад, падоўгу спаць у акопах няпоўнага профілю ці ля вогнішча на голай зямлі, хадзіць у ботах і шынялях, і нарэшце — не весяліцца, не танчыць. Не насіць летнія сукенкі? Забыцца на туфлі і кветкі... Ім жа было па васямнаццаць-дваццаць гадоў! Я звыклася думаць, што жаночаму жыццю няма месца на вайне. Яно немагчымае там, амаль забароненае. Але я памылялася... Вельмі хутка, ужо падчас першых сустрэч, заўважыла: пра што б жанчыны ні казалі, нават пра смерць, яны заўсёды згадвалі (так!) прыгажосць, яна была неад'емнай складовай іхняга існавання: «Яна ляжала ў труне такая прыгожая... Як нявеста...» (*А. Строцава, пехацінка*) ці: «Мяне павінны былі ўзнагародзіць медалём, а ў мяне старая гімнасцёрка. Я падшыла сабе каўнерык марляй. Усё ж белы... Мне здавалася, што я такая ў гэтую хвіліну прыгожая. А люстэрка не было, я сябе не бачыла. Усё ў нас разбамбілі...» (*Н. Ермакова, сувязістка*). Весела і ахвотна распавядалі пра свае наіўныя дзявочыя хітрыкі, маленькія сакрэцікі, нябачныя знакі, як у «мужчынскім» побыце вайны і ў «мужчынскай» справе вайны ўсё-такі хацелі застацца самімі сабой. Не здрадзіць сваёй прыродзе. Памяць іх на здзіўленне (як-ніяк, сорак гадоў мінула) захавала вялізную колькасць

драбніцаў вайсковага побыту. Дэталяў, адценняў, фарбаў і гукаў. У іх свеце побыт і быццё злучаліся, і плынь быцця была самакаштоўнай, яны згадвалі пра вайну як пра час жыцця. Не столькі дзеянне, як жыццё, я не аднойчы назірала, што малое ў іхніх аповедах перамагала вялікае, нават гісторыю. «Шкада, што прыгожая я была толькі на вайне… Там прамінулі мае найлепшыя гады. Спаліліся. Потым я хутка пастарэла…» (*Ганна Галай, аўтаматчыца*).

З адлегласці гадоў адны падзеі пакрысе ўзбуйняліся, іншыя — меншалі. І ўзбуйнялася чалавечае, інтымнае, яно рабілася і мне, і, самае дзіўнае, нават ім самім больш цікавым і блізкім. Чалавечае перамагала нечалавечае — адно таму, што яно чалавечае. «Ты не палохайся маіх слёз. Не шкадуй. Хай мне балюча, але я табе ўдзячная, што згадала сябе маладую…» (*К. С. Ціханава, сяржант, зенітчыца*).

Гэтай вайны я таксама не ведала. І нават не ўяўляла…

## Пра мужчынскія боты і жаночыя капялюшыкі

«Жылі мы ў зямлі… Як краты… Але нейкімі драбніцамі сябе цешылі. Увесну галінку прынясеш, паставіш. Радасць. А заўтра цябе можа і не быць, — пра гэтае толькі сам-насам думалі. І запамінаеш, запамінаеш… Адной дзяўчыне прыслалі з дому ваўняную сукенку. Мы зайздросцілі, хаця насіць свае сукенкі не дазвалялася. А старшына, ён жа мужчына, буркатаў: "Лепей бы табе прасцінку даслалі. Больш карысці…". У нас прасцінаў не было, падушак таксама. Мы спалі на веццці, на саломе.

Але ў мяне былі прыхаваныя завушніцы, я ноччу начаплю і сплю з імі...

Калі мяне першы раз кантузіла, я не чула і не размаўляла. Сказала сабе: калі не адновіцца голас, кінуся пад цягнік. Я так спявала, і раптам голасу няма. Але голас вярнуўся.

Шчаслівая я, у завушніцы прыбралася. Прыходжу на дзяжурства — крычу ад радасці:

—Таварыш старшы лейтэнант, дакладвае дзяжурная...

—А гэта што?

—Як што?

—Прэч адсюль!

—Чаму?

—Зараз жа выдзеры завушніцы. Што гэта за салдат?

Старшы лейтэнант быў вельмі прыгожы. Усе нашыя дзяўчаты былі ў яго хоць трохі закаханыя. Ён нам казаў, што на вайне патрэбныя салдаты і толькі салдаты. Патрэбны быў салдат... А хацелася быць яшчэ прыгожай. Я ўсю вайну баялася, каб ногі не пакалечыла. У мяне былі прыгожыя ногі. Мужчыну — што? Яму не так страшна, калі нават і ногі страціць. Усё роўна — герой. Жаніх! А жанчыну скалечыць, дык гэтым яе лёс вырашыцца. Жаночы лёс...»

*Марыя Мікалаеўна Шчолакава,*
*сяржант, камандзір аддзялення сувязі*

«Я ўсю вайну ўсміхалася... Я лічыла, што мушу ўсміхацца як мага часцей, бо жанчына мусіць несці святло. Перад адпраўкай на фронт стары прафесар так вучыў: "Вы павінны кожнаму параненаму казаць, што вы яго любіце. Самыя моцныя вашы лекі — гэта любоў. Любоў беражэ, дае моцы жыць". Ляжыць паранены, яму

так балюча, што ён плача, а ты яму: "Ну, мой міленькі. Ну, мой харошанькі..." — "Ты мяне любіш, сястрычка?" (Яны нас усіх, маладзенькіх, звалі сястрычкамі.) — "Канешне, люблю. Толькі папраўляйся хутчэй". Яны маглі крыўдаваць, лаяцца, а мы ніколі. За адно дрэннае слова можна было і на гаўптвахту трапіць.

Цяжка... Ну так, цяжка... Нават у спадніцы ўскараскацца на машыну, калі адны мужчыны вакол. А грузавікі высокія, спецыяльныя санітарныя машыны. Ускараскайся на самую вышыню! Паспрабуй...»

*Вера Уладзіміраўна Шавалдышава,*
*старшы лейтэнант, хірург*

«Далі нам вагоны... Таварняк... Нас дванаццаць дзяўчатак, астатнія ўсе мужчыны. Дзесяць-пятнаццаць кіламетраў праедзем, і цягнік стаіць. Дзесяць-пятнаццаць кіламетраў — і зноў нас у тупік. Ні вады, ні прыбіральні... Зразумела?

Мужчыны зладзяць вогнішча на прыпынку, страсаюць вошай, сушацца. А нам дзе? Пабяжым у якую-небудзь схованку, там і распранаемся. У мяне быў швэдрык вязаны, дык вошы сядзелі на кожным сантыметры, у кожнай пяцельцы. Пабачыш, званітуе. Вошы бываюць галаўныя, адзежныя, лабковыя... У мяне былі яны ўсе... Ну, не буду ж я разам з мужчынамі. Не буду разам вошай гэтых смажыць. Сорамна. Выкінула швэдрык і засталася ў адной сукеначчы. На нейкай станцыі незнаёмая жанчына вынесла мне кофтачку, туфлі старыя.

Доўга ехалі, а потым яшчэ доўга ішлі пешшу. Быў мароз. Я ішла і ўвесь час зазірала ў люстэрка: ці не абмарозілася? Пад вечар адчуваю, што абмарозілася. Да чаго дурненькая была... Чула, што калі абмарозіш шчокі, дык яны белыя. А ў мяне чырвоныя-чырвоныя.

Думаю, хай бы заўсёды абмарожаныя былі. А назаўтра яны счарнелі...»

*Надзея Васілеўна Аляксеева, радавая, тэлеграфістка*

«У нас было шмат прыгожых дзяўчат... Пайшлі ў лазню, а пры лазні цырульня працавала. Ну і, адна на адну гледзячы, бровы ўсе пафарбавалі. Як разлаваўся камандзір: "Вы ваяваць ці баляваць прыехалі?". Усю ноч плакалі, адмывалі. Зранку хадзіў і паўтараў кожнай: "Мне патрэбныя салдаты, а не паненкі. Паненкі на вайне не выжываюць". Вельмі строгі камандзір. Да вайны ён быў настаўнікам матэматыкі...»

*Настасся Пятроўна Шэлег,*
*малодшы сяржант, аэрастатчыца*

«Мне здаецца, я два жыцці пражыла — мужчынскае і жаночае...

Калі трапіла ў вучэльню, там адразу вайсковая дысцыпліна: і на палігоне, і на пляцы, і ў казарме — усё паводле статуту. Спагады нам, як дзяўчатам, ніякай. Толькі і чуваць: "Спыніць размовы!", "Маўчаць!". Увечары карцела пасядзець, павышываць... Нешта жаночае згадаць... Не дазвалялася ні ў якім разе. А мы засталіся без дому, без хатніх турбот, і было неяк няўтульна. Давалі толькі гадзіну адпачынку: сядзелі ў ленінскім пакоі, пісалі лісты, можна было пастаяць вольна, паразмаўляць. Але ні смеху, ні гучнага слова — гэта было не дазволена.

— Песню можна было праспяваць?

— Не, нельга.

— А чаму нельга?

— Нельга. Вось калі аддзяленнем ідзём, спявай — калі дадуць каманду. Каманда: "Запявала, заспявай!"

— А так нельга?

—Нельга. Гэта супраць статута.

—Цяжка было звыкнуцца?

—Мне здаецца, я з гэтым і не звыклася. Толькі заснеш, як раптам: "Пад'ём!". Як ветрам здзімае нас з ложкаў. Пачынаеш апранацца, а ў жанчын апратак болей, чым у мужчынаў, то адно валіцца з рук, то другое. Нарэшце рэмень у рукі — і бегма да раздзявальні. На бягу хапаеш шынель і тут жа ў збройны пакой. Там чахол на рыдлёўку, працягваеш праз рэмень, накідваеш на сябе падсумак, сяк-так зашпільваешся. Хапаеш вінтоўку, закрываеш затвор і з чацвёртага паверха па сходах літаральна валішся на падворак. Тады ўжо парадкуеш сябе да поўнага ладу. І на ўсё гэта маеш лічаныя хвіліны.

А гэта на фронце… Боты ў мяне на тры памеры большыя, загнуліся, брудныя. Гаспадыня прынесла два яйкі: "Вазьмі ў дарогу, такая худзенькая, што хутка пераломішся". А я неўпрыкмет, каб яна не бачыла, разбіла гэтыя два яйкі, яны невялічкія былі, і пачысціла боты. Вядома, есці хацелася, аднак перамагло жаночае — быць прыгожай. Вы не ведаеце, як шынель дзярэ, якое гэта ўсё мужчынскае — і рэмень, і ўсё. Найболей я не любіла, што шынель шыю дзярэ, і яшчэ гэтыя боты. Крок мяняўся, усё мянялася…

Я згадваю, што мы былі сумныя. Увесь час хадзілі сумныя…»

*Станіслава Пятроўна Волкава,*
*малодшы лейтэнант, камандзір сапёрнага ўзвода*

«Не так лёгка было перарабіць нас у салдатаў. Не так проста…

Атрымалі абмундзіраванне. Старшына загадаў:

—Выраўняць наскі.

Мы выроўніваем. Наскі роўныя, а самі ззаду, бо боты саракавога — сорак першага памераў. Ён:

—Насочкі, насочкі!

А потым:

—Курсанткі, зважай на грудзі чацвёртага чалавека…

У нас гэта, натуральна, не атрымліваецца, і ён на ўвесь голас:

—Што гэта вы там у кішэні гімнасцёрак паклалі?

Мы рагочам.

—Адставіць смех, — крычыць старшына.

Каб бездакорна адпрацаваць прыём вітання, усё — ад крэслаў да плакатаў — змушаў вітаць. Вох, і напакутаваўся ён з намі.

У нейкім горадзе прывялі нас маршам у лазню. Мужчыны — у мужчынскае аддзяленне, а мы — у жаночае. А там жанчыны лямантуюць, сваё патаемнае закрываюць: "Салдаты ідуць!". Нас не адрозніш — дзяўчаткі ці хлопчыкі: мы і падстрыжаныя, і форма на нас вайсковая. А іншым разам пайшлі ў прыбіральню — жанчыны міліцыянера прывялі. Мы яму кажам:

—Дык куды нам ісці?

Ён тады давай на жанчын наракаць:

—Гэта ж дзяўчаты!

—Якія ж гэта дзяўчаты, калі салдаты…»

*Марыя Мікалаеўна Сцяпанава, маёр, начальнік сувязі ў батальёне сталковага корпуса*

«Памятаю толькі дарогу. Дарогу… То ўперад, то назад…

Калі мы апынуліся на Другім Беларускім фронце, нас хацелі ў штабе дывізіі пакінуць, маўляў, вы жанчыны, навошта вам на перадавую. На што атрымалі адказ: "Не, мы снайперкі, пасылайце нас, куды рыхтавалі". Тады яны нам кажуць: "Пашлём у адзін полк, там

харошы палкоўнік, ён дзевак беражэ”. Розныя камандзіры былі. Нам так і сказалі.

Гэты палкоўнік нас сустрэў такімі словамі: “Глядзіце, дзеўкі, прыехалі ваяваць, ваюйце, а іншымі справамі не займайцеся. Наўкол адны мужчыны, а жанчын няма. Чорт яго ведае, як яшчэ вам гэта патлумачыць. Вайна, дзеўкі…”. Ён разумеў, што мы яшчэ зусім маляўкі. Першы раз наляцелі самалёты. Я прысела і закрыла галаву рукамі, потым падумала, што рук таксама шкада. Яшчэ не была падрыхтаваная да смерці.

Згадваю, як у Германіі… Ой, смешна! У адным нямецкім мястэчку нас адправілі начаваць у жылы замак. Шмат пакояў, вялізныя залы. Такія залы! У шафах паўнютка прыгожага адзення. Дзяўчаты — кожная сукенку сабе выбрала. Мне жоўценькая адна спадабалася і яшчэ халат, не пераказаць словамі, які гэта быў прыгожы халат — доўгі, лёгкі… Пушынка! А ўжо спаць трэба класціся, стаміліся надта. Мы надзелі гэтыя сукенкі і леглі спаць. Апранулі тое, што нам спадабалася, і тут жа паснулі. Я легла ў сукенцы і халат яшчэ паўзверх…

А іншым разам у пакінутай майстэрні капялюшыкаў выбралі на ўласны густ і, каб пабыць у іх даўжэй, спалі ўсю ноч седзячы. Зранку падняліся… Пакруціліся яшчэ раз каля люстэрка… І ўсё знялі, надзелі зноў свае пілоткі. Нічога з сабой не бралі. У дарозе і голка цяжкая. Лыжку за халяву ўваткнеш, і ўсё…»

*Бэла Ісакаўна Эпштэйн, сяржант, снайперка*

«Мужчыны… Яны такія.. Не заўсёды нас разумелі…

Але свайго палкоўніка Пціцына мы вельмі любілі. Звалі яго “Бацька”. Ён быў не падобны да іншых, разумеў нашу жаночую душу. Пад Масквой — тады адступалі, самы цяжкі час, — а ён нам кажа:

—Дзяўчаты, Масква побач. Я прывязу вам цырульніцу. Фарбуйце бровы, вейкі, завіўку рабіце. Хаця гэта і не паводле статута, але я хачу, каб вы былі прыгожымі. Вайна доўгая… Не хутка скончыцца…

І прывёз нам майстрыху. Мы зрабілі завіўкі, падфарбаваліся. І такія былі шчаслівыя…»

*Зінаіда Пракопаўна Гомарава, тэлеграфістка*

«Пабеглі па лёдзе Ладажскага возера… У наступ. Неўзабаве трапілі пад моцны артылерыйскі абстрэл. Вакол вада, параняць — чалавек адразу ідзе на дно. Я поўзаю, перавязваю, падпаўзла да аднаго, у яго ногі перабітыя, прытомнасць губляе, але мяне адштурхоўвае і ў свой “сідар” (рэчмяшок, значыцца) лезе. Свой “НЗ” шукае. Паесці — хаця б перад смерцю. А мы, перад тым як наступаць, атрымалі харч. Я хачу яго перавязаць, а ён па сухар лезе: мужчыны чамусьці вельмі цяжка голад трывалі. Голад для іх быў страшнейшы за смерць…

А я пра сябе вось што запомніла… Спачатку баішся смерці… У табе разам і здзіўленне, і цікаўнасць. А потым ні таго, ні другога — ад стомы. Увесь час на мяжы магчымасцяў. За мяжой. Да канца застаецца толькі страх — быць непрыгожай пасля смерці. Жаночы страх… Толькі б не раскідала на кавалкі снарадам… Я ведаю, як гэта… Сама падбірала…»

*Сафія Канстанцінаўна Дубнякова, санінструктарка*

«Дажджыла і дажджыла… Бяжым па твані, людзі падаюць у гэтую твань. Параненыя, забітыя. Так не хочацца гінуць у балоце. У чорным балоце. Ну як маладой дзяўчыне там ляжаць… А іншым разам, гэта ўжо ў беларускіх… аршанскіх лясах, там кусты з чаромхай. Пралескі блакітныя. Уся паляна блакітная. Загінуць бы ў такіх

кветках! Тут ляжаць… А я яшчэ дурная малеча, сямнаццаць гадоў… Гэта я сабе так смерць тады ўяўляла…

Я думала, што памерці — гэта як быццам некуды адляцець. Аднойчы ноччу мы размаўлялі пра смерць, але толькі аднойчы. Баяліся вымаўляць гэтае слова…»

*Любоў Іванаўна Асмалоўская, радавая, разведчыца*

«Наш полк быў цалкам жаночы… Вылецелі на фронт у маі сорак другога года.

Далі нам самалёт "По-2". Маленькі, павольны. Лётаў ён толькі на малой вышыні, часта над самай зямлёй! Да вайны на ім вучылі моладзь у аэраклубах, але ніхто не мог падумаць, што яго скарыстаюць і на вайне. Самалёт быў драўлянай канструкцыі, цалкам з фанеры, абцягнуты паркалем. Папросту кажучы — марляй. Даволі было аднаго трапнага стрэлу з зеніткі, як яго ахоплівала полымя — і ён згараў у паветры, не даляцеўшы да зямлі. Як запалка. Адзіная важкая металёвая канструкцыя — гэта сам рухавік М-ІІ. Потым ужо, напрыканцы вайны, нам выдалі парашуты і паставілі кулямёт у кабіне штурмана, а да гэтага не было ніякай зброі, чатыры бомбатрымальнікі пад крыламі — і ўсё. Цяпер нас назвалі б камікадзэ, напэўна, мы і былі камікадзэ. Так! Былі! Але перамога ацэньвалася вышэй за нашыя жыцці. Перамога!

Вас цікавіць, як мы вытрымлівалі? Я вам адкажу…

Перад тым, як сысці на пенсію, я захварэла ад адной гэтай думкі: як гэта я не буду працаваць? Навошта тады пасля пяцідзесяці я скончыла другі інстытут? Стала гісторыкам. А так — усё жыццё геолаг. Але добры геолаг заўсёды ў полі, а ў мяне ўжо сілы былі не тыя. Прыехаў доктар, зняў кардыяграму і пытае:

— Вы калі перанеслі інфаркт?

— Які інфаркт?

—У вас усё сэрца ў шнарах.

А гэтыя шнары, відаць, з вайны. Ты заходзіш над цэллю, цябе ўсю трасе. Усё цела ў дрыжыках, бо ўсюды агонь: знішчальнікі страляюць, зенiткі расстрэльваюць... Некалькі дзяўчат пакінулі полк, не вытрывалі. Лёталі мы звычайна ноччу. Нейкі час нас спрабавалі пасылаць на заданне днём, але хутка адмовіліся ад гэтай ідэі. Нашыя "По-2" падстрэльвалі нават з аўтаматаў...

Рабілі да дванаццаці вылетаў за ноч. Я бачыла знакамітага лётчыка-аса Пакрышкіна, калі ён вяртаўся з баявога палёту. Гэта быў моцны мужчына, яму не дваццаць гадоў і не дваццаць тры, як нам: пакуль самалёт запраўлялі, тэхнік паспяваў выкруціць ягоную кашулю. З яе цякло, як быццам ён у залеву трапіў. Цяпер уявіце сабе, што рабілася з намі. Прыляціш — і нават не хапае моцы з кабіны выкараскацца. Не маглі ўжо планшэт несці, цягнулі па зямлі.

А праца нашых дзяўчат-збройніц! Ім трэба было чатыры бомбы — гэта чатыры сотні кіло — падвесіць да машыны рукамі. І так усю ноч — адзін самалёт узляцеў, другі — апусціўся. Арганізм да такой ступені перайначваўся, што мы ўсю вайну не былі жанчынамі. Ніякіх у нас жаночых справаў... Месячных... Ну, вы самі разумееце... А пасля вайны не ўсе змаглі нарадзіць...

Мы ўсе курылі. І я курыла, такое адчуванне, быццам трохі супакойваешся. Прыляціш — усю ліхаманіць, закурыш — як бы спакайнейшай зрабілася. Хадзілі мы ў скураных куртках, штанах, гімнасцёрках, узімку яшчэ была куртка з футра. Міжволі і хада, і рухі ўвогуле зрабіліся трохі мужчынскімі. Калі скончылася вайна, нам пашылі сукенкі хакі. Мы раптам адчулі, што мы дзяўчаты...»

*Аляксандра Сямёнаўна Папкова,*
*гвардыі лейтэнант, штурман*

«Не так даўно ўзнагародзілі мяне медалём... Ад Чырвонага Крыжа... Залаты міжнародны медаль "Флорэнс Найтынгейл". Усе віншуюць і дзівяцца: "Як гэта вы маглі выцягнуць сто сорак сем параненых? Такая маленькая дзяўчынка на вайсковых фотаздымках". Ды я іх, можа, і дзвесце выцягнула, хто тады лічыў. Мне і да галавы не было, мы гэтага не разумелі. Ідзе бой, салдаты скрываўленыя, а я буду сядзець і натаваць. Я ніколі не чакала, калі спыніцца атака, рухалася следам і падбірала параненых. Калі хто скалечаны аскепкам, а я падпаўзу да яго праз гадзіну-другую, дык мне там не будзе чаго рабіць, чалавек застанецца без крыві.

Тры разы параненая і тры разы кантужаная. На вайне хто пра што марыў: хто дахаты вярнуцца, хто дайсці да Берліна, а я пра адно думала — дажыць да дня нараджэння, да васямнаццаці гадоў. Чамусьці мне страшна было памерці раней. Хадзіла я ў штанах, у пілотцы, абарваная, таму што заўсёды на каленях поўзаеш, ды яшчэ з цяжарам параненага. Не было нават веры, што калі-небудзь можна будзе падняцца і па зямлі на поўны рост крочыць, а не поўзаць. Гэта толькі мара была. Прыехаў неяк камандзір дывізіі, пабачыў мяне і пытае: "А што гэта ў вас за падлетак? Навошта такога трымаць? Яго трэба адправіць вучыцца".

Памятаю, не хапала бінтоў... Такія страшныя кулявыя раны, што кладзеш цэлы пакет. З сябе ўсё споднее зняла, разарвала і хлопцаў прашу: "Здымайце кальсоны, ніжнія кашулі, у мяне людзі гінуць". Яны паздымалі, парвалі на кавалкі. Я іх не саромелася, як з братамі хлопчыкам сярод іх жыла. Ідзём, трымаемся ўтраіх за рукі, і сярэдні спіць гадзіну-другую. Потым змена.

Дайшла да Берліна. Распісалася на Рэйхстагу: "Я, Сафія Кунцэвіч, прыйшла сюды, каб забіць вайну".

Пабачу брацкую магілу, перад ёю кленчу. Перад кожнай брацкай магілай... Толькі на каленях...»

*Сафія Адамаўна Кунцэвіч, старшына, санінструктарка стралковай роты*

## Пра дзявочы дыскант і матроскія забабоны

«Чула я... Словы... Атрута... Словы, як камяні... Маўляў, гэта была мужчынская хэнць — ісці на вайну. Хіба можа жанчына забіваць?! Гэта сапсаваныя, нічога не вартыя жанчыны...

Не! Тысячу разоў не! Гэта было нармальнае чалавечае памкненне. Пачалася вайна, я жыла як усе... Як усе дзяўчаткі... Але суседка атрымала ліст — мужа параніла, ляжыць у шпіталі. Я падумала: "Ён паранены, а замест яго хто?". Вярнуўся адзін без рукі — замест яго хто? Другі вярнуўся без нагі — замест яго хто? Я пісала, прасіла, маліла забраць мяне ў войска. Так мы выхоўваліся, што без нас нічога не павінна адбывацца ў нашай краіне. Нас навучылі яе любіць. Захапляцца. Паколькі здарылася вайна, мы абавязаныя дапамагаць. Патрэбныя медсёстры, трэба ісці ў медсёстры. Патрэбныя зенітчыцы, значыць, трэба ісці ў зенітчыцы.

Ці хацелі мы на фронце быць падобнымі да мужчынаў? Першы час вельмі хацелі: рабілі кароткія стрыжкі, нават хаду іначылі. А потым не, фіг вам! Так захацелася прыхарошвацца, што цукар не ясі, а беражэш, каб валасы начупырыць. Мы былі шчаслівыя, калі знаходзіўся кацялок вады памыць галаву. Як доўга ішлі, шукалі мяккую траву... Ірвалі яе і ногі... Ну, разумееце, травой змывалі... Мы ж свае адметнасці мелі, дзяўчаты... Армія пра гэта не падумала... Ногі ў нас зялёныя

былі… Добра, калі старшына быў сталы чалавек і ўсё разумеў, не адбіраў з рэчмяшка лішнюю бялізну, а калі малады, дык абавязкова выкіне. А якое яно лішняе дзяўчатам, для якіх часам бывае патрэба два разы на дзень пераапрануцца. Мы адрывалі рукавы ад ніжніх кашуль, а іх жа толькі дзве. Гэта ўсяго чатыры рукавы…»

*Клара Сямёнаўна Ціхановіч,*
*старшы сяржант, зенітчыца*

«Да вайны я любіла ўсё вайсковае… Мужчынскае… Звярталася ў авіяцыйную вучэльню, каб даслалі правілы прыёму. Мне пасавала вайсковая форма. Любіла шыхт, рэзкасць, абрывістыя словы каманды. З вучэльні адказалі: "Найперш скончыце школу".

Натуральна, з такімі настроямі я не магла сядзець дома, калі пачалася вайна. Але на фронт мяне не бралі, бо мне было ўсяго шаснаццаць гадоў. Ваенкам казаў: што падумае пра нас вораг, калі вайна толькі пачалася, а мы ўжо дзяцей бяром на фронт, дзяўчатак непаўнагадовых.

— Ворага біць трэба.

— Без вас паб'юць.

Пераконвала яго, што я высокая, што выглядаю на ўсе васямнаццаць. Стаю ў кабінеце, не сыходжу: "Напішыце васямнаццаць, а не шаснаццаць гадоў". — "Гэта цяпер ты так кажаш, а потым якімі словамі мяне згадаеш?"

Пасля вайны я не хацела, ды проста і не магла пайсці ні па адной вайсковай спецыяльнасці. Хутчэй бы скінуць з сябе ўсё вайсковае… А штаны мне да гэтай пары агідныя, я не апранаю іх нават калі еду ў лес. У грыбы, у ягады… Хочацца насіць толькі ўласцівае мне, жаночае…»

*Клара Васілеўна Ганчарова, радавая, зенітчыца*

«Вайна нас прыхапіла адразу... Скончылі вучэльню, і ў той жа дзень з'явіліся "пакупнікі", так называлі тых, хто прыязджаў з вайсковых частак, адпраўленых на перафармаванне, па новых салдатаў. Гэта былі заўсёды мужчыны, добра заўважалася, што яны нас шкадуюць. Мы на іх аднымі вачамі глядзелі, яны на нас — іншымі: мы імкнуліся з шарэнгаў наперад, хутчэй бы нас заўважылі, узялі, хутчэй бы нам сябе паказаць, а яны, стомленыя, глядзелі, ведаючы, што нас чакае. Усё разумелі.

...Полк наш быў мужчынскі, усяго дваццаць дзве жанчыны. Гэта восемсот сямідзясяты полк дальняга бамбавання. Узялі дома дзве-тры пары бялізны, шмат не набярэш. Неўзабаве разбамбілі нас ушчэнт, засталіся з тым, у чым збегчы паспелі. Мужчыны пайшлі на перасыльны пункт, іх там апранулі. А нам нічога няма. Далі толькі новыя анучы, мы з іх трусікі, станікі пашылі. Камандзір даведаўся, аблаяў.

Мінула недзе паўгода... І ад знямогі мы перасталі быць жанчынамі... У нас спыніліся... Збіўся біялагічны цыкл... Зразумела? Вельмі страшна! Страшна падумаць, што ты ўжо ніколі не будзеш жанчынай...»

*Марыя Несцераўна Кузьменка,*
*старшы сяржант, збройніца*

«Мы ўпарціліся... Мы не хацелі, каб пра нас казалі: "Ах, гэтыя жанчыны!". І намагаліся болей, чым мужчыны, мы яшчэ мусілі давесці, што не горшыя за мужчынаў. Але на нас яшчэ доўга глядзелі зверху, паблажліва: "Наваюць гэтыя бабы...".

А як быць мужчынам? Немагчыма быць мужчынам. Нашы думкі — гэта адно, а наша прырода — гэта іншае. Наша біялогія...

Ідзём… Чалавек дзвесце дзяўчат, а за намі чалавек дзвесце мужчынаў. Спякота. Марш-кідок — трыццаць кіламетраў. Трыццаць! Мы ідзём, а пасля нас чырвоныя плямы на пяску… Сляды чырвоныя… Ну, справы гэтыя… Нашыя… Як ты тут што схаваеш? Салдаты рушаць следам і робяць выгляд, што нічога не заўважаюць… Не глядзяць пад ногі… Штаны на нас пазасыхалі, як са шкла зрабіліся. Рэзалі. Там раны былі і ўвесь час чуваць было пах крыві. Нам жа нічога не выдавалі. Мы пільнавалі — калі салдаты павесяць на кусты свае кашулі. Некалькі штук скрадзем… Яны потым ужо здагадаліся, рагаталі: "Старшына, дай нам яшчэ бялізны. Дзяўчаты нашу забралі". Ваты і бінтоў параненым не хапала… А не тое што… Жаночая бялізна недзе толькі гады праз два з'явілася. У мужчынскіх трусах хадзілі і майках. Ну, ідзём… У ботах! Ногі таксама спякліся. Ідзём… Да пераправы, там чакаюць паромы. Дайшлі, і тут наляцелі самалёты і пачалі бомбы кідаць. Бамбавалі жудасна, мужчыны — хто куды пахаваліся. Нас клічуць… А мы нічога не чуем, нам не да бомбаў, мы хутчэй у рэчку. Да вады… Вада! Вада! І сядзелі там, пакуль не адмоклі… Пад аскепкамі… Вось яно як… Сорам быў страшнейшы за смерць. І некалькі дзяўчат у рэчцы загінулі.

Можа, першы раз тады я захацела быць мужчынам… Першы раз…

І вось — Перамога. Гуляю па вуліцы і не веру, што Перамога. Сяду за стол — і не веру, што Перамога. Перамога! Наша перамога…»

*Марыя Сямёнаўна Каліберда, сяржант, сувязістка*

«Вызвалялі ўжо Латвію… Мы стаялі пад Даўгаўпілсам. Ноч, я толькі сабралася спаць. Чую, вартавы некага спыняе: "Стой! Хто ідзе?". І літаральна праз дзесяць хві-

лін мяне выклікаюць да камандзіра. Спускаюся ў камандзірскую зямлянку, там сядзяць нашыя таварышы і нейкі мужчына ў цывільным. Я добра запомніла гэтага чалавека. Усе апошнія гады я бачыла мужчынаў толькі ў вайсковым, у шынялях, а ён быў у чорным палітоне з плюшавым каўняром.

— Патрэбная ваша дапамога, — кажа мне гэты мужчына. — За два кіламетры адсюль рыхтуецца нарадзіць мая жонка. Яна адна, болей у доме нікога няма.

Камандзір пытаецца:

— Гэта на нейтральнай паласе? Самі ведаеце — небяспечна.

— Нараджае жанчына. Я мушу ёй дапамагчы.

Далі мне пяць аўтаматчыкаў. Напакавала сумку перавязачным матэрыялам, нядаўна мне выдалі новыя фланелевыя анучы, таксама ўзяла з сабой. Пайшлі. Увесь час абстрэльваюць — то недалёт, то пералёт. І лес такі цёмны, што нават месяца не відаць. Нарэшце з'явіўся контур нейкай будыніны. Гэта ўжо быў хутар. Калі мы зайшлі ў хату, я адразу ўбачыла жанчыну. Яна ляжала на падлозе ў нейкім старым рыззі. Муж пачаў занавешваць вокны. Два аўтаматчыкі на двары, два — ля дзвярэй, адзін мне ліхтарыкам свеціць. Жанчына ледзьве стрымлівае стогны, ёй вельмі балюча.

Я ўвесь час прасіла яе:

— Патрывайце, родненькая. Нельга крычаць. Трывайце.

Гэта ж нейтральная паласа. Калі немцы ўчуюць штонебудзь, дык нас закідаюць снарадамі. Але калі салдаты пачулі, што дзіця нарадзілася… "Ура! Ура!" Ціха так, амаль шэптам. На перадавой нарадзілася дзіця!

Прынеслі вады. Гатаваць не было дзе, абцерла немаўлятка халоднай. Загарнула ў свае анучы. У хаце

нічога не знайсці, толькі старызна, на якой ляжала жанчына.

Потым я наведвала хутар яшчэ некалькі начэй. Апошні раз прыйшла перад наступленнем, развітацца.

— Болей я да вас не прыйду. Паеду.

Жанчына пра нешта запыталася мужа па-латышску. Ён пераклаў:

— Як вас завуць?

— Ганна.

Жанчына яшчэ нешта сказала. І муж зноў пераклаў.

— Яна кажа, што вельмі прыгожае імя. І ў ваш гонар мы назавём сваю дачку Ганнай.

Жанчына трохі прыўзнялася — падняцца яшчэ не магла — і працягнула мне прыгожую маціцовую пудраніцу. Гэта была, відаць, яе самая дарагая рэч. Я прыадкрыла пудраніцу, і гэты пах пудры ноччу, калі вакол страляюць, узрываюцца снарады… Гэта было нешта неверагоднае… Я і цяпер плакаць хачу… Пах пудры, гэтая маціцовая накрыўка… Маленькае дзіця… Дзяўчыначка… Усё нешта такое хатняе, нешта з сапраўднага жаночага жыцця…»

*Ганна Мікалаеўна Храловіч, гвардыі лейтэнант, фельчарка*

«Жанчына на флоце… Гэта было штосьці забароненае, нават ненатуральнае. Здавён лічылася, што жанчына прыносіць на карабель бяду. Сама я родам з-пад Фастава, у нашай вёсцы бабы да смерці дражнілі маму: каго ты нарадзіла — дзеўку ці хлопца? А я пісала самому Варашылаву, каб мяне прынялі ў Ленінградскую артылерыйска-тэхнічную вучэльню. І толькі паводле яго ўласнага загаду мяне туды залічылі. Адзіную дзяўчыну.

Скончыла вучэльню, усё роўна хацелі пакінуць на сушы. Тады я перастала казаць, што я жанчына. Рата-

вала ўкраінскае прозвішча "Рудэнка". Але адзін раз усё-такі выдала сябе. Драіла палубу, раптам чую нейкі шум, азірнулася: матрос гоніць котку, якая невядома як трапіла на карабель, дзе, пэўна, яшчэ ад першых мараплаваў трымаўся забабон, што коткі і жанчыны ў моры наклікаюць бяду. Котка не хацела пакідаць карабель і выробляла такія фінты, што ёй пазайздросціў бы і футбаліст сусветнага ўзроўню. На караблі — смех. Але ў той момант, калі котка ледзь не звалілася ў ваду, я спалохалася ды закрычала. І, відаць, гэта быў такі дзявочы дыскант, што мужчынскі смех умомант абарваўся.

Чую голас камандзіра:

—Вахтавы, на карабель праходзіла жанчына?

—Ніяк не, таварыш камандзір.

Тут зноў паніка — на караблі жанчына.

...Я была першая жанчына, кадравы афіцэр Ваенна-Марскога флоту. У вайну ўзбройвала караблі, марскую пяхоту. Тады англійская прэса пісала, што нейкае дзіўнае стварэнне — ці то жанчына, ці то мужчына — ваюе ў рускіх на флоце. І, маўляў, гэтую "лэдзі з корцікам" ніхто замуж не возьме. Мяне замуж не возьме?! Не, пане харошы, памыляешся, яшчэ як возьме, самы прыгожы афіцэр...

Я была шчаслівай жонкай і зрабілася шчаслівай маці і бабуляй. Не мая віна, што муж загінуў на вайне. А флот я любіла і люблю ўсё жыццё...»

*Таццяна Пятроўна Рудэнка-Шавялёва, капітан,*
*камандзір роты Маскоўскага флоцкага экіпажа,*
*цяпер падпалкоўнік у адстаўцы*

«Я працавала на заводзе... На ланцуговым заводзе ў нашай вёсцы Міхальчыкава Кстоўскага раёна Горкаўскай вобласці. Як толькі сталі забіраць мужчынаў

і адпраўляць на фронт, мяне паставілі на станок выконваць мужчынскую працу. Потым перавялі ў гарачы цэх малатабойцам, дзе кавалі карабельныя ланцугі.

Прасілася на фронт, але кіраўніцтва праз розныя хітрыкі затрымлівала мяне на заводзе. Тады я напісала ў райкам камсамола і ў сакавіку сорак другога года атрымала позву. Нас сабралася некалькі дзяўчат, праводзіла ўся вёска. Трыццаць кіламетраў да Горкага ішлі пешшу, а там нас раскідалі ў розныя месцы. Мяне накіравалі ў семсот восемдзесят чацвёрты зенітны, артылерыйскі полк сярэдняга калібру. Хутка прызначылі першым нумарам-наводчыкам. Але мне і гэтага было мала, я хацела ўласнаручна зараджаць гармату. Праўда, гэтая справа лічылася толькі мужчынскай: трэба было падымаць пудовыя снарады і весці інтэнсіўны агонь у тэмпе пяць секунд на залп. Толькі не дарэмна я працавала малатабойцам. Праз год мне далі званне малодшага сяржанта і прызначылі камандзірам другой гарматы, абслугу якой складалі дзве дзяўчыны і чацвёра мужчынаў. Ад няспынных стрэлаў ствалы хутка распальваліся да чырвані і ўжо было небяспечна, мусілі насуперак правілам студзіць змочанымі вадой коўдрамі. Зброя не вытрымлівала, а людзі трымаліся. Я — моцная, трывушчая дзяўчына, але тут зразумела, што на вайне здольная на большае, чым у мірным жыцці. Нават фізічна. Аднекуль з'яўляліся невядомыя мне сілы…

Пачуўшы па радыё пра Перамогу, я падняла падначаленых па трывозе і выгукнула сваю апошнюю каманду:

—Азімут — пятнаццаць нуль-нуль. Вугал узвышэння — дзесяць нуль. Выбухоўка сто дваццаць, тэмп дзесяць!

Сама падышла да замка і пачала салютаваць чатырма снарадамі ў гонар нашай Перамогі пасля чатырох гадоў вайны.

На стрэлы выбеглі ўсе, хто быў на пазіцыі батарэі, а таксама і камбат Слатвінскі. За самаўпраўства ён пры ўсіх загадаў арыштаваць мяне, але потым адклікаў свой загад. І мы ўсе разам салютавалі цяпер ужо з персанальнай зброі, абдымаліся і цалаваліся. Пілі гарэлку, спявалі песні. А потым плакалі ўсю ноч і ўвесь дзень...»

*Клаўдзія Васілеўна Канавалава,*
*малодшы сяржант, камандзір зенітнай гарматы*

«У мяне на плячах ручны кулямёт... Я ніколі не скажу, што ён цяжкі. Хто мяне тады другім нумарам тут пакіне. Няспраўны баец, трэба змяніць. Адправяць на кухню. А гэта сорамна. Не дай Божа ўсю вайну адваяваць на кухні. Я плакала б...

—Жанчын пасылалі на заданні нароўні з мужчынамі?

—Нас беraглі. Трэба было прасіцца на баявое заданне ці заслужыць. Праявіць сябе. Патрэбная была адвага, баявітасць у характары дзеля такой справы. А на гэта не кожная дзяўчына была здатная. Працавала ў нас на кухні Валя. Яна такая мяккая, сарамлівая, яе з вінтоўкай і не ўявіць. У скрайняй сітуацыі яна, напэўна б, страляла, але не з уласнай волі. А я? Я прагнула. Я марыла!

А ў школе была ціхай дзяўчынкай... Непрыкметнай...»

*Галіна Яраславаўна Дубовік, партызанка дванаццатай*
*кавалерыйскай партызанскай брыгады імя Сталіна*

«Загад: быць на месцы праз дваццаць чатыры гадзіны... Накіраванне — у палявы перасоўны шпіталь семсот трыццаць...

Памятаю, што з'явілася ў шпіталь у чорнай маркізетавай сукенцы і ў басаножках, а зверху на мне была

мужава плашч-накідка. Адразу выдалі вайсковае абмундзіраванне, але я адмовілася яго браць: усё было на тры-чатыры памеры большае за мой. Начальніку шпіталя даклалі, што я не падначальваюся вайсковай дысцыпліне. Ён ніякіх спагнанняў не стаў рабіць, маўляў, пачакаем, праз некалькі дзён пераапранецца сама.

Праз некалькі дзён мы выправіліся ў іншае месца, і нас моцна бамбілі. Хаваліся мы ў бульбяным полі, а перад гэтым быў дождж. Няцяжка ўявіць, у што ператварылася мая маркізетавая сукенка і якімі зрабіліся басаножкі. На наступны дзень я такі пераапранулася салдатам. З ног да галавы.

Так пачаўся мой вайсковы шлях... Да самай Германіі...

У сорак другім годзе на пачатку студзеня мы апынуліся ў вёсцы Афонеўка Курскай вобласці. Былі моцныя маразы. Два школьныя будынкі былі бітма набітыя параненымі: ляжалі на насілках, на падлозе, на саломе. Не хапала машынаў і паліва, каб вывезці ўсіх у тыл. Камандзір шпіталя арганізаваў конны абоз з Афонеўкі ў суседнюю вёску. Зранку абоз ужо быў у нас. Кіравалі коньмі выключна жанчыны. На санях ляжалі саматканыя коўдры, кажухі, падушкі, у некаторых — нават пярыны. Дагэтуль не магу згадаць без слёз, як яно было... Гэтыя сцэны... Кожная жанчына выбрала сабе свайго параненага, пачала рыхтаваць да дарогі і ціхенька супакойваць: “Сыночак родненькі!”, “Ну, мой міленькі!”, “Ну, мой харошанькі!”. Кожная ўзяла з сабой трохі хатніх харчоў, аж да цёплай бульбы. Яны ўхутвалі параненых у свае хатнія рэчы, асцярожна ўладкоўвалі ў сані. І сёння памятаецца тая малітва, тое ціхае жаночае гаварэнне: “Ну, мой міленькі!”, “Ну, мой харошанькі...”.

Шкада, нават сорамна, што тады мы не запыталіся прозвішчаў у тых жанчын.

Яшчэ я запомніла, як мы рухаліся па вызваленай Беларусі і ў вёсках нас сустракалі толькі жанчыны. Адны жанчыны засталіся…»

*Алена Іванаўна Варухіна, медсястра*

## Пра моўчу вусцішы і прыгажосць уяўлення

«Хіба я знайду такія словы? Пра тое, як страляла, я магу апавесці. А пра тое, як плакала, не. Гэта застанецца нявыказаным. Ведаю адно: на вайне чалавек робіцца страшным і чужым. Як яго зразумець?

Вы — пісьменніца. Прыдумайце што-кольвек самі. Што-небудзь прыгожае. Без вошай і бруду, без ванітаў… Без паху гарэлкі і крыві… Не такое страшнае, як напраўду…»

*Настасся Іванаўна Мядзведкіна, радавая, кулямётчыца*

«Не ведаю… Не, я разумею, пра што вы пытаеце, але мне не хапае маёй мовы… Маіх словаў… Як пераказаць? Трэба… Каб… Душыў спазм, як ён душыць мяне: ноччу ляжу і раптам згадаю. Задуха, усю ліхаманіць. Вось так…

Недзе ёсць гэтыя словы… Патрэбны паэт… Як Дантэ…»

*Ганна Пятроўна Калягіна, сяржант, санінструктарка*

«Бывае, пачую музыку… Ці песню… Жаночы голас… І там знайду тое, што я тады адчувала. Нешта падобнае…

А гляджу кіно пра вайну — няпраўда, кнігу чытаю — няпраўда. Ну, не тое… Не тое атрымліваецца. Сама

пачынаю казаць — таксама не тое. Не так страшна і не так прыгожа. Ведаеце, якім прыгожым бывае ранак на вайне? Перад боем... Ты глядзіш і ведаеш: ён можа быць у цябе апошні. Зямля такая прыгожая... І паветра... І сонейка...»

*Вольга Мікітаўна Забеліна, ваенны хірург*

«У гета мы жылі за калючым дротам... Я нават памятаю, што гэта здарылася ў аўторак, чамусьці потым звярнула ўвагу, што гэта быў аўторак. Аўторак... Дзень і месяц не памятаю. Але гэта быў аўторак. Выпадкова падышла да акна. На лаўцы насупраць нашага дома сядзелі хлопчык з дзяўчынкай і цалаваліся. Вакол пагромы, расстрэлы. А яны цалуюцца! Я была ўзрушаная гэтай мірнай карцінай...

З іншага канца вуліцы, наша вуліца была кароткая, з'явіўся нямецкі патруль. Немцы таксама гэта ўбачылі, усё добра праглядалася. Я нічога не паспела ўсвядоміць. Ну так, не паспела... Крык. Грукат. Стрэлы... Я... Ніякіх думак... Першае пачуццё — страх. Я толькі ўбачыла, што хлопчык і дзяўчынка — р-раз! Падняліся — і вось ужо падаюць. Яны ўпалі разам.

А потым... Дзень мінуў, другі... Трэці... А я ўсё пра гэта думаю. Усё спрабую зразумець: яны ж цалаваліся не дома, а на вуліцы. Чаму? Яны хацелі так памерці... Ведалі, што ўсё роўна загінуць у гета, і вырашылі зрабіць гэта па-свойму. Зразумела, гэта каханне. А што яшчэ? Што можа быць іншае... Толькі каханне.

Распавяла вам... Ну гэта ж праўда, атрымалася — прыгожа. А ў жыцці? У жыцці я адчула жах... Так... Што яшчэ? Зараз падумаю... Яны змагаліся... Яны хацелі прыгожа памерці. Гэта, я ўпэўненая, быў іх выбар...»

*Любоў Эдуардаўна Крэсава, падпольшчыца*

«Я? Я не хачу казаць... Хаця не... Карацей... Пра гэта нельга казаць...»

*Ірына Майсееўна Ляпіцкая, радавая, стралок*

«Па горадзе блукала звар'яцелая жанчына... Ніколі яна ўжо не ўмывалася, не расчэсвала валасы. У яе забілі пяць дзетак. Усіх. І забівалі па-рознаму. Аднаму ў галаву стралялі, другому ў вушка...

Яна падыходзіла да чалавека на вуліцы... Да любога... І казала: "Я раскажу табе, як забілі маіх дзетак. З якога пачаць? З Васілька? Яму ў вушка стрэлілі! А Толіку ў галоўку... Ну, з якога?".

Ад яе ўсе ўцякалі. Яна была звар'яцелая, таму магла расказваць...»

*Антаніна Альбертаўна Выжутовіч,*
*партызанская медсястра*

«Адно толькі памятаю: крыкнулі — перамога! Увесь дзень стаяў крык... Перамога, браткі! Перамога! Я спачатку не дала веры, бо ўжо прызвычаілася да вайны — быццам гэта і ёсць жыццё. Перамога! Мы перамаглі... Мы былі шчаслівыя! Шчаслівыя!»

*Ганна Міхайлаўна Перапёлка, сяржант, медсястра*

# «ПАНЕНКІ! А ВАМ ВЯДОМА: КАМАНДЗІР САПЁРНАГА ЎЗВОДА ЖЫВЕ ТОЛЬКІ ДВА МЕСЯЦЫ»

Я ўвесь час кажу пра адно… Так ці інакш да яго вяртаюся…

Перадусім я згадваю смерць. Пра іх стасункі са смерцю — яна ж неадступна была побач. Так блізка і ўжо звыкла, як і жыццё. Я спрабую зразумець, як можна было вытрываць сярод гэтага бясконцага досведу памірання. Бачыць з дня ў дзень. Думаць. Міжволі прымервацца.

Ці можна пра гэта распавесці? Што паддаецца словам і нашым пачуццям? А што — невымоўнае? Пытанняў у мяне збіраецца ўсё болей, а адказаў усё меней.

Бывае, вяртаюся дамоў пасля сустрэч — з думкай, што пакута — гэта адзінота. Глухая ізаляцыя. Іншым разам мне здаецца, што пакута — адмысловы спосаб ведаў. Ёсць нешта ў чалавечым жыцці, што іначай нельга спазнаць і перадаць, асабліва ў нас. Так уладкаваны наш свет, так упарадкаваныя мы.

З адной гераіняй гэтай часткі кнігі мы сустрэліся ў аўдыторыі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Студэнты вясёлай гурмой збіраліся дамоў. «Якія мы былі тады? — адказала яна пытаннем на маё запытанне. — Вось такія, як яны, мае студэнты. Толькі апратка была іншая і ўпрыгожанні больш сціплыя. Металёвыя пярсцёнкі, шкляныя пацеркі. Гумовыя тэпці. Не было яшчэ гэтых джынсаў, магнітафонаў».

Я глядзела ў спіны гаманкім студэнтам, а расповед ужо пачынаўся…

«Да вайны мы з сяброўкай скончылі ўніверсітэт, падчас вайны — сапёрную школу. Ехалі на фронт ужо афіцэрамі… Малодшымі лейтэнантамі… Сустрэлі нас: “Малайцы, дзяўчаты. Добра, што прыехалі, дзяўчаты. Але нікуды мы вас не адправім. Застаняцеся ў нас у штабе”. Гэта нас так сустрэлі ў штабе інжынерных войскаў. Тады мы разварочваемся і выходзім шукаць камандуючага фронтам Маліноўскага. Пакуль мы шукалі, разнеслася чутка, што нейкія дзве дзяўчыны шукаюць камандуючага. Спыняе нас афіцэр і кажа:

—Вашы дакументы.

Паглядзеў.

—Чаму вы шукаеце камандуючага, калі вам патрэбна ў штаб інжынерных войскаў?

Мы яму адказваем:

—Нас прыслалі камандзірамі сапёрных узводаў, а хочуць пакінуць пры штабе. Мы будзем патрабаваць, каб толькі — камандзірамі сапёрных узводаў і толькі — на перадавую.

Тады гэты афіцэр зноў адводзіць нас у штаб інжынерных войскаў. І доўга яны там усе абмяркоўвалі і абмяркоўвалі, назбіралася поўная хата афіцэраў, і кожны сваё раіць, а нехта смяецца. Але мы зацяліся на сваім, маўляў, у нас ёсць накіраванне, мы мусім быць толькі камандзірамі сапёрных узводаў. Тады гэты афіцэр, які нас прывёў, раззлаваўся:

—Паненкі! А вы ведаеце, колькі жыве камандзір сапёрнага ўзвода? Камандзір сапёрнага ўзвода жыве толькі два месяцы…

—Ведаем, таму нам і трэба на перадавую…

Рабіць няма чаго, выпісваюць нам накіраванне:

—Ну добра, мы вас адправім у пятую ўдарную армію. Што такое ўдарная армія, вы, пэўна, ведаеце, сама назва кажа. Гэта — увесь час перадавая.

Якімі толькі жахамі яны нас не палохалі. А мы ўсцешаныя.

—Згодныя!

Прыехалі ў штаб пятай ударнай, там сядзіць інтэлігентны капітан, ён нас вельмі прыязна сустрэў, але калі пачуў, што мы згодныя быць толькі камандзірамі сапёрных узводаў, схапіўся за галаву:

—Не, не! Што вы? Знойдзем вам работу тут, у штабе. Вы што, жартуеце, там жа адны мужчыны, і раптам камандзірам будзе жанчына — гэта вар'яцтва. Што вы, што вы!

Два дні яны нас там апрацоўвалі. Па-простаму кажучы… Упрошвалі. Мы не адступалі: толькі камандзірамі сапёрных узводаў. Ад свайго — ні на крок. Але і гэта яшчэ не ўсё. Нарэшце… Нарэшце атрымалі прызначэнне. Прывялі мяне да майго ўзвода… Салдаты глядзяць: хто са смехам, хто злосна нават, а іншы так сцепане плячыма — адразу ўсё зразумела. Калі камандзір батальёна сказаў, што вось вам новы камандзір узвода, усе адразу ўзвылі: "У-у-у…". Адзін нават сплюнуў: "Цьху!".

А праз год, калі мяне ўзнагародзілі ордэнам Чырвонай Зоркі, гэтыя ж хлопцы, хто застаўся жывым, мяне на руках у маю зямлянку неслі. Яны мною ганарыліся.

Калі б вы спыталіся, якога колеру вайна, я б вам сказала — колеру зямлі. Для сапёра… Чорнага, жоўтага, глінянага колеру зямлі…

Кудысьці ідзём… Начуем у лесе. Расклалі вогнішча, і гарыць яно, і ўсе сядзяць ціха-ціха, а нехта ўжо заснуў. Я засынаю, гледзячы на агонь, я сплю з адплюшчанымі вачыма: нейкія матылі, нейкая жамяра ляціць на агонь, ляціць усю ноч, ні гуку, ні шолаху, яны моўчкі знікаюць у гэтым вялікім агні. Іншыя следам лятуць… Вось так і мы. Ішлі ды ішлі. Кацілі валам.

Праз два месяцы мяне не забіла, праз два месяцы мяне параніла. Першы раз лёгка. І я перастала думаць пра смерць…»

*Станіслава Пятроўна Волкава,*
*малодшы лейтэнант, камандзір сапёрнага ўзвода*

«У дзяцінстве… Я пачну з дзяцінства. Хаця на вайне найбольш баялася згадваць дзяцінства. Менавіта дзяцінства. Самае пяшчотнае на вайне нельга згадваць… Пяшчотнае нельга… Табу.

Дык вось… У дзяцінстве бацька стрыг мяне нагала машынкай-нулёўкай. Гэта мне ўспомнілася, калі нас пастрыглі і з дзяўчат мы ператварыліся ў маладзенькіх салдацікаў. Некаторыя дзяўчаты спужаліся… А мне было лёгка звыкнуцца. Мая стыхія. Недарма бацька ўздыхаў: “Не дзеўка, а хлопец расце”. А ва ўсім было вінаватае адно маё захапленне, за якое мяне не аднойчы каралі бацькі. Узімку я скакала з крутога берага ў засыпаную снегам Об. Пасля ўрокаў я брала старыя ватныя бацькавы штаны, адзявала іх і завязвала на валёнках. Ватную фуфайку запраўляла ў штаны і моцна зацягвала папругай. На галаве шапка-вушанка, завязаная пад падбароддзем. У такой апранасе, перавальваючыся, як мядзведзь, з нагі на нагу, іду да рэчкі. Разганяюся з усёй моцы і скачу з абрыву ўніз…

Ах! Якое ўзрушэнне адчуваеш, пакуль ляціш у прорву і з галавой знікаеш пад снегам. Дух захоплівае! Спрабавалі са мной разам іншыя дзяўчаты, але ў іх не ўсё атрымлівалася добра: то нагу падверне, то нос падзярэ аб жорсткі снег, ці яшчэ нешта здарыцца. Я ж была спрытнейшая за хлопцаў…

Пра дзяцінства згадала… Бо не хочацца адразу пра кроў… Але я разумею — гэта важна, гэта, канешне, важна. Я люблю кніжкі чытаць. Я разумею…

Прыехалі мы ў Маскву ў верасні сорак другога... Цэлы тыдзень нас цягалі колам па чыгунцы. Спыняліся на станцыях: Кунцава, Пярова, Ачакава, і ўсюды з эшалона выгружаліся дзяўчаты. Прыходзілі, як кажуць, "пакупнікі", камандзіры з розных відаў войска, агітавалі нас у снайперкі, санінструктаркі, радысткі... Мяне ўсё гэта не вабіла. Нарэшце з усяго эшалона нас засталося трынаццаць чалавек. Усіх змясцілі ў адну цяплушку. У тупіку было ўсяго два вагоны: наш і штабны. Двое сутак да нас ніхто не падыходзіў. Мы смяяліся і спявалі песню: "*Я забыты, закінуты*". Нарэшце пад вечар мы ўбачылі, што да нашых вагонаў разам з начальнікам эшалона кіруюць тры афіцэры.

"Пакупнікі"! Яны былі высокія, хударлявыя, зацягнутыя ў партупеі. Шынялі падагнаныя, боты наваксаваныя да бляску, са шпорамі. Вось гэта шык! Такіх мы яшчэ не бачылі. Яны падняліся ў штабны вагон, а мы прытуліліся да сценкі падслухаць, што там будуць казаць. Начальнік зачытаў уголас увесь спіс і пачаў даваць кароткую характарыстыку кожнай: хто такая, дзе нарадзілася, адукацыя. Напрыканцы мы пачулі: "Усе пасуюць".

Тады яны спусціліся з вагона і начальнік загадаў нам пашыхтавацца. Запыталі: "Жадаеце вучыцца мастацтву ваяваць?". Ну як мы можам не жадаць, зразумела, жадаем. Вельмі. Марым. Нават ніхто з нас не запытаўся: дзе вучыцца і на каго? Загад: "Старшы лейтэнант Мітрапольскі, даставіць дзяўчат у вучэльню". Кожная закінула за спіну свой рэчмяшок, сталі па дзве, і павёў нас афіцэр па вуліцах Масквы. Любая Масква... Сталіца... Нават у гэтую цяжкую пару прыгожая... Родная... Афіцэр рухаўся хутка, шырокім крокам, мы ледзьве паспявалі за ім. Толькі на сустрэчы ў Маскве ў дзень трыццацігоддзя

Перамогі Сяргей Фёдаравіч Мітрапольскі прызнаўся нам, былым курсанткам Маскоўскай Вайскова-інжынернай вучэльні, як яму было сорамна весці нас па Маскве. Ён імкнуўся падалей адысці ад нас, каб на яго не звярталі ўвагі. На гэты дзявочы табун... Але мы таго не ведалі і амаль бегма даганялі яго. Пэўна, смешна ўсё гэта выглядала!

Дык вось... З першых дзён заняткаў я схапіла два нарады па-за чаргой: то халодная аўдыторыя мяне не задавальняла, то яшчэ нешта. Ведаеце, школьныя звычкі. Ну, і атрымала па заслугах — адзін нарад па-за чаргой, другі... Потым яшчэ і яшчэ. Пры разводзе на вуліцы курсанты запрымецілі мяне і пачалі смяяцца: штатны днявальны. Ім, канешне, смешна, а я на заняткі не хаджу, ноччу не сплю. Днём стаю побач з дзвярыма каля тумбачкі, а ноччу націраю ў казарме падлогу масцікай. Як гэта тады рабілася? Зараз патлумачу... У дэталях... Гэта не тое, што цяпер, калі ёсць розныя шчоткі і ўсялякае іншае. А тады... Пасля адбою здымаеш боты, каб не запэцкаць масцікай, абматаеш ногі кавалкамі старога шыняля, робіш як бы лапці, абкручаныя шпагатам. Раскідваеш масціку па падлозе, расціраеш шчоткай, ды не капронавай, а валасяной, да якой прыліпаюць кавалкі масцікі, і тады ўжо пачынаеш шураваць нагамі. Церці трэба да люстранога бляску. Вось тут за ноч нагуляешся. Ногі гудуць і дранцвеюць, спіна колам, пот залівае вочы. Зранку нават не хапае моцы крыкнуць роце: "Пад'ё-о-ом!". А днём хоць трохі адпачыць таксама не выпадае, бо днявальны ўвесь час мусіць стаяць ля тумбачкі. Аднойчы са мной здарыўся смешны выпадак... Стаю ля тумбачкі, толькі ўправілася з прыборкай казармы. Да таго захацелася спаць, што адчуваю — зараз звалюся. Абаперлася на тумбачку ды прыснула.

І раптам чую, як нехта адчыняе дзверы, усхапілася — перада мной стаіць дзяжурны па батальёне. Я ўскінула руку і дакладваю: "Таварыш старшы лейтэнант, рота на адпачынку". А ён глядзіць на мяне ва ўсе вочы і не можа схаваць смеху. Тады здагадалася, што я ж ляўша, дык спрасонку прыклала да шапкі левую руку. Паспрабавала хутка змяніць яе на правую, толькі было ўжо позна. Зноў праштрафілася.

Я доўга не магла прызвычаіцца, што гэта не забава нейкая і не школа, а вайсковая вучэльня. Падрыхтоўка да вайны. Загад камандзіра — закон для падначаленага.

На апошнім экзамене запомнілася апошняе пытанне:

—Колькі разоў у жыцці памыляецца сапёр?

—Сапёр памыляецца адзін раз у жыцці.

—Добра гэта запомні, дзяўчынка...

А следам:

—Вы свабодныя, курсант Байрак.

І вось — вайна. Сапраўдная вайна...

І мой узвод. Каманда: "Узвод, смірна". А ўзвод і не збіраецца падымацца. Хто ляжыць, хто сядзіць, а хто пацягваецца з хрумстам у костках: "Э-эх!". Карацей, робіць выгляд, што мяне не заўважае. Ім было крыўдна, што яны, бывалыя мужчыны-разведчыкі, мусяць падначаліцца нейкай дваццацігадовай дзяўчынцы. Я гэта адразу зразумела і тут жа падала каманду: "Адставіць!".

Тут пачаўся абстрэл... Скочыла ў траншэю, а шынель новенькі, дык я легла не на дно ў гразюку, а збоку на нерасталы снег. У маладосці яно так бывае — шынель даражэйшы за жыццё. Дзяўчо — дурніца! Ну, і мае салдаты рагочуць.

Дык вось... Што такое інжынерная разведка? Ноччу байцы капалі акопчык для дваіх на нейтральнай паласе.

Перад світанкам мы з адным з камандзіраў аддзялення паўзлі да гэтага акопчыка, а байцы нас маскавалі. І мы там таіліся цэлы дзень, баючыся лішні раз варухнуцца. Праз гадзіну-дзве ўжо мерзнуць рукі, хоць на табе валёнкі і кажух. Праз чатыры гадзіны — ты суцэльны лядзяш. Падае снег... Пакрысе ператвараешся ў снежную бабу... Гэта ўзімку... А ўлетку даводзілася трываць на спякоце ці пад дажджом. Цэлы дзень уважліва сочым за наваколлем і складаем карту перадавой: у якіх месцах адбыліся змены. Калі заўважым купінку і свежыя камякі зямлі, брудны снег, прымятую траву ці абсыпаную расу на траве, дык гэта тое, што трэба... Нашая справа... Ясна: там нямецкія сапёры рыхтавалі мінныя палі. Калі ж яны паставілі агароджу з калючага дроту, дык неабходна вылічыць яго даўжыню і шырыню. Якія скарыстаныя міны — супрацьпяхотныя, супрацьтанкавыя ці міны-нечаканкі? Высочвалі агнявыя кропкі ворага...

Перад наступам нашых войскаў працавалі ноччу. Сантыметр за сантыметрам прамацвалі мясцовасць. Ладзілі калідоры на мінных палях... Увесь час па зямлі поўзалі... На пузе... Я ж, як чаўнок, сноўдала ад аднаго аддзялення да другога. "Маіх" мінаў заўсёды было болей.

У мяне шмат розных выпадкаў... Ды іх на кіно хопіць... Нават на цэлы серыял.

Запрасілі афіцэры на сняданак. Я пагадзілася, сапёрам не заўсёды шчасціла на гарачую страву, пераважна жылі на сухіх пайках. Калі ўсе паселі за кухонны стол, звярнула ўвагу на рускую печку, закрытую заслонкай. Падышла і стала разглядаць. Афіцэры кпілі: маўляў, жанчыне міны нават у чыгунках трызняцца. Я адказваю на жарцікі і тут заўважаю, што ў самым нізе заслонкі, з левага боку, маленькая дзірачка. Углядаюся больш уважліва і бачу танюткі дроцік, які сыходзіць у печку.

Хутка азіраюся і кажу: “Хата замініраваная, прашу пакінуць памяшканне”. Афіцэры сцішыліся і з недаверам пазіраюць на мяне, ніхто не мае жадання ўставаць ад стала. Пахкае мяса, смажаная бульба... Я яшчэ раз кажу: “Неадкладна пакінуць памяшканне”. З сапёрамі тут жа падступіліся да працы. “Перакусілі” нажніцамі дрот... Ну а там... Там... У печцы ляжала некалькі звязаных шпагатам эмаліраваных літровых кубкаў. Мара салдата! Лепей, чым кацялок. А ў глыбі печкі, загорнутыя ў чорную паперу, два вялікія скруткі. Кілаграмаў дваццаць выбухоўкі. Вось вам — і чыгункі.

Рухаліся мы па Украіне, гэта была ўжо Станіслаўская, цяпер Івана-Франкоўская вобласць. Узводу было даручана тэрмінова размініраваць цукровы завод. Дарагая кожная хвіліна, невядома якім чынам замініраваны завод, калі падключаны гадзіннікавы механізм, дык выбухаў можна чакаць кожны момант. Рушылі паскораным маршам. Надвор’е было цёплым, я зняла пілотку. Калі праміналі пазіцыі артылерыстаў-дальнабойшчыкаў, раптам адзін выскачыў з траншэі і закрычаў: “Увага! Рама!”. Я ўскінула галаву і шукаю ў небе “раму”. Ніякага самалёта не бачу. Цішыня, ні скуль ні гуку. Дзе ж тая “рама”? Тут адзін з маіх сапёраў папрасіў дазволу выйсці з шыхту. Гляджу, ён кіруе да таго артылерыста і дае яму кухталя. Не паспела я што-небудзь зразумець, як артылерыст заенчыў: “Хлопцы, нашых б’юць!”. З траншэі павыскоквалі яшчэ артылерысты і абклалі нашага сапёра. Мой узвод, не доўга думаючы, пакідаў шчупы, мінашукальнікі, рэчмяшкі і кінуўся яго ратаваць. Пачалася бойка. Я не магла зразумець: што здарылася? Кожная хвіліна на рахунку, а тут невядома што робіцца. Камандую: “Узвод, пашыхтавацца!”. Ніхто не звяртае на мяне ўвагі. Тады я выхапіла пісталет і стрэліла

ў паветра. З бліндажа павыскоквалі афіцэры. Пакуль усе сцішыліся, мінула даволі часу. Наблізіўся да майго ўзвода капітан і пытае: "Хто тут найстарэйшы?". Я дакладаю. У яго акругліліся вочы, ён нават разгубіўся. Затым пытае: "Што тут адбылося?". Я нічога не магла сказаць, бо насамрэч не ведала. Тады выступіў мой памочнік і распавёў, як усё было. Тут я і даведалася, што такое "рама", якое гэта крыўднае для жанчыны слова. Нешта накшталт лярвы. Франтавая лаянка…

А ведаеце… У нас жа шчырая размова… Я ні пра каханне, ні пра дзяцінства не дазваляла сабе на вайне думаць. Ні пра смерць таксама. Але… у нас шчырая размова… Дык вось… Я ўжо казала, у мяне было шмат забаронаў, дзеля таго, каб застацца жывой. Найперш усё ласкавае і пяшчотнае сабе забараніла. Нават думаць пра гэта. Згадваць. Памятаю, што ўпершыню ў вызваленым Львове далі нам некалькі вольных вечароў. Упершыню за ўсю вайну. У гарадскім кінатэатры батальён глядзеў кіно. Спачатку неяк нават дзіўна было сядзець у мяккіх крэслах, бачыць прыгожы інтэр'ер, слухаць утульную цішыню. Перад пачаткам сеансу граў аркестр, выступалі акторы. У фае зладзілі танцы. Танчылі польку, кракавяк, падэспань і заканчвалі нязменнай "Рускай". На мяне вельмі моцна ўздзейнічала музыка… Нават цяжка было паверыць, што недзе страляюць і неўзабаве нам зноў на перадавую. А там побач смерць.

Насамрэч, ужо праз дзень майму ўзводу было загадана праверыць дарогу ад аднаго мястэчка да чыгункі. Там падарваліся некалькі машынаў. Міны… Уздоўж дарогі пайшлі разведчыкі з мінашукальнікамі. Церусіў халодны дожджык. Усе прамоклі наскрозь. Боты мае набрынялі вадой, зрабіліся цяжкімі, як бы з жалеза. Я ўваткнула полы шыняля за рэмень, каб не блыталіся пад

нагамі. Паперадзе мяне на шворцы ішла Нэлька — мой сабачка. Знойдзе снарад ці міну, сядзе каля яе і чакае, пакуль не размініруюць. Мой надзейны сябрук... І вось Нэлька села. Чакае і павісквае... А тут перадаюць па ланцужку: "Лейтэнант, да генерала". Азірнулася: у баку на гравійцы стаяў "віліс". Я пераскочыла праз кювет, на хаду выпрастала полы шыняля, паправіла рэмень і пілотку. Усё роўна выгляд у мяне быў не парадны.

Падбегла да легкавіка, адкрыла дзверцы і стала дакладваць:

—Таварыш генерал, паводле вашага загаду...

Пачула:

—Адставіць...

Выцягнулася па стойцы "Смірна!". Генерал нават не азірнуўся на мяне, а праз шкло машыны глядзіць на дарогу. Нервуецца і раз-пораз глядзіць на гадзіннік. Я не рухаюся. Ён звяртаецца да свайго ардынарца:

—Ну, дзе той камандзір сапёраў?

Я зноў паспрабавала дакласці:

—Таварыш генерал...

Ён нарэшце павярнуўся да мяне незадаволена:

—На халеру ты мне патрэбная!

Я ўсё зразумела і ледзь не разрагаталася. Тады ягоны ардынарац першым здагадаўся:

—Таварыш генерал, можа, яна і ёсць камандзір сапёраў?

Генерал вылупіўся на мяне:

—Ты хто?

—Камандзір сапёрнага ўзвода, таварыш генерал.

—Ты — камандзір узвода? — абурыўся ён.

—Так, таварыш генерал!

—Гэта твае сапёры працуюць?

—Так, таварыш генерал!

—Заладзіла: генерал, генерал…

Вылез з легкавіка, зрабіў некалькі крокаў наперад, потым вярнуўся да мяне. Пастаяў, змерыў вачыма. І да свайго ардынарца:

—Бачыш?

А ў мяне запытаўся:

—Колькі ж табе гадоў, лейтэнант?

—Дваццаць, таварыш генерал.

—Адкуль родам?

—Сібірачка.

Ён яшчэ доўга распытваў, прапанаваў перайсці ў іх танкавую частку. Абураўся, што я была ў такім заношаным адзенні: ён бы такога не дазволіў. Ім добрыя сапёры моцна патрэбныя. Потым адвёў мяне далей і непрыкметна паказаў на лясок:

—Вунь там стаяць мае каробачкі. Я хачу прапусціць іх па гэтай чыгунцы. Рэйкі і шпалы знятыя, але насып можа быць замініраваны. Дапамажы танкістам, правер насып. Тут больш зручна і бліжэй рушыць да перадавой. Ведаеш, што такое раптоўны ўдар?

—Ведаю, таварыш генерал.

—Ну, будзь здаровая, лейтэнант. Абавязкова дажыві да перамогі, яна цяпер не за гарамі. Разумееш!

Насып сапраўды быў замініраваны. Мы праверылі.

Усім хацелася дажыць да перамогі.

У кастрычніку сорак чацвёртага наш батальён у складзе дзвесце дзясятага асобнага атрада размініравання разам з войскамі Чацвёртага Украінскага фронту ўвайшоў на тэрыторыю Чэхаславакіі. Усюды нас сустракалі з удзячнасцю. Кідалі кветкі, садавіну, пачкі цыгарэт… Засцілалі на бруку дываны… Тое, што дзяўчына камандуе ўзводам мужчынаў ды яшчэ сама сапёр-мінёр, сталася сенсацыяй. Я была пастрыжаная пад хлопца,

хадзіла ў штанах і кіцелі, паводзіны зрабіліся мужчынскімі, карацей, была падобная да падлетка. Бывала, што заязджала ў вёску на кані вярхом, тут ужо зусім цяжка было вызначыць, хто вершнік; што праўда, жанчыны сваёй чуйнасцю здагадваліся і больш пільна прыглядаліся да мяне. Жаночая інтуіцыя… Было смешна… Цудоўна! Я прыходзіла на кватэру, дзе мусіла спыніцца, і тут гаспадары даведваліся, што іхні кватарант афіцэр, але не мужчына. Ад здзіўлення многія лупілі вочы… Нямое кіно. Але мне гэта… М-м-м… Мне гэта нават падабалася. Падабалася здзіўляць такім чынам. Тое самае было ў Польшчы. Згадваю, у адной вёсачцы бабулька пагладзіла мяне па галаве. Я здагадалася: "Цо пані, рогі на мне шука?". Яна засаромелася і сказала, маўляў, не, проста хацела пашкадаваць "таку млоду паненку".

А міны — яны на кожным кроку. Мінаў было шмат. Аднойчы зайшлі ў дом, нехта першы ўбачыў хромавыя боты каля шафы. Ужо працягнуў руку, каб узяць… Я крыкнула: "Не чапай!". Калі агледзелася, дык убачыла, што яны замініраваныя. Сустракаліся замініраваныя крэслы, камоды, серванты, лялькі, жырандолі… Вяскоўцы прасілі размініраваць грады з памідорамі, бульбай, капустай. Каб пакаштаваць варэнікаў, узводу спатрэбілася размініраваць поле з пшаніцай і нават цэп, каб абмалаціць снапы…

Дык вось… Прайшла Чэхаславакію, Польшчу, Румынію, Германію… А ўражанняў у памяці засталося вобмаль, пераважна згадваюцца толькі зрокавыя выцінанкі рэльефу мясцовасці. Камяні… Высокая трава… Ці то насамрэч яна была высокай, ці нам так здавалася, бо праз яе было вельмі цяжка прабівацца і працаваць шчупамі ды мінашукальнікамі. Трава старая… Дзядоўнік вышэйшы за кусты… Згадваецца яшчэ мноства ручаін

і яроў. Лясныя нетры, бясконцыя калючыя загароды з падгнілымі слупамі, зарослыя мінныя палі. Утравелыя клумбы. Там часта таіліся міны, немцы любілі клумбы. Аднойчы на суседнім полі капалі рыдлёўкамі бульбу, а мы побач выкопвалі міны…

У Румыніі ў горадзе Дзеж я спынілася ў доме маладой румынкі, якая добра размаўляла па-руску. Выявілася, што яе бабуля руская. У жанчыны было трое дзяцей. Муж загінуў на фронце, між іншым, у румынскай добраахвотнай дывізіі. Але яна любіла пасмяяцца, павесяліцца. Аднойчы і мяне запрасіла пайсці з ёй на танцы. Прапанавала свой гардэроб. Спакуса была вялікая. Я надзела штаны, гімнасцёрку, хромавыя боты, а паўзверх усяго — румынскі нацыянальны строй: доўгую, вышытую па тканіне кашулю і вузкую ў клетку спадніцу з воўны, а ў таліі перахапіла яе чорным пасам. На галаву накінула каляровую хустку з вялікімі кутасамі. Калі яшчэ дадаць, што, караскаючыся па гарах, за лета я загарэла да чарнаты, толькі на скронях праглядалі белыя кудзеры, ды нос аблупіўся, дык мяне ўжо было не адрозніць ад сапраўднай румынкі. Румынскай дзяўчыны.

Клуба ў іх не было, збіралася моладзь у прыватным доме. Калі мы прыйшлі, ужо грала музыка, танчылі. Я ўбачыла амаль усіх афіцэраў свайго батальёна. Спачатку баялася, што мяне пазнаюць і выкрыюць, таму адседжвалася далёка збоку, каб не прыцягваць да сябе ўвагі, нават трохі прыкрывалася хусткай. Хаця б паглядзець на ўсё… Ну, паназіраю здалёк… Але пасля таго, як мяне запрасіў некалькі разоў на танец адзін з нашых афіцэраў і не пазнаў з нафарбаванымі вуснамі і падведзенымі бровамі, мне зрабілася смешна і радасна. Я весялілася ад душы… Мне падабалася, калі казалі, што я прыгожая. Чула кампліменты… Танчыла і танчыла…

Скончылася вайна, а мы яшчэ цэлы год размініравалі палі, азёры, рэчкі. У вайну ўсё скідалі ў ваду, галоўнае было адолець, прамінуць, паспець. А цяпер трэба было думаць пра іншае… Пра жыццё… Для сапёраў вайна скончылася адно праз некалькі гадоў пасля вайны, яны ваявалі даўжэй за ўсіх. А што такое чакаць выбуху пасля Перамогі? Чакаць гэтага імгнення… Не-не! Смерць пасля Перамогі — самая страшная смерць. Двойчы смерць.

Дык вось… У падарунак да Новага, сорак шостага года мне выдалі дзесяць метраў чырвонага саціну. Я пасмяялася: “Ну навошта ён мне? Хіба пасля дэмабілізацыі пашыю сабе чырвоную сукенку. Сукенку Перамогі”. Як у ваду глядзела… Хутка з’явіўся загад пра маю дэмабілізацыю… Паводле завядзёнкі, мне зладзілі ў батальёне ўрачыстыя праводзіны. На вечарыне афіцэры падарылі вялікую, тонкай вязкі сінюю хустку. Гэтую хустку я мусіла выкупіць песняй пра “синий платочек”. І я ім увесь вечар спявала.

А ў цягніку ў мяне падскочыла тэмпература. Апух твар, рот не раскрыць. Раслі зубы мудрасці… Я вярталася з вайны…»

*Апаліна Ніканаўна Ліцкевіч-Байрак, малодшы лейтэнант, камандзір сапёрна-мінёрнага ўзвода*

## «ТОЛЬКІ ПАГЛЯДЗЕЦЬ АДЗІН РАЗ...»

А цяпер будзе пра каханне...

Каханне — адзіная ўласна твая падзея на вайне. Усё астатняе агульнае — нават смерць.

Што было для мяне нечаканасцю? Тое, што пра каханне яны казалі менш адкрыта, чым пра смерць. Увесь час нешта не дагаворвалі, як быццам абараняліся, заўсёды спыняліся каля нейкай мяжы. Пільна яе трымаліся. Паміж усімі імі быццам існавала негалосная дамова — далей нельга. Заслона апускалася. Ад чаго бараніліся — зразумела, ад крыўдаў і нагавораў ужо мірнага часу. Тады зноў хапіла ліха! Пасля вайны ў іх была яшчэ адна вайна, не менш страшная за тую, з якой яны вярнуліся. Калі нехта адважваўся быць шчырым дарэшты і тады з адчаем вырывалася прыхаванае, дык напрыканцы абавязкова гучала просьба: «прозвішча маё змяніце», ці «ў наш час пра такое не казалі на людзях... сорамна...». Я чула болей пра рамантычнае і трагічнае.

Зразумела, гэта не ўсё жыццё і не ўся праўда. Але гэта іх праўда. Як мужна выказаўся адзін з пісьменнікаў ваеннага пакалення: «Будзь ты выклятая, вайна — наш зорны час!». Гэта пароль, агульны эпіграф да іх жыцця.

А ўсё ж такі: якое яно, каханне, там? Каля смерці...

### Пра чортавую бабу і майскія ружы

«Вайна забрала ў мяне каханне... Маё адзінае каханне...

Кідаюць на горад бомбы, прыбегла да мяне сястра Ніна, развітваемся. Думалі — ужо не пабачымся. Яна

мне кажа: “Я пайду ў сандружынніцы, толькі дзе мне іх знайсці?”. І вось памятаецца: гляджу на яе, а гэта было лета, на ёй лёгенькая сукенка, і раптам заўважаю на левым плячы, тут, каля шыі, радзімую пазначку. Гэта мая родная сястра, а я раней не бачыла. Гляджу і думаю: “Цяпер я цябе заўсёды пазнаю”.

І такое вострае пачуццё… Такая любоў… Сэрца млее…

З Мінска ўсе сыходзілі. Дарогі абстрэльвалі, таму рухаліся лесам. Недзе дзяўчынка крычыць: “Мама, вайна”. Наша вайсковая частка адступае. Прамінаем разлеглае шырокае поле, ускаласілася жыта, а каля дарогі нізкая вясковая хата. Ужо Смаленшчына… Стаіць жанчына, здавалася, яна вышэйшая за свой дамок, апранутая ва ўсё льняное, вышытае нацыянальным узорам. Яна скрыжавала рукі на грудзях і нізка кланялася, салдаты праходзілі, а яна ім кланялася і казала: “Хай цябе Бог верне дамоў”. І вы ведаеце, кожнаму яна кланялася і так казала. Ва ўсіх на вачах былі слёзы…

Я яе ўсю вайну памятала… А цяпер іншае, гэта было ў Нямеччыне, калі мы немцаў назад гналі. Нейкае мястэчка… Сядзелі ў двары дзве немкі ў сваіх чапцах і пілі каву. Як быццам не было ніякай вайны… І я падумала: “Божа мой, у нас разваліны, у нас людзі ў зямлі жывуць, у нас людзі лебяду варыць, а вы седзяце і сёрбаеце каву”. Едуць побач нашыя машыны, на іх салдаты… А яны сёрбаюць каву…

А потым я ехала па нашай зямлі… І што бачыла? На месцы вёскі адна печ. Сядзіць стары, а за ім стаяць трое ўнукаў, пэўна, згубіў і сына, і нявестку. Старая збірае галавешкі запаліць печку. Павесіла кажух, відаць, з лесу вярнуліся. І што ў гэтай печцы будзе варыцца?

І такое вострае пачуццё… Такая любоў…

...Наш эшалон спыніўся. Забылася, што там было — ці то рамонт дарогі, ці то змена паравоза. Сядзім мы з адной медсястрой, а побач двое нашых салдатаў вараць кашу. Аднекуль падыходзяць да нас два палонныя немцы, сталі прасіць есці. А ў нас быў хлеб. Мы падзялілі бохан хлеба і падалі ім. Салдаты, што варылі кашу, чую, разважаюць:

—Глядзі, колькі доктаркі далі хлеба фашыстам! — І далей, у тым сэнсе, што хіба яны ведаюць сапраўдную вайну, сядзелі ў шпіталях, скуль ім...

Праз нейкі час іншыя палонныя падышлі ўжо да салдатаў, якія варылі кашу. І той салдат, што нас кагадзе папракаў, кажа аднаму немцу:

—Што — жэрці захацеў?

А той стаіць... Чакае. Другі наш салдат перадае бохан свайму таварышу:

—Чаго ўжо там, адрэж яму.

Той адрэзаў па кавалку хлеба. Немцы ўзялі і стаяць — бачаць, што каша гатуецца.

—Дай ім кашы, — кажа той самы салдат.

—Ды яна яшчэ не зварылася.

Вы чулі?

І немцы, як быццам таксама разумеюць мову, стаяць. Чакаюць. Салдаты заправілі кашу салам і наклалі ім у бляшанкі з-пад кансерваў.

Вось вам душа рускага салдата. Яны абгаворвалі нас, а самі далі хлеба, і яшчэ кашы, і толькі тады, як заправілі салам. Вось што я памятаю...

І такое вострае пачуццё... Такое моцнае...

Вайна даўно скончылася... Я збіралася на курорт... Якраз быў Карыбскі крызіс. Зноў у свеце зрабілася трывожна. Усё захісталася. Пакую чамадан, сукенкі ўзяла, кофтачкі склала. Ну, здаецца, нічога не забыла... Дастаю

скрыначку з дакументамі і вымаю адтуль вайсковы білет. Думаю: "Здарыцца што, я там адразу пайду ў ваенкамат".

Ужо на моры, калі адпачывалі, распавяла за столікам у сталоўцы, што ехала сюды і прыхапіла вайсковы білет. Я так сказала, без усялякай думкі ці жадання выхваліцца. А адзін мужчына за нашым столікам расхваляваўся:

— Не, толькі руская жанчына можа прыхапіць з сабой на курорт вайсковы білет і думаць, што калі нешта такое, дык яна адразу пойдзе ў ваенкамат.

Я помню яго вочы. Яго захапленне. Так на мяне мой муж глядзеў. Гэткімі самымі вачыма…

Прабачце за доўгі ўступ… Я не ўмею гаварыць упарадкавана. Думкі заўсёды ў мяне пераскокваюць, пачуцці ліхаманяць…

Мы разам з мужам пайшлі на фронт. Удваіх.

Я шмат чаго забыла. Хаця згадваю кожны дзень…

Скончыўся бой… Не верылася цішыні. Ён гладзіў траву рукамі, трава мяккая… І глядзеў на мяне. Глядзеў… Такімі вачыма…

Яны пайшлі групай у разведку. Чакалі іх два дні… Я не спала два дні… Прыснула. Прачынаюся ад таго, што ён сядзіць побач і глядзіць на мяне. "Кладзіся спаць". — "Шкада спаць".

І такое вострае ўзрушэнне… Такое каханне… Сэрца гатовае разарвацца…

Я шмат забыла, амаль усё забыла. А думала, што не забуду. Ні за што не забуду.

Мы ўжо ішлі праз Усходнюю Прусію, ужо ўсе чакалі Перамогу. І тут ён загінуў… Загінуў імгненна… Ад аскепка. Раптоўнай смерцю. Секунднай. Мне перадалі, што іх прывезлі, я пабегла… Я яго абняла, я не дала яго забраць. Пахаваць. У вайну хавалі хутка: калі бой скончыўся, дык адразу збіраюць усіх, звозяць адусюль у адно

месца і капаюць вялікую яміну. Засыпаюць. Іншым разам адным сухім пяском. І калі доўга на гэты пясок глядзець, дык здаецца, што ён рухаецца, дрыжыць. Калышацца гэты пясок. Бо там… Там для мяне яшчэ жывыя людзі, яны зусім нядаўна былі жывыя… Я бачу іх, я з імі размаўляю… Не веру… Мы ўсе ходзім і не верым, што яны там… Дзе?

І я не дазволіла яго адразу хаваць. Хацела, каб яшчэ была ў нас адна ноч. Сядзець каля яго. Глядзець… Гладзіць…

Зранку… Я вырашыла, што адвязу яго дамоў. У Беларусь. А гэта — некалькі тысяч кіламетраў. Ваенныя дарогі… Бязладдзе… Усе падумалі, што я ад гора страціла розум. "Ты мусіш супакоіцца. Табе трэба паспаць". Не! Не! Я пайшла ад аднаго генерала да другога, апошнім заставаўся камандуючы фронтам Ракасоўскі. Спачатку ён адмовіў… Ну, ненармальная нейкая! Колькі ўжо ў брацкіх магілах закапана, ляжыць у чужой зямлі…

Я яшчэ раз дабілася да яго на прыём:

—Хочаце, я стану перад вамі на калені?

—Я вас разумею… Але ён ужо мёртвы…

—У мяне няма ад яго дзяцей. Дом наш згарэў. Нават фотаздымкі зніклі. Нічога няма. Калі я прывязу яго на радзіму, то застанецца хаця б магіла. І мне будзе куды вяртацца пасля вайны.

Маўчыць. Ходзіць па кабінеце. Ходзіць.

—Вы калі-небудзь кахалі, таварыш маршал? Я не мужа хаваю, я любоў хаваю.

Маўчыць.

—Тады я таксама хачу тут памерці. Навошта мне без яго жыць?

Ён яшчэ доўга маўчаў. Потым падышоў да мяне і пацалаваў руку.

Мне далі спецыяльны самалёт на адну ноч. Я зайшла ў самалёт… Абняла труну… І страціла прытомнасць…»

*Ефрасіння Рыгораўна Брэўс, капітан, доктар*

«Разлучыла нас вайна… Муж — на фронце. Я эвакуявалася спачатку ў Харкаў, а затым у Татарыю. Уладкавалася там працаваць. І вось аднойчы мяне шукаюць… Маё дзявочае прозвішча Лісоўская, але ўсе завуць: "Соўская! Соўская!" І я тады адгукаюся: "Гэта я!". Мне кажуць: "Ідзіце ў "энкавэдэ", бярыце пропуск і выпраўляйцеся ў Маскву". Чаму? Мне ніхто нічога не патлумачыў, і я не ведала. Ваенны час… Еду і думаю, можа, муж паранены, можа, мяне да яго выклікаюць. А я ўжо чатыры месяцы нічога ад яго не атрымлівала, ніякай вестачкі. У мяне такі намер, калі яго знайду без рук, без ног, калеку, забяру і адразу дамоў. Неяк будзем жыць.

Прыязджаю ў Маскву, звяртаюся па адрасе. Там напісана: "ЦК КПБ", гэта значыць наш беларускі ўрад, і там такіх, як я, вельмі шмат. Мы цікавімся: "Што? Чаму? Навошта?". Кажуць: "Яшчэ пачакайце трошкі". Сабралі нас усіх у вялізнай зале: там наш сакратар ЦК Беларусі, таварыш Панамарэнка, іншыя кіраўнікі. У мяне запыталі: "Ці жадаеце вы туды, адкуль з'ехалі?". Ну, адкуль я з'ехала — з Беларусі. Вядома, жадаю. І мяне накіроўваюць у спецшколу. Пачынаюць рыхтаваць, каб заслаць у тыл ворага.

Сёння скончылі навучанне, а ўжо назаўтра пасадзілі нас на машыны і павезлі да лініі фронту. Потым мы пешкі рушылі. Я не ведала, што такое фронт і якая яна — нейтральная паласа. Каманда: "Падрыхтавацца! Гатоўнасць — нумар адзін". "Бах!" — стрэліла ракета. Снег, бачу, белы-белы, а тут чорна ад людзей, гэта мы адзін за адным леглі. Нас шмат. Ракета згасла, стрэлаў

няма. Новая каманда: "Бягом!", і мы пабеглі... І так перайшлі...

У партызанскім атрадзе мяне нейкім цудам знайшоў ліст ад мужа. Гэта было столькі радасці, так нечакана, два гады я пра яго нічога не ведала. А тут — самалёт скінуў харч, баявы рыштунак... І пошту... І сярод пошты, у гэтым брызентавым меху, мне — ліст. Тады я звяртаюся ў ЦК. Я напісала, што на ўсё згодная, толькі каб нам з мужам быць разам. І гэты ліст неўпрыкмет ад камандзіра атрада перадала лётчыку. Неўзабаве даведваемся навіну па сувязі — пасля выканання задання нашу групу чакаюць у Маскве. Усю нашу спецгрупу. Пашлюць на новае месца... Усе мусяць ляцець, а Фядосенка дык абавязкова.

Чакаем самалёт, а гэта ноч, цёмна, як у бочцы. І нейкі самалёт над намі кружляе, а потым як сыпане бомбамі. Гэта быў "месершміт", немцы даведаліся пра нашую стаянку, ён зайшоў на новы круг. А ў гэты момант наш самалёт апускаецца — "У-2", якраз каля яліны, дзе я стаяла. Лётчык трохі прысеў да зямлі і давай адразу падымацца, бо пабачыў, што немец зараз развернецца і зноў пачне бамбаваць і страляць. Я зачапілася за крыло і крычу: "Мне ў Маскву! У мяне дазвол!". Ён нават вылаяўся: "Сядай!". Так мы і ляцелі з ім удваіх. Не было ні параненых... Нікога.

У маі месяцы ў Маскве я хадзіла ў валёнках. Прыйшла ў тэатр у валёнках. І было цудоўна. Пішу мужу: як нам сустрэцца? Я пакуль у рэзерве... Але мне абяцаюць... Усюды прашу: пашліце мяне туды, дзе муж, дайце мне хаця б два дні, мне б толькі паглядзець на яго разок, а потым пасылайце куды заўгодна. Усе паціскаюць плячыма. Але я даведваюся паводле нумара пошты, дзе ён ваюе, і еду туды. Прыязджаю спачатку ў абкам

партыі, паказваю адрас мужа, дакументы, што я ягоная жонка, і кажу, што хачу сустрэцца з ім. Мне адказваюць, што гэта немагчыма, бо ён на самай перадавой, вяртайцеся назад, а я ўся такая пабітая, такая галодная, і як гэта — назад? Пайшла да ваеннага каменданта. Ён паглядзеў на мяне і загадаў, каб мяне трохі прыадзелі. Далі мне гімнасцёрку, рэмень падперазацца. І пачаў ён мяне адгаворваць:

—Ну што вы, там, дзе ваш муж, вельмі небяспечна…

Я сяджу і плачу, тады ён пашкадаваў мяне і выдаў пропуск.

—Выйдзеце, — кажа, — на гасцінец, там будзе рэгуліроўшчык, і ён вам скажа, куды ехаць.

Знайшла гэты гасцінец, адшукала рэгуліроўшчыка, пасадзіў ён мяне на машыну. Прыязджаю ў частку, там усе дзівяцца, вакол толькі вайскоўцы. “А вы хто?” — пытаюць. Я не магу сказаць — жонка. Ну, як такое скажаш, калі вакол снарады бухаюць… Я адказваю — сястра. Нават не ведаю, чаму я так сказала — сястра. “Пачакайце, — кажуць, — яшчэ шэсць кіламетраў туды трэба ісці”. Як гэта я буду чакаць, калі ўжо так далёка дабралася? Але якраз адтуль машына па абед прыехала, і з ёй быў старшына такі рудаваты, рабаваты. Ён кажа:

—Дык я Фядосенку ведаю, але гэта ў самай траншэі.

Ну, упрасіла яго. Пасадзілі мяне, еду, нідзе нічога не бачна… Лес… Лясная дарога… Для мяне гэта навіна: перадавая, а нідзе нікога. Толькі зрэдчас трохі пастрэльваюць.

Старшына пытае:

—А дзе Фядосенка?

Яму адказваюць:

—Яны ўчора пайшлі ў разведку, іх заспеў світанак, і яны чакаюць.

Але сувязь там была. І яму па сувязі сказалі, што да яго прыехала сястра. Якая сястра? Кажуць: "Рыжая". А сястра ў яго чорная. Ну, калі рыжая, ён адразу здагадаўся, якая сястра. Не ведаю, як ён там выпаўзаў, але Фядосенка хутка з'явіўся, і мы там жа зладзілі сустрэчу. Радасці было...

Пабыла я ў яго адзін дзень, другі, а потым кажу:

— Ідзі ў штаб і дакладай. Я з табой тут застануся.

Ён пайшоў да камандзіраў, а я не дыхаю: ну, як скажуць, каб у дваццаць чатыры гадзіны нагі яе не было? Гэта ж фронт, што тут казаць. І раптам бачу — ідуць у зямлянку камандзіры: маёр, палкоўнік. Вітаюцца ўсе за руку. Потым, зразумела, селі мы ў зямлянцы, выпілі, і кожны сказаў сваё слова, што жонка знайшла свайго мужа ў траншэі, гэта ж сапраўдная жонка, і дакументы ёсць. Гэта ж такая жанчына! Дайце паглядзець на такую жанчыну! Яны такія словы казалі, усе плакалі. Я той вечар усё жыццё згадваю... Што ў мяне яшчэ засталося?

Залічылі санітаркай. Хадзіла з ім у разведку. Стрэл мінамёта, бачу — зваліўся. Думаю: забіты ці паранены? Бягу, а мінамёт страляе, і камандзір крычыць:

— Куды ты прэш, чортавая баба!?

Падпаўзла — жывы... Жывы!

Каля Дняпра ноччу пад поўняй мяне ўзнагародзілі ордэнам Чырвонага Сцяга. А на другі дзень муж быў паранены, цяжка. Мы разам беглі, мы разам плюхалі па балоце, разам паўзлі. Кулямёты стралялі і стралялі, а мы паўзлі і паўзлі, і яго параніла ў сцягно. Раніла разрыўной куляй, і паспрабуй накладзі павязку, гэта ж клубы. Усё разарвалася, і гразь, і зямля — усё туды. А мы выходзілі з акружэння. Вывозіць параненых няма куды, медыкаментаў у мяне таксама ніякіх. Адна надзея, што прарвёмся. Калі прарваліся, я суправаджала яго да самога

шпіталя. Пакуль давезлі, было ўжо агульнае заражэнне крыві. Гэта быў Новы год… Сорак чацвёрты год… Ён паміраў… Я разумела, што ён памірае… А ён быў шмат разоў узнагароджаны, я сабрала ўсе ягоныя ўзнагароды, паклала каля яго. Быў якраз абход, а ён спаў. Доктар:

— Вам трэба сыходзіць адсюль. Ён ужо мёртвы.

Я адказваю:

— Ціха, ён яшчэ жывы.

Муж якраз расплюшчыў вочы і кажа:

— Нешта столь блакітнай зрабілася.

Я гляджу:

— Не, яна не блакітная. Столь, Вася, белая. — А яму здавалася, што блакітная.

Сусед кажа:

— Ну, Фядосенка, калі застанешся жыць, то жонку сваю мусіш на руках насіць.

— І буду насіць, — пагаджаецца ён.

Я не ведаю, ён, напэўна, адчуваў, што памірае, бо ўзяў мяне за рукі, нахіліў да сябе і пацалаваў. Так апошні раз цалуюць:

— Любачка, так шкада, ва ўсіх Новы год, а мы з табой тут… Але ты не сумуй, у нас яшчэ ўсё будзе…

І калі яму заставалася некалькі гадзінаў жыцця… У яго здарылася гэтае няшчасце… Карацей, трэба было памяняць яму бялізну… Я паслала чыстую прасціну, нагу перавязала, а далей трэба на падушку падцягнуць, гэта ж мужчына, цяжкі, я яго цягну, нахілілася нізка-нізка і адчуваю, гэта ўжо ўсё, яшчэ хвіліна-другая і яго не стане… Гэта быў вечар. Дзесяць гадзін пятнаццаць хвілін… Да хвіліны запомніла… І мне захацелася самой памерці… Але я насіла пад сэрцам нашае дзіця, і толькі гэта мяне ўтрымала, я перажыла тыя дні. Пахавала яго першага студзеня, а праз трыццаць восем дзён у мяне

нарадзіўся сын, ён з сорак чацвёртага года, сам ужо мае дзяцей. Мужа звалі Васіль, сын у мяне Васіль Васілевіч, і ўнук у мяне Вася... Васілёк...»

*Любоў Фамінічна Фядосенка, радавая, санітарка*

«Бачыла... Кожны дзень... Але не магла змірыцца. Малады прыгожы мужчына памірае... Хацелася паспець, ну... пацалаваць яго. Нешта жаночае для яго зрабіць, калі нічым не можаш дапамагчы як доктар. Хаця б усміхнуцца. Пагладзіць. Узяць за руку...

Праз шмат год пасля вайны мне адзін мужчына прызнаўся, што памятае маю маладую ўсмешку. А для мяне гэта быў звычайны паранены, я яго нават не згадала. Ён казаў, што гэтая ўсмешка вярнула яго да жыцця, з таго свету, як кажуць... Жаночая ўсмешка...»

*Вера Уладзіміраўна Шавалдышава,*
*старшы лейтэнант, хірург*

«Прыбылі на Першы Беларускі фронт... Дваццаць сем дзяўчат. Мужчыны на нас глядзелі з захапленнем: "Ні прачкі, ні тэлефаністкі, а дзяўчаты-снайперкі. Мы ўпершыню бачым такіх дзяўчат. Якія дзяўчаты!". Старшына ў наш гонар вершы напісаў. Сэнс быў такі, каб дзяўчаты заставаліся пяшчотнымі, як майскія ружы, каб вайна не скалечыла іх душы.

Перад адпраўкай на фронт кожная з нас дала клятву: ніякіх раманаў на вайне. Калі мы ацалеем, усё будзе пасля вайны. А да вайны мы не паспелі нават пацалавацца. Мы больш строга ставіліся да ўсяго гэтага, чым сучасныя маладыя людзі. Пацалавацца для нас значыла — палюбіць на ўсё жыццё. На фронце каханне было як бы забароненым, калі даведвалася камандаванне, аднаго з дваіх пераводзілі ў іншую частку, папросту

разлучалі. Мы яго берaглі-ахоўвалі. І не стрымалі сваіх дзіцячых клятваў... Мы кахалі...

Я думаю, што калі б не закахалася на вайне, то не выжыла б. Каханне ратавала. Мяне яно ўратавала...»

*Соф'я Крыгель, старшы сяржант, снайперка*

«Пра каханне пытаеце? Я не баюся сказаць праўду... Я была папажэ — паходна-палявая жонка. Жонка на вайне. Другая. Незаконная.

Першы камандзір батальёна...

Я яго не любіла. Ён харошы быў чалавек, але я яго не любіла. Пайшла да яго ў зямлянку праз некалькі месяцаў. А куды падзецца? Адны мужчыны вакол, дык лепей з адным жыць, чым усіх баяцца. У баі не так страшна было, як пасля бою, асабліва, калі адпачынак, на перафармаванне адыдзем. Калі страляюць, калі агонь, яны клічуць: "Сястрычка! Сястрычка!", а пасля бою кожны за табой сочыць... З зямлянкі ноччу не вылезеш... Казалі вам гэта іншыя дзяўчаты ці не прызналіся? Пасаромеліся, думаю... Схавалі. Ганарлівыя! А яно ўсё было, бо паміраць не хацелася. Было крыўдна паміраць, калі ты малады... Ну, і для мужчынаў цяжка чатыры гады без жанчын... У нашым войску бардэляў не было, і пігулак ніякіх не давалі. Недзе, можа, за гэтым сачылі. А ў нас дык не. Чатыры гады... Камандзіры толькі маглі нешта сабе дазволіць, а просты салдат — не. Дысцыпліна. Але пра гэта маўчаць... Нельга... Я, напрыклад, у батальёне была адна жанчына, жыла ў агульнай зямлянцы. Разам з мужчынамі. Адасобілі мне месца, але якое яно асобнае, уся зямлянка шэсць метраў. Я прачыналася ноччу ад таго, што махала рукамі — то аднаму пляснў па шчоках, па руках, то другому. Мяне параніла, я трапіла ў шпіталь і там махала

рукамі. Нянька ноччу разбудзіць: "Ты — чаго?". Каму распавядзеш?

Першага камандзіра забіла мінным аскепкам.

Другі камандзір батальёна…

Яго я кахала. Ішла з ім у бой, хацела быць побач. Я яго кахала, а ў яго была каханая жонка, двое дзяцей. Ён паказваў мне іх фотаздымкі. І я ведала, што пасля вайны, калі застанецца жывы, ён вернецца да іх. У Калугу. Ну і што? У нас былі такія шчаслівыя хвіліны! Мы перажылі такое шчасце! Вось вярнуліся… Жахлівы быў бой… А мы жывыя. У яго ні з кім такое не паўторыцца! Не атрымаецца! Я ведала… Я ведала, што шчаслівы ён без мяне не будзе. Не зможа быць шчаслівы ні з кім так, як мы былі з ім шчаслівыя на вайне. Не зможа… Ніколі!

Напрыканцы вайны я зацяжарала. Я так хацела… Але нашую дачку я гадавала сама, ён мне не дапамог. Ніводнага падарунка ці ліста… ці хоць паштовачкі. Скончылася вайна, і скончылася каханне. Як песня… Ён паехаў да законнай жонкі, да дзяцей. Пакінуў мне на памяць сваю фотакартку. А я не хацела, каб вайна канчалася… Страшна такое сказаць… Адкрыць сваё сэрца… Я — вар'ятка. Бо я кахала! Бо ведала, што разам з вайной скончыцца і каханне. Яго каханне… Але ўсё роўна я яму ўдзячная за тыя пачуцці, якія ён мне падарыў і якія я з ім спазнала. Вось я яго любіла ўсё жыццё, я пранесла свае пачуцці праз гады. Мне цяпер няма сэнсу хлусіць. Я ўжо старая. Так, праз усё жыццё! І я не шкадую.

Дачка мяне папікнула: "Мама, за што ты яго любіш?". А я люблю… Нядаўна даведалася — ён памёр. Шмат плакала. Мы нават пасварыліся з дачкой: "Чаго ты плачаш? Ён для цябе даўно памёр". А я яго і цяпер люблю. Згадваю вайну, як найлепшы час майго жыцця, я там была шчаслівая…

Толькі прашу вас, без прозвішча. Дзеля маёй дачкі...»

*Соф'я К-віч, санінструктарка*

«Падчас вайны...

Прывезлі мяне на перадавую. Камандзір сустрэў словамі: "Здыміце, калі ласка, шапку". Я здзівілася... Зняла... У ваенкамаце нас стрыглі пад хлопчыкаў, але пакуль мы былі ў ваенных лагерах, пакуль дабіраліся да фронту, валасы мае трохі падраслі. Сталі кучаравіцца, яны ў мяне такія, як у баранчыка... Цяпер нават цяжка ўявіць... Ужо старая стала... І вось ён глядзіць і глядзіць на мяне: "Я два гады жанчыну не бачыў. Хачу наглядзецца".

Пасля вайны...

Я жыла ў камунальнай кватэры. Суседкі ўсе былі замужнія, крыўдзілі мяне. Здзекаваліся: "Ха-ха-ха... Раскажы, як ты там б... з мужыкамі...". У мой чыгунок з бульбай воцату нальюць. Сыпануць лыжку солі... Ха-ха-ха...

Дэмабілізаваўся з войска мой камандзір. Прыехаў да мяне, і мы пабраліся шлюбам. Распісаліся ў загсе — і ўсё. Без вяселля. А праз год ён сышоў да іншай жанчыны, загадчыцы нашай фабрычнай сталоўкі: "Ад яе водар парфумы, ад цябе смурод ботаў і анучаў".

Так і жыву адна. Нікога ў мяне няма ва ўсім белым свеце. Дзякуй, што ты прыйшла...»

*Кацярына Мікітаўна Саннікава, сяржант, стралок*

«А мой муж... Добра, што яго няма, ён на працы. Ён строга мне загадаў... Ведае, што мне заўсёды карціць пра нашае каханне апавядаць... Як я вясельную сукенку сабе за адну ноч з бінтоў пашыла. Сама. А бінты мы з сяброўкамі месяц збіралі. Бінты трафейныя... У мяне была сапраўдная вясельная сукенка. Захаваўся фотаздымак: я ў гэтай

сукенцы і ў ботах, але ботаў не бачна, ды я памятаю, што была ў ботах. А паясок выштукавала са старой пілоткі… Вельмі ўдалы атрымаўся. Але што гэта я… За сваё… Муж загадаў пра каханне ні слова, ні-ні, а распавядаць пра вайну. Ён у мяне строгі. Па карце вучыў… Два дні вучыў, дзе які фронт стаяў… Дзе наша частка… Я зараз вазьму паперчыну, я за ім занатавала. Прачытаю…

Чаго ты смяешся? Ой, як хораша ты смяешся. Я таксама смяялася… Ну, які з мяне гісторык! Лепей здымак, дзе я ў сукенцы з бінтоў, пакажу.

Я так сабе там падабаюся… У белай сукенцы…»

*Настасся Леанідаўна Жардзецкая,*
*яфрэйтар, санінструктарка*

## Пра дзіўную цішыню, неба і згублены пярсцёнак

«Выправілася з Казані на фронт у дзевятнаццаць…

А праз паўгода пісала маме, што мне даюць дваццаць пяць — дваццаць сем гадоў. Кожны дзень у страху і жаху. Аскепак ляціць, дык здаецца: з цябе здымаюць скуру… І людзі паміраюць. Паміраюць кожны дзень, кожную гадзіну і, здаецца, што кожную хвіліну. Прасцінаў не хапала накрываць. У ніжняй бялізне складалі. Дзіўная цішыня была ў палатах. Такой цішыні я болей нідзе не чула. Калі чалавек памірае, ён заўсёды ўзіраецца над сабой, ніколі не глядзіць у бок ці на цябе, калі ты побач. Толькі ўверх… У столь… Але так углядаецца, быццам там неба…

І я казала сабе, што ніводнага слова любові ў гэтым пекле пачуць не змагу. Не змагу даць веры. Колькі год вайна доўжылася, я ніякіх песень не памятаю. Нават знакамітую “Зямлянку” не памятаю. Ніводнай… Калі

сыходзіла з дому на фронт, у нас у садзе квітнелі вішні. Іду і азіраюся... Потым, напэўна, я сустракала сады на дарогах, яны ж і ў вайну цвілі... Толькі я не магу згадаць... У школе такая весялуха была, а тут ніколі нават не ўсміхалася. Калі я бачыла, што нейкая дзяўчына вышчыпала бровы ці падфарбавала вусны, я абуралася. Катэгарычна адмаўляла: як гэта магчыма, як гэта яна хоча ў такую пару некаму падабацца?

Вакол параненыя, вакол стогны... У мёртвых такія жоўта-зялёныя твары. Ну як тут можна думаць пра радасць? Пра сваё шчасце. Я не хацела лучыць любоў з гэтым... З усім гэтым... Мне здавалася, што тут, у такіх абставінах, любоў загіне імгненна. Без урачыстасці, без прыгажосці якое можа быць каханне? Скончыцца вайна, будзе прыгожае жыццё. І будзе каханне. А тут... Тут — не. А раптам я загіну, і той, хто мяне палюбіць, будзе пакутаваць. І мне так шкада. Вось такой я была...

Мой цяперашні муж яшчэ там да мяне заляцаўся, мы сустрэліся на фронце. А я не хацела яго слухаць: "Не-не, скончыцца вайна, тады і будзем размаўляць пра гэта". Не забудуся, як аднойчы ён вярнуўся з бою і папрасіў: "У цябе няма якой-небудзь кофтачкі? Апрані, калі ласка. Дай паглядзець, якая ты ў кофтачцы". А ў мяне нічога не было, акрамя гімнасцёркі.

Я і сяброўцы сваёй, яна пабралася шлюбам на фронце, казала: "Кветак не дарыў. На спатканні не запрашаў. І раптам — замуж. Хіба гэта любоў?". Я яе не разумела.

Вайна скончылася... Мы глядзелі адно на аднаго і не верылі, што вайна скончылася і мы жывыя засталіся. Вось цяпер мы будзем жыць, будзем любіць... А мы ўсе на гэта забыліся, не ўмелі. Прыехала я дамоў, пайшла з мамай шыць сабе сукенку. Мая першая сукенка пасля вайны.

Падыходзіць чарга, і мяне пытаюць:

—Які вам фасон?

—Я не ведаю.

—Як гэта, выбраліся ў атэлье і не ведаеце, якую хацелі б сукенку?

—Не ведаю...

А я пяць гадоў ніводнай сукенкі не бачыла. Я нават забылася, як яны шыюцца. Што патрэбныя там нейкія вытачкі, нейкія разрэзы... Нізкая талія, высокая талія... Гэта мне было зусім незразумела. Купіла туфлі на абцасах, абтаптала пакой і зняла іх. Паставіла ў куток і думаю: "Я ніколі не навучуся ў іх хадзіць..."»

*Марыя Селіверстаўна Бажок, медсястра*

«Я хачу згадаць... Я хачу сказаць, што неверагодна прыгожае пачуццё я вынесла з вайны. Ніякімі словамі не перадаць, з якім захапленнем і пяшчотай глядзелі на нас мужчыны. Я з імі жыла ў адной зямлянцы, спала на адных нарах, хадзіла разам на заданні, і калі я калела так, што чула, як селязёнка замярзае, як язык у роце ледзьве варушыцца і хутка страчу прытомнасць, дык прасіла: "Міхась, расшпілі кажух, пагрэй". Ён пагрэе: "Ну як, лягчэй?" — "Лягчэй".

Я такога ніколі болей не сустракала ў жыцці. Але ні пра што сваё нельга было думаць, пакуль Радзіма ў небяспецы.

—Але была любоў?

—Так, была любоў. Я яе сустракала... Толькі вы мне прабачце, магчыма, я і не мела рацыі, і гэта не зусім натуральна, але ў душы я такіх людзей не ўхваляла. Я лічыла, што цяпер не час для любошчаў. Вакол — зло. Нянавісць. Мне здаецца, што так разважалі многія...

—А якой вы былі да вайны?

—Я спяваць любіла. Смяяцца любіла. Хацела стаць лётчыцай. Якія там думкі пра каханне! Яно не было для мяне чымсьці важным. Галоўнае — Радзіма. Цяпер я думаю, што мы былі наіўныя…»

*Алена Віктараўна Кляноўская, партызанка*

«У шпіталі… Яны ўсе былі шчаслівыя, бо засталіся жывыя. Дваццацігадовы лейтэнант спачатку пакутаваў, што застаўся без нагі. Але сярод усеагульнага гора зразумеў гэта як шчасце — ён жывы, у яго, падумаеш, толькі адной нагі няма. Галоўнае — жывы. І любоў у яго будзе, і жонка будзе, і ўсё будзе. Гэта цяпер застацца без нагі — жах, а тады яны ўсе скакалі на адной назе, курылі, смяяліся. Яны героі і ўвогуле! Што вы?!

—Вы там улюбляліся?

—Вядома, мы ж такія юныя. Як толькі новых раненых прывязуць, мы абавязкова ў каго-небудзь закахаемся. Сяброўка мая захапілася адным старшым лейтэнантам, ён быў увесь зранены. Яна мне паказала — вось ён. Ну, і я, канешне, таксама ў яго закахалася. Калі яго забіралі, ён папрасіў у мяне фотаздымак. А ў мяне быў толькі адзін, недзе на станцыі мы сфатаграфаваліся. Я ўзяла гэты фотаздымак, каб яму аддаць, а потым думаю: раптам гэта не любоў, а я яму апошні падару? І вось яго ўжо нясуць, я руку яму працягнула, у кулаку здымак, а расціснуць пальцы пашкадавала. Вось і ўся любоў…

Потым Паўлік быў, таксама лейтэнант. Яму было вельмі балюча, дык я шакаладку пад падушку паклала. І вось, калі мы сустрэліся, гэта ўжо пасля вайны, праз дваццаць гадоў, ён стаў дзякаваць маёй сяброўцы Лілі Драздовай за тую шакаладку. Ліля кажа: “Якая шакаладка?”. Тады я прызналася, што гэта я… І ён мяне пацалаваў… Праз дваццаць гадоў пацалаваў…»

*Святлана Мікалаеўна Любіч, сандружынніца*

«Аднойчы пасля канцэрта... У вялікім шпіталі... Да мяне падыходзіць галоўны доктар і просіць: “Тут у нас у асобнай палаце ляжыць цяжкапаранены танкіст. Ён амаль ні на што не рэагуе, раптам яму дапаможа ваша песня”. Іду ў палату. Колькі буду жыць, не забуду гэтага чалавека, які цудам выскачыў з вогненнага танка і абгарэў з ног да галавы. Ён ляжаў, нерухома выцягнуўшыся на ложку, з чорным, без вачэй, тварам. Маё горла перахапіла сутарга, і я некалькі хвілін не магла ўзяць сябе ў рукі. Потым пачала ціха спяваць... Бачу, ягоны твар трохі зварухнуўся. Ён нешта прашаптаў. Я нахілілася і пачула: “Праспявайце яшчэ...”. Я спявала яму яшчэ і яшчэ, увесь свой рэпертуар, пакуль доктар не сказаў: “Здаецца, ён заснуў...”».

*Лілія Александроўская, артыстка*

«У нас — камбат і медсястра Люба Сіліна... Яны кахалі адно аднаго! Гэта ўсе бачылі. Ён ішоў у бой, і яна... Казала, што не прабачыць сабе, калі ён загіне не на яе вачах і яна не ўбачыць яго ў апошнюю хвіліну. “Хай, — казала, — нас разам заб’юць. Адным снарадам”. Яны збіраліся разам ці паміраць, ці жыць. Нашая любоў там не дзялілася на сёння і на заўтра, было толькі — сёння. Кожны ведаў, што ты любіш цяпер, а праз хвіліну або цябе, або твайго чалавека можа не быць. На вайне ўсё адбываецца хутка: і жыццё, і смерць. За некалькі гадоў мы пражылі там цэлае жыццё. Я ніколі нікому не магла гэтага патлумачыць. Там — іншы час...

У адным баі камбата цяжка параніла, а Любу лёгка, трохі драпанула плячо. І яго адвозяць у тыл, а яна застаецца. Люба ўжо цяжарная, і ён пакідае ліст: “Адпраўляйся да маіх бацькоў. Што б са мной ні здарылася, ты мая жонка. І ў нас будзе наш сын ці наша дачка”.

Потым Люба напісала: яго бацькі не прынялі яе і дзіцяці не прызналі. А камбат памёр.

Шмат гадоў збіралася... Хацелася з'ездзіць да яе ў госці, але так і не атрымалася. Мы былі вельмі блізкія сяброўкі. Толькі далёка ехаць — на Алтай. А нядаўна атрымала ліст, што яна памерла. Цяпер яе сын мяне кліча наведаць магілку...

Хачу паехаць...»

*Ніна Леанідаўна Міхай, старшы сяржант, медсястра*

«Дзень Перамогі...

Мы сабраліся на нашую традыцыйную сустрэчу. І вось я выходжу з гасцініцы, а дзяўчаты мне кажуць:

—Дзе ты, Ліля, была? Мы так наплакаліся.

Тлумачаць: падышоў да іх мужчына, казах, пытаецца:

—Вы адкуль, дзяўчаты? З якога шпіталя?

—А каго вы шукаеце?

—Я кожны год прыязджаю сюды і шукаю адну сястрычку. Яна выратавала мне жыццё. Я яе палюбіў. Хачу знайсці.

Мае дзяўчаты смяюцца:

—Ды што там сястрычку шукаць, яна ўжо бабулька.

—Не...

—Жонка, пэўна, ёсць? Дзеці?

—Унукі ёсць, дзеці ёсць, жонка ёсць. Душу згубіў... Душы няма...

Дзяўчаты мне гэта распавядаюць, і мы разам згадалі: а ці не мой гэта казах?

...Прывезлі хлопчыка казаха. Ну, зусім падлетак. Падступіліся да аперацыі... У яго было сем ці восем разрываў страўніка, ён лічыўся безнадзейным. І настолькі ляжаў абыякавы да ўсяго, што я яго адразу

запрыкмеціла. Як вольная хвіліна, дык адразу забягу: "Ну, як маешся?". Унутрывеннае сама ўкалю, тэмпературу памераю, і ён урэшце выкараскаўся. Стаў папраўляцца. А мы ў сябе параненых не трымалі доўга, мы на першай лініі. Управімся з пільнай дапамогай, выхапім у смерці і накіроўваем далей. І вось яго з чарговай партыяй павінны везці.

Ён ляжыць на насілках, і мне перадаюць, што кліча мяне.

—Сястрычка, падыдзі да мяне.

—Што такое? Чаго табе? У цябе ўсё добра. Адпраўляешся ў тыл. Лічы, што ўжо жывеш.

Ён кажа:

—Я вельмі цябе прашу, я адзін у бацькоў. Ты мяне ўратавала. — І працягвае мне падарунак — пярсцёнак, маленькі такі пярсцёнак.

А я такіх не насіла, чамусьці не любіла. І я адмаўляюся:

—Я не магу. Не магу.

Ён просіць, параненыя падтрымліваюць…

—Ды вазьмі, ён жа ад чыстага сэрца.

—Гэта ж мой абавязак, разумееце?

Угаварылі яны мяне. Праўда, я гэты пярсцёнак потым згубіла. Ён быў мне завялікі, аднойчы я заснула, а машыну падкінула, і ён некуды зваліўся. Шкадавала вельмі.

—Вы знайшлі таго мужчыну?

—Мы так і не сустрэліся. Не ведаю, ці той гэта. Але мы яго цэлы дзень разам з дзяўчатамі шукалі.

…У сорак шостым вярнулася дамоў. Мяне пытаюць: "Ты будзеш хадзіць у вайсковым ці як раней?". Зразумела, у вайсковым. Нават не падумаю здымаць. Пайшла ўвечары ў Дом афіцэраў на танцы. І вось вы зараз пачуеце, як ставіліся да ваенных дзяўчат.

Я была ў туфліках, сукенцы, а шынель і боты ў гардэробе пакінула.

Падыходзіць да мяне адзін вайсковы і запрашае танчыць.

—Вы, — кажа, — напэўна, не мясцовая. Вельмі інтэлігентна выглядаеце.

І ўвесь вечар ён са мной. Не адпускае. Скончыліся танцы, кажа:

—Дайце ваш нумарок.

Пайшоў наперад. А ў гардэробе яму даюць боты, даюць шынель.

—Гэта не маё…

Я падыходжу:

—Не, гэта маё.

—Але вы мне не сказалі, што былі на фронце.

—А вы мяне пыталіся?

Ён разгубіўся. Не мог на мяне вочы ўзняць. А сам толькі з вайны вярнуўся…

—Чаму гэта вас так здзівіла?

—Я не мог сабе ўявіць, што вы былі ў войску, франтавая дзяўчына…

—Вас здзівіла, што я, як бачна, адна? Без мужа і не цяжарная? Не нашу фуфайку, не дымлю папяросай "Казбек" і не лаюся матам?

Я не дазволіла яму праводзіць мяне.

І заўсёды ганарылася, што была на фронце. Радзіму бараніла…»

*Лілія Міхайлаўна Бутко, хірургічная медсястра*

«Мой першы пацалунак…

Малодшы лейтэнант Мікалай Белахвосцік… Ой, глядзіце, пачырванела ўся, а ўжо бабуля. А тады былі маладыя гады. Юныя. Я думала… Была пэўная… Што…

Я нікому не прызнавалася, нават сяброўцы, што ў яго закаханая. Як кажуць, па вушы. Маё першае каханне… Можа, і апошняе? Хто ведае… Я думала: ніводзін чалавек у роце не здагадваецца. Мне ніхто раней так не падабаўся! А калі і падабаліся, дык не вельмі. А ён… Я хадзіла і ўвесь час пра яго думала, кожную хвіліну. Гэта было сапраўднае каханне. Я адчувала. Усе прыкметы… Ай, глядзіце, пачырванела…

Мы яго хавалі… Ён ляжаў на плашч-палатцы, яго толькі-толькі забіла. Немцы абстрэльваюць. Трэба хаваць хутка… Проста зараз… Знайшлі вялікія бярозы, спыніліся на той, якая падалей ад старога дуба стаяла. Самая вялікая. Каля яе… Я намагалася запомніць, каб потым вярнуцца і знайсці гэтае месца. Тут вёска канчаецца, тут раздарожжа… Але як запомніць? Як запомніць, калі адна бяроза на нашых вачах ужо гарыць… Як? Сталі развітвацца… Мне кажуць: “Ты першая!”. У мяне аж сэрца падскочыла, я зразумела… Што… Што ўсе ведаюць пра маё каханне… Думка скаланула: а можа, і ён ведаў? Вось… Ён ляжыць… Зараз яго апусцяць у зямлю… Закапаюць. Накрыюць пяском… Але я моцна ўсцешылася ад гэтай думкі, што, можа, ён таксама ведаў. А раптам я яму таксама падабалася? Быццам ён жывы і зараз мне адкажа… Згадала, як на Новы год ён падарыў мне нямецкую шакаладку. Я яе месяц не ела, у кішэні насіла.

Я ўсё жыццё гэта згадваю… Гэты момант… Бомбы падаюць… Ён… Ляжыць на плашч-палатцы… Гэты момант… А я ўсцешаная… Стаю і пра сябе ўсміхаюся. Вар’ятка. Цешуся, што ён, можа быць, ведаў пра маё каханне…

Падышла і пацалавала яго. Ніколі дагэтуль не цалавала мужчыну… Ён быў першы…»

*Любоў Міхайлаўна Гроздзь, санінструктарка*

## Пра адзіноту кулі і чалавека

«Мая гісторыя адметная... Малітвы мяне суцяшаюць. Малюся за сваю дзяўчынку...

Памятаю маміна прыслоўе. Яна любіла казаць: "Куля — дура, лёс — ліхадзей". Былі ў яе такія словы на кожную бяду. Куля адна, і чалавек адзін, куля ляціць куды хоча, і лёс матляе чалавекам як заўгодна. Туды-сюды, туды-сюды. Чалавек — пёрка, вераб'інае пёрка. Ніколі не ўведаеш сваёй будучыні... Нам не дадзена. Не дазволена асягнуць таямніцы. Мне цыганка варажыла, калі мы з вайны ехалі. Падышла на станцыі, адклікала ўбок... Вялікае каханне абяцала... Быў у мяне нямецкі гадзіннік, зняла яго з рукі і аддала за тое вялікае каханне. Паверыла.

А цяпер не пераплакаць мне таго кахання...

Я на вайну весела збіралася. Па-камсамольску. Разам з усімі. Ехалі мы ў таварных вагонах, на іх надпіс чорным мазутам: "Сорак людзей — восем коней". А нас напхалі сотню чалавек.

Стала снайперкай. А магла і сувязісткай быць, карысная прафесія — і ваенная, і мірная. Жаночая. Але сказалі: трэба страляць — і страляла. Лоўка страляла. Два ордэны Славы маю, чатыры медалі. За тры гады вайны.

Крыкнулі нам — Перамога! Абвясцілі — Перамога! Я помню сваё першае пачуццё — радасць. І адразу ж, у тую самую хвіліну — страх! Паніка! Паніка! Як жыць далей? Тата загінуў пад Сталінградам. Два старэйшыя браты зніклі без вестак яшчэ на пачатку вайны. Засталіся мама і я. Дзве жанчыны. Як нам жыць? Усе нашыя дзяўчаты прызадумаліся... Збяромся ўвечары у зямлянцы... Размовы ў нас адно пра тое, што жыццё толькі пачынаецца. І радасць, і страх. Раней баяліся смерці,

а цяпер жыцця… Аднолькава было страшна. Шчыра кажу! Гамана, гамана, а потым сядзім і маўчым.

Пабяромся шлюбам ці не пабяромся? Праз каханне ці без яго? На рамонках гадалі… Вяночкі ў рэчку кідалі, свечкі плавілі… Памятаю, у адной вёсцы нам паказалі, дзе жыве чарадзейка. Усе — да яе, нават некалькі афіцэраў. А дзяўчаты — усе. Яна на вадзе варажыла. Па руцэ. Іншым разам у бадзягі з катрынкай паперкі цягнулі. Білецікі. Мне шчаслівыя білецікі выпадалі… А дзе яно, маё шчасце?

Як нас сустрэла Радзіма? Без слёз не магу… Сорак гадоў мінула, а дагэтуль шчокі полымем. Мужчыны маўчалі, а жанчыны… Яны крычалі нам: "Ведаем, чым вы там займаліся! Вабілі маладымі п… нашых мужыкоў. Франтавыя б… Сучкі ваенныя…". Як толькі не абражалі… Слоўнік рускі багаты…

Праводзіць мяне хлопец з танцаў, мне раптам дрэнна-дрэнна, сэрца як затахкае. Іду-іду і сяду ў сумёт. "Што з табой?" — "Ды нічога. Натанчылася". А гэта дзве мае раны. Гэта — вайна… А трэба вучыцца быць пяшчотнай. Быць слабой і крохкай, а ногі ў ботах разнасіліся — саракавы памер. Нязвыкла, каб нехта мяне абняў. Прызвычаілася сама за сябе адказваць. Ласкавых словаў чакала, але не разумела іх. Яны мне, як дзіцячыя. На фронце сярод мужчынаў — моцны рускі мат. Да яго звыклася. Сяброўка мяне вучыла, яна ў бібліятэцы працавала: "Чытай вершы. Ясеніна чытай".

Шлюбам я пабралася хутка. Праз год. З нашым інжынерам на заводзе. Я марыла пра любоў. Хацела мець дом і сям'ю. Каб у доме маленькімі дзецьмі пахла. Першыя пялюшкі нюхала-нюхала, не магла нанюхацца. Пах шчасця… Жаночага… На вайне няма жаночых пахаў, усе яны — мужчынскія. Вайна па-мужчынску пахне.

Двое дзяцей у мяне... Хлопчык і дзяўчынка. Першы хлопчык. Харошы, разумны хлопчык. Інстытут скончыў. Архітэктар. А вось дзяўчынка... Мая дзяўчынка... Яна пачала хадзіць у пяць гадоў, першае слова “мама” сказала ў сем. У яе дагэтуль атрымліваецца не “мама”, а “мумо”, не “тата”, а “тато”. Яна... Мне ўсё яшчэ здаецца, што гэта няпраўда. Памылка нейкая. Яна ў доме для псіхічна хворых... Ужо сорак гадоў там. Калі я пайшла на пенсію, стала наведвацца да яе кожны дзень. Мой грэх...

Ужо шмат гадоў першага верасня купляю ёй новы буквар. Мы чытаем яго цэлымі днямі. Часам, калі вяртаюся ад яе дамоў, дык мне здаецца, што я развучылася чытаць і пісаць. Размаўляць. І ні ў чым гэтым я не маю патрэбы. Навошта мне гэта?

Я пакараная... За што? Можа, за тое, што забівала? І так падумаю... У старасці шмат часу... Думаю і думаю. Зранку стаю на каленях, гляджу ў акно. І прашу Бога... За ўсіх прашу... На мужа крыўды не маю, даўно яму прабачыла. Нарадзіла дачку... Ён паглядзеў на нас, пабыў трохі і сышоў. Сышоў з папрокам: “Хіба нармальная жанчына пойдзе на вайну? Навучыцца страляць? Таму ты і нармальнае дзіця нарадзіць не змагла”. Я за яго малюся...

А можа, ён і праўду кажа? Раз-пораз і так думаю... Мой грэх...

Я любіла Радзіму болей за ўсё на свеце. Я любіла... Каму цяпер гэта распавесці... Маёй дзяўчынцы... Ёй адной... Я згадваю вайну, а яна думае, што я байкі ёй баю. Дзіцячыя казкі. Страшныя дзіцячыя казкі...

Прозвішча не пішыце. Не трэба...»

*Клаўдзія С-ва, снайперка*

# «ПРА БУЛЬБУ ДРОБНЕНЬКУЮ...»

Была яшчэ адна вайна...

На гэтай вайне ніхто не пазначаў на карце, дзе праходзіць нейтральная паласа, а дзе пачынаецца лінія фронту. Ніхто не лічыў там усіх салдатаў. Адзінак зброі. Стралялі з зенітных установак, кулямётаў, паляўнічых стрэльбаў. Не было тут ратацыі асабовага складу і генеральных наступаў. Шмат хто ваяваў з уласнай волі. І паміраў сам-насам. Змагалася не армія — дывізіі, батальёны, роты, а народ — партызаны і падпольшчыкі: мужчыны, старыя, жанчыны, дзеці. Талстой называў гэты ўсеагульны парыў «дубінай народнай вайны» і «прыхаванай цеплынёй патрыятызму», а Гітлер (следам за Напалеонам) жаліўся сваім генералам, што «Расія ваюе не па правілах».

Памерці на гэтай вайне было не самае страшнае. Больш страшным было іншае. Уявім сабе салдата на фронце разам з сваёй сям'ёй — дзеці, жонка, старыя бацькі. Кожную хвіліну трэба быць гатовым іх таксама прынесці ў ахвяру. Аддаць на забой. У мужнасці, як і ў здрады, там часта не было сведкаў.

У нашых вёсках у Дзень Перамогі не радуюцца, а плачуць. Шмат плачуць. Смуткуюць. «Было так страшна... Я ўсіх родных пахавала, я пахавала на вайне душу» *(В. Г. Андросік, падпольшчыца)*.

Пачынаюць гаворку ціха, а напрыканцы амаль усе крычаць.

«Я — сведка...

Распавяду пра камандзіра нашага партызанскага атрада... Не трэба называць прозвішчы, бо жывыя яшчэ сваякі, ім будзе балюча чытаць...

Сувязныя перадалі ў атрад: сям'ю камандзіра забралі ў гестапа — жонку, дзвюх маленькіх дочак і старую маці. Усюды развешаныя абвесткі, на кірмашы раздаюць улёткі: калі камандзір не здасца, сям'ю павесяць. Тэрмін, каб падумаць, — два дні. Паліцаі ездзілі па вёсках і ладзілі сярод людзей агітацыю: чырвоныя камісары не шкадуюць нават уласных дзяцей. Яны — пачвары. Для іх няма нічога святога. Скідалі ўлёткі з самалёта над лесам... Камандзір хацеў здацца, хацеў застрэліцца. Яго не пакідалі аднаго ўвесь гэты час. Сачылі за ім. Ён мог застрэліцца.

Звязаліся з Масквой. Расказалі пра сітуацыю. Атрымалі інструкцыю... У той жа дзень сабралі ў атрадзе партыйны сход. На ім было прынятае рашэнне: не паддавацца на нямецкую правакацыю. Як камуніст, ён падначаліўся партыйнай дысцыпліне...

Праз два дні паслалі ў горад разведчыкаў. Яны прынеслі страшную вестку: усю сям'ю павесілі. У першым жа баі камандзір загінуў... Неяк незразумела загінуў. Выпадкова. Я думаю, ён хацеў памерці...

У мяне слёзы замест словаў. Як мне сябе пераканаць, што не трэба маўчаць? Як паверыць... Людзі хочуць спакойна і хораша жыць, а не слухаць мяне і пакутаваць...»
*(В. Каратаева, партызанка)*

І я сябе пераконваю, што трэба ісці далей...

## Пра кошык з мінай і плюшавую цацку

«Я выканала заданне... І ўжо не магла заставацца ў мястэчку, сышла ў партызаны. Маму праз некалькі дзён забралі ў гестапа. Брат паспеў збегчы, а маму забралі. Яе там катавалі, дапытвалі, дзе дачка. Два гады яна была

там. Два гады фашысты яе разам з іншымі жанчынамі штурхалі паперадзе сябе, калі праводзілі свае аперацыі… Яны баяліся партызанскіх мінаў і заўсёды гналі перад сабой мясцовае насельніцтва — будуць міны, гэтыя людзі загінуць, а нямецкія салдаты застануцца цэлымі. Жывы шчыт… Два гады яны так вадзілі і маю маці…

Не раз было: сядзім у засадзе і раптам бачым, як ідуць жанчыны, а за імі — немцы. Падыдуць бліжэй, і бачыш, што там твая маці. І самае страшнае — гэта чакаць, калі камандзір дасць каманду страляць. Усе са страхам чакалі гэтай каманды, таму што адзін шэпча: "Вунь мая маці", другі — "А вунь мая сястрычка", а нехта дзіцё сваё пабачыў… Мама мая заўжды хадзіла ў белай хусцінцы. Яна была высокая, яе заўсёды першай бачылі. Я сама не паспею заўважыць, мне перакажуць: "Твая мама ідзе…". Пачуеш каманду страляць — страляеш. І сама не ведаеш, куды цэліш, у галаве адно: не згубіць з вачэй белую хусцінку — ці жывая яна, ці не ўпала? Беленькая хусцінка… Усе разбягуцца, пападаюць, і не ведаеш, забітая мама ці не. Колькі дзён хаджу свая не свая, пакуль сувязныя не вернуцца з мястэчка і не скажуць, што жывая. Зноў я жыць магу. І так да наступнага разу… Мне здаецца, што цяпер я б гэтага не вытрывала… Як я іх ненавідзела… Мне дапамагала нянавісць… У мяне дагэтуль у вушах стаіць крык дзіцяці, якога кінулі ў студню. Ці чулі вы калі-небудзь такі крык? Дзіцё падае і крычыць, крычыць, як аднекуль з-пад зямлі, з таго свету. Гэта не дзіцячы крык і не чалавечы… А ўбачыць распілаванага пілой маладога хлопца… Наш партызан… І пасля гэтага, калі ідзеш на заданне, сэрца аднаго просіць: забіваць іх, забіваць як мага болей, знішчыць самым жорсткім спосабам. Калі я бачыла палонных фашыстаў, мне хацелася ўчапіцца хоць у каго. Душыць. Душыць рукамі,

грызці зубамі. Я іх не забівала б, гэта залішне лёгкая смерць. Я б не зброяй, не вінтоўкай…

Перад самым сваім адступленнем, гэта ўжо ў сорак трэцім годзе, фашысты расстралялі маю маму… А ў мяне мама была такая, яна сама нас блаславіла:

—Ідзіце, дзеці, вам трэба жыць. Чым проста паміраць, лепей не трэба проста паміраць.

Мама не казала высокіх словаў, яна знаходзіла простыя жаночыя словы. Яна хацела, каб мы жылі і вучыліся, абавязкова вучыліся.

Жанчыны, якія былі з ёй у камеры, казалі, што кожны раз, калі яе выводзілі, яна прасіла:

—Ох, бабанькі, я плачу пра адно: дапамажыце, калі памру, маім дзецям!

Пасля вайны адна з тых жанчын узяла мяне да сябе, у сваю сям'ю, хаця ў яе было двое маленькіх дзяцей. Хату нашую фашысты спалілі, малодшы брат загінуў у партызанах, маму расстралялі, бацька на фронце. Вярнуўся паранены, хворы. Пажыў нядоўга, неўзабаве памёр. Так з усёй сям'і я адна засталася. Жанчына гэтая і сама была бедная, і двое сваіх дзяцей у яе, я вырашыла сысці, куды-небудзь з'ехаць. А яна плакала і не пускала.

Калі я даведалася, што маму расстралялі, я самлела. Не знаходзіла сабе месца, мне не было супакою. Мне трэба было… Я мусіла яе знайсці… А іх расстралялі і магілу зараўнялі цяжкімі машынамі. У вялікім супрацьтанкавым рове… Мне прыблізна паказалі: дзе, у якім месцы яна стаяла, і я пабегла, капала там, варочала рукамі трупы. Я пазнала маму па пярсцёнку на руцэ… Як убачыла гэты пярсцёнак, закрычала і нічога болей не памятаю. Нічога не памятаю… Нейкія жанчыны выцягнулі яе, абмылі вадой з бляшанкі і пахавалі. Я тую бляшанку да гэтай пары берагу.

Начамі, бывае, ляжу і думаю: маці загінула праз мяне. Не, не праз мяне… Калі б я, з боязі за сваіх блізкіх, не пайшла змагацца, калі б так сама зрабіў і трэці, і чацвёрты — не было б таго, што ёсць цяпер. Але сказаць сабе… Забыць… Як ішла мая мама… Гучала каманда… І я страляла ў той бок, адкуль яна выходзіла… Яе беленькая хусцінка… Вы ніколі не зведаеце, як цяжка з гэтым жыць. І чым далей, тым цяжэй. Часам ноччу малады смех ці голас за акном, і ты здрыганешся, табе раптам падасца, што гэта дзіцячы плач, дзіцячы крык. А то раптам прачынаешся і адчуваеш, што не можаш дыхаць. Душыць пах гарэлага… Вы не ведаеце, як пахне гарэлае чалавечае цела, асабліва ўлетку. Чымсьці трывожным і салодкім. Цяпер у мяне такая праца ў райвыканкаме, што калі дзесьці пажар, дык трэба выехаць на месца, скласці пратакол. Але калі скажуць, што дзесьці загарэлася ферма, загінула жывёла, я ніколі не еду, я не здольная… Мне гэта нагадвае… Гэты пах… Як людзі гарэлі… І вось ноччу прачнешся, бяжыш па парфуму, і здаецца, што ў парфуме таксама ёсць гэты пах. Усюды…

Доўга баялася замуж выходзіць. Баялася мець дзяцей. Раптам вайна, я пайду на фронт. А як жа дзеці? Цяпер палюбіла чытаць кнігі пра жыццё пасля смерці. Што там? З кім там сустрэнуся? Хачу і баюся сустрэцца з мамай. Маладая не баялася, а пастарэла…»

*Антаніна Аляксееўна Кандрашова,*
*партызанка-разведчыца Бытошскай партызанскай брыгады*

«Першае маё ўражанне… Я ўбачыла немца… Як быццам цябе выцялі, усё цела баліць, кожная клетачка — як гэта яны тут? Нянавісць — яна была мацнейшай, чым страх за сваіх блізкіх, любых і за страх уласнай смерці.

Зразумела, мы думалі пра сваіх родных, але выбару ў нас не было. Вораг прыйшоў са злом на нашу зямлю… З агнём і мячом…

Калі, напрыклад, стала вядома, што мяне павінны арыштаваць, я сышла ў лес, да партызанаў. Сышла, пакінуўшы ў адзіноце маці… А ёй было семдзесят пяць гадоў. Мы дамовіліся, што яна прыкінецца сляпой, глухой, і яе не крануць… Вядома ж, гэта я так сябе суцяшала.

Назаўтра ж, як я пайшла, фашысты ўварваліся ў дом. Мама зрабіла выгляд, што яна сляпая, дрэнна чуе, як мы і дамаўляліся. Яны яе моцна білі, выпытвалі, дзе дачка. Мама доўга хварэла…»

*Ядвіга Міхайлаўна Савіцкая, падпольшчыца*

«Я такой да канца застануся… Такой, якімі мы былі тады. Так, наіўнай, так, рамантычнай. Да сівых валасоў… Але — гэта я!

Мая сяброўка Каця Сімакова была партызанскай сувязной. У яе дзве дзяўчынкі. Яны яшчэ невялікія, ну, колькі ім было — па шэсць-сем гадоў. Яна брала сваіх дзяўчатак за рукі, хадзіла па горадзе і запаміналa, дзе якая тэхніка стаіць. Пакліча яе вартавы, яна адкрые рот, як нейкая дурніца. Так некалькі гадоў… Маці ахвяравала сваімі дзецьмі…

Яшчэ ў нас была Зажарская, а ў яе — дачка Валерыя. Дзяўчынцы сем гадоў. Аднойчы прыдумалі падарваць сталоўку. Мы вырашылі закласці міну ў печ, але яе трэба было пранесці. І Зажарская сказала, што міну пранясе яе дачка. Паклала ў кошык міну, а зверху некалькі дзіцячых касцюмчыкаў, плюшавую цацку, два дзясяткі яек і масла. І так гэтая дзяўчынка пранесла ў сталовую міну. Кажуць: мацярынскі інстынкт мацнейшы за ўсё.

Не, ідэя мацнейшая! І вера мацнейшая! Я так думаю… Я нават у гэтым пэўная, бо каб не было такой мамы, такой дзяўчынкі, і яны не пранеслі гэтую міну, то мы б і не перамаглі. Так, жыццё — гэта добра. Гэта цудоўна. Але ёсць рэчы даражэйшыя…»

*Аляксандра Іванаўна Храмава, сакратарка Антопальскага падпольнага райкама партыі*

«Былі ў нас у атрадзе браты Чымукі… Яны трапілі ў сваёй вёсцы на засаду, адстрэльваліся ў нейкім хляве, іх падпалілі. Пакуль не скончыліся патроны, яны стралялі… Потым выйшлі абпаленыя… Іх вазілі на падводзе, паказвалі, каб хто прызнаў, чые яны. Каб нехта выдаў…

Уся вёска стаяла. Стаялі іх бацька і маці, ніхто ні слова не прамовіў. Якое сэрца трэба было мець маці, каб не ўскрыкнуць. Не адгукнуцца. Але яна ведала, калі заплача, тады ўсю вёску спаляць. Заб'юць не яе адну. Усіх заб'юць. За аднаго забітага нямецкага салдата палілі ўсю вёску. Яна ведала… За ўсё ёсць узнагарода, але ніякай не хопіць, самай высокай Зоркі Героя мала дзеля гэтай маці…»

*Паліна Каспяровіч, партызанка*

«У партызаны мы прыйшлі ўдзвюх з мамай… Яна мыла для ўсіх, гатавала. Трэба — і на варце стаяла. Аднойчы я была на заданні, а маме перадалі, што мяне павесілі. Калі я праз колькі дзён вярнулася, мама як убачыла мяне, дык яе адразу спаралізавала, некалькі гадзінаў не магла гаварыць. І ўсё гэта трэба было перажыць…

Мы падабралі па дарозе жанчыну, яна была непрытомная. Не магла ісці, паўзла і думала, што ўжо мёртвая. Чула, што кроў па ёй цячэ, але думала, што гэта яна адчувае на тым свеце, а не на гэтым. І калі мы яе

раскатурхалі, яна прыйшла ў сябе і распавяла, як іх расстрэльвалі, гналі на расстрэл яе і пяцёра дзяцей з ёй. Пакуль ішлі да хлява, дзяцей забівалі… Стралялі і пры гэтым рагаталі… Застаўся апошні хлопчык, немаўля. Фашыст паказвае: падкідвай, я буду страляць. Маці кінула немаўля так, каб забіць яго самой… Сваё дзіця… Каб немец не паспеў стрэліць… Яна казала, што не хоча жыць, не можа пасля ўсяго жыць на гэтым свеце, толькі на тым… Не хоча…

Я не хацела забіваць, я не нарадзілася, каб забіваць. Я хацела быць настаўніцай. Але я ўбачыла, як палілі вёску… Я не магла крыкнуць, я не магла гучна плакаць: мы ішлі ў разведку і якраз апынуліся ля гэтай вёскі. Я магла толькі грызці сабе рукі, у мяне на руках засталіся шнары з той пары, я грызла да крыві, да мяса. Памятаю, як крычалі людзі… Крычалі каровы… Крычалі куры… Мне здавалася, што ўсё крычыць чалавечым голасам. Усё жывое. Гарыць і крычыць.

Гэта не я гавару, гэта гора маё прамаўляе…»

*Валянціна Міхайлаўна Ількевіч,*
*партызанская сувязная*

«Мы ведалі… Усе ведалі, што мы мусім перамагчы…

Людзі думалі, што бацьку пакінулі, маўляў, у яго быў загад ад райкама партыі. Ніхто яго не пакідаў, ніякага задання. Мы самі вырашылі змагацца. Я не памятаю, каб у нашай сям'і была паніка. Было вялікае гора — гэта так, але панікі не было, мы верылі, што перамога будзе абавязкова. У першы дзень, калі немцы апынуліся ў нашай вёсцы, татаграў увечары на скрыпцы "Інтэрнацыянал". Яму хацелася нешта такое зрабіць. Нейкі пратэст…

Два месяцы прамінула ці тры… Ці…

Гэта быў габрэйскі хлопчык... Немец прывязаў яго да ровара, і той бег за ім, як сабачка: "Шнэль! Шнэль!". Едзе і рагоча. Малады немец... Хутка яму надакучыла, ён злез з ровара і паказвае хлопчыку: апускайся на каленкі... На карачкі... І паўзі, як сабачка... Скачы... "Хундзік! Хундзік!" Кінуў палку: прынясі! Хлопчык падхапіўся і прынёс палку ў руках. Немец раззлаваўся... Стаў яго біць. Лаяць. Паказвае: скачы на карачках і прынясі ў зубах. Хлопчык у зубах прынёс...

Гадзіны дзве немец забаўляўся з гэтым хлопчыкам. А потым зноў прывязаў яго да ровара, і яны выправіліся назад. Хлопчык бег, як сабачка... У бок гета...

А вы пытаеце: чаму мы пачалі змагацца? Чаму навучыліся страляць...»

*Валянціна Паўлаўна Кажамякіна, партызанка*

«Як забыць... Параненыя елі лыжкамі соль... Перад шэрагам называлі прозвішча, баец ступае наперад і падае разам з вінтоўкай ад слабасці. Ад голаду.

Народ нам дапамагаў. Каб не дапамагаў, то партызанскі рух не мог бы існаваць. Народ разам з намі ваяваў. Іншы раз са слязьмі, але ўсё-такі аддаюць:

—Дзетачкі, разам будзем гараваць. Перамогу чакаць.

Апошнюю дробненькую бульбу адкладуць, адрэжуць хлеба. У лес нам мяхі збяруць. Адзін кажа: "Я стольki дам", другі — "Стольki". — "А ты, Іван?" — "А ты, Маруся?" — "Як усе, так і я, але ў мяне ж дзеці".

Што мы без насельніцтва? Цэлае войска ў лесе, аднак без іх мы б загінулі, яны ж аралі, сеялі, дзяцей і нас падтрымлівалі, апраналі ўсю вайну. Ноччу аралі, пакуль не страляюць. Згадваецца, як прыйшла ў адну вёску, а там хаваюць старога чалавека. Яго ноччу забілі. Жыта

сеяў. Так сціснуў зярняткі ў руцэ, што выпрастаць пальцы не змаглі. З зернем пахавалі…

У нас зброя, мы маглі абараніцца. А яны? За тое, што хлеба далі партызану, — расстрэл, я пераначавала і пайшла, а калі хто данясе паліцаям, што я ў гэтай хаце начавала, — ім усім расстрэл. А там жанчына адна, без мужа, а з ёй трое маленькіх дзяцей. Яна ж не праганяла нас, калі прыйдзем, і печку напаліць, і памые… Апошнім падзеліцца: "Ешце, хлопчыкі". А бульба ўвесну дробненькая-дробненькая, як гарошыны. Мы ямо, а дзеці на печцы сядзяць, плачуць. Бо гарошынкі гэтыя апошнія…»

*Аляксандра Нікіфараўна Захарава,*
*партызанскі камісар дзвесце дваццаць*
*пятага палка Гомельскай вобласці*

«Першае даручэнне… Прынеслі мне лістоўкі. Я зашыла іх у падушку. Мама слала пасцель і намацала. Распарола падушку і ўбачыла тыя лістоўкі. Стала плакаць. "Ты сябе пагубіш і мяне". Але потым сама дапамагала.

Да нас часта завітвалі партызанскія сувязныя. Распрагуць коней, зойдуць. Што вы думаеце, суседзі не бачылі? Бачылі і здагадваліся. Я казала, што гэта ад брата, з вёскі. Але ўсе добра ведалі, што ў мяне ніякага брата ў вёсцы няма. Я ім удзячная, я ўсёй нашай вуліцы мушу пакланіцца. Аднаго слова было дастаткова, каб мы загінулі, уся сям'я. Варта было толькі пальцам тыцнуць у наш бок. Але ніхто… Ніводзін чалавек… У вайну я так палюбіла людзей, што ніколі ўжо не змагу іх разлюбіць…

Пасля вызвалення… Іду па вуліцы і азіраюся: ужо не магла не палохацца, не магла спакойна хадзіць. Іду і машыны лічу, на вакзале цягнікі… Доўга адвыкала…»

*Вера Рыгораўна Сядова, падпольшчыца*

«Я ўжо плачу… Слёзы пацяклі…

Зайшлі мы ў хату, а там нічога няма. Дзве голыя габляваныя лаўкі і стол. Нават кубка, здаецца, не было — вады напіцца. Усё ў людзей забралі. І толькі абраз у куце, і ручнік на ім вісіць.

Сядзяць дзед з бабуляй. Адзін наш партызан зняў боты, анучы такія рваныя, ён імі ногі абгарнуць ужо не можа. А дождж, а гразішча, а боты рваныя. І вось гэтая бабуля ідзе да абраза, здымае ручнік і дае яму: “Дзетка, а як жа ты пойдзеш?”.

А болей нічога ў гэтай хаце няма…»

*Вера Сафронаўна Давыдава, партызанка*

«У першыя дні… Падабрала я за вёскай двух параненых… Адзін быў паранены ў галаву, у другога салдата — аскепак у назе. Сама гэты аскепак выцягнула, а рану заліла газай — не знайшла нічога іншага. А я ўжо ведала… Пра газу, што яна дэзінфікуе…

Выхадзіла іх, падняла на ногі. Спачатку адзін пайшоў у лес, потым другі. Апошні, калі сыходзіў, — мне ў ногі. Хацеў мне ногі цалаваць:

—Сястрычка мілая! Ты ж мне жыццё ўратавала.

Не было ні імя, нічога. Толькі — сястра, брат.

Бабы збяруцца ўвечары ў мяне ў хаце:

—Кажуць немцы, што Маскву ўзялі.

—Ніколі!

З гэтымі ж бабамі мы падымалі пасля вызвалення калгас, мяне прызначылі старшынёй. Было яшчэ ў нас чатыры дзяды і пяць хлопчыкаў дзесяці-трынаццаці гадоў. Гэта мае ратаі. Было дваццаць коней, у іх καροста, іх трэба лекаваць. Не было ні колаў, ні хамутоў. Рыдлёўкамі бабы зямлю падымалі, на каровах і быках баранавалі, бычкам хвасты паадкручвалі, яны лягуць,

і іх не падняць. Хлопчыкі дзень барануюць, а ўвечары торбачкі свае развяжуць, ва ўсіх ежа аднолькавая — праснакі. Вы і не ведаеце, што гэта такое. Семя шчаўя, абаротнік… Не чулі? Такая трава ёсць. Канюшыну шчыпалі. І ўсё гэта таўклі ў ступе. І пяклі гэтыя праснакі. Такі хлеб… Горкі-горкі…

Увосень прыйшла разнарадка: пяцьсот восемдзесят кубаметраў лесу паваліць. З кім? Узяла свайго хлопчыка дванаццаці гадоў і дзяўчынку дзесяці гадоў. І іншыя бабы так зрабілі. Здалі мы гэты лес…»

*Вера Мітрафанаўна Талкачова,*
*партызанская сувязная*

Распавядаюць Восіп Георгіевіч Васюкевіч і яго дачка Марыя, у вайну партызанскія сувязныя атрада імя Петракова брыгады імя Ракасоўскага:

*Восіп Георгіевіч:*

—Усё аддаў дзеля перамогі… Самае роднае. Сыны мае ваявалі на фронце. Двух пляменнікаў расстралялі за сувязь з партызанамі. Сястру маю, іх маці, фашысты спалілі. У яе хаце… Людзі пераказвалі, што пакуль дым не схаваў, стаяла яна роўненька, як свечка, і абраз трымала. Пасля вайны: сонца садзіцца, а мне здаецца, нешта гарыць…

*Марыя:*

—Я была дзяўчынка, трынаццаць гадоў. Я ведала, што бацька дапамагае партызанам. Разумела. Прыходзілі нейкія людзі ноччу. Нешта забіралі, штосьці пакідалі. Часта бацька браў з сабой мяне, пасадзіць на воз: «Сядзі і не падымайся з гэтага месца». Калі прыедзем куды трэба, ён выме адтуль зброю ці лістоўкі.

Потым стаў мяне пасылаць да станцыі. Навучыў, што трэба запамінаць. Я неўпрыкмет схаваюся за кустамі і да ночы там, лічу, колькі цягнікоў прамінула. Запамінаю, што вязуць, яно бачна: розная зброя, танкі ці салдаты едуць. Два-тры разы на дзень немцы прастрэльвалі кусты.

—А ці не страшна было?

—Я маленькая, праслізну заўсёды так, што мяне ніхто не заўважыць. А той дзень… Я добра запомніла… Бацька два разы спрабаваў выехаць з хутара, дзе мы жылі. Пад лесам чакалі партызаны. Два разы выязджаў і два разы яго вярталі патрулі. Насунуліся прыцемкі. Кліча мяне: «Марыйка…». А маці ўголас: «Не пушчу дзіця!». Цягне мяне ад бацькі…

Але я пабегла праз лес, як ён сказаў. Я там усе сцежкі на памяць ведала, што праўда, цемры баялася. Партызанаў знайшла, яны чакалі, усё перадала, што бацька сказаў. А калі вярталася назад, ужо віднець пачало. Як абмінуць нямецкія патрулі? Кружляла па лесе, кружляла, і правалілася ў возера, бацькаў пінжак, боты — усё патанула. З палонкі выкараскалася… Бегла па снезе басанож… Захварэла, і як злегла, дык з ложка ўжо і не паднялася. Ногі адняліся. Дактароў і лекаў тады не было. Мама лекавала адварамі з траваў. Гліну прыкладала…

Пасля вайны павезлі да дактароў. Але ўжо было позна. Засталася я ляжаць… Магу пасядзець, але нядоўга, ляжу і гляджу ў акно… Вайну згадваю…

*Восіп Георгіевіч:*

—Я яе на руках нашу… Сорак гадоў. Як дзіця малое… Два гады таму памерла жонка. Усё, сказала мне, даравала. Грахі маладыя… Усе… А Марыйку не даравала. Па вачах зразумеў… А я паміраць баюся, тады

Марыйка адна застанецца. Хто яе на руках панясе? Хто перахрысціць на ноч? Бога папросіць…

## Пра мамак і татак

Вёска Ратынцы Валожынскага раёна Мінскай вобласці. Гадзіна дарогі ад сталіцы. Звычайная беларуская вёска — драўляныя хаты, кветкі пад вокнамі, пеўні і гусі на вуліцы. Дзеткі ў пяску. Старыя жанчыны на лаўках. Я прыехала да адной з іх, а сабралася ўся вуліца. Загаварылі. Загаманілі ў адзін голас.

Кожная пра сваё, а разам пра адно і тое самае. Пра тое, як аралі, сеялі, хлеб партызанам пяклі, як дзетак аберагалі, хадзілі да варажбітак і цыганак, разгадвалі сны і прасілі Бога заступіцца. Чакалі з вайны мужыкоў.

Занатавала першыя тры прозвішчы: Алена Адамаўна Вялічка, Юсціна Лук'янаўна Грыгаровіч, Марыя Фёдараўна Мазура. А далей ужо немагчыма было расчуць сярод плачу…

«Ах, дачушка мая! Залатая мая, не люблю я Дзень Перамогі. Плачу! Ой, плачу! Як згадаю, усё яно вяртаецца. Шчасце за гарамі, а бяда за плячамі…

Спалілі нас немцы, забралі ўсё да зернейка. Засталіся мы на адным шэрым камені. Вярнуліся з лесу, нічога няма. Толькі каты цягаюцца. Што елі? Улетку пайду ягадаў, грыбоў назбіраю. У мяне поўная хата дзяцей.

А скончылася вайна, у калгас пайшлі. І жала, і касіла, і малаціла. Плуг на сабе цягала замест коней. Коней не было, і іх забілі. Сабак пастралялі. Мама мая так казала: калі памру, не ведаю, што з душой будзе, а рукі — дык адпачнуць. Дзяўчынцы маёй дзесяць гадоў было, яна са

мной жала. Брыгадзір прыехаў паглядзець, як такая малая і да вечара норму зробіць. А мы жнём і жнём, сонца за лес коціцца, а нам каб яно вышэй паднялося. Нам дня замала. Па дзве нормы рабілі. А плаціць нам нічога не плацілі, адно птушачкі на працадні ставілі. Ходзіш усё лета ў поле, а ўвосень меха мукі не атрымаеш. На адной бульбачцы дзяцей падымалі…»

«Вось і скончылася вайна. І засталася я адна. Я карова, я і бык, я і баба, і мужык. Аёй-аёй…»

«Вайна-бяда… У маёй хаце адно дзеці. Ні лаўкі, ні куфэрка. Агалелі зусім. Жалуды елі, увесну траву… Пайшла мая дзяўчынка ў школу, толькі тады я ёй першыя чаравічкі купіла. Яна ў іх спаць клалася, не хацела здымаць. Во як жылі! Жыццё канчаецца, а ўспомніць няма чаго. Адна вайна…»

«Чуткі пайшлі, што ў мястэчка прыгналі нашых палонных, хто пазнае там свайго, можа забраць. Падняліся, пабеглі нашы бабы! Увечары хто свайго, хто чужога прывёў, і такое апавядаюць, што немагчыма паверыць: гніюць людзі жывымі, з голаду паміраюць, на дрэвах усе лісты абскублі… Траву жуюць… Карэньчыкі з зямлі калупаюць… Пабегла я на другі дзень, свайго не знайшла, думаю, сына каму-небудзь уратую. Прыгляну́ўся мне адзін чарнявенькі, Сашко звалі, як цяпер майго ўнучка. Яму гадоў васямнаццаць… Дала немцу сала, яек, бажуся: "Брат". Хрышчуся. Прыйшлі мы дахаты, ён аднаго яйка не з'есць, такі слабы. Месяц не пабылі гэтыя людзі ў нас, і знайшоўся гад. Жыў, як усе, жанаты, двое дзяцей… Пайшоў у камендатуру і паказаў, што мы чужых узялі. Назаўтра немцы прыехалі на матацыклах.

Просім, на калені падаем, а яны падманулі, што адвязуць іх бліжэй да дому. Я Сашку касцюм дзедаў аддала… Думала, ён будзе жыць…

А іх вывелі за вёску… І паклалі з аўтаматаў… Усіх. Да аднаго… Яны ж маладыя-маладыя, харошыя! І мы вырашылі, у каго яны былі — дзевяць чалавек, іх пахаваць. Упяцёх з ямы выцягваюць, а чацвёра азіраюцца, каб немцы не наскочылі. Рукамі нельга, самая спякота, а яны чатыры дні ляжалі… І рыдлёўкамі пасекчы баімся… На абрус пакладзеш і цягнеш. І ваду пырскалі, і насы завязвалі. Каб самім не зваліцца… Магілку адну ў лесе выкапалі, паклалі ў шэраг… Прасцінамі галовы панакрывалі… Ногі…

Год мы не сціхалі, плакалі па хлопцах. І кожная думала: а дзе мой мужык ці сын? Ці жывыя яны? Бо з вайны яшчэ дачакаешся, а з пясочку ўжо ніколі… Аёй-аёй…»

«Муж у мяне быў харошы, добры. Мы з ім паспелі пажыць толькі паўтара гадочка. Калі ён пайшоў, я дзіцё пад грудзямі насіла. Але ён дзяўчынку не дачакаўся, без яго нарадзіла. Ён улетку пайшоў, а я ўвосень нарадзіла.

Яшчэ яе каля грудзей трымала, без малога гадок. Сяджу на ложку, кармлю… Стук у акно: "Лена, паперку прынеслі… На мужыка твайго…". (Гэта бабы паштара не пусцілі, самі прыйшлі сказаць.) А я як стаяла, як дзяўчынку трымала, так малако з мяне і пырснула, аж на зямлю. Дачка як заенчыць — гэтак спалохалася. Цыцку маю больш не ўзяла. Гэта якраз у вербную суботу мне сказалі. У красавіку… Ужо сонейка прыгрэла… У паперцы прачытала, што загінуў мой Іван у Польшчы. Пад горадам Гданьскам яго магілка. Загінуў сямнаццатага сакавіка сорак пятага года… Такая маленькая танюсенькая паперчына… Ужо мы Перамогу чакалі,

вось-вось нашыя мужыкі вернуцца. Сады пачыналі квітнець…

Дзяўчынка мая пасля пярэпалаху доўга хварэла, пакуль у школу не пайшла. Дзвярыма грукнуць ці крыкне хто — яна ўжо хворая. Плача начамі. Я доўга з ёй пакутавала, напэўна, сем гадоў сонца не бачыла. Увачччу ў мяне было чорна.

Сказалі — Перамога! Сталі мужыкі да хатаў вяртацца. Але вярнулася меней, чым мы выправілі. Меней за палову. Брат мой Юзік прыйшоў першым. Праўда, скалечаны. І ў яго была такая ж дзяўчынка, як мая. Чатыры годзікі, потым пяць… Мая дзяўчынка гуляць да іх бегала, а аднойчы вярнулася і плача: "Не пайду да іх". — "А чаго ж ты плачаш?" — пытаю. "Волечку (а іх дзяўчынку Вольгай звалі) татка на каленкі садзіць, шкадуе. А ў мяне таткі няма. У мяне толькі мамка". Абняліся мы…

І так гады два-тры. Прыбяжыць з вуліцы да мяне: "Я ў хаце пагуляю? А то татка будзе ісці, а я з іншымі дзецьмі на вуліцы, ён мяне не пазнае. Ён жа мяне не бачыў". Не магу выгнаць з хаты на вуліцу да дзяцей. Цэлымі днямі дома сядзела. Татку чакала. А татка наш не вярнуўся…»

«Мой, як сыходзіў на вайну, дык моцна плакаў, што дзяцей малых пакідае. Жаліўся. А дзеці такія маленькія, яны яшчэ нават не разумелі, што ў іх татка ёсць. І галоўнае — хлопчыкі ўсе. Самага меншага яшчэ на руках насіла. Ён яго як схапіў, як прытуліў да сябе. Я бягу за ім, ужо крычаць: "У калону станаві-і-ісь!". А ён адпусціць дзіця не можа, у калону з ім становіцца… Вайсковец на яго крычыць, а ён дзіцятка слязьмі абмывае. Усе пялюшкі былі мокрыя. Беглі мы з дзецьмі за ім аж за вёску, яшчэ кіламетраў з пяць беглі. А з намі і іншыя бабы. Дзеці мае

ўжо падаюць, і я гэтага маленькага ледзьве нясу. А Валодзя, гэта мой мужык, азіраецца, і я бягу і бягу. Апошняя засталася... Дзяцей недзе на дарозе кінула. Толькі з маленькім яго даганяю...

А праз год атрымала паперку: загінуў ваш муж Уладзімір Рыгоравіч у Германіі пад самым Берлінам. Я і магілкі яго не бачыла. Адзін сусед вярнуўся, зусім здаровы, другі вярнуўся без нагі. Такі жаль мяне ахапіў: хай бы і мой вярнуўся, хай бы без ног, толькі б жывы. Я б на руках яго насіла...»

«У мяне трое сыночкаў засталося... І снапы на сабе цягала, і дровы з лесу, і бульбачку, і сена. Усё сама... Плуг саматугам, на гарбе сваім, валаку і барану. А што рабіць? У нас праз хату-дзве — удава ці салдатка. Пазаставаліся мы без мужыкоў. Без коней. Коней таксама на вайну пазабіралі. Дык я... Я яшчэ ў перадавіках хадзіла. Дзве ганаровыя граматы мне далі, а адзін раз нават дзесяць метраў паркалю. Во радасць была! Маім хлопчыкам, усім тром, кашулі пашыла...»

«Пасля вайны... Сыны тых, хто загінуў, толькі падымаліся. Выраслі. Трынаццаць-чатырнаццаць гадкоў хлопчыкам, а яны ўжо думалі, што дарослыя. Хацелі жаніцца. Мужыкоў няма, а бабы ўсе маладыя...

І вось калі б сказалі: аддай кароўку — і вайны не будзе. Аддала б! Каб мае дзеці не зведалі таго, што мне было. Днюю і начую, а бяду сваю чую...».

«Зірну ў акно, дык быццам ён сядзіць... Бывае, пад вечар нешта падасца... Я ўжо старая, а яго заўсёды маладым бачу. Такім, якім яго выпраўляла. Калі прысніцца, дык таксама малады. Там і я маладая...

Бабам усім пахаванкі прыслалі, а ў мяне паперка — "знік без звестак". Сінім чарнілам напісана. Першыя дзесяць гадоў чакала кожны дзень. Ды і цяпер чакаю. Пакуль чалавек жыве, на ўсё можна спадзявацца...»

«А як бабе адной жыць? Чалавек прыйшоў, дапамог мне ці не дапамог... Адна халера. Кожны слова кіне... Людзі нагаварыліся, сабакі набрахаліся... Але паглядзеў бы мой Іван на сваіх пяцёра ўнукаў. Я іншым разам стану каля яго партрэта, фотаздымкі іх пакажу. Паразмаўляю з ім...»

«Аей-аей-аей... Божухна наш... Міласэрны...»

«Сніла я адразу пасля вайны сон: выходжу на падворак, а там мой ходзіць... У вайсковым... І так кліча мяне, гукае. Выскачыла я з-пад коўдры, расхінула акно... Ціха-ціха. Нават птушак не чуваць. Спяць. Ветрык лістамі варушыць... Пасвіствае... Зранку ўзяла дзясятак яек і пайшла да цыганкі. "Яго ўжо няма, — кінула яна карты. — Не чакай марна. Гэта яго душа каля хаты блукае". А мы з ім праз любоў сышліся. Праз вялікую любоў...»

«Мяне адна варажбітка навучыла: "Заснуць усе. Надзень чорную хустку ды сядай каля вялікага люстэрка. І ён адтуль з'явіцца... Дакранацца не трэба ні да яго, ні да ягонага адзення. Толькі размаўляй з ім...". Я ўсю ноч праседзела... Пад самы ранак з'явіўся... Нічога не казаў, маўчаў і слёзы цяклі. Разы тры так прыходзіў. Паклічу — прыйдзе. Плача. І я перастала яго вярэдзіць. Шкадую...»

«І я са сваім сустрэчы чакаю. Дзень і ноч буду яму распавядаць. Мне ад яго нічога не трэба, адно — хай паслухае. Ён, пэўна, там таксама пастарэў. Як і я...»

«Мая ты зямелька… Капаю бульбачку, буракі… Вось ён недзе там, і я хутка да яго прыйду… Сястра мне кажа: “Ты не ў зямлю, а на неба глядзі. Над сабой. Яны — там”. Вось мая хатка… Побач… Заставайся ў нас. Пераначуеш, больш пачуеш. Кроў не вада, праліваць шкада, а яна льецца. Я па тэлевізары бачу… Кожны дзень…

Можаш і не пісаць пра нас… А лепш запомні… Вось мы з табой разам пагаварылі. Паплакалі. І ты, калі развітаешся з намі, азірніся на нас і на нашыя хаты. Не адзін раз азірніся, як чужая, а два. Як свая. І больш нічога не трэба. Азірніся…»

## Пра маленькае жыццё і вялікую ідэю

«Я заўсёды верыла… Я верыла Сталіну… Верыла камуністам. Я сама была камуністкай. Верыла ў камунізм. Жыла дзеля гэтага, выжыла дзеля гэтага. Пасля даклада Хрушчова на XX з’ездзе, калі ён сказаў пра памылкі Сталіна, я захварэла, злегла ў ложак. Я не магла даць веры, што гэта праўда. У вайну я таксама крычала: “За Радзіму! За Сталіна!”. Мяне ніхто не змушаў… Я верыла… Гэта маё жыццё…

Вось яно…

У партызанах ваявала два гады… У апошнім баі мяне параніла ў ногі, я страціла прытомнасць, а мароз быў моцны, калі ачуняла, зразумела, што памарозіла рукі. Цяпер жывыя, харошыя рукі, а тады чорныя… І ногі, вядома, таксама былі абмарожаныя. Калі б не мароз, можа быць, ногі атрымалася б ўратаваць, але яны былі ў крыві, і я доўга ляжала. Калі знайшлі мяне, паклалі разам з іншымі параненымі, звезлі ў адно месца, шмат нас, а тут немцы зноў акружаюць. Атрад адступае…

Прарываецца… Нас, як дровы, на сані пакідалі. Не было калі глядзець, шкадаваць, усіх адвозяць глыбей у лес. Хаваюць. Так адвозілі і адвозілі, а потым паведамілі ў Маскву пра мяне. Я ж была дэпутатам Вярхоўнага Савета. Вялікі чалавек, мной ганарыліся. А я з самага нізу, простая сялянка. З сялянскай сям'і. Я рана ўступіла ў партыю…

Ног не стала… Ногі адрэзалі… Ратавалі мяне там жа, у лесе. Аперацыя была ў самых прымітыўных умовах. Паклалі на стол апераваць, і нават ёду не было, звычайнай пілой адпілоўвалі ногі, абедзве. Паклалі на стол, і няма ёду. За шэсць кіламетраў у іншы атрад паехалі па ёд, а я ляжу на стале. Без наркозу. Без… Замест наркозу — бутэлька самагонкі. Нічога не было, акрамя звычайнай пілы… Сталярнай…

Звязаліся з Масквой, каб прыслалі самалёт. Самалёт тройчы прылятаў, пакружыць-пакружыць, а сесці не можа. Усюды стралялі. На чацвёрты раз сеў, але ў мяне абедзве нагі ўжо былі ампутаваныя. Потым у Іванаве і ў Ташкенце чатыры разы рабілі рэампутацыю — чатыры разы зноў пачыналася гангрэна. Па кавалку кожны раз рэзалі, і атрымалася — вельмі высока. Першы час плакала… Скавытала… Уяўляла, як па зямлі буду поўзаць, хадзіць не змагу, а буду поўзаць. І сама не ведаю, што мне дапамагло, утрымала… Як я сябе пераканала… Што праўда, добрых людзей сустрэла. Шмат добрых людзей. У нас быў хірург, сам застаўся без ног, ён казаў пра мяне, гэта іншыя дактары перадалі: "Я схіляюся перад ёю. Я стольківі мужчынаў апераваў, але такіх не бачыў. Не ўскрыкне". Я трымалася… Я звыклася быць на людзях моцнай…

Потым прыехала назад, у Дзісну. Свой гарадок. Вярнулася з мыліцамі.

Гэта я цяпер дрэнна рухаюся, бо старая, а тады бегала па горадзе і ўсюды пешшу. На пратэзах бегала. І ў калгасы ездзіла. Далі мне пасаду намесніцы старшыні райвыканкама. Сур'ёзная праца. У кабінеце не сядзела. Усё па вёсках, па палях. Нават крыўдавала, калі палёгку рабілі. Граматных калгасных старшыняў у тую пару было няшмат, і калі якая адказная кампанія, пасылалі на месца прадстаўнікоў з раёна. І вось па панядзелках выклікалі нас у райкам і давалі заданне, каму куды. Гляджу зранку ў акно — усе ідуць і ідуць да райкама, а да мяне не тэлефануюць. І мне неяк балюча, бо хацелася быць як усе.

І нарэшце званок, тэлефануе першы сакратар: "Фёкла Фёдараўна, зайдзіце". Якая я тады шчаслівая, хоць мне вельмі і вельмі цяжка было ездзіць па вёсках, мяне пасылалі і за дваццаць, і за трыццаць кіламетраў, дзе, бывала, пад'едзеш, а дзе і пешкі. Іду праз лес, звалюся, а падняцца не магу. Сумку падкладу, каб абаперціся, ці за дрэўца ўчаплюся, падымуся і далей іду. А пенсію атрымлівала, магла б жыць дзеля сябе, для адной сябе. Але я хацела жыць дзеля іншых. Я ж камуністка…

Нічога ў мяне свайго няма. Толькі ордэны, медалі і ганаровыя граматы. Дом дзяржава пабудавала. Дом вялікі, бо дзяцей у ім няма, вось ён і здаецца такім вялікім… А столь такой высокай… Жывём удзвюх з сястрой. Яна — мая сястра, мая мама, мая нянька. Я цяпер старая… Сама зранку не падымуся…

Жывём удзвюх, жывём мінулым. У нас — прыгожае мінулае. Цяжка жылі, але прыгожа і шчыра, і мне за сябе не крыўдна. За сваё жыццё… Я жыла сумленна…»

*Фёкла Фёдараўна Струй,*
*партызанка*

«Нас час зрабіў такімі, якімі мы былі. Паказалі сябе. Болей такога не будзе. Не паўторыцца. А тады — ідэя наша была маладая, і мы маладыя. Ленін памёр нядаўна. Сталін жывы… З якім гонарам я насіла піянерскі гальштук. Камсамольскі значок…

І вось — вайна. І вось мы такія… Натуральна, у нас у Жытоміры хутка сфармавалася падполле. Я была там ад пачатку, гэта нават не абмяркоўвалася: ісці ці не ісці, страшна ці не страшна. Пытання не было…

Праз некалькі месяцаў нашу падпольную групу высачылі. Дакладней, нам здрадзілі. Мяне схапіла гестапа. Канешне, гэта было страшна. Для мяне нават страшней, чым памерці. Я баялася катавання. Катавання баялася… А раптам не вытрываю? Кожны з нас пра гэта думаў… Сам-насам… Я, прыкладам, дрэнна трываю хоць які боль… Але мы яшчэ не ведалі сябе, не ведалі, якія мы моцныя…

На апошнім допыце, пасля якога я трэці раз трапіла ў расстрэльны спіс, у трэцяга па ліку следчага, што казаў, быццам ён гісторык паводле адукацыі, было так… Гэты фашыст хацеў зразумець, чаму мы такія людзі, чаму для нас такія важныя нашыя ідэі. “Жыццё вышэйшае за ідэю”, — казаў ён. Я, натуральна, не пагаджалася з гэтым, ён крычаў, біў. “Што? Што змушае вас быць такімі? Спакойна прымаць смерць? Чаму камуністы лічаць, што камунізм мусіць перамагчы ва ўсім свеце?” — пытаўся. Ён выдатна размаўляў па-руску. І я вырашыла яму ўсё сказаць, бо ведала — усё роўна заб’юць, дык хоць не задарма, хай ведае, якія мы моцныя. Каля чатырох гадзінаў ён дапытваў, а я адказвала, як ведала, наколькі паспела вывучыць марксізм-ленінізм у школе і ўніверсітэце. О, што з ім рабілася! Хапаўся за галаву, бегаў па пакоі, спыняўся як укапаны і глядзеў-глядзеў на мяне, але ўпершыню не біў…

Я стаяла перад ім... Палова валасоў у мяне вырваная, а да гэтага былі дзве тоўстыя касы. Галодная... Спачатку марыла: каб кавалачак хлеба маленькі-маленькі, потым — ну, хаця б скарыначку, затым — хай бы хоць крышачку знайсці... Я перад ім стаю такая... Вочы гараць... Ён слухаў доўга мяне. Слухаў і не біў... Не, яшчэ не спалохаўся, яшчэ толькі сорак трэці год. Але ўжо нешта адчуў... нейкую небяспеку. Захацеў даведацца — якую? Я яму адказала. Але калі мяне адвялі ў камеру, запісаў на расстрэл...

Ноччу перад расстрэлам я згадвала сваё жыццё, сваё кароткае жыццё...

Мой самы шчаслівы дзень, калі бацька з маці, ад'ехаўшы пад бомбамі некалькі дзясяткаў кіламетраў ад горада, вырашылі вярнуцца. Не сыходзіць. Застацца дома. Я ведала — мы будзем змагацца. Нам здавалася, што так хутка прыйдзе перамога. Абавязкова! Першае, што мы пачалі рабіць, — гэта шукалі і ратавалі параненых. Яны ляжалі на полі, у траве, у канавах, у хлеў запаўзуць да каго-небудзь. Я выйшла накапаць зранку бульбы і аднаго знайшла на нашым агародчыку. Ён паміраў. Малады афіцэр... У яго не было нават моцы сказаць сваё імя. Шаптаў нейкія словы... Не зразумець... Я памятаю свой адчай. Але мне здаецца, што ніколі я не была такой шчаслівай, як у тыя дні... Я займела бацькоў другі раз. Да гэтага я была пэўная, што мой тата далёкі ад палітыкі, а ён быў беспартыйны бальшавік. Мая мама — малапісьменная вяскоўка, яна верыла ў Бога. Яна malілася ўсю вайну. Але як? Падала перад абразом на калені: "Выратуй народ! Выратуй Сталіна! Выратуй камуністычную партыю ад гэтага ірада Гітлера". Кожны дзень на допыце ў гестапа я чакала, што адчыняцца дзверы і зойдуць родныя. Тата з мамай... Я ведала,

куды я трапіла, і я шчаслівая, што нікому не здрадзіла. Больш за смерць мы баяліся ўласнай здрады. Калі мяне арыштавалі, я адразу зразумела, што мяне чакаюць пакуты. Я ведала, што дух мой моцны, а цела?

Не памятаю першы допыт… Прытомнасці я не губляла. Адзін толькі раз свядомасць паплыла, калі нейкім колам выкручвалі рукі. Здаецца, не крычала, хоць перад гэтым мне паказалі, як енчаць іншыя. Далей на допытах ужо губляла пачуццё болю, цела дранцвела. Фанернае цела. Адна думка: не! На іхніх вачах я не памру. Не! І толькі калі ўсё скончыцца, прыцягнуць у камеру, я пачынала адчуваць боль, я ператваралася ў рану. Суцэльную рану. Усё цела… Але вытрываць. Вытрываць! Каб мама ведала, што паміраю я чалавекам, нікому не здрадзіўшы. Мама!

Білі, падвешвалі. Заўсёды абсалютна голую. Фатаграфавалі. Рукамі можаш закрыць толькі грудзі… Я бачыла, як вар'яцелі… Бачыла, як маленькі Міколка, якому не было года, мы яго вучылі слову “мама”, як ён, калі яго забіралі ў маці, зразумеў містычным чынам, што губляе яе назаўжды, і закрычаў першы раз у сваім жыцці: “Мама!”. Гэта было не слова ці не толькі слова… Я хачу вам распавесці, усё распавесці… О, якіх людзей я там сустрэла! Яны паміралі ў сутарэннях гестапа, і пра іх мужнасць ведалі толькі сцены. І цяпер, праз сорак гадоў, я ў думках апускаюся перад імі на калені. “Памерці — працей за ўсё”, — казалі яны. А вось жыць… Як хацелася жыць! Мы верылі: пераможам, у адным толькі не былі пэўныя — ці дажывём да гэтага вялікага дня?

У нас у камеры было маленькае акенца, закратаванае, трэба было, каб хто-небудзь цябе падсадзіў, і тады пабачыш — і тое нават не кавалачак неба, а кавалак даху. А мы ўсе такія слабыя, што падсадзіць адно

аднаго не маглі. Але была ў нас Ганна, парашутыстка. Яе схапілі, калі іх скідалі ў тыл з самалёта, група трапіла ў засаду. І вось яна, уся скрываўленая, збітая, раптам папрасіла: “Падсадзіце мяне, я зірну на волю. Хачу туды!”.

Хачу — і ўсё. Мы разам яе паднялі, яна ўскрыкнула: “Дзяўчаты, там кветка…”. І тады кожная стала прасіцца: “І мяне…”, “І мяне…”. І скуль толькі ў нас узяліся сілы дапамагаць адна адной. А гэта быў дзьмухавец, як яго занесла на гэты дах, як ён там трымаўся, не магу сцяміць. Кожная нешта загадала на гэтую кветку. Як я цяпер думаю, усе задумалі адно: выйсці жывымі з гэтага пекла.

Я так любіла вясну… Любіла, калі цвітуць вішні і каля бэзавых кустоў струменіць водар бэзу… Вы не здзіўляйцеся майму стылю, я вершы пісала. А цяпер я вясну не люблю. Гэта вайна стала паміж намі, паміж мной і прыродай. Калі цвілі вішні, я бачыла фашыстаў у родным Жытоміры…

Я выжыла цудам… Мяне ўратавалі людзі, якія хацелі аддзячыць майму бацьку. Мой бацька — доктар, па тых часах гэта была вялікая справа. Мяне выпіхнулі з калоны, выпіхнулі ў цемры, калі нас вялі на расстрэл. А я нічога не запомніла ад болю, рухалася, як у сне… Рушыла, куды вялі… Потым везлі… Прывезлі дамоў, я ўся была скалечаная, адразу высыпала нервовая экзэма. Я нават голас чалавечы чуць не магла. Пачую — адразу балюча. Мама і тата размаўлялі шэптам. Я ўвесь час крычала, сцішвалася толькі ў гарачай вадзе. Маму ні на секунду не адпускала ад сябе, яна прасіла: “Дачушка, мне трэба да печкі, на агарод…”. А я трымалася за яе… Як толькі адпускала руку, на мяне зноў усё навальвалася. Усё, што са мной было. Каб нечым мяне забавіць, мама

прыносіла кветкі. Мае любімыя званочкі… Лісце каштана… Пахі адцягвалі ўвагу… Сукенку, у якой я была ў гестапа, мама трымала ў сябе. І калі памірала, яна ў яе пад падушкай была. Да яе апошняй гадзіны…

Першы раз я паднялася, калі пабачыла нашых салдатаў. Раптам я, што ляжала болей за год, падхопліваюся і выбягаю на вуліцу: “Родныя мае, родненькія… Вы вярнуліся…”. Салдаты на руках занеслі мяне ў нашу хату. На эмацыйным уздыме я на другі і на трэці дзень бегала ў ваенкамат: “Дайце мне працу”. Тату сказалі, ён прыйшоў па мяне: “Дзетка, як ты тут апынулася? Хто табе дапамог?”. Мяне хапіла на некалькі дзён… І зноў пачаліся болі… Пакуты… Я крычала цэлымі днямі. Людзі праходзілі паўз нашу хату і прасілі: “Божа, або прымі яе душу, або дапамажы, каб яна не пакутавала”.

Выратавалі мяне лекавыя гразі Цхалтуба. Выратавала жаданне жыць. Жыць, жыць і — болей нічога. Я яшчэ жыла. Жыла, як усе… Жыла… Чатырнаццаць гадоў працавала ў бібліятэцы. Гэта былі радасныя гады. Самыя-самыя. А цяпер жыццё ператварылася ў бясконцае змаганне з хворасцямі. Старасць, што ні кажы, рэч нядобрая. Яшчэ адзінота, я засталася зусім адна. Таты і мамы даўно няма. Гэтыя доўгія ночы без сну. Колькі гадоў мінула, а мой самы страшны сон… я прачынаюся спатнелая. Я не памятаю прозвішча Ганны… Я не памятаю, ці яна з Браншчыны, ці са Смаленшчыны. Я памятаю, як яна не хацела паміраць! Закіне белыя поўныя рукі за галаву і ў акно праз краты крычыць: “Я жыць хачу!”.

Я не знайшла яе родных… Я не ведаю, каму пра гэта распавесці…»

*Сафія Міронаўна Верашчак,*
*падпольшчыца*

«Пасля вайны мы даведаліся пра Асвенцым, Дахаў... Як пасля гэтага нараджаць? А я ўжо цяжарная...

Тут мяне пасылаюць у вёску падпісваць на заём. Дзяржаве патрэбныя грошы, пара аднаўляць заводы, фабрыкі.

Прыехалі — вёскі няма, уся ў зямлі... У зямлянках жывуць... Выйшла жанчына, нейкая там на ёй апранаха, страшна глядзець. Я залезла ў зямлянку, сядзяць трое дзяцей, усе галодныя. Яна ім нешта там таўкла ў ступцы, нейкую траву.

Жанчына запытала:

—Ты прыйшла падпісваць на заём?

Я адказваю:

—Так.

Яна:

—У мяне грошай няма, але ёсць курыца. Пайду запытаю, калі суседка, яна ўчора прасіла ў мяне, купіць, я табе аддам.

І цяпер распавядаю, а ў самой камяк у горле. Якія былі людзі! Якія людзі! У яе мужа забілі на фронце, засталося трое дзяцей, і нічога няма, толькі адна гэтая курыца, і яна яе прадае, каб мне аддаць грошы. Мы тады збіралі наяўнымі. Яна гатовая ўсё аддаць, каб толькі быў мір, каб дзеці яе засталіся жывыя. Памятаю яе твар. І ўсіх дзяцей яе...

Кім яны выраслі? Я хацела б ведаць... Хацела б знайсці і сустрэцца...»

*Клара Васілеўна Ганчарова, зенітчыца*

Не бачу канца гэтай дарозе. Зло мне здаецца бясконцым. Я ўжо не магу ставіцца да яго толькі як да гісторыі. Хто б мне адказаў: з кім я маю справу — з часам ці з чалавекам? Час іначыцца, а чалавек? Думаю пра бессэнсоўны калаўрот жыцця.

Яны распавядалі як салдаты. Як жанчыны. Многія з іх мелі дзяцей...

## Пра купанне дзіцяці і пра маму, падобную да таты

«Я бягу... Нас некалькі чалавек бяжыць. Уцякае... За намі пагоня. Страляюць. А там мая мама стаіць пад аўтаматамі. Але яна бачыць, як мы бяжым... І я чую яе голас, яна крычыць. Мне потым людзі пераказвалі тыя словы. Яна крычала: "Добра, што ты сукенку белую апранула... Дачушка... Цябе ўжо не будзе каму апранаць...". Яна была пэўная, што мяне заб'юць, і ў яе радасць, што я буду ляжаць уся ў белым... А перад гэтым мы збіраліся ў госці ў суседнюю вёску. На Вялікдзень... Да нашых сваякоў...

Была такая цішыня... Спынілася стралянiна. Адна мая мама крычала... А можа, стралялі? Я не чула...

За вайну ўся наша сям'я загінула. Скончылася вайна, а мне чакаць няма каго...»

*Любоў Ігараўна Рудкоўская, партызанка*

«Пачалі кідаць бомбы на Мінск...

Я кінулася бегма ў дзіцячы садок па сына, а дачка ў мяне была за горадам. Ёй якраз споўнілася два годзікі,

яна засталася ў яслях, а яслі выехалі за горад. Я вырашыла спехам забраць сына дахаты, а потым бегчы па дачку. Хацелася хутчэй сабраць усіх разам.

Апынаюся каля садка, а самалёты над горадам, недзе выбухі. Чую за плотам голас сынка, яму было блізу чатырох гадкоў:

—Вы не бойцеся, мама сказала, немцаў паб'юць.

Адкрываю брамку, дзетак там шмат, і гэта ён так супакойвае іншых. А пабачыў мяне, пачаў дрыжэць, плакаць, відаць, як сам баяўся.

Прывяла яго дахаты, папрасіла свякруху прыгледзець, а сама кінулася па дзяўчынку! На тым месцы, дзе мусілі быць яслі, нікога не знайшла. Вясковыя жанчыны падказалі, што дзяцей некуды павялі. Куды? Хто? Кажуць, што, напэўна, у горад. Былі з імі дзве нянькі, машыны яны не дачакаліся і рушылі пешкі. Да горада дзесяць кіламетраў… Але гэта ж такія маленькія дзеці, ад годзіка да двух. Мілая мая, я шукала іх два тыдні… Па розных вёсках… Калі знайшла дом і мне сказалі, што гэта менавіта тыя яслі, тыя дзеці, я не дала веры. Яны ляжаць, прабачце, ва ўласных выпаражненнях, з тэмпературай. Як мёртвыя… Загадчыца ясляў зусім маладая жанчына, яна зрабілася сівой. Яны, як высветлілася, увесь шлях да горада прайшлі пешкі, губляліся па дарозе, памерла некалькі дзяцей.

Ступаю паміж імі і не пазнаю сваёй дачкі. Загадчыца мяне супакойвае:

—Шукайце, яна мусіць быць тут. Я яе памятаю.

Я знайшла сваю Элачку па чаравічку… Інакш ніколі б не пазнала…

Потым згарэў наш дом… Мы засталіся на вуліцы ў чым былі. Гэта ўжо немцы захапілі горад. Нам не было куды падзецца, некалькі дзён я блукала з дзецьмі па

вуліцах. Сустрэла Тамару Сяргееўну Сініцыну, да вайны мы былі з ёй трохі знаёмыя. Яна выслухала і кажа:

—Хадзем да мяне.

—Мае дзеці на коклюш хварэюць. Як я магу да вас пайсці?

У яе таксама былі малыя дзеці, яны маглі набрацца... А гэта ж такі час... Лекаў няма, бальніцы ўжо не працуюць.

—Не, хадзем.

Мілая мая, такое хіба забудзеш? Яны бульбяным шалупіннем з намі дзяліліся. Са сваёй старой спадніцы я пашыла сыну штонікі, каб было што падарыць на дзень народзінаў.

Але мы марылі пра змаганне... Бяздзейнасць мучыла... Якое шчасце было, калі з'явілася магчымасць далучыцца да падпольнай працы, а не сядзець, склаўшы рукі. Чакаць. Сына, ён большы, старэйшы, я на ўсялякі выпадак адвяла да свекрыві. Яна сказала: "Вазьму ўнука, але каб тваёй нагі ў доме не было. Праз цябе нас усіх заб'юць". Тры гады я не бачыла сына, баялася да дому падысці. А дачку, калі за мной пачалі сачыць, немцы трапілі на след, я ўзяла з сабой, разам з ёй сышлі ў партызаны. Я несла яе на руках пяцьдзясят кіламетраў. Пяцьдзясят кіламетраў... Мы ішлі два тыдні...

Болей за год яна была са мной... Часта думаю: як гэта ўсё мы з ёй пераэжылі? Запытайце мяне — не скажу. Мілая мая, такое вытрываць немагчыма. Ад словаў "партызанская блакада" ў мяне і сёння ляскочуць зубы.

Май сорак трэцяга... Мяне паслалі з друкаркай у суседнюю партызанскую зону. Барысаўскую. У іх была звычайная друкарка, з нашым шрыфтам, а патрабавалася з нямецкім, такая была толькі ў нас. Паводле задання падпольнага камітэта, я вынесла яе з акупаванага

Мінска. Калі прыйшла туды, да возера Палік, праз некалькі дзён пачалася блакада. Вось куды я трапіла…

А я прыйшла не адна, я была з дачкой. Калі сыходзіла на дзень-другі, дык пакідала яе на чужых людзей, а пакінуць на доўгі час не было дзе. Таму, натуральна, што дзіця ўзяла з сабой. І мы трапілі з ёй у блакаду. Немцы абклалі партызанскую зону… З неба бомбы, з зямлі расстрэльваюць… Калі мужчыны былі толькі з вінтоўкамі, дык я несла вінтоўку, друкарку і Элачку. Валочымся, я спатыкнуся, яна праз мяне — і ў балота. Пройдзем — і зноў ляціць… І так два месяцы! Я клялася, што калі выжыву, ніколі болей не падыду да балота, я яго бачыць не магу.

—Я ведаю, чаму ты не кладзешся, калі страляюць. Ты хочаш, каб нас разам забілі. — Гэта дачка мне кажа, чатыры годзікі. А я не мела моцы легчы, калі я лягу, дык ужо ніколі не падымуся.

Партызаны іншым разам пашкадуюць:

—Хопіць. Давай мы дачку возьмем.

Але я адмаўлялася. Раптам пачнецца абстрэл, раптам без мяне яе заб'юць і я не пачую? Раптам згубіцца…

Сустрэў мяне камбрыг Лапацін.

—Ну і жанчына! — ён быў узрушаны. — У такой калатнечы дачку пранесла і друкарку не кінула. На такое не кожны мужчына здатны.

Узяў Элачку на рукі, абдымае, цалуе. Вытрас усе свае кішэні — высыпаў ёй хлебныя крышкі. Яна запіла балотнай вадой. І на ягоным прыкладзе іншыя партызаны павытрасалі свае кішэні для Элачкі.

Калі мы выйшлі з блакады, я была зусім хворая. Уся ў фурункулах, з мяне аблазіла скура. А на руках дзіця… Чакалі самалёт з Вялікай зямлі, сказалі, што, калі ён прыляціць, дык забярэ моцна параненых і могуць узяць маю Элачку. Я добра памятаю гэтыя хвіліны, калі яе

адпраўляла. Параненыя цягнуцца: “Элачка, да мяне”. — “Давай да мяне. Тут хопіць месца…”. Яны ўсе яе ведалі, яна ў шпіталі спявала ім: “*Эх, як бы дажыць бы да шлюбу-жаніцьбы*”.

Лётчык пытае:

—З кім ты тут, дзяўчынка?

—З мамай, яна на зямлі засталася.

—Пакліч маму, каб яна ляцела з табой.

—Не, маме нельга. Яна мусіць біць фашыстаў.

Вось такія яны былі, нашыя дзеці. А я гляджу на яе тварык, і ў мяне спазмы — ці ўбачу калі-небудзь?

Я вам яшчэ распавяду, як мы з сынам сустрэліся… Гэта ўжо пасля вызвалення. Іду да дому, дзе свякруха жыла, а ногі — ватныя. Жанчыны ў атрадзе, што былі старэйшыя, папярэдзілі:

—Ты, калі ўбачыш яго, ні ў якім разе не прызнавайся адразу, што ты яго маці. Ты ўяўляеш, колькі ён без цябе перажыў?

Бяжыць суседская дзяўчынка:

—Ой! Лёнева мама. А Лёня жывы…

У мяне ногі не ідуць далей: сын жывы. Яна сказала, што свякруха памерла ад тыфу, а Лёню ўзяла суседка.

Заходжу да іх на падворак. У чым я? У нямецкай гімнасцёрцы, у зацыраваных чорных ватніках, у ботах старых. Суседка мяне адразу пазнала, але маўчыць. А сын сядзіць, босы, абарваны.

—Як цябе завуць, хлопчык? — пытаю.

—Лёня…

—А з кім ты жывеш?

—Жыў раней з бабуляй. Калі яна памерла, я яе пахаваў. Я прыходзіў да яе кожны дзень і прасіў, каб яна забрала мяне ў магілку. Я баяўся адзін спаць…

—А дзе твае тата і мама?

— Тата жывы, ён на фронце. А маму забілі фашысты. Так бабуля казала…

Са мной былі двое партызанаў, хавалі сваіх таварышаў. Яны слухаюць, што ён кажа, і плачуць.

Тут я не вытрывала:

— Чаму ж ты сваёй мамы не пазнаеш?

Ён кінуўся да мяне:

— Тата! — Я ў мужчынскім адзенні, у шапцы. А потым абняў з крыкам: — Мама!!!

Гэта быў такі крык. Такая істэрыка… Ён месяц мяне нікуды не адпускаў, нават на працу. Я брала яго з сабой. Яму мала было бачыць мяне, ён павінен быў за мяне трымацца. Вось мы сядзем абедаць, ён адной рукой учэпіцца за мяне, а другой есць. Называў толькі: "Мамачка". І цяпер так называе… Мамачка… Матулечка…

Калі мы сустрэліся з мужам, тыдня не хапіла, каб усё пераказаць. Я яму і дзень і ноч расказвала…»

*Раіса Рыгораўна Хасяневіч, партызанка*

«Вайна — гэта пахаванні. Хавалі партызанаў часта. То засаду напаткае група, то ў баі загінуць. Я вам распавяду пра адзін выпадак...

Быў вельмі цяжкі бой. Тады мы загубілі шмат людзей, і я там была параненая. І вось пасля бою пахаванне. Звычайна ля магілы казалі кароткія прамовы. Спачатку камандзіры, потым сябры. А тут сярод загінулых быў адзін мясцовы хлопец, і на пахаванне прыйшла маці. Усчала яна галашэнне: "А мой жа ты сыночак! А мы ж табе хатачку будавалі! А ты ж абяцаў нам маладую прывесці! А сам вянчаешся з зямелькай…".

Атрад стаіць, усе маўчаць, не спыняюць. Потым яна падняла галаву і ўбачыла, што забіты не толькі яе сын, а шмат маладых ляжыць, і яна па тых, чужых сынах стала

плакаць: “А мае ж вы сыночкі родныя! А вашы ж мамачкі не бачаць вас, яны не ведаюць, што вас у зямельку кладуць! А зямелька такая халодная. А на дварэ зіма лютая. Дык паплачу я замест іх, усіх вас пашкадую. Мае вы родныя… Родненькія…”.

Яна толькі сказала: “усіх вас пашкадую” і “мае вы родныя” — усе партызаны пачалі плакаць. Ніхто стрымацца не мог, не меў моцы. Атрад румзае. І тады камандзір крыкнуў: “Салют!”. І салют усё заглушыў.

І вось мяне ўразіла, я і цяпер пра гэта думаю, веліч сэрца маці. У такім горы, калі хаваюць яе сына, у яе хапіла сэрца, каб аплакаць і чужых сыноў… Аплакаць, як родных…»

*Ларыса Лявонцеўна Кароткая, партызанка*

«Вярнулася ў сваю вёску…

Гуляюць каля нашай хаты дзеці. Я гляджу і думаю: “Якое ж дзіцё маё?”. Усе аднолькавыя. І стрыжаныя, як раней авечак стryглі, — радкамі. Сваю дачку я не пазнала, запыталася, хто з іх Люся? Гляджу, адзін з найменшых у доўгай кашулі падхапіўся і пабег да хаты. Цяжка было зразумець, хто дзяўчынка, а хто хлопчык, так яны ўсе былі апранутыя. Я зноў пытаю:

—Дык хто ж з вас Люся?

Яны паказваюць пальцам на тую, што пабегла. І я зразумела, што гэта была мая дачка.

Праз нейкую хвіліну вядзе яе за руку бабуля, гэта ўжо мама маёй мамы. Вядзе яе мне насустрач:

—Хадзем, хадзем. Мы зараз гэтую маму адлупцуем за тое, што яна нас кінула.

Была я ў мужчынскім вайсковым адзенні, у пілотцы і на кані, а маму дачка, канешне, уяўляла, як бабулю, як іншых жанчын. А тут прыехаў салдат. Доўга яна не ішла

да мяне на рукі, палохалася. І тут крыўдуй не крыўдуй, а не я ж яе гадавала, яна расла з бабулямі.

У падарунак я прывезла з сабой мыла. На той час гэта быў багаты падарунак, і калі пачала яе мыць, яна кусала яго зубамі. Хацела пакаштаваць і з'есці. Так яны жылі. Я сваю маці памятала маладой жанчынай, а сустрэла мяне старая. Ёй сказалі, што дачка прыехала, яна выскачыла з гарода на вуліцу. Убачыла мяне, рукі раскрыліла і бяжыць. І я яе пазнала, бягу да яе. Яна не дабегла некалькі крокаў, упала без сілаў. Я побач упала. Цалую маму, цалую зямлю. І такая ў сэрцы любоў, і такая нянавісць.

Згадваю, як ляжыць паранены немец і рукамі чапляецца за зямлю, немцу балюча, а наш салдат яму: "Не чапай, гэта мая зямля. Твая там, адкуль ты прыйшоў…"».

*Марыя Васілеўна Паўлавец, партызанскі доктар*

«Я сышла на вайну следам за мужам…

Дачку пакінула ў свякрухі, але тая хутка памерла. У мужа была сястра, і яна ўзяла дзяўчынку. А пасля вайны, калі я дэмабілізавалася, яна не схацела мне аддаваць маё дзіця. Казала ў тым сэнсе, што ў цябе не можа быць дачкі, паколькі ты кінула яе маленькую і пайшла ваяваць. Як гэта маці можа кінуць сваё дзіцё, ды яшчэ такое малое. Я вярнулася з вайны, маёй дачцэ ўжо было сем гадоў, а я яе пакінула ў тры гады. Мяне сустрэла амаль дарослая дзяўчынка. Што праўда, маленькая, яна недаядала, недасыпала, побач быў шпіталь, яна хадзіла туды, выступала, танчыла, ёй давалі хлеба. Яна мне потым распавяла… Чакала спачатку тату і маму, потым — адну маму. Тата загінуў… Яна разумела…

Я часта дачку згадвала на фронце, я на яе ні на хвіліну не забывалася, я яе сніла. Вельмі сумавала. Пла-

кала, што не я ёй казкі на ноч чытаю, што яна засынае і прачынаецца без мяне… Хто ёй коскі заплятае… І я не крыўдавала на залоўку. Разумела… Яна вельмі любіла брата, ён быў дужы, прыгожы, нельга было паверыць, што такога можна забіць. А загінуў у першыя месяцы вайны… Іх самалёты разбамбілі зранку на зямлі. Першыя месяцы і нават першы год вайны — гаспадарамі ў небе былі нямецкія лётчыкі. І ён загінуў… Ёй не хацелася вяртаць тое, што ад яго засталося. Апошняе. І яна была з тых жанчын, для якіх сям'я, дзеці — самае галоўнае ў жыцці. Бомбы, абстрэл, а ў яе адна думка: як гэта я дзіця сёння не купала? Я не магу яе вінаваціць…

Яна казала, што я жорсткая… Без жаночай душы… А мы ж на вайне моцна пакутавалі… Без сям'і, без дому, без дзяцей. У многіх дзеці засталіся дома, не толькі ў мяне. Сядзім пад парашутам, чакаем каманды на вылет. Мужчыны кураць, гуляюць у даміно, а мы, пакуль ракеты няма, сядзім, вышываем насоўкі. Мы заставаліся жанчынамі. Ведаеце, вось мой штурман. Яна хацела фотаздымак дамоў паслаць, дык мы ёй — у кагосьці знайшлася хустка — павязалі яе, каб пагонаў не было відаць, а гімнасцёрку захінулі коўдрай. І яна як быццам у сукенцы… І вось так сфатаграфавалася. Гэта быў яе фотаздымак…

З дачкой мы пасябравалі… І сябруем усё жыццё…».

*Антаніна Рыгораўна Бондарава,*
*гвардыі лейтэнант, старшы лётчык*

## Пра Чырвоны Каптурок і радасць сустрэць на вайне котку

«Я доўга да вайны прывыкала…

Пайшлі ў наступ. І калі ў параненага пырснула артэрыяльная кроў — такога раней не бачыла — б'е

фантанам — я кінулася па доктара. А сам паранены крычыць: “Куды? Ты куды? Перавязвай рэменем!”. І толькі тады я ачуняла…

Пра што шкадую? Пра аднаго хлопчыка… Хлопчык без мамкі застаўся. Мамку забілі. Хлопчык сядзеў на дарозе каля мёртвай маці. Ён не разумеў, што яе ўжо няма, ён чакаў, калі яна прачнецца, і прасіў есці…

Камандзір наш не кінуў гэтага хлопчыка, узяў да сябе: “У цябе няма матулі, хлопчык, але будзе шмат татаў”. Так ён з намі і рос. Як сын палка. З сямі гадоў. Набіваў патронамі дыскі аўтаматаў ППШ…

Вось вы сыдзеце, а мой муж будзе сварыцца. Ён не любіць такіх размоваў. Вайны не любіць. Але ён на вайне не быў, малады, маладзейшы за мяне. У нас дзяцей няма. Я ўсё згадваю таго хлопчыка. Мог бы быць маім сынам…

Мне пасля вайны ўсіх было шкада. І чалавека, і пеўня, і сабаку… Я і цяпер не магу чужога болю трываць. Працавала ў больніцы, хворыя мяне любілі, бо клапацілася. У нас сад вялікі. Ніводнага яблыка ні разу не прадала, ніводнай ягадкі. Проста раздаю людзям… З вайны гэта ў мяне засталося… Такое сэрца…»

*Любоў Захараўна Новік, медсястра*

«Тады я не плакала…

Я баялася аднаго… Схопяць таварышаў — некалькі дзён невыноснага чакання: вытрывае катаванні ці не? Калі не вытрывае, пачнуцца новыя арышты. Праз нейкі час робіцца вядома, што іх будуць вешаць. Загадваюць: ідзі паглядзі, каго сёння будуць вешаць. Ідзеш па вуліцы, рыхтуюць вяроўку… Плакаць нельга, затрымлівацца на лішнюю секунду нельга, бо ўсюды за табой сочаць. І колькі трэба было, нядобрае тут слова, — мужнасці,

колькі моцы душэўнай, каб змаўчаць. Без слёз прайсці міма…

Тады я не плакала…

Я ведала, на што адважылася, але зразумела, адчула ўсё, калі мяне арыштавалі. Забралі ў турму. Білі і ботамі, і бізунамі. Зведала, што такое фашысцкі “манікюр”. Рукі кладуць на стол, і нейкая машынка ўтыкае табе голкі пад пазногці… Пад усе пазногці разам. Пякельны боль. Адразу губляеш прытомнасць. Нават не памятаю, ведаю, што боль невыносны, а не памятаю. Мяне расцягвалі на бярвёнах. Можа, гэта не дакладна, можа, няправільна. Але запомнілася: вось тут такое бервяно і тут, а цябе паміж імі кладуць… І нейкая машынка пачынае працаваць… І ты чуеш, як у цябе хрумсцяць-выварочваюцца косткі… Ці доўга гэта? Таксама не памятаю… Мяне катавалі на электрычным крэсле… Гэта калі я плюнула аднаму з катаў у твар… Малады, стары — нічога не згадваецца. Яны распранулі мяне да галізны, і той падышоў і ўзяў мяне за грудзі… Я магла толькі плюнуць… Я болей нічога не магла. І я плюнула яму ў твар. Яны пасадзілі мяне на электрычнае крэсла…

Я з той пары вельмі баюся электрычнасці. Помню, як мяне пачало трэсці… І цяпер нават бялізну прасаваць не магу… На ўсё жыццё гэта ў мяне — пачынаю прасаваць, і ва ўсім целе адчуваю ток. Нічога рабіць не магу, што звязанае з электрычнасцю. Можа, патрэбная была нейкая псіхатэрапія пасля вайны? Не ведаю. Але ўжо пражыла жыццё так…

Дзіўна, чаго гэта сёння расплакалася. Тады я не плакала…

Прысудзілі мяне да смяротнага пакарання на шыбеніцы. Змясцілі ў камеры смяротнікаў. Там былі яшчэ дзве жанчыны. Дайце веры, мы не плакалі, не істэрылі,

мы ж разумелі, калі ішлі ў падполле, што нас чакае, і таму паводзіліся стрымана. Абмяркоўвалі паэзію, улюбёныя оперы... Шмат гаварылі пра Ганну Карэніну... Пра каханне... Але ні слова не казалі пра сваіх дзяцей, мы пра іх баяліся згадваць. Нават усміхаліся, адна адну падбадзёрвалі. Так мы чакалі двое з паловай сутак... Зранку на трэці дзень мяне выклікалі. Мы расцалаваліся, развіталіся без слёз. Страху не было: відаць, я настолькі звыклася з думкай пра смерць, што страх ужо расцерушыўся. І слёзы таксама высахлі. Нейкая пустэча была. Ужо ні пра каго не думалася...

Доўга мы ехалі, я нават не ведаю колькі, бо развітвалася з жыццём... Урэшце машына спынілася, і мы, нас было чалавек дваццаць, не змаглі злезці з яе, такія былі знявечаныя. Нас, як мяхі, скінулі на зямлю, і камендант загадаў паўзці да баракаў. Падганяў бізуном... Стаіць каля аднаго барака жанчына і корміць грудзьмі дзіця. І неяк ведаеце... І сабака, і ахова, усе аслупянелі і глядзяць, не чапаюць. Камендант пабачыў усё гэта... Падскочыў. Выхапіў з рук маці дзіця... І ўяўляеце, там была калонка, калонка — ваду пампаваць, дык ён дзіця б'е аб гэтае жалеза. Мазгі пацяклі... Малако... І я бачу: маці валіцца на зямлю, я разумею, я ж доктар... Я разумею, што ў яе разарвалася сэрца...

...Нас гоняць на працу. Гоняць праз горад, па знаёмых вулках. Толькі пачалі спускацца, перад гэтым быў вялікі пад'ём, раптам чую голас: "Мама, мамачка!". Бачу: стаіць мая цётка Дар'я, а з ходніка бяжыць дачка. Яны ішлі па вуліцы і выпадкова ўбачылі. Дачка як бегла, дык адразу абхапіла мяне. І вы ўявіце, там сабакі, яны спецыяльна вывучаныя кідацца на людзей, але ніводзін сабака не зрушыў з месца. Падыдзеш, дык яны рвуць на кавалкі, яны на гэта спрактыкаваныя, а тут ніводзін

не зварухнуўся. Дачка кінулася да мяне, а я не плакала, толькі паўтарала: "Дачушка! Наталачка, не плач. Я хутка буду дома". І ахова стаяла, і сабакі. І ніхто яе не крануў...

І тады я не плакала...

Мая дачка ў пяць гадоў чытала малітвы, а не вершы. Цётка Дар'я вучыла, як трэба маліцца. Яна малілася за тату і маму, каб мы засталіся жывыя.

У сорак чацвёртым, трынаццатага лютага, мяне адправілі на фашысцкую катаргу... Трапіла ў канцлагер Краазет на беразе Ла-Манша.

Увесну... У дзень Парыжскай Камуны французы зладзілі нам уцёкі. Я сышла ў "макі".

Узнагароджаная французскім ордэнам "Баявы крыж"...

Пасля Перамогі вяртаюся дамоў... Я памятаю... Першы прыпынак на нашай зямлі... Мы ўсе павыскоквалі з вагонаў, мы цалавалі зямлю, абдымалі... Згадваю: я была ў белым халаце, упала на зямлю, цалую яе і за пазуху жменямі кладу. Няўжо, думаю, я яшчэ калі яе пакіну, такую родную...

Прыехала ў Мінск, а мужа дома няма. Дачка ў цёткі Дар'і. Мужа арыштавала НКУС, ён — у турме. Я іду туды... І што я там чую... Мне кажуць: "Ваш муж — здраднік". А мы разам з ім працавалі ў падполлі. Удваіх. Гэта мужны, сумленны чалавек. Я разумею, што яго абгаварылі... Што быў паклёп... "Не, — кажу, — мой муж не можа быць здраднікам. Я веру яму. Ён — сапраўдны камуніст". Ягоны следчы... Ён як закрычыць на мяне: "Маўчы, французская лярва! Маўчы!". Жыў у акупацыі, трапіў у палон, завезлі ў Нямеччыну, сядзеў у фашысцкім канцлагеры — ва ўсіх сумняваліся. Адно пытанне: як жывы застаўся? Чаму не загінуў? Нават мёртвых падазравалі... І яны таксама... І пад увагу не бралі, што мы

змагаліся, усім ахвяравалі дзеля перамогі. Перамаглі… Народ перамог! А Сталін усё роўна да народа не меў даверу. Вось як аддзячыла радзіма. За нашу любоў, за нашу кроў…

Я хадзіла… Пісала ва ўсе інстанцыі. Мужа вызвалілі праз паўгода. Яму зламалі адно рабро, адбілі нырку… Фашысты, калі ён трапіў да іх у турму, разбілі яму галаву, зламалі руку, ён там пасівеў, а ў сорак пятым у НКУС яго канчаткова зрабілі інвалідам. Я даглядала яго гадамі, выцягвала з хваробаў. Але нічога не магла сказаць супраць, ён і чуць не хацеў… “Гэта была памылка”, — і ўсё. Галоўнае, лічыў ён, мы перамаглі. Усё — кропка. І я яму верыла.

І не плакала. Нават тады я не плакала…»

*Людміла Міхайлаўна Кашачкіна, падпольшчыца*

«Як патлумачыць дзіцяці? Як яму патлумачыць смерць…

Іду з сынам па вуліцы, ляжаць забітыя — і з аднаго боку, і з другога. Я яму казку пра Чырвоны Каптурок апавядаю, а вакол забітыя. Гэта калі мы з бежанства вярталіся. Спыніліся ў маці, а з сынам нешта нядобрае: залазіць пад ложак і сядзіць там цэлымі днямі. Пяць гадоў яму было, на вуліцу не выгнаць…

Год я з ім мучылася. Ніяк не магла зразумець: у чым жа справа? А мы тады жылі ў склепе — калі хто ідзе па вуліцы, дык бачныя толькі ногі. І вось ён неяк вылез з-пад ложка, убачыў боты ў акне і як закрычыць… Тады я згадала, што немец ударыў яго ботам…

Ну, неяк пакрысе адпусціла. Гуляе ў двары з дзецьмі… Аднойчы вяртаецца ўвечары дамоў і пытаецца:

—Мама, а што такое — тата?

Я яму тлумачу:

—Ён беленькі, прыгожы, змагаецца ў войску.

А калі Мінск вызвалялі, дык першымі ў горадзе былі танкі. І вось мой сын прыбягае дадому ў слязах:

— Майго таты няма! Там усе чорныя, няма белых…

Гэта быў ліпень, танкісты ўсе маладыя, загарэлыя.

Муж вярнуўся з вайны інвалідам. Прыйшоў не малады, а стары, і ў мяне зноў бяда: сын прызвычаіўся думаць, што бацька — беленькі, прыгожы, а тут хворы стары чалавек. І сын доўга не лічыў яго за бацьку. Не ведаў, як называць. Мне трэба было іх прывучыць адзін да аднаго.

Муж прыходзіць позна з працы, я яго сустракаю:

— Што ж ты так позна? Дзіма хваляваўся: "Дзе мой татка?".

Ён таксама за шэсць гадоў вайны (быў яшчэ на японскай) адвык ад сына. Ад дому.

А калі што набуду, сыну кажу:

— Гэта татка купіў, ён пра цябе клапоціцца…

Урэшце яны пасябравалі…»

*Надзея Вікенцьеўна Хатчанка, падпольшчыца*

«Мая біяграфія…

З дваццаць дзявятага года я працавала на чыгунцы. Памочніцай машыніста. У той час жанчын-машыністаў не было нідзе ў Савецкім Саюзе. А я марыла. Начальнік паравознага дэпо дзівіўся: "Што за дзеўка, абавязкова ёй патрэбная мужчынская прафесія". Толькі я ўпарцілася. І ў трыццаць першым годзе сталася першай… Я была першая жанчына-машыніст. Вы не дасцё веры, калі я ехала на паравозе, на станцыях збіраліся людзі: "Дзяўчына вядзе паравоз".

У той дзень наш паравоз стаяў на прафілактыцы. Мы з мужам ездзілі па чарзе, паколькі ў нас ужо было дзіця, і мы ўпарадкавалі так: калі ён паехаў — я з дзіцём,

я паехала — ён дома сядзіць. Якраз у той дзень муж вярнуўся, а я мусіла ехаць. Зранку прачынаюся, чую: нешта нязвыклае на вуліцы, нейкая гамана. Уключыла радыё: "Вайна!".

— Лёня, падымайся! Вайна! Падымайся, вайна!

Ён пабег у дэпо, вяртаецца ўвесь у слязах:

— Вайна! Вайна! Ты ведаеш, што такое — вайна?

Як быць? Куды падзець дзіця?

Эвакуявалі мяне з сынам ва Ульянаўск, у тыл. Далі двухпакаёвую кватэру, кватэра была добрая, у мяне такой і цяпер няма. Сына ўзялі ў дзіцячы садок. Усё файна. Любілі ўсе мяне. Як жа! Жанчына-машыністка, ды яшчэ першая... Цяжка паверыць, пажыла я там трохі, паўгода не пажыла. І болей не магу, усе абараняюць Радзіму, а я ў кватэры баўлюся!

Прыехаў муж:

— Што, Маруся, будзеш у тыле сядзець?

— Не, — кажу, — паедзем.

У гэты час фармавалі калону асаблівага рэзерву дзеля абслугоўвання фронту. Мы з мужам папрасіліся туды. Муж быў старшым машыністам, а я машыністам. Чатыры гады ў цяплушках ездзілі, і сын разам з намі. Ён у мяне за ўсю вайну нават коткі не бачыў. Калі злавілі пад Кіевам кацяня, наш цягнік моцна бамбілі, наляцела пяць самалётаў, ён абняў яго: "Каточак міленькі, як я рады, што цябе ўбачыў. Я не бачу нікога, ну, пасядзі са мной. Дай я цябе пацалую". Дзіця... У дзіцяці ўсё мусіць быць дзіцячым... Ён засынаў са словамі: "Мамачка, у нас ёсць котка. У нас цяпер сапраўдны дом". Такога не падгледзіш, не прыдумаеш... Ты не абміні, абавязкова напішы пра кацяня...

Нас часта закідвалі бомбамі, абстрэльвалі з кулямётаў. І цэляць найперш па паравозе, ім галоўнае — забіць

машыніста, зніштожыць паравоз. Самалёты апускаліся зусім нізка і цэлілі таксама па цяплушках, а там мой сын сядзіць. Я найболей баялася за сына. Не пераказаць… Калі бамбілі, брала з цяплушкі да сябе на паравоз. Схаплю яго, прытулю да сэрца: “Хай заб’е адным аскепкам”. Але хіба так заб’е! Таму, відаць, і жывыя засталіся. І гэта запішы…

Паравоз — маё жыццё, мая маладосць, маё самае прыгожае ў жыцці. Я і цяпер хацела б вадзіць цягнік, ды не пускаюць — старая…

Як страшна мець адно дзіця. Якая глупота… Вось мы цяпер жывём… Я жыву з сям’ёй сына. Ён доктар, загадчык аддзялення. У нас невялікая кватэра. Але я нікуды не еду ў адпачынак, ніколі пуцёвак не прашу… Я не хачу разлучацца з сынам, з унукамі. Мне на адзін дзень страшна з імі разлучыцца. І сын у мяне нікуды не ездзіць. Хутка будзе дваццаць пяць гадоў, як працуе, але далёка не адлучаўся. На працы ўсе дзівяцца, што ні разу не папрасіў пуцёўкі. “Мамачка, я лепей пабуду з табой”, — вось што ён кажа. І нявестка ў мяне такая самая. Не пераказаць… Мы лецішча не маем адно таму, што не можам разлучыцца нават на некалькі дзён. Я не магу жыць без іх ні хвіліны.

Хто быў на вайне, той ведае, што гэта такое — разлучыцца на дзень. Усяго на адзін дзень…»

*Марыя Аляксандраўна Арэстава, машыніст*

### Пра маўчанне тых, хто ўжо можа казаць

«Я і цяпер кажу шэптам… Пра… Гэта… Шэптам. Праз сорак з лішкам гадоў…

Вайну забыла… Бо і пасля вайны жыла ў страху. Жыла ў пекле.

Ужо — Перамога, ужо — радасць. Мы ўжо цэглу збіралі, жалеза, разграбалі горад. Працавалі днём, працавалі ноччу, я не памятаю, калі мы спалі і што мы елі. Працавалі і працавалі.

Верасень... Верасень быў цёплы, шмат сонца. Садавіна. Шмат садавіны. На кірмашы вёдрамі прадавалі антонаўку. І гэты дзень... Я развешвала бялізну на балконе... Запомніла ўсё да дробязі, бо з гэтага дня ўсё змянілася. Усё абарвалася. Перакулілася. Развешваю бялізну... Белую пасцельную бялізну — яна ў мяне заўсёды была белай. Мама навучыла, як пяском замест мыла мыць. Па пясок хадзіла да рэчкі, я там месца адно ведала. І вось... Бялізна... Суседка знізу кліча, крычыць не сваім голасам: "Валя! Валя!". Я хутчэй — уніз, першая думка: а дзе сын? А тады, ведаеце, хлопчыкі бегалі сярод развалінаў, гулялі ў вайну і знаходзілі сапраўдныя гранаты, сапраўдныя міны. Падрываліся... Заставаліся без рук, без ног... Мы не адпускалі іх ад сябе, але гэта — хлопчыкі, ім цікава. Насварышся: сядзі дома — а праз пяць хвілінаў яго ўжо няма. Іх вабіла зброя... Пасля вайны асабліва... Я — хутчэй уніз. Выскачыла ў двор, а там мой муж... Мой Іван... Мужанёк мой каханы... Ванечка! Вярнуўся. Вярнуўся з фронту! Я яго цалую, я яго кранаю. Гладжу гімнасцёрку, рукі яго. Вярнуўся... У мяне ногі падгінаюцца... А ён... Стаіць як каменны, ну, ці як кардонны. Не ўсміхнецца, не абдыме мяне. Замарожаны нейкі. Я спалохалася: пэўна, думаю, кантужаны. Можа, глухі. Ну, нічога, галоўнае — вярнуўся. Выхаджу яго, выняньчу. Ужо нагледзелася, як іншыя жанчыны жывуць з такімі мужамі, але ім усё роўна ўсе зайздросцілі. Усё гэта вобмільгам у маёй галаве пранеслася, у адно імгненне. Ногі ў мяне ад шчасця падкошваюцца. Дрыжаць. Жывы! Ах, міленькая мая, наша жаночая доля.

Суседзі тут жа збегліся. Усе радыя, усе абдымаюцца. А ён — каменны. Маўчыць. Хутка заўважылі.

Я:

—Ваня... Ванечка...

—Пайшлі ў дом.

Добра, хадзем. На ягоным плячы павісла... Шчаслівая! Уся ў радасці і шчасці. Ганарлівая! Сеў дома на зэдлік і маўчыць.

—Ваня... Ванечка...

—Разумееш... — і не можа далей казаць. Заплакаў.

—Ваня...

У нас была адна ноч. Усяго адна ноч.

Назаўтра па яго прыйшлі, пагрукалі ў дзверы зранку. Ён курыў і чакаў, ужо ведаў, што прыйдуць. Мне сказаў мала... Не паспеў... Вызваліў Румынію, Чэхію, узнагароды прывёз, а вяртаўся ў страху. Яго ўжо дапытвалі, ужо было дзве дзяржправеркі. Паставілі кляймо — быў у палоне. У першыя тыдні вайны... Пад Смаленскам трапіў у палон, а мусіў быў застрэліцца. Ён хацеў, я ведаю, ён хацеў... У іх патроны хутка скончыліся, не тое што ваяваць, застрэліцца не было чым. Яго параніла ў нагу, ён паранены трапіў у палон. На яго вачах камісар разбіў сабе галаву каменем... Апошні патрон не стрэліў... На яго вачах... Савецкі афіцэр у палон не здаецца, у нас няма палонных, у нас ёсць здраднікі. Так казаў таварыш Сталін, ён ад роднага сына адмовіўся, які быў у палоне. Мой муж... Мой... Следчы яму крычаў: "Чаму жывы? Чаму жывы застаўся?". З палону ўцёк... Уцёк у лес да ўкраінскіх партызанаў, калі вызвалілі Украіну, папрасіўся на фронт. У Чэхіі сустрэў дзень Перамогі. Прадставілі да ўзнагароды...

У нас была адна ноч... Калі б я ведала... Я яшчэ хацела нарадзіць, дзяўчынку хацела...

Зранку яго забралі... Паднялі з ложка... Я села за стол на кухні і чакала, калі прачнецца наш сын. Яму ўжо

было адзінаццаць гадоў. Я разумела, што ён прачнецца і запытае, першае, што запытае: “Дзе наш татка?”. Што я яму адкажу? Як растлумачу суседзям? Маме?

Муж вярнуўся праз сем гадоў… Мы чакалі яго з сынам чатыры гады з вайны, а пасля Перамогі яшчэ сем гадоў з Калымы. З лагера. Адзінаццаць гадоў чакалі. Сын вырас…

Навучыліся маўчаць… Дзе ваш муж? Хто твой бацька? У любой анкеце пытанне: ці быў хто са сваякоў у палоне? Мяне ў школу тэхнічкай не ўзялі, калі я напісала, падлогу не даверылі мыць. Я зрабілася ворагам народа, жонкай ворага народа. Здрадніка. Усё маё жыццё скалечылі… Была да вайны настаўніцай, педвучэльню скончыла, а пасля вайны цэглу на будоўлі цягала. Эх, маё жыццё… Прабачце, што нязграбна, блытана ў мяне атрымліваецца. Я спяшаюся… Я, бывала, ноччу… Колькі начэй я ляжала адна і невядома каму сваё жыццё пераказвала і пераказвала. А днём маўчала.

Цяпер можна пра ўсё казаць. Я хачу… Запытацца: хто вінаваты, што ў першыя месяцы вайны мільёны салдатаў і афіцэраў трапілі ў палон? Я хачу ведаць… Хто абезгаловіў войска перад вайной, расстраляў і агаварыў — нямецкі шпіён, японскі шпіён — чырвоных камандзіраў? Я хачу… Хто верыў у конніцу Будзённага ў той час, калі Гітлер узбройваўся танкамі і самалётамі? Хто нас запэўніваў: “Наша граніца на замку…”. А ў першыя дні армія ўжо лічыла патроны…

Я хачу… Магу ўжо запытаць… Дзе маё жыццё? Нашае жыццё? Але я маўчу і мой муж маўчыць. Нам і сёння страшна. Мы баімся… Так і памром у страху. Крыўдна і сорамна…»

*Валянціна Еўдакімаўна М-ва, партызанская сувязная*

# «І ЯНА КЛАДЗЕ РУКУ ТУДЫ, ДЗЕ СЭРЦА...»

І нарэшце — Перамога...

Калі раней жыццё было падзеленае для іх на мір і вайну, дык цяпер — на вайну і Перамогу.

Зноў — два розныя светы, два розныя жыцці. Пасля таго, як навучыліся ненавідзець, трэба было нанова вучыцца любіць. Згадваць забытыя пачуцці. Забытыя словы.

Чалавек вайны павінен быў стаць чалавекам не вайны...

## Пра апошнія дні вайны, калі забіваць гідка

«Мы былі шчаслівыя...

Перайшлі мяжу — радзіма вызваленая. Вызваленая наша зямля... Я не пазнавала салдатаў, гэта былі іншыя людзі. Усе ўсміхаліся. Надзелі чыстыя кашулі. Аднекуль кветкі ў руках, такіх шчаслівых людзей я не ведала. Раней не бачыла. Я думала, што калі мы трапім у Германію, дык у мяне жалю да іх не будзе, нікому даравання не будзе. Столькі помсты настыла ў грудзях! Крыўды! Чаму я мушу шкадаваць ягонае дзіця? Чаму я мушу шкадаваць ягоную маці? Чаму я не магу разбурыць ягоны дом? Ён не шкадаваў... Ён забіваў... Паліў... А я? Я... я... я... Чаму? Чаму-у-у? Хацелася пабачыць іх жонак, іх матак, што нарадзілі такіх сыноў. Як яны будуць глядзець нам у вочы? Я хацела паглядзець ім у вочы...

Я думала: што ж будзе са мной? З нашымі салдатамі? Мы ўсё помнім... Як мы гэта вытрываем? Якія

патрэбныя сілы, каб усё гэта вытрываць? Спыніліся ў нейкім мястэчку, дзеці бегаюць — галодныя, няшчасныя… Баяцца нас… Хаваюцца… Я, якая клялася, што іх усіх ненавіджу… Я збірала ў сваіх салдатаў усё, што ў іх ёсць, што заставалася ад пайка, кожны кавалачак цукру, і аддавала нямецкім дзецям. Зразумела, я не забыла… Я ўсё памятала… Але глядзець спакойна ў галодныя дзіцячыя вочы я не магла. Ад самага ранку ўжо стаяла чарга нямецкіх дзяцей каля нашых кухняў, давалі першае і другое. У кожнага з іх праз плячо перакінутая торба для хлеба, на поясе бітончык для супу і што-небудзь для другога — кашы, гароху. Мы іх кармілі, лекавалі. Нават гладзілі… Я першы раз пагладзіла… Спалохалася… Я… Я! Гладжу нямецкае дзіця… У мяне зрабілася суха ў роце ад хвалявання. Але хутка звыклася. І яны звыклі…»

*Соф'я Адамаўна Кунцэвіч, санінструктарка*

«Дайшла да Германіі… Ад Масквы ішла…

Я была старшым фельчарам у танкавым палку. У нас "трыццацьчацвёркі", яны хутка гарэлі. Вельмі страшна. Я да вайны не чула нават стрэлу з вінтоўкі. Недзе адзін раз далёка-далёка бамбілі, калі мы ехалі на фронт, дык мне здавалася — уся зямля дрыжыць. Сямнаццаць гадоў было, толькі тэхнікум скончыла. Ды так атрымалася, што прыехала — і адразу бой.

Вылезла з танка… Пажар… Неба палае… Зямля гарыць, жалеза гарыць… Тут мёртвыя, а там енчаць: "Ратуйце… Дапамажыце…". Такі мяне жах ахапіў! Я не ведаю, як не пабегла. Як не ўцякла з поля бою? Гэта ж такі жах, што словаў няма, адно эмоцыі. Я раней не вытрымлівала, а цяпер ужо гляджу фільмы пра вайну, толькі ўсё роўна плачу.

Дайшла да Германіі…

Першае, што пабачыла на нямецкай зямлі, — самаробны плакат ля самай дарогі: "Вось яна — праклятая Германія!".

Мы зайшлі ў мястэчка... Аканіцы ва ўсіх шчыльна закрытыя. Яны ўсё кінулі і з'ехалі на роварах. Гебельс іх пераканаў, што рускія будуць сячы, калоць, рэзаць. Адчыніш дзверы ў дом: нікога няма ці ўсе ляжаць забітыя або атручаныя. Дзеці ляжаць, яны самі стралялі ў сябе, атручваліся... Што мы адчувалі? Радасць, што перамаглі і ім цяпер балюча, як і нам. Пачуццё помсты. А дзяцей было шкада...

Знайшлі адну старую жанчыну.

Я ёй кажу:

— Мы перамаглі.

Яна заплакала:

— У мяне два сыны ў Расіі загінулі.

— А хто вінаваты? Колькі ў нас загінула!

Яна адказвае:

— Гітлер...

— Гітлер сам вас не штурхаў. Гэта ж вашыя дзеці, мужы...

Яна тады маўчыць.

Дайшла да Германіі...

Хацела маме распавесці... А мая мама памерла ў вайну ад голаду, у іх ні хлеба, ні солі, нічога не было. Брат ляжаў у шпіталі цяжка паранены. Адна сястра дома чакала мяне. Яна пісала, што калі нашыя вызвалілі Арол, яна ўсіх дзяўчат хапала за шынялі. Ёй здавалася, што я абавязкова буду сярод іх. Я павінна была сюды вярнуцца...»

*Ніна Пятроўна Сакава, лейтэнант, фельчарка*

«Дарогі Перамогі...

Вы ўявіць сабе не можаце дарог Перамогі! Рухаліся вызваленыя вязні — з вазкамі, з клункамі,

з нацыянальнымі сцягамі. Рускія, палякі, французы, чэхі… Усё змяшалася, кожны ішоў у свой бок. Усе абдымалі нас, цалавалі.

Сустрэлі рускіх дзяўчат. Загаварыла з імі, і яны распавялі… Адна з іх была цяжарная. Самая прыгожая. Яе згвалціў гаспадар, у якога яны працавалі. Змусіў з ім жыць. Яна ішла і плакала, біла сябе па жываце: “Ну, фрыца я дамоў не павязу! Не панясу!”. Яны яе ўпрошвалі… Але яна засілілася… Разам са сваім фрыцам…

Вось калі трэба было слухаць — слухаць і запісваць. Шкада, што нікому тады такое да галавы не было, усе паўтаралі слова “Перамога”, а астатняе здавалася неістотным.

Мы з сяброўкай ехалі аднойчы на роварах. Ідзе немка, трое дзяцей у яе — двое ў вазочку, адзін побач, за спадніцу трымаецца. Яна такая змучаная. І вось, вы ўяўляеце, параўняўшыся з намі, яна ўкленчыла і кланяецца. Вось так… Да зямлі... Мы не разумеем, што яна кажа. А яна кладзе руку туды, дзе сэрца, і на дзяцей паказвае. Урэшце, мы ўцямілі — яна плача, кланяецца і дзячыць нам за тое, што яе дзеці засталіся жывымі…

Гэта ж была нечая жонка. Яе муж, магчыма, ваяваў на ўсходнім фронце… У Расіі…»

*Настасся Васілеўна Варапаева,*
*яфрэйтар, пражэктарыстка*

«У нас адзін афіцэр закахаўся ў нямецкую дзяўчыну…

Даведалася начальства… З яго знялі званні і адправілі ў тыл. Калі б згвалціў… Такое… Канешне, было… У нас не пішуць, але гэта — закон вайны. Мужчыны столькі гадоў без жанчын заставаліся, ды яшчэ нянавісць. Увойдзем у мястэчка ці вёску — першыя тры дні на рабаванне і… Ну, негалосна, зразумела… Самі

ведаеце… А праз тры дні можна было і пад трыбунал трапіць. Пад гарачую руку. А тры дні пілі і… А тут — каханне. Афіцэр сам прызнаўся ў асобым аддзеле — каханне. Зразумела, гэта — здрада… Закахацца ў немку — у дачку ці жонку ворага? Гэта… І… Ну, карацей, забралі ў яго фотаздымкі, яе адрас. Вядома ж, знайшлі…

Я памятаю… Канешне, я памятаю згвалчаную немку. Яна ляжала голая, граната засунутая паміж ног… Цяпер сорамна, а тады сораму не было. Стаўленне, безумоўна, мянялася. Адно мы адчувалі ў першыя дні, іншае — потым… Праз некалькі месяцаў да нас у батальён… Да нашага камандзіра прыйшлі пяць нямецкіх дзяўчат. Яны плакалі… Гінеколаг агледзеў: у іх там — раны. Раны рваныя. Усе трусы ў крыві… Іх усю ноч гвалцілі… Салдаты стаялі ў чарзе…

Не запісвайце… Выключыце магнітафон… Праўда! Усё — праўда. Паставілі батальён… Гэтым нямецкім дзяўчатам сказалі: падыходзьце і глядзіце, калі каго пазнаеце — расстрэл на месцы. Не паглядзім на званні. Нам сорамна! Але яны толькі сядзелі і плакалі. Яны не хацелі… Яны не хацелі болей крыві. Так і сказалі… Тады ім кожнай далі па бохане хлеба. Усё гэта вайна. Канешне…

Думаеце, лёгка было даравацць? Бачыць цэлыя… белыя… дамкі з дахоўкай. Ружы пад вокнамі… Я сама хацела, каб ім было балюча… Канешне… Хацела бачыць іх слёзы… Зрабіцца добрай адразу нельга. Правільнай і добрай. Такой харошай, як вы цяпер. Шкадаваць іх. Дзеля гэтага мне трэба было, каб дзясяткі гадоў мінула…»

*А. Раткіна, малодшы сяржант, тэлефаністка*

«Родная зямля вызваленая… Паміраць зрабілася зусім невыносна, хаваць было зусім невыносна. Паміралі за чужую зямлю, хавалі ў чужой зямлі. Нам тлумачылі, што

ворага трэба дабіць. Вораг яшчэ небяспечны… Усе разумелі… А паміраць шкада… Ужо нікому не хочацца…

Запомніліся шматлікія плакаты ўздоўж дарог, яны былі падобныя да крыжоў: “Вось яна — клятая Германія!”. Той плакат запомнілі ўсе…

І ўсе чакалі гэтага моманту… Вось зараз мы зразумеем… Мы ўбачым… Адкуль яны? Якая ў іх зямля, якія дамы? Няўжо гэта звычайныя людзі? І яны жылі звычайным жыццём? На фронце я не ўяўляла сабе, што магу зноў чытаць вершы Гайнэ. Свайго ўлюбёнага Гётэ. Я ўжо не магла б слухаць Вагнера… Да вайны, а я вырасла ў сям'і музыкантаў, я любіла нямецкую музыку — Баха, Бетховена. Вялікага Баха! Усё гэта я выкрасліла з сваёй памяці. Потым мы бачылі, нам паказалі крэматорыі… Лагер Асвенцым… Горы жаночай апраткі, дзіцячых чаравічкаў… Шэры попел… Яго на палі вывозілі, пад капусту. Пад салаты… Я не магла болей слухаць нямецкай музыкі… Шмат часу сышло, перш як я вярнулася да Баха. Стала граць Моцарта.

Нарэшце мы на іх зямлі… Першае, што нас уразіла, — гэта іхнія дарогі. Вялікія вясковыя дамы… Гаршчэчкі з кветкамі, прыгожыя фіранкі на вокнах, нават у гумнах. У дамах белыя абрусы. Дарагі посуд. Парцаляна. Я там упершыню пабачыла пральную машыну… Мы не маглі зразумець: навошта ім было ваяваць, калі яны так добра жылі? У нас людзі ў зямлянках туляцца, а ў іх белыя абрусы. Кава ў маленькіх кубачках. А я адно ў музеі такія бачыла. Такія кубачкі… Я забылася распавесці пра адно неверагоднае ўзрушэнне… Мы кінуліся ў наступ, і вось першыя нямецкія акопы, якія мы захапілі… Заскокваем туды, а там у тэрмасах яшчэ гарачая кава. Пах кавы… Галеты. Белыя прасціны. Чыстыя ручнікі. Папера для прыбіральні… У нас усяго гэтага і знаку не

было. Якія прасціны? Спалі на саломе, на вецці. Іншы раз па два-тры дні жылі без гарачага… І нашыя салдаты расстрэльвалі гэтыя тэрмасы… Гэтую каву…

А ў нямецкіх дамах я бачыла расстраляныя кававыя сервізы. Гаршкі з кветкамі. Падушкі… Дзіцячыя вазочкі… Але ўсё роўна мы не здольныя былі зрабіць ім тое, што яны нам нарабілі. Змусіць іх пакутаваць так, як мы пакутавалі.

Нам цяжка было зразумець, адкуль іх нянавісць? Наша зразумелая. А іх?

Дазволілі адпраўляць дамоў пасылкі. Мыла, цукар… Нехта запакоўваў абутак, у немцаў ён трывалы, гадзіннікі, скураныя рэчы. Найперш шукалі гадзіннікі. А я не магла, у мяне была агіда. Я нічога не жадала ў іх браць, хаця ведала, што мама з сястрычкамі жывуць у чужым доме. Наш спалілі. Калі вярнуліся дамоў, сказала маме, яна абняла мяне: “Я таксама нічога не змагла б у іх узяць. Яны забілі нашага тату”.

Томік Гайнэ я разгарнула праз дзясяткі гадоў пасля вайны. Тое самае было і з пласцінкамі нямецкіх кампазітараў, якія любіла да вайны…»

*Аглая Барысаўна Несцярук, сяржант, сувязістка*

«Гэта ўжо ў Берліне… У мяне быў такі выпадак: на вуліцы выскоквае насустрач хлопчык з аўтаматам — фольксштурм, ужо канец вайны. Апошнія дні. У мяне рука таксама на аўтамаце. Напагатове. Ён на мяне глянуў, заміргаў і заплакаў. А я сабе не веру, бо і ў мяне слёзы на вачах. Мне так яго шкада зрабілася, стаіць хлопчык з гэтым аўтаматам ідыёцкім. Піхаю яго да разбуранай будыніны: маўляў, хавайся. А ён спалохаўся, што я яго застрэлю зараз, — у мяне шапка на галаве, не бачна, дзяўчына ці хлопец. За руку мяне хапае. Енчыць!

Я пагладзіла яго па галаве. Ён аслупянеў. Вайна — усё-такі… Ды я і сама аслупянела! Я ж іх усю вайну ненавідзела. Справядліва — несправядліва, а ўсё роўна гідка забіваць, асабліва ў апошнія дні вайны…»

*Альбіна Аляксандраўна Ганцімурава,*
*старшы сяржант, разведчыца*

«Шкадую… Я не выканала адну просьбу…

Прывезлі ў наш шпіталь нямецкага параненага. Мне здаецца, гэта быў лётчык. У яго перабітае сцягно, пачалася гангрэна. Нейкая ахапіла мяне шкадоба. Ляжыць і маўчыць.

Я трохі нямецкую мову разумела. Пытаю:

—Піць даць?

—Не.

Параненыя ведалі, што ў палаце немец. Ён асобна ляжаў. Я іду, яны абураюцца:

—Дык вы ворага поіце?

—Ён памірае… Я абавязаная яму дапамагчы…

Нага ў яго ўся сіняя, нічога ўжо нельга зрабіць. Гангрэна на вачах адымае жыццё, спальвае чалавека за суткі.

Даю яму ваду, а ён на мяне глядзіць і раптам кажа:

—Гітлер капут!

А гэта сорак другі год. Мы пад Харкавам у акружэнні.

Я пытаю:

—Чаму?

—Гітлер капут!

Тады я ў адказ:

—Гэта так кажаш цяпер, бо ў нас ляжыш. А там вы забіваеце…

Ён:

—Я не страляў, я не забіваў. Мяне змусілі. Але я не страляў…

—Усе так кажуць, калі ў палон трапляюць.

І раптам ён мяне просіць:

—Я вельмі... вельмі... прашу, фраў... — і дае мне пакет фотаздымкаў. Паказвае, што вось яго мама, ён, яго браты, сёстры... Прыгожы такі фотаздымак. На зваротным баку піша адрас: — Вы будзеце там. Будзеце! — І гэта казаў немец у сорак другім годзе пад Харкавам. — Дык кіньце, калі ласка, у паштовую скрыню.

Ён напісаў адрас на адным фотаздымку, а там быў поўны канверт. Я яго доўга з сабой вазіла. Вельмі засмуцілася, калі пры моцным абстрэле згубіла. Гэта здарылася ўжо ў Германіі...»

*Лілія Міхайлаўна Бутко, хірургічная медсястра*

«Памятаю бой...

Тады мы захапілі шмат нямецкіх палонных. Былі сярод іх і параненыя. Мы перавязвалі, яны стагналі, як нашыя хлопцы. А спякота... Сквар! Знайшлі чайнік, далі папіць. Месца голае. Па нас страляюць. Загад: хутчэй акопвацца і маскавацца.

Мы пачалі капаць акопы. Немцы глядзяць. Ім патлумачылі: маўляў, дапамагайце капаць, давайце працаваць. Яны, як зразумелі, чаго мы ад іх патрабуем, з жахам на нас азіраліся, бо падумалі, што калі падрыхтуюць ямы, мы іх паставім на ўскрайку і расстраляем. Яны чакалі... Трэба было бачыць, з якой роспаччу яны капалі... Іх твары...

А калі пабачылі, што мы іх перавязалі, напаілі вадой і ў акопы, якія яны выкапалі, сказалі ім хавацца, дык не маглі ачомацца, яны разгубіліся... Адзін немец заплакаў... Гэта быў сталы чалавек, ён плакаў і не хаваў сваіх слёз...»

*Ніна Васілеўна Ільінская, медсястра*

## Пра сачыненне з дзіцячымі памылкамі і кінакамедыі

«Вайна скончылася…

Выклікае зампаліт:

—Вера Іосіфаўна, трэба папрацаваць з нямецкімі параненымі.

А ў мяне на той час ужо былі забітыя два браты.

—Не буду.

—Ну, разумееце, трэба.

—Я не буду, у мяне загінулі два браты, я бачыць іх не магу, я гатовая іх рэзаць, а не лекаваць. Зразумейце мяне…

—Гэта загад.

—Калі загад, тады выканаю. Я — ваенны чалавек.

Я працавала з гэтымі параненымі, рабіла ўсё, што трэба, але мне было цяжка. Дакранацца да іх, палягчаць боль. Тады я знайшла ў сябе першыя сівыя валасы. Менавіта тады. Я рабіла ўсё: аперыравала, карміла, абязбольвала — усё, што належыць. Аднаго толькі не змагла — рабіць вечаровы абход. Зранку ты перавязваеш параненага, слухаеш пульс, карацей, робіш усё, што патрабуецца ад доктара, а падчас вечаровага абходу трэба паразмаўляць з хворым, запытацца, як яму пачуваецца. Вось гэтага я не магла. Перавязаць, прааперыраваць — так, а размаўляць з імі — не. Я пра гэта зампаліта адразу папярэдзіла:

—Вечаровага абходу рабіць не буду…»

*Вера Іосіфаўна Хорава, вайсковы хірург*

«У Германіі… У нашых шпіталях ужо з'явілася шмат нямецкіх параненых…

Памятаю свайго першага. У яго пачалася гангрэна, яму ампутавалі нагу… І ён ляжаў у маёй палаце…

Увечары мне кажуць:

—Каця, ідзі паглядзі свайго немца.

Я пайшла. Можа, рана адкрылася ці што. Ён прачнуўся, ляжыць. Тэмпературы няма, нічога.

Ён так дзіўна глядзіць-глядзіць, потым выцягвае маленькі такі пісталецік:

—На…

Ён кажа па-нямецку, я ўжо не згадаю словаў, але збольшага зразумела, бо вучыла нямецкую ў школе.

—На… — кажа, — я хацеў вас забіваць, але цяпер ты забі мяне.

У тым сэнсе, што яго выратавалі. Ён нас забіваў, а мы яго выратавалі. А я не магу сказаць праўду, што ён памірае…

Сыходжу з палаты і нечакана заўважаю ў сябе слёзы…»

*Кацярына Пятроўна Шалыгіна, медсястра*

«У мяне магла быць сустрэча… Я баялася гэтай сустрэчы…

Калі вучылася ў школе, а я вучылася ў школе з нямецкім ухілам, да нас у госці наведаліся нямецкія школьнікі. У Маскву. Мы хадзілі з імі ў тэатр, разам спявалі. Я ў аднаго нямецкага хлопчыка… Ён так прыгожа спяваў. Мы з ім пасябравалі, я нават у яго закахалася… І ўсю вайну думала: а што, калі сустрэну яго і пазнаю? Няўжо ён таксама сярод гэтых? Я такая эмацыйная, з дзяцінства неверагодна ўражлівая. Неверагодна!

Аднойчы іду полем, толькі бой скончыўся… Сваіх забітых мы падабралі, засталіся немцы… Мне падалося, што ён ляжаў… Ну, такі падобны малады хлопец… На нашай зямлі… Я доўга над ім стаяла…».

*Марыя Анатолеўна Фляроўская, палітработніца*

«Хочаце ведаць праўду? Я яе сама палохаюся…

Адзін наш салдат… Як вам патлумачыць? У яго ўсе дома загінулі. Ён… Нервы… Можа, п'яны? Чым бліжэй была перамога, тым болей пілі. У дамах і скляпах заўсёды можна было знайсці віно. Шнапс. Пілі і пілі. Ён схапіў аўтамат і кінуўся ў нямецкі дом… Расстраляў усю абойму… Ніхто за ім не паспеў. Пабеглі… А ў доме ўжо адны трупы… Дзеці ляжаць… Забралі ў яго аўтамат, звязалі. А ён мацюкаецца: "Дайце я сам застрэлюся".

Яго арыштавалі і судзілі — расстрэл. Я яго шкадавала, усе яго шкадавалі. Ён усю вайну ваяваў. Да Берліна дайшоў…

А ці можна пра гэта пісаць? Раней нельга было…»

*А. С-ва, зенітчыца.*

«Вайна мяне чакала...

Я адзначыла васямнаццаць гадоў… Прынеслі позву: чакаюць у райвыканкаме. З сабой мець на трое сутак харчу, пару бялізны, кубак, лыжку. Гэта называлася: мабілізацыя на працоўны фронт.

Прывезлі нас у горад Наватроіцк Арэнбургскай вобласці. Сталі мы працаваць на заводзе. А маразы былі такія, што ў пакоі паліто замярзала, возьмеш у рукі, а яно цяжкае, як палена. Чатыры гады без адпачынку, нават без выходных працавалі.

Чакалі і чакалі, калі вайне будзе канец… У тры гадзіны ночы шум у інтэрнаце, прыйшлі дырэктар завода і астатняе кіраўніцтва: "Перамога!". А я не маю моцы падняцца з ложка, мяне пасадзяць, а я назад падаю. Цэлы дзень падняць не маглі. Ад радасці, ад вялікага ўзрушэння мяне спаралізавала. Толькі наступным ранкам акрыяла… Выйшла на вуліцу, мне хацелася кожнага абняць і пацалаваць…»

*Ксенія Кліменцьеўна Бялко, баец працоўнага фронту*

«Якое прыгожае слова — перамога...

Я распісалася на Рэйхстагу... Напісала вугалем, тым, што пад руку трапіла: “Перамагла вас руская дзяўчына з Саратава”. Усе нешта пісалі на сценах, нейкія словы. Прызнанні і праклёны...

Перамога! У мяне сяброўкі пытаюць: “Кім ты будзеш?”. А мы ў вайну так нагаладаліся... Не перадаць. Хацелася наесціся хоць раз ад пуза. У мяне мара была — атрымаю першы пасля вайны заробак і куплю скрыню печыва. Кім я буду? Натуральна, кухаркай. І дагэтуль працую ў сферы харчавання.

Другое пытанне: “Калі замуж?”. Як мага хутчэй... Я марыла, як буду цалавацца. Вельмі моцна хацелася цалавацца... Яшчэ хацелася — спяваць. Спяваць! Ну вось...»

*Алена Паўлаўна Шалава, камсарг стралковага батальёна*

«Я навучылася страляць, кідаць гранаты... Ставіць міны. Рабіць першую медыцынскую дапамогу...

Але за чатыры гады... За вайну я забыла ўсе правілы граматыкі. Усю школьную праграму. Магла разабраць аўтамат з заплюшчанымі вачыма, але сачыненне пры паступленні ў інстытут напісала з дзіцячымі памылкамі і амаль без косак. Выратавалі баявыя ўзнагароды — у інстытут прынялі. Пачала вучыцца. Чытаю кнігі — і не разумею, чытаю вершы — і не разумею. Я забыла гэтыя словы...

Начамі ахоплівалі жахі: эсэсаўцы, гырканне сабак, апошнія ўскрыкі... Калі чалавек памірае, дык часта нешта шэпча, гэта страшней за крык... Усё да мяне вярталася... Чалавека вядуць на расстрэл... У ягоных вачах страх... Разам з тым відаць, што ён не верыць, да апошняй хвіліны не верыць. І цікаўнасць таксама,

і цікаўнасць ёсць. Ён стаіць пад аўтаматам і ў апошнюю хвіліну захінаецца рукамі. Твар хавае... Да ранку мая галава разбухала ад крыку...

Падчас вайны я не задумвалася, а тут стала думаць. Згадваць... Усё былое паўтаралася і паўтаралася... Я не спала... Дактары забаранілі мне вучыцца. Але дзяўчаты — суседкі ў пакоі — сказалі, каб не слухала дактароў, і ўзялі нада мной шэфства. Кожны вечар па чарзе цягнулі мяне ў кіно, на камедыі. "Ты мусіш навучыцца смяяцца. Шмат смяяцца". Хацела ці не — цягнулі. Камедый было мала, і кожную я глядзела па сто разоў, разоў сто — найменей. Першы час смяялася, як плакала...

Але кашмары адчапіліся. Змагла вучыцца...»

*Тамара Усцінаўна Варабейкава, падпольшчыца*

## Пра Радзіму, Сталіна і чырвоны паркаль

«Гэта была вясна...

Гінулі маладыя хлопцы, гінулі ўвесну... У сакавіку, красавіку... Запомніла, што ўвесну, калі сады ў квецені і ўсе чакаюць перамогі, хаваць людзей было найцяжэй. Нават калі вам гэта ўжо казалі, яшчэ раз згадайце. Моцна памятаецца...

Два з паловай гады я была на фронце. Тысячы перавязак зрабілі мае рукі, тысячы ран прамылі... Перавязвала і перавязвала... Аднойчы пайшла змяніць хусцінку, прытулілася да шыбіны і забылася. Ачуняла — і адчуваю, што адпачыла. Сустракае мяне доктар і пачынае ганіць. Я нічога не разумею... Ён сышоў, але перад гэтым даў мне два нарады па-за чаргой. Мая напарніца патлумачыла, у чым справа: я адсутнічала больш за гадзіну. Не заўважыла, як заснула.

Цяпер здароўе слабое, нервы нічога не вартыя. А калі пытаюцца: "Якія ў вас узнагароды?", — сорамна прызнацца, што няма ў мяне ўзнагарод, не паспелі мяне ўзнагародзіць. І, магчыма, таму не паспелі, што шмат нас было на вайне і кожны рабіў, што мог... Што было ў ягоных сілах... Хіба можна ўзнагародзіць кожнага? Але ёсць у нас ва ўсіх самая вялікая ўзнагарода — 9 мая. Дзень Перамогі!

Згадваецца нязвыклая смерць. Ніхто тады не звярнуў увагі, не да таго было... А я згадваю... У нас памёр адзін капітан у першы дзень, як мы ступілі на нямецкую зямлю. У яго, мы ведалі, уся сям'я загінула ў акупацыі. Гэта быў мужны чалавек, ён так чакаў... Ён баяўся загінуць раней. Не дажыць да таго дня, калі ўбачыць іх зямлю, іх няшчасце, іх гора. Як яны плачуць, як пакутуюць. Убачыць руіны замест іх дамоў. Памёр ён проста так, не паранены, нічога. Дайшоў, паглядзеў — і памёр.

Я і цяпер часам думаю: чаму ён памёр?»

*Тамара Іванаўна Кураева, медсястра*

«Я папрасілася на перадавую проста з цягніка... Адразу... Ішла вайсковая частка — я да яе. На тую пару мне ўяўлялася, што з перадавой хоць на дзень раней дахаты вярнуся, чым з тылу. Маму дома пакінула. Нашыя дзяўчаты і цяпер згадваюць: "Яна не хацела ў санроце быць". І праўда, прыйду ў санроту, памыюся, бялізну якую вазьму — і назад у свой акоп. На перадавыя пазіцыі. Пра сябе не думала. Паўзеш, бяжыш... Вось толькі пах крыві... Да паху крыві я прызвычаіцца не змагла...

Пасля вайны ў радзільным аддзяленні ўладкавалася акушэркай — але нядоўга там затрымалася. Мала... У мяне алергія на пах крыві, проста не трываў яго арганізм. Столькі той крыві на вайне было, што болей

ужо не вытрымлівала. Арганізм ужо не прымаў. Сышла з "радзілкі" на "Хуткую дапамогу". У мяне крапіўніца была, я задыхалася.

А пашыла з чырвонай тканіны блузку, па руках распаўзліся нейкія плямы. Пухіры. Ці то ад чырвонага паркалю, ці то ад чырвоных кветак — ружаў або гваздзікоў — я рабілася хворай. Нічога чырвонага, нічога колеру крыві... У мяне і цяпер нічога чырвонага ў доме няма. Не знойдзеш. Чалавечая кроў вельмі яркая, ні ў прыродзе, ні ў мастакоў на карцінах я не сустракала такога яркага колеру. Сок граната трохі падобны, і то не зусім. Спелага граната...»

*Марыя Якаўлеўна Яжова, гвардыі лейтэнант, камандзір санітарнага ўзвода*

«Вох-вох-вох... Ха-ха-ха... Усе вохкаюць ды ахаюць, якая я квяцістая. Расфуфыраная. А я і на вайне была такая. Не вайсковая. Розныя бірулькі на мне... Добра, што камандзір у нас быў, як цяпер сказалі б, дэмакрат. Не з казармы, а з універсітэта. Уяўляеце сабе, дацэнт. З шляхетнымі манерамі. На той час... Рэдкая птушка... Рэдкая птушка да нас заляцела...

Я люблю пярсцёнкі, хай і танныя, але каб шмат, на кожнай руцэ. Люблю якасную парфуму. Модную. Усялякія бразготкі. Розныя і шмат. У нашай сям'і заўжды смяяліся: "Чаго б нашай шалёнай Аленцы падарыць на дзень народзінаў? Натуральна, пярсцёнак". Пасля вайны першы пярсцёнак брат выпілаваў мне з бляшанкі з-пад кансерваў. І кулон тачыў-тачыў і вытачыў з зялёнага шкла бутэлькі. А яшчэ адзін — са светла-карычневага.

Усё на сябе чапляю, як сарока, усё, што блішчыць. Ніхто не дае веры, што я была на вайне. Сама ўжо не

веру. Мы з табой размаўляем, а ў шкатулцы ляжыць ордэн Чырвонай Зоркі... Самы прыгожы ордэн... Праўда, прыгожы? Мне яго спецыяльна далі. Ха-ха-ха... А калі сур'ёзна... Дзеля гісторыі, так? Гэтая штуковіна ў цябе запісвае... Значыць, дзеля гісторыі... Скажу вось што: калі не быць жанчынай, дык на вайне не выжыць. Я ніколі не зайздросціла мужчынам. Ні ў дзяцінстве, ні ў юнацтве, ні на вайне. Я заўсёды цешылася, што я жанчына. Кажуць, што зброя — аўтамат, пісталет — прыгожая, у ёй шмат чалавечай думкі, жарсці, а для мяне яна ніколі не была прыгожай. Я бачыла, з якім захапленнем мужчыны трымаюць у руцэ пісталет, але мне гэта не зразумела. Я — жанчына.

Чаму засталася адна? Жаніхі ў мяне былі. Хапала жаніхоў... Але вось адна... Сама сябе забаўляю. Усе сяброўкі ў мяне маладыя. Я люблю маладосць. Мяне старасць палохае болей, чым вайна. Ты позна прыйшла... Я цяпер пра старасць думаю, а не пра вайну...

А штуковіна твая працуе, так? Дзеля гісторыі, так?»

*Алена Барысаўна Звягінцава, радавая, збройніца*

«Я — дома.... Усе жывыя... Мама выратавала ўсіх: дзядулю з бабуляй, сястрычку і брата. І я вярнулася...

Праз год прыехаў наш тата. Ён меў найвышэйшыя ўзнагароды, ды я прывезла ордэн і два медалі. Але ў нас у сям'і галоўнай гераіняй была мама. Яна ўсіх выратавала. Зберагла сям'ю, зберагла дом. У яе была самая страшная вайна. Тата ніколі не прышпільваў ні ордэнаў, ні ордэнскіх калодак, ён лічыў, што выстаўляцца перад мамай няёмка. Сорамна. У мамы ж няма ўзнагарод...

Нікога ў жыцці я так не люблю, як сваю маму...»

*Рыта Міхайлаўна Акунеўская, радавая, мінёрка*

«Я вярнулася іншай… У мяне доўга былі ненармальныя стасункі са смерцю. Дзіўныя, я б так сказала…

Па Мінску рушыў першы трамвай, і я ў гэтым трамваі ехала. Раптам ён спыніўся, усе крычаць, жанчыны плачуць: “Чалавека забіла! Чалавека забіла!”. А я адна сяджу ў вагоне і зразумець не магу: з чаго ўсе плачуць? Я зусім не адчувала, што гэта страшна. Столькі забітых на фронце бачыла… Таму і не рэагавала. Я звыклася жыць сярод іх. Забітыя заўсёды побач… Каля іх кураць, харчуюцца. Размаўляюць. Яны не недзе там, не ў зямлі, як у мірным жыцці. А заўсёды тут. З намі.

А потым вярнулася гэтае пачуццё, зноў было страшна, калі пабачу мёртвага чалавека. У труне. Праз колькі гадоў да мяне гэтае пачуццё вярнулася. Я зрабілася нармальная… Падобная да іншых…»

*Бэла Ісакаўна Эпштэйн, сяржант, снайперка*

«Да вайны…

Я была ў тэатры. Падчас антракту, калі запалілі святло, я яго ўбачыла… Усе яго пабачылі… Усчалася бура апладысментаў. Гром! Ва ўрадавай ложы сядзеў Сталін. У мяне быў арыштаваны бацька, знік у лагерах старэйшы брат, але ўсё роўна я адчула такое захапленне, што пырснулі слёзы з вачэй. Я абмерла ад шчасця! Уся зала… Уся зала ўсхапілася! Стаяла і шалёна пляскала ўвесь антракт.

Такая я прыехала на вайну. Ваяваць. А на вайне пачула ўтоеныя размовы… Ноччу параненыя кураць у калідоры. Хто спіць, а хто не спіць… Шапталіся пра Тухачэўскага, пра Якіра… Зніклі тысячы, мільёны людзей! Куды? Украінцы распавядалі… Як іх у калгасы заганялі. Застрашалі… Як Сталін арганізаваў голад, яны называлі яго — галадамор. Звар'яцелыя маці елі сваіх дзяцей… А зямля там такая багатая, што ўваткнеш

галінку — вярба вырасце. Палонныя немцы яе ў пасылкі насыпалі і дамоў адпраўлялі. Такая яна тлустая, гэтая зямля. Метр чарназёму. Размовы былі ціхія… Амаль шэптам… Ніколі такіх размоваў не вялося ў хаўрусе, а толькі, калі два чалавекі. Трэці лішні, трэці данясе…

Анекдот згадаю… Згадаю, каб не заплакаць. Значыць, так… Ноч. Барак. Вязні ляжаць і размаўляюць. Пытаюць кожнага: “За што арыштавалі?”. Адзін кажа — за праўду, другі — за бацьку… А трэці адказвае: “За лянoту”. Як?! Усе здзівіліся. Апавядае: “Былі ўвечары ў адной кампаніі і пераказвалі анекдоты. Дамоў вярнуліся позна. Жонка пытае: «Цяпер пойдзем з даносам ці зранку?» — «Давай, — кажу, — заўтра. На сон цягне». А зранку па нас прыйшлі…”.

Смешна. А не смяешся. Плакаць хочацца. Плакаць.

Пасля вайны… Усе чакалі родных з фронту, а мы з мамай чакалі з лагера. З Сібіры… Як жа! Мы ж перамаглі, мы ж даказалі сваю вернасць, сваю любоў. Цяпер нам дадуць веры.

Брат вярнуўся ў сорак сёмым, а тату мы не знайшлі… Ездзіла я да сваіх франтавых сябровак ва Украіну. Жывуць яны ў вялікай вёсцы пад Адэсай. Там стаяць два абеліскі: палова вёскі памерла ад голаду, а ўсе мужчыны загінулі на вайне. А як у Расіі палічыць? Яшчэ тыя людзі жывыя, трэба хадзіць і пытацца. Такіх, як ты, мая дзяўчынка, на нашу гісторыю трэба сотні. Каб апісаць нашыя пакуты. Наша мора слёз. Мая ты дзяўчынка…»

*Наталля Аляксандраўна Купрыянава,*
*хірургічная медсястра*

# «РАПТАМ СТРАШНА ЗАХАЦЕЛАСЯ ЖЫЦЬ...»

Тэлефон звоніць і звоніць. Запісваю новыя адрасы, атрымліваю новыя лісты. І немагчыма спыніцца, бо кожны раз праўда невыносная.

*Тамара Сцяпанаўна Умнягіна, гвардыі малодшы сяржант, санінструктарка:*

«Ах, мая ты брыльянтавая...

Усю ноч згадвала, збірала ў памяці...

Прыбегла я ў ваенкамат: спаднічка з радна, на нагах прапітаныя гумай тэпці, яны, як туфлікі, зашпільваліся, гэта была мода з модаў. Вось на мне гэтая спаднічка, тэпці — папрасілася на фронт, атрымала згоду. Села на нейкую машыну. Даехала да вайсковай часткі, гэта стралковая дывізія, яна пад Мінскам стаяла, а мне кажуць, што непатрэбная ты тут, маўляў, сорамна мужчынам, калі сямнаццацігадовыя дзяўчаткі будуць ваяваць. І далей у тым сэнсе, што хутка ворага знішчожым, таму ідзі ты, дзяўчынка, да мамы. Я, натуральна, пакрыўдзілася, што не бяруць на вайну. І што я раблю? Іду да начальніка штаба, а ў яго сядзіць той палкоўнік, які мне адмовіў, і я кажу: "Таварыш начальнік яшчэ вышэйшы, дазвольце не паслухацца таварыша палкоўніка. Я ўсё роўна дамоў не паспею вярнуцца, буду з вамі адступаць. Куды я пайду — немцы ўжо блізка". Так мяне і звалі потым: "Таварыш начальнік яшчэ вышэйшы". Гэта быў сёмы дзень вайны. Пачалі мы адступаць...

Хутка крывёю ўмыліся. Параненых апынулася вельмі шмат, але яны былі такія ціхія, яны так трывалі, яны

так хацелі жыць. Усе хацелі дажыць да пераможнага дня. Чакалі: вось-вось... Памятаю, у мяне ўсё набрыняла крывёю — аж да... Тэпці мае падзерліся, далей ішла басанож. Што я бачыла? Пад Магілёвам бамбілі станцыю. І там цягнік з дзецьмі. Іх сталі выкідаць у вокны вагонаў, маленькія дзеці — тры-чатыры годзікі. Непадалёку лес, вось яны бягуць у той лес. Тут з'явіліся нямецкія танкі, і танкі пайшлі па дзецях. Нічога ад дзетак не засталося... Ад гэтай карціны і сёння можна звар'яцець. Але ў вайну людзі вытрымлівалі, вар'яцелі яны пасля вайны. Хварэлі пасля вайны. А ў вайну верады страўніка гаіліся самімі шнарамі. На снезе спіш, шынялёк слабы, а зранку нават носам не чмыхаеш.

Потым трапіла наша часць у акружэнне, у мяне столькі параненых, толькі ніводная машына не хоча запыніцца. А немцы наступаюць на пяты, вось-вось абкладуць канчаткова. Тады адзін паранены лейтэнант дае мне свой пісталет: "Умееш страляць?". Скуль я ўмею? Я толькі бачыла, як страляюць. Аднак узяла пісталет і пайшла з ім на дарогу спыняць машыны. Там першы раз вылаялася. Як мужык. Сапраўдным трохпавярховым матам... Усе машыны міма... Першы раз стрэліла ў паветра... Ведаю, што параненых на руках не зможам забраць. Не выцягнем. Яны просяць: "Хлопцы, дабіце. Не пакідайце нас так". Другі стрэл... Прадзіравіла кузаў... "Дурная! Ты навучыся спачатку страляць". Запыніліся. Дапамаглі пагрузіць.

Але самае страшнае было наперадзе, самае страшнае — гэта Сталінград. Якое там поле бою? Гэта горад — вуліцы, дамы, скляпы. Паспрабуй выцягні адтуль параненага. У мяне цела было — суцэльны сіняк. І штаны ў мяне ўсе ў крыві. Цалкам. Старшына нас папярэджваў: "Дзяўчаты, болей няма штаноў, і не прасіце". А ў нас

штаны засохнуць і стаяць, ад крухмалу так не стаяць, як ад крыві, парэзацца можна. Плямкі чыстай няма, увесну не будзе чаго здаваць. Гарэла ўсё, на Волзе і вада гарэла. Нават узімку Волга не замярзала, а гарэла. У Сталінградзе не было ніводнага лапіка зямлі, не палітага крывёю. Рускай і нямецкай. І бензінам... Алівай... Там усе зразумелі, што адступаць далей няма куды, нельга нам адступаць: ці загінем усе — краіна, рускі народ — ці пераможам. Гэта ўсім стала зразумела, настаў такі момант. Уголас не казалі, але кожны разумеў. Генерал і салдат разумеў...

Прысылаюць дапамогу. Маладыя такія, прыгожыя хлопцы. Перад боем глядзіш і ўжо ведаеш, што іх заб'юць. Я баялася новых людзей. Баялася запамінаць, размаўляць. Таму што сёння яны прыехалі, а праз два-тры дні іх ужо няма... Глядзіш, глядзіш на іх перад боем... Гэта ж сорак другі год — самы складаны, самы цяжкі момант. Быў выпадак, калі з трох соцень напрыканцы дня нас засталося толькі дзесяць. І калі нас столькі засталося, калі ўсё сцішылася, мы сталі цалавацца, плакаць, што мы раптам жывыя. Родныя адно аднаму. Парадніліся.

На тваіх вачах чалавек памірае... І ты ведаеш, бачыш, што нічым не можаш яму дапамагчы, у яго лічаныя хвіліны засталіся. Цалуеш яго, гладзіш яго, ласкавыя словы яму кажаш. Развітваешся з ім. Ну, нічым ты яму болей не здольны дапамагчы... Гэтыя твары ў мяне вось і цяпер у памяці. Я бачу іх — усіх-усіх хлопцаў. Чамусьці гады прамінулі, а хоць бы каго забыць, хаця б адзін твар. Вось жа, нікога не забыла, усіх памятаю... Усіх бачу... Нам хацелася самім ім магілкі выкопваць, сваімі рукамі, але так не заўсёды атрымлівалася. Мы сыходзілі, а яны заставаліся. Здаралася, забінтуеш усю

галаву, а ён у цябе пад бінтамі памёр. І яго хаваюць з забінтаванай галавой. Іншы, калі на полі бою паміраў, ён хаця б у неба глядзеў. Ці паміраe і просіць: “Заплюшчы мне вочы, сястрычка, толькі акуратна”. Горад разбураны, дамы — гэта, канешне, страшна, але калі людзі ляжаць, маладыя мужчыны... Ты не можаш аддыхацца, ты бяжыш... Ратуеш... Здаецца, што моцы ўжо няма, болей, чым на пяць хвілінаў, цябе ўжо не хопіць... Але ты бяжыш... Сакавік, першая вада пад нагамі... Валёнкі абуваць нельга, а я насунула і пабегла. Цэлы дзень у іх поўзала, пад ноч яны зрабіліся такія мокрыя, што не магла іх зняць. Мусіла рэзаць. І не захварэла... Уяўляеш, мая брыльянтавая?

Калі ў Сталінградзе скончыліся баі, мы атрымалі загад вывозіць найбольш цяжка параненых на параходах, баржах у Казань, Горкі. Гэта ўжо вясна, недзе сакавік-красавік. Але столькі яшчэ знаходзілі скалечаных, яны хаваліся ў зямлі — у акопах, зямлянках, сутарэннях... Іх было так шмат, я пераказаць не магу. Гэта быў жах! Мы заўсёды думалі, калі выносілі параненых з поля бою, што іх ужо не засталося, усіх забралі, у самім Сталінградзе іх няма, а калі ўсё скончылася, дык іх выявілася столькі, што не верылася... Не ўявіць... На тым параходзе, дзе я плыла, сабралі тых, хто без рук, без ног, сотні хворых на сухоты. Мы мусілі іх лекаваць, суцяшаць ціхімі словамі, супакойваць усмешкай. Калі нас сюды накіроўвалі, дык казалі, маўляў, будзе вам адхланне ад баёў, гэта як бы падзяка, узнагарода такая была. А наяве атрымалася нават больш страшна, чым сталінградскае пекла. Там з бою выцягнула чалавека, справіла яму першую медычную дапамогу, перадала — маеш пэўнасць: цяпер усё добра, яго адвезлі. Ідзеш, паўзеш, спяшаешся па наступнага. А тут яны ўвесь час на

тваіх вачах… Там яны прагнулі жыць, імкнуліся жыць: “Хутчэй, сястрычка! Хутчэй, мілая!”. А тут адмаўляюцца есці, марaць пра смерць. Яны выкідаліся з парахода. Мы іх вартавалі. Я каля аднаго капітана нават начамі сядзела — у яго не было рук, ён хацеў пакончыць з жыццём. І аднойчы іншую медсястру не папярэдзілі, на некалькі хвілінаў адлучылася, і ён кінуўся за борт…

Прывезлі мы ўсіх ва Усолле, гэта каля Пярмі. Там ужо чакалі навюткія чысценькія дамкі, усё спецыяльна для параненых. Як піянерскі летнік… Мы іх на насілках пераносім, а яны зубамі за зямлю чапляюцца. Здаецца, ну прыняла бы ўсялякага за мужа. На руках бы яго насіла. Вяртаемся на параходзе, пустыя, адпачыць можна, а мы не спім. Дзяўчаты ляжаць-ляжаць, а потым як загалосяць… Мы сядзелі і кожны дзень пісалі ім лісты. Вызначылі, хто каму піша. Тры-чатыры лісты на дзень.

І вось якая драбяза. Я пасля гэтага пачала хаваць у баі свае ногі і твар. У мяне былі прыгожыя ногі, я так баялася, што іх знявечаць. І за твар хвалявалася. Вось як…

Пасля вайны некалькі гадоў не магла вызваліцца ад паху крыві, ён праследаваў мяне доўга-доўга. Стану мыць бялізну — чую гэты пах, пачну гатаваць абед — зноў чую. Падарылі мне чырвоную блузку, а тады ж гэта была вялікая рэдкасць, матэрыі не хапала, але я яе не адзявала, бо яна чырвоная. Вось гэты колер я любіць ужо не магла. Не магла хадзіць па прадукты. У мясныя аддзелы. Асабліва ўлетку… І бачыць курынае мяса, разумееш, яно вельмі падобнае… Такое ж белае, як чалавечае… У мяне муж хадзіў… Улетку зусім не магла заставацца ў горадзе, спяшалася хоць куды з’ехаць. Як толькі лета, мне здаецца, што зараз пачнецца вайна. Калі сонца награвала дрэвы, дамы, асфальт — усё гэта

пах мела, усё гэта пахла для мяне крывёю. Што б я ні ела, ні піла, не магла ўратавацца ад гэтага паху. Нават чыстую бялізну засцялю, а яна мне крывёю тхне...

...Майскія дні сорак пятага... Памятаю, што мы шмат фатаграфаваліся. Былі неверагодна шчаслівыя. Дзявятага мая — усе крычаць: "Перамога! Перамога!". Салдаты качаліся па траве — Перамога! Білі чачотку. Ай-да-я-я-я...

Стралялі... Што ў каго ёсць, з таго і стралялі...

—Спыніць страляніну! — крычалі камандзіры.

—Усё роўна патроны застаюцца. А навошта яны? — не разумелі мы.

Што б хто ні казаў, я чула адно слова — Перамога! І раптам страшна захацелася жыць! А як прыгожа мы ўсе цяпер пачнём жыць! Надзела ўсе свае ўзнагароды і папрасіла, каб мяне сфатаграфавалі. Чамусьці захацелася сярод кветак. Сфатаграфавалася ў нейкім кветніку.

Сёмага чэрвеня ў мяне было шчасце, было маё вяселле. Батальён зладзіў нам вялікае свята. Мужа я ведала даўно: ён быў капітанам, камандаваў ротай. Мы з ім пакляліся, калі застанемся жыць, дык возьмем шлюб пасля вайны. Далі нам месяц адпачынку...

Мы выправіліся ў Кінешму, гэта Іванаўская вобласць, да ягоных бацькоў. Я ехала гераіняй, я ніколі не думала, што інакш можна сустрэць франтавую дзяўчыну. Мы ж столькі ваявалі, столькі ўратавалі мацеркам дзяцей, жонкам мужоў. Як раптам... Я зведала абразы, я пачула крыўдныя словы. Дагэтуль акрамя як: "сястрычка родная", "сястрычка дарагая", нічога іншага не чула. А я не якая-небудзь была, я была прыгожанькая. Мне далі новую форму.

Селі ўвечары піць гарбату, маці адвяла сына на кухню і плача: "З кім ты ажаніўся, з франтавой... У цябе ж

дзве малодшыя сястры. Хто іх цяпер замуж возьме?". І сёння, калі пра гэта згадаю, прыкра робіцца. Уяўляеце: прывезла я пласцінку, вельмі любіла яе. Там былі такія словы: "*і табе належыць з поўным правам у шыкоўных туфліках хадзіць*...". Гэта пра франтавую дзяўчыну. Я яе паставіла на грамафон, дык старэйшая сястра падышла і на маіх вачах раструшчыла, маўляў, няма ў вас ніякіх правоў. Яны знішчожылі ўсе мае франтавыя фотаздымкі... Ах ты, мая брыльянтавая, словаў для гэтага няма. Не маю я словаў...

Харчаваліся тады па літарах, такія былі карткі. Мы з мужам склалі свае літары і паехалі іх атаварваць. Прыйшлі, гэта склад адмысловы, там ужо чарга, мы сталі і чакаем. І вось падыходзіць мая чарга, як раптам мужчына, які стаяў за прылаўкам, пераскоквае праз яго — і да мяне, цалуе, абдымае і крычыць: "Хлопцы! Хлопцы! Я яе знайшоў. Я яе ўбачыў. Так хацеў сустрэць, так хацеў знайсці. Хлопцы, гэта яна мяне ўратавала!". І мой муж побач стаіць. А гэта паранены, якога я з-пад агню выцягнула. З-пад абстрэлу. Ён мяне запомніў, а я? Я хіба ўсіх запомню, іх колькі было! Іншым разам на вакзале інвалід перастрэў: "Сястрычка! — пазнаў. І плача: — Думаў, сустрэну, на калені стану...". А нагі адной у яго няма...

Хапанулі мы гора, франтавыя дзяўчаты. І пасля вайны нам хапіла, пасля вайны ў нас была яшчэ адна вайна. Таксама страшная. Патроху мужчыны пакінулі нас. Не прыкрылі. На фронце па-іншаму было. Паўзеш — ляцяць аскепкі ці кулі... Хлопцы берагуць... "Кладзіся, сястрычка!" — крыкне хто-небудзь і сам на цябе падае, сабой закрывае. І куля ўжо яго... Ён — мёртвы ці паранены. Мяне тры разы так уратавалі.

З Кінешмы мы зноў вярнуліся ў сваю частку. Там даведаліся, што нас не расфармоўваюць, мы будзем

размініраваць палі. Калгасам трэба даць зямлю. Для ўсіх вайна скончылася, а для сапёраў яшчэ працягвалася. Хаця маці ўжо ведаюць, што Перамога... Травы стаяць высокія-высокія, а пад імі яшчэ міны, бомбы. А людзям патрэбная зямля, і мы спяшаемся. І кожны дзень гінуць нашыя таварышы. Кожны дзень пасля вайны трэба было хаваць... Шмат людзей мы пакінулі там, у палях... Шмат... Ужо зямлю вернем калгасу, рушыць трактар, а недзе міна стаілася, былі і супрацьтанкавыя, і трактар выбухае, і трактарыст гіне. А трактароў не так шмат. І мужчынаў не так шмат засталося. І бачыць гэтыя вось слёзы ў вёсцы пасля вайны... Бабы галосяць, дзеці румзаюць... Згадваецца, быў у нас салдат... Пад Старой Русай, запамятавала вёску, ён быў сам адтуль, пайшоў разміноўваць свой калгас, сваё поле і там загінуў. Усёй вёскай яго там хавалі. Ён усю вайну праваяваў, чатыры гады, а пасля вайны загінуў на сваёй бацькаўшчыне, на родным полі.

Я як толькі пачну пераказваць, дык адразу раблюся хворай. Апавядаю, а ў мяне ўнутры быццам халадзец, усё дрыжыць. Зноў усё бачу, уяўляю: як ляжаць забітыя, у іх раты параскрываныя, нешта крычалі і не дакрычалі, кішкі вывернутыя. Бярвёнаў меней бачыла, чым забітых... А як страшна! Як страшна ў разаніне, дзе чалавек на чалавека са штыхом ідзе... Голым штыхом. Пачынаеш заікацца, некалькі дзён слова цалкам не вымавіць. Губляеш мову. Хіба гэта зразумее той, хто там не быў? А як распавесці? З якім тварам? Ну, ты адкажы мне — з якім тварам пра гэта трэба казаць? Іншыя неяк могуць... Здольныя... А я — не. Плачу. А гэта трэба, трэба, каб засталося. Важна пераказаць. Недзе павінен захавацца наш крык. Наш енк...

Я заўсёды чакаю нашае свята. Дзень Перамогі... Чакаю і палохаюся яго. Некалькі тыдняў наўмысна збіраю

бялізну, каб шмат было бялізны, і цэлы дзень мыю. Я мушу быць чымсьці занятай, я павінна ўвесь дзень думаць пра нешта іншае. А калі мы сустракаемся, нам насовак не хапае — вось што такое нашы франтавыя сустрэчы. Мора слёз… Я не люблю ваенных цацак, дзіцячых ваенных цацак. Танкі, аўтаматы… Хто гэта прыдумаў? Мне верне душу. Я ніколі не купляла і не дарыла дзецям такіх цацак. Ні сваім, ні чужым. Аднойчы нехта ў дом прынёс ваенны самалёцік і пластыкавы аўтамат. Тут жа выкінула на сметнік. Адразу! Бо чалавечае жыццё — гэта такі падарунак… Вялікі! Сам чалавек яму не гаспадар.

Ведаеце, якая на вайне была ў нас ва ўсіх думка? Мы марылі: “Вось, дажыць бы… Якія гэта будуць шчаслівыя людзі пасля вайны! Якое шчаслівае, якое прыгожае пачнецца жыццё! Людзі, якія столькі перажылі, яны стануць адно аднаго берагчы. Любіць. Гэта будуць зусім іншыя людзі”. Мы не сумняваліся ў гэтым. Ні на каліўца.

Мая ты брыльянтавая… А людзі ж па-ранейшаму ненавідзяць адно аднаго. Зноў забіваюць. Мне гэтага не зразумець… І хто гэта? Мы… Мы гэта…

Пад Сталінградам… Цягну двух параненых. Аднаго падцягну — пакіну, потым другога. І так па чарзе, бо абодва цяжка параненыя, іх нельга пакідаць, у абодвух, калі казаць па-простаму, высока адбітыя ногі, яны ўсе ў крыві. Тут хвіліна каштоўная, кожная хвіліна. І калі я далей ад бою адпаўзла, меней стала дыму, дык раптам заўважаю, што цягну аднаго нашага танкіста і аднаго немца… Мяне ахапіла паніка: за спінай нашыя гінуць, а я немца ратую… Там, у дыме, не згледзела… Бачу: чалавек памірае, чалавек крычыць… А-а-а… Яны абодва абгарэлыя, чорныя. Аднолькавыя. А тут я разгледзела: чужы медальён, чужы гадзіннік, усё чужое. Гэта форма

праклятая. І што цяпер? Цягну далей нашага параненага і думаю: "Вяртацца па немца ці не?". Я разумела, што калі яго пакіну, дык ён хутка памрэ. Ад страты крыві... І я папаўзла па яго... І цягнула далей абодвух...

Гэта ж Сталінград... Самыя страшныя баі. Самыя-самыя. Мая ты брыльянтавая... Не можа быць адно сэрца для нянавісці, а другое — для любові. У чалавека яно адно, і я заўсёды думала, як выратаваць маё сэрца.

Пасля вайны доўга баялася неба, нават падняць галаву да неба. Баялася ўзаранай зямлі. А па ёй ужо без страху хадзілі гракі. Птушкі хутка забыліся на вайну...»

1978–2004

## ЗМЕСТ

ЧАЛАВЕК БОЛЬШЫ ЗА ВАЙНУ
(З дзённіка кнігі) .......... 7
1978–1985 гг. .......... 7
Праз сямнаццаць гадоў (2002–2004 гг.) .......... 24
З таго, што скасавала цэнзура .......... 26
Размовы з цэнзарам .......... 28
З таго, што выкінула я сама .......... 33

«НЕ ХАЧУ ЗГАДВАЦЬ...» .......... 39

«ПАДРАСЦІЦЕ, ДЗЯЎЧАТКІ...
ВЫ ЯШЧЭ ЗЯЛЁНЫЯ...» .......... 55
Пра клятвы і малітвы .......... 56
Пра пах страху і чамадан цукерак .......... 69
Пра побыт і быццё .......... 88

«АДНА Я ВЯРНУЛАСЯ ДА МАМЫ...» .......... 103

«У НАШЫМ ДОМЕ ДЗВЕ ВАЙНЫ ЖЫВУЦЬ» .......... 124

«ТЭЛЕФОННАЯ ТРУБКА НЕ СТРАЛЯЕ...» .......... 132

«НАС УЗНАГАРОДЖВАЛІ МАЛЕНЬКІМІ
МЕДАЛЯМІ...» .......... 147
Пра лялькі і вінтоўкі .......... 151
Пра пах крыві і здзіўленне перад смерцю .......... 156
Пра коней і птушак .......... 160

«ГЭТА БЫЛА НЕ Я…» .......................................164

«Я ГЭТЫЯ ВОЧЫ І СЁННЯ ПАМЯТАЮ…» ............174

«МЫ НЕ СТРАЛЯЛІ…»........................................192
Пра чаравічкі і клятую кавялу.......................192
Пра адмысловае мыла «К» і гаўптвахту ..............200
Пра расплаўленыя падшыпнікі і рускі мат… .......208

«ПАТРЭБНЫ БЫЎ САЛДАТ…
А ХАЦЕЛАСЯ БЫЦЬ ЯШЧЭ ПРЫГОЖАЙ…»..........217
Пра мужчынскія боты і жаночыя капялюшыкі....218
Пра дзявочы дыскант і матроскія забабоны ........229
Пра моўчу вусцішы і прыгажосць уяўлення.........239

«ПАНЕНКІ! А ВАМ ВЯДОМА: КАМАНДЗІР
САПЁРНАГА ЎЗВОДА ЖЫВЕ
ТОЛЬКІ ДВА МЕСЯЦЫ».......................................242

«ТОЛЬКІ ПАГЛЯДЗЕЦЬ АДЗІН РАЗ…»......................257
Пра чортавую бабу і майскія ружы ......................257
Пра дзіўную цішыню,
неба і згублены пярсцёнак .................................271
Пра адзіноту кулі і чалавека................................280

«ПРА БУЛЬБУ ДРОБНЕНЬКУЮ…» ..........................283
Пра кошык з мінай і плюшавую цацку ...................284
Пра мамак і татак ............................................296
Пра маленькае жыццё і вялікую ідэю ...................302

«МАМА, ШТО ТАКОЕ — ТАТА?» ...........................311
Пра купанне дзіцяці і пра маму,
падобную да таты ............................................311

Пра Чырвоны Каптурок
і радасць сустрэць на вайне котку .......................319
Пра маўчанне тых, хто ўжо можа казаць............327

«І ЯНА КЛАДЗЕ РУКУ ТУДЫ, ДЗЕ СЭРЦА...»........331
Пра апошнія дні вайны, калі забіваць гідка ........331
Пра сачыненне з дзіцячымі памылкамі
і кінакамедыі ..........................................................340
Пра Радзіму, Сталіна і чырвоны паркаль............344

«РАПТАМ СТРАШНА ЗАХАЦЕЛАСЯ ЖЫЦЬ...» .....350

12+

Святлана Аляксандраўна Алексіевіч

ГАЛАСЫ УТОПІІ | КНІГА ПЕРШАЯ

У ВАЙНЫ НЕ ЖАНОЧЫ ТВАР

Рэдактар Андрэй Хадановіч
Карэктар Віктар Жыбуль
Дызайн вокладкі Арцём Масюкевіч

Падпісана да друку 19.04.2018. Фармат 60×100/32.
Аб'ём 13,23 умоўн. друк. арк. Папера афсетная. Друк афсетны.
Гарнітура Charter ITC, Aeroport. Наклад 5 300. Заказ 3425/18.

Выдавец Logvino literatūros namai
J. Savickio g. 4, LT-01108 Vilnius
lohvinau.by

Друк ООО «ИПК Парето-Принт»

ISBN 978-609-8213-36-4

Ладную частку кнігі «У вайны не жаночы твар» перакладаў на беларускую мову з пігулкамі валідолу пад языком. Столькі болю і пакутаў чалавечых, што сэрца спатыкалася...

Відаць, гэта самая трагічная кніга сучаснасці мілітарнага жанру. Хоць па вялікім рахунку яна зусім не пра вайну, а пра нешта значна больш.

ВАЛЯНЦІН АКУДОВІЧ

ulej

Белгазпромбанк
Энергия твоего будущего!

Логвінаў

# У ВАЙНЫ НЕ ЖАНОЧЫ ТВАР

СВЯТЛАНА АЛЕКСІЕВІЧ